БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

А. М. Лукашэвіч В. А. Цяплова

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

## (першая палова XIX ст.)

*Рэкамендавана*
*Вучэбна-метадычным аб'яднаннем*
*па гуманітарнай адукацыі ў якасці*
*дапаможніка для студэнтаў,*
*якія навучаюцца па спецыяльнасці*
*1-21 03 01 «Гісторыя (па напрамках)»*

МІНСК
БДУ
2015

УДК 94(476)"18"(075.8)
ББК 63.3(4Беи)я73-1
Л84

Р э ц э н з е н т ы :
кафедра гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі
Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (загадчык кафедры,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А. В. Мартынюк*);
доктар гістарычных навук дацэнт
Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта *А. Ю. Бендзін*

© Лукашэвіч А. М.,
Цяплова В. А., 2015
© БДУ, 2015

**ISBN 978-985-566-236-6**

# УСТУП

У дапаможніку на аснове навейшых навуковых распрацовак адлюстраваны найбольш важныя пытанні дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага і духоўнага развіцця беларускага народа ў першай палове XIX ст. у кантэксце ўсходнеславянскай і заходнееўрапейскай гісторыі.

Вызначальнымі асаблівасцямі кнігі з'яўляюцца: удасканаленне зместу вучэбнага матэрыялу, выкарыстанне прафесійнага, кампетэнтнаснага падыходу ў навучанні, акцэнт на самастойнай рабоце студэнтаў, выкарыстанне сучасных інавацыйных тэхналогій.

Дапаможнік распрацаваны на аснове тыпавой вучэбнай праграмы «Гісторыя Беларусі» для вышэйшых навучальных устаноў, тыпавой вучэбнай праграмы па абавязковым модулі для ўстаноў вышэйшай адукацыі «Гісторыя» з улікам спецыфікі выкладання курса «Гісторыя Беларусі» на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Змест дапаможніка адпавядае раздзелам (модулям) тыпавой праграмы.

Усе даты айчыннай гісторыі прыводзяцца па старым (юліянскім) стылі, а міжнароднай – па старым і новым (грыгарыянскім) адначасова.

# 1

# АЙЧЫННАЯ І ЗАМЕЖНАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ. КРЫНІЦЫ. ІХ КЛАСІФІКАЦЫЯ

## ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

Свядомае асэнсаванне і грунтоўнае вывучэнне гісторыі Беларусі першай паловы XIX ст. пачынаецца ўжо ў 1850-х гг. Спрэчкі аб гістарычным месцы і нацыянальным лёсе Беларусі дасягнулі крайняга абвастрэння асабліва пасля паўстання 1863–1864 гг., падзеі якога вынеслі на паверхню вельмі хвалюючыя пытанні для беларускага народа: што ж такое Беларусь? У чым яе роля ў жыцці суседніх краін – Расіі, Літвы і Польшчы?

Гісторыкі М. Каяловіч, Р. Кіпрыяновіч, М. Ізвекаў, Г. Шавельскі і іншыя звязвалі гістарычнае развіццё Беларусі з Расіяй[1]. Беларуская ідэнтычнасць успрымалася імі як важны элемент узаемаадносін паміж «вялікарусамі», «маларусамі» і беларусамі, якія ўваходзілі ў склад агульнага «рускага народа» (вялікай рускай нацыі) і адзінай Рускай праваслаўнай царквы. Невыпадкова з'яўляюцца фундаментальныя працы, якія раскрываюць складаныя, часам трагічныя старонкі гісторыі праваслаўнай царквы Беларусі, традыцыі праваслаўнай культуры (slavia orthodoxa). Найбольш актуальнымі Р. Кіпрыяновічу бачыліся падзеі, звязаныя з гісторыяй і наступствамі Полацкага царкоўнага сабора (1839), які змяніў канфесійную сітуацыю на беларускіх землях.

[1] *Киприанович Г. Я.* Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве с древнейшего времени до настоящего времени. Вильна, 1895 ; 2-е доп. изд., 1899 ; *Яго ж.* Жизнь Иосифа Семашки, митрополита литовского и виленского, и воссоединение западнорусских униатов с православной церковью в 1839 г. Вильно, 1897 ; *Извеков Н. Д.* Исторический очерк состояния православной церкви в Литовской епархии с 1839 по 1889 г. М., 1899 ; *Шавельский Г.* Последнее воссоединение с православной церковию униатов Белорусской епархии (1833–1839 гг.). СПб., 1910.

Прыхільнікі іншага напрамку (Т. Грабоўскі, К. Скірмунт, С. Радзішэўскі і інш.) у падзеях канца XVIII – першай паловы XIX ст. бачылі толькі разбурэнне польскай дзяржаўнасці.

Якасна новы этап у асэнсаванні гісторыі Беларусі быў звязаны з дзейнасцю беларускіх народнікаў у канцы 70-х – першай палове 80-х гг. XIX ст. Важнае значэнне мелі іх падпольныя выданні «Пісьмы пра Беларусь» («Пісьмо першае» за подпісам «Даніла Баравік», «Пасланне да землякоўбеларусаў» за подпісам «Шчыры Беларус»), два нумары гектаграфічнага часопіса «Гоман» і інш. У гэтых выданнях упершыню была абгрунтавана ідэя існавання самастойнага беларускага этнасу, акрэсліваліся тэрыторыя рассялення беларусаў, іх этнічныя прыкметы і асаблівасці гістарычнага шляху. У якасці праграмнага патрабавання выстаўляўся лозунг федэратыўнай самастойнасці Беларусі ў сям'і іншых славянскіх народаў[1].

Станоўчы ўплыў на развіццё гістарычных ведаў аб наяўнасці этнічных асаблівасцей беларусаў мелі выдадзеныя ў канцы XIX – пачатку XX ст. грунтоўныя даследаванні гісторыкаў, этнографаў і лінгвістаў М. Янчука, А. Слупскага, І. Насовіча, М. Дзімітрыева, М. Федароўскага, Е. Раманава і інш.

Вялікі ўклад у развіццё беларусазнаўства і разуменне працэсаў, звязаных з фарміраваннем беларускай нацыі, унёс даследчык і гісторык беларускай мовы Я. Карскі. Галоўным яго навуковым дасягненнем стала трохтомная праца «Беларусы», выдадзеная на працягу 1903–1922 гг. Яе называюць энцыклапедыяй беларусазнаўства, найвышэйшым дасягненнем беларускай славістыкі канца XIX – пачатку XX ст. Асабліва каштоўнымі былі складзеныя Я. Карскім у 1903 і 1917 гг. этнаграфічныя і лінгвістычныя карты рассялення беларусаў[2].

Аднак сістэматычнае вывучэнне гісторыі Беларусі XIX ст., у тым ліку яго першай паловы, пачалося толькі пасля 1917 г., калі былі адкрыты архівасховішчы і ў рукі гісторыкаў трапілі дакументы, якія раней не даследаваліся. Гэта была эпоха 1920-х – пачатку 1930-х гг. – перыяд станаўлення марксісцкай метадалогіі ў гісторыі. Многія беларускія гісторыкі выкарыстоўвалі новыя прынцыпы даследаванняў у сваёй працы. Навуковыя манаграфіі па гісторыі Беларусі першай паловы XIX ст. галоўным чынам былі прысвечаны сацыяльна-эканамічным і рэвалюцыйным праблемам, звязаным з марксісцкім разуменнем гістарычнага працэсу.

[1] *Александрович С. Х.* Публицистика белорусских народников. Минск, 1983.
[2] *Карский Е. Ф.* Белорусы : в 3 т. Варшава, 1903–1916. Т. 1–3.

Сярод прац, якія былі напісаны ў гэты час, трэба адзначыць даследаванні Усевалада Ігнатоўскага «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі» і «Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецця»[1]. Гэты вучоны з'яўляўся адным са стваральнікаў нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі, якая разглядала айчынную гісторыю з пункту гледжання беларусаў як народа і як нацыі. Уваходжанне беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі У. Ігнатоўскі бачыў як працэс інкарпарацыі і пісаў, што з адной раскіданай дзяржавы Беларусь увайшла ў другую, якая таксама «не магла пахваліцца сваім здароўем». На думку гісторыка, палітычны стан «гнілога вялікага арганізму» прадвызначыў і характар палітыкі царскай улады ў краі: дэкляраванне палітыкі «апекі» над мясцовым насельніцтвам пры наяўнасці рэальнага сацыяльнага прыгнёту, пашырэнне мерапрыемстваў па русіфікацыі. Па меркаванні У. Ігнатоўскага, беларускі нацыянальна-вызваленчы рух выступаў за адраджэнне мясцовай культуры, мовы і нацыянальнай самасвядомасці, меў свае гістарычныя, сацыяльныя карані і быў палітычна абгрунтаваны.

Асэнсаванню палітычнай гісторыі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі былі прысвечаны дзесяць раздзелаў абагульняючай працы Мітрафана Доўнар-Запольскага «Гісторыя Беларусі»[2]. З пункту гледжання вучонага, увесь перыяд беларускай гісторыі канца XVIII – пачатку XX ст. быў звязаны з урадавай палітыкай, якая ўвесь час кідалася паміж пракаталіцка і апазіцыйна настроеным дваранствам і праваслаўным сялянствам і звычайна станавілася на бок дваранства, зневажаючы нацыянальныя інтарэсы Беларусі. Такім чынам, з-за перакосаў у адносінах улад да беларускага насельніцтва і ўзнікала ідэя аб неабходнасці стварэння незалежнай беларускай дзяржавы. Гэтыя высновы былі працягнуты ў пазнейшай працы М. Доўнар-Запольскага «Асновы дзяржаўнасці Беларусі»[3]. Вучоны правёў грунтоўны аналіз гістарычнага развіцця беларускага народа, выкарыстоўваючы вялікі аб'ём крыніцазнаўчага матэрыялу. Многія тэзісы даследчыка да нашага часу не страцілі сваёй актуальнасці. Аднак гісторыі Беларусі першай паловы XIX ст. у гэтых працах не было нададзена спецыяльнай увагі.

Наогул, 1920-я гг. былі асабліва плённымі ў распрацоўцы гісторыі Беларусі. У гэты час публікаваліся даследаванні названых аўтараў, а так-

[1] *Ігнатоўскі У. М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мінск, 1919 ; 5-е выд., Мінск, 1991 ; *Яго ж.* Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецця. Мінск, 1923 ; 3-е выд., 1928.

[2] *Доўнар-Запольскі М. В.* Гісторыя Беларусі. Мінск, 1994 ; *Яго ж.* Страницы из истории крепостного права в XVIII–XIX вв. М., 1906.

[3] *Доўнар-Запольскі М. В.* Асновы дзяржаўнасці Беларусі. Городно, 1919.

сама Ф. Турука, А. Смоліча, У. Пічэты; з’явіліся ў друку публіцыстычныя матэрыялы А. Луцкевіча, Я. Лёсіка, М. Гарэцкага і інш. У 1929 г. было падрыхтавана даследаванне Аляксандра Цвікевіча «“Западно-руссизм”: Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в.»[1]. У гэтай навуковай працы была ўзнята адна з найбольш складаных праблем грамадска-палітычнага жыцця Беларусі 1920-х гг. – наяўнасць ідэалогіі і практыкі заходнерусізму, якія значна стрымлівалі нацыянальнае развіццё беларускага народа пасля рэвалюцыйных падзей 1917 г. А. Цвікевіч стаў першым даследчыкам гэтай унікальнай грамадска-палітычнай з’явы. Вучоны разглядаў яе эвалюцыю ад моманту зараджэння, якое звязваў з палітыкай расійскага ўрада ў XIX ст., да перыяду актыўнай палітычнай дзейнасці ў пачатку XX ст. Пры гэтым гісторык не звярнуў увагі на тое, што галоўнымі апанентамі ідэолагаў заходнерусізму былі не прадстаўнікі беларускага «адраджэння», а польскія нацыянал-дэмакраты і «краёўцы». Створаная ў вострай палітычнай палеміцы 1920-х гг. праца А. Цвікевіча да нашага часу застаецца найбольш глыбокім даследаваннем аднаго з найменш вывучаных напрамкаў грамадска-палітычнай думкі Беларусі.

Усе працы 1920-х гг., прысвечаныя гістарычнай тэме, былі напісаны яшчэ без дамінуючага негатыўнага ўплыву ленінскай перыядызацыі «вызваленчага руху» і таму выявіліся асабліва плённымі ў распрацоўцы праблем эканамічнай і сацыяльна-палітычнай гісторыі Беларусі. Дасягненнем гісторыкаў гэтага часу з’явілася ўвядзенне ў навуковы абарот новага, недасягальнага раней, вялікага аб’ёму дакументальнага матэрыялу, вызначэнне і даследаванне фактычна ўсіх асноўных пытанняў палітычнай гісторыі Беларусі: выяўленне адносін да «расійскага» перыяду, абгрунтаванне патрэбы беларускай дзяржаўнай незалежнасці, аналіз рэвалюцыйных, нацыянальных і апазіцыйных да ўлад рухаў. Аднак гэты перыяд працягваўся нядоўга. Ужо напрыканцы дзесяцігоддзя інтэнсіўнае і глыбокае вывучэнне гісторыі Беларусі ператвараецца ў вузкапартыйнае, больш спрошчанае тлумачэнне гістарычных фактаў, падзей і працэсаў, што было абумоўлена новым палітычным курсам, які ўвайшоў у гісторыю як перыяд «сталінізму».

З сярэдзіны 1930-х гг. марксізм набывае дагматычны характар і становіцца адзінай метадалагічнай асновай развіцця гістарычнай навукі. Прыкладам такога падыходу да вывучэння гісторыі Беларусі могуць з’яўляцца працы Маісея Поташа, якія адлюстроўваюць ленінскі погляд на развіццё рэвалюцыйнага руху і класавай барацьбы ў Беларусі[2].

[1] *Цвікевіч А.* «Западно-руссизм»: Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. 2-е выд. Мінск, 1993.

[2] *Поташ М.* Народнический социализм. М. ; Л., 1930 ; *Яго ж.* Бальшавізм і дробнабуржуазныя партыі ў рэвалюцыі 1905 года. Мінск, 1930.

Гісторыкі, якія не жадалі ці не імкнуліся авалодаць дадзенай метадалогіяй, падвяргаліся ганенням і рэпрэсіям. Аднак і ў гэты складаны час у беларускай гістарыяграфіі з'яўляліся працы, напісаныя на высокім прафесійным узроўні. Усе яны былі прысвечаны вывучэнню сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, якое марксісцка-ленінскай метадалогіяй прызнавалася базіснай асновай у развіцці грамадства. Сярод іх – манаграфія Канстанціна Кернажыцкага «Гаспадарка прыгоннікаў на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.»[1]. Пад уплывам негатыўнай ацэнкі, дадзенай «Кратким курсом истории ВКП(б)» (1938) вывучэнню народніцкага руху, даследаванне гісторыі Беларусі, асабліва праблем нацыянальна-вызваленчага руху, было прыпынена. Толькі пасля XX з'езду КПСС (1956) зноў распачалося глыбокае і ўсебаковае вывучэнне гэтай з'явы.

У 1940-х – пачатку 1950-х гг. беларускія гісторыкі працягвалі даследаванне праблем сацыяльна-эканамічнай гісторыі, рэвалюцый і рэвалюцыйнага руху, характэрных для савецкай гістарыяграфіі папярэдняга перыяду. Менавіта тады былі вызначаны адносіны да паўстання 1830–1831 гг.[2], якое стала разглядацца ў якасці заканамернага працягу беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, накіраванага супраць царызму. Аднак асноўным напрамкам працы даследчыкаў з'яўляўся працэс накаплення крыніцавага матэрыялу.

Новы перыяд гістарычнай навукі пачаўся ў другой палове 1950-х гг. і працягваўся да канца 1980-х гг. У гэты час беларускія гісторыкі папранейшаму галоўную ўвагу звярталі на вывучэнне пытанняў сацыяльна-эканамічнага жыцця, фарміравання буржуазнага грамадства, развіцця грамадска-палітычнага і рэвалюцыйнага руху. Былі надрукаваны працы М. Улашчыка[3], М. Болбаса[4], В. Чапко[5], Н. Раманоўскага[6], П. Казлоў-

---

[1] *Кернажыцкі К. І.* Гаспадарка прыгоннікаў на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Мінск, 1935 ; *Яго ж.* Аграрная рэформа ў Бабруйскім старостве і эканамічнае становішча яго насельніцтва з XVII да пал. XIX ст. Мінск, 1931.

[2] *Воронков И. А.* Польское восстание 1830–1831 гг. в Литве и Белоруссии : автореф. дис. ... канд. ист. наук. М., 1951.

[3] *Улащик Н. Н.* Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. М., 1965.

[4] *Болбас М. Ф.* Развитие промышленности в Белоруссии (1795–1861). Минск, 1966.

[5] *Чепко В.* Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в. Минск, 1966 ; *Ее ж.* Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX в. Минск, 1972 ; *Ее ж.* Города Белоруссии в первой половине XIX века. Минск, 1981.

[6] *Романовский Н. Т.* Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии (вторая половина XVIII – первая половина XIX века). Минск, 1966.

скага[1], А. Лютага[2], В. Загарульскай[3]. Значная частка раней невядомых фактапагічных звестак была ўведзена ў навуковы зварот па пытаннях развіцця рэвалюцыйнага грамадска-палітычнага руху, падзеленага на тры этапы: дваранскі (дэкабрысты), разначынны (паўстанне 1863–1864 гг.) і сацыял-дэмакратычны. У адпаведнасці з гэтымі напрамкамі былі надрукаваны даследаванні В. Чапко[4], С. Букчына[5], А. Смірнова[6] і інш. У канцы 60-х – 70-я гг. XX ст. былі выдадзены сур'ёзныя публікацыі па гісторыі грамадска-палітычнай думкі і культуры Беларусі. Сярод іх трэба назваць працы Э. Дарашэвіча[7], Н. Махнач[8], А. Мальдзіса[9], Л. Дробава[10]. Этапнымі ў распрацоўцы праблем першай паловы XIX ст. сталі абагульняючыя працы па гісторыі Беларусі. Найбольш значнымі сярод іх з'яўляюцца першы том пяцітомнай «Гісторыі Беларускай ССР» (1972) і аднатомная «История Белорусской ССР» (1977)[11].

Нават пры метадалагічнай абмежаванасці прац 1940–80-х гг., выкліканай перш за ўсё эпохай, у якую яны ствараліся, вартасцю гэтых даследаванняў з'яўляецца вялікі фактычны матэрыял, які не згубіў сваёй каштоўнасці да сённяшняга часу.

Новы перыяд у асэнсаванні гістарычнага мінулага Беларусі пачаўся ў 1990-я гг. і працягваецца ў нашы дні. Ён з'яўляецца прамым працягам тых навуковых пошукаў у вывучэнні айчыннай гісторыі, якія былі пачаты і штучна спынены ў канцы 20-х гг. XX ст. Прадметам даследавання гісторыкаў становяцца амаль што не закранутыя да гэтага часу прабле-

[1] *Козловский П. Г.* Землевладение и землепользование в Белоруссии в первой половине XIX в. Минск, 1982.

[2] *Лютый А. М.* Социально-экономическое развитие городов в Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX в. Минск, 1987.

[3] *Загорульская О. Э.* Реформа государственной деревни (30–50 гг. XIX в.). Минск, 1987.

[4] *Чепко В. В.* Общественно-политическое движение в Белоруссии в 40-е гг. XIX в. // Тр. Ин-та истории Акад. наук БССР : сб. ст. Минск, 1958. Вып. 3. С. 110–139.

[5] *Букчин С.* К мечам рванулись наши руки. Минск, 1978.

[6] *Смирнов А. Ф.* Революционные связи народов России и Польши. М., 1962.

[7] *Дорошевич Э. К.* Философия эпохи Просвещения в Белоруссии. Минск, 1971.

[8] *Мохнач Н. Н.* Идейная борьба в Белоруссии в 30–40 гг. XIX в. Минск, 1971 ; *Яе ж.* От Просвещения к революционному демократизму. Минск, 1976 ; *Яе ж.* Общественно-политическая и этическая мысль Белоруссии начала XIX в. Минск, 1985.

[9] *Мальдзіс А. І.* Падарожжа ў XIX стагоддзе. Мінск, 1969.

[10] *Дробов Л. Н.* Живопись Белоруссии XIX – начала XX в. Минск, 1974.

[11] Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. Мінск, 1972. Т. 1 ; История Белорусской ССР. Минск, 1977.

мы – розныя напрамкі ўрадавай палітыкі, канфесіі, культура. Першай спробай стварэння такіх навуковых прац з'явіліся «Нарысы гісторыі Беларусі»[1]. Ужо ў гэтай калектыўнай працы сацыяльна-эканамічная і палітычная гісторыя Беларусі атрымала больш разгорнуты характар, хоць многія яе аспекты яшчэ не былі закрануты.

Заўважнай з'явай у вывучэнні сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі Беларусі сталі працы А. Лютага[2], Г. Туміловіч[3], С. Лугаўцовай[4], У. Сосны[5], В. Макарэвіча[6], Л. Пракаповіч[7]. Палітыцы расійскіх улад у сферы культуры, адукацыі і цэнзуры прысвечаны працы А. Гурэцкага[8], С. Куль-Сяльверставай[9], А. Загорнава[10], І. Герасімавай[11], Л. Ігнатавец[12];

---

[1] Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. Мінск, 1994. Ч. 1.

[2] *Люты А. М.* Дваранства Беларусі ў перыяд разлажэння і крызісу феадалізму (канец XVIII – першая палова XIX ст.). Мінск, 1991 ; *Яго ж.* Генезис капитализма в промышленности Белоруссии (вторая половина XVIII – первая половина XIX в.). Минск, 1991 ; *Яго ж.* Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX ст. Мінск, 2004.

[3] *Туміловіч Г. М.* Палітыка царызму ў адносінах да дробнай шляхты Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. // Нацыянальная палітыка расійскага самадзяржаўя ў канцы XVIII – першай палове XIX стагоддзя. Мінск, 1995. С. 114–128.

[4] *Луговцова С. Л.* Политика российского самодержавия по отношению к дворянству Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX в. Минск, 1997.

[5] *Сосна У. А.* Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII–XIX ст. Мінск, 2000.

[6] *Макарэвіч В.* Трансфармацыя сацыяльнай структуры дваранства Беларусі ў канцы XVIII–XIX ст. // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. / рэдкал. : У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2009. Вып. 4. С. 33–41 ; *Яго ж.* Дробная шляхта ў структуры сельскага насельніцтва Мінскай губерні ў 70-я гг. XIX ст. // Весн. БДУ. Сер. 3, № 1. 2007. С. 20–25.

[7] *Пракапович Л. Э.* Становление и развитие фабрично-заводской промышленности в Беларуси в XIX в. : автореф. дис. ... канд. ист. наук. Минск, 2006.

[8] *Гурецкий А. А.* Влияние политики Российского самодержавия на народное образование в Белоруссии в 1803–1825 гг. Минск, 1997.

[9] *Куль-Сяльверстава С. Я.* Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур: Фармаванне культуры Новага часу на беларускіх землях (другая палова XVIII ст. – 1820-я гг.). Мінск, 2000 ; *Яе ж.* Историография политики царизма в Белоруссии и национальное возрождение белорусов // Славяноведение. 1996. № 5.

[10] *Загорнов А. А.* Цензура в Беларуси: законодательство и практика в первой половине XIX века. Брест, 2006.

[11] *Герасимова И. П.* Еврейское образование в Белоруссии в XIX – начале XX в. и отношение к нему российского самодержавия : автореф. дис. ... канд. ист. наук. Минск, 1996.

[12] *Игнатовец Л. М.* Белорусский учебный округ: создание и деятельность (1829–1850 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук. М., 2013.

канфесійнай палітыцы – А. Філатавай[1], А. Гарбацкага[2], І. Ганчарука[3], М. Папова[4], А. Раманчука[5], П. Шаўкуна[6] і інш. Арганізацыя і камплектаванне дзяржаўных устаноў на беларускіх землях, механізмы іх функцыянавання, сацыяльны і нацыянальны склад бюракратычнага апарату разглядаюцца ў даследаваннях С. Токця[7], А. Кісялёва[8], П. Брыгадзіна, А. Лукашэвіча[9], В. Лепеш[10], М. Смяховіча, А. Філатавай[11].

На новых метадалагічных падыходах, больш разнастайнай і рэпрэзентатыўнай крыніцавай базе працягваецца вывучэнне грамадска-палітычных рухаў і грамадска-палітычнай думкі В. Шалькевічам[12], В. Шведам[13],

---

[1] *Филатова Е. Н.* Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси 1772–1860 гг. Минск, 2006 ; Канфесіі на Беларусі (канец XVIII–XX ст.) / Грыгор'ева В. В. [і інш.] ; навук. рэд. У. І. Навіцкі. Мінск, 1998.

[2] *Гарбацкі А. А.* Стараабраднiцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX ст. : аўтарэф. дыс. ... доктара гіст. навук. Мінск, 1999.

[3] *Ганчарук І. Г.* Палітыка царызму ў адносінах да каталіцкай царквы (1772–1830) // Беларус. гіст. часоп. 2002. № 1. С. 39–46.

[4] *Попов М. А.* Митрополит Станислав Богуш-Сестренцевич (1731–1826): роль в формировании правительственной политики по отношению к Римско-католической церкви на белорусских землях (конец XVIII – первая четверть XIX в.). Минск, 2012.

[5] *Романчук А., прот.* Иосиф (Семашко), митрополит Литовский и Виленский: жизнь и служение. Минск, 2012.

[6] *Шевкун П. В.* Политика правительства Российской империи в отношении православной церкви Беларуси (1796–1855 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук. Минск, 2013.

[7] *Токць С. М.* Дзяржаўны апарат царызму ў Беларусі ў 30–60-х гг. XIX ст. (структура, функцыі, чыноўніцкі корпус) : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук. Мінск, 1997.

[8] *Киселев А. А.* Система управления и чиновничество белорусских губерний в конце XVIII – первой половине XIX в. Минск, 2007.

[9] *Бригадин П. И., Лукашевич А. М.* Минские губернаторы: история власти. Минск, 2009.

[10] *Лепеш О. В.* Комитет западных губерний: организация и деятельность (1831–1848). Минск, 2010.

[11] *Смяховіч М. У.*, *Філатава А. М.* Праекты дзяржаўнасці беларуска-літоўскіх зямель (20–50-я гг. XIX ст.) // Палітычныя, сацыяльныя і этнакультурныя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст.: Да 150-годдзя скасавання прыгоннага права ў Расійскай імперыі : матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., г. Мінск, 4 сак. 2011 г. Мінск, 2011. С. 65–68.

[12] *Шалькевич В. Ф.* Общественно-политическая и философская мысль Беларуси в первой половине XIX в. : дис. ... д-ра ист. наук. Минск, 1993.

[13] *Швед В. В.* Беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў. Мінск, 1998 ; *Яго ж.* Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.). Гродна, 2001 ; *Яго ж.* Масоны і ложы на землях Беларусі (канец XVIII – першая чвэрць XIX ст.) : біябібліягр. слоўн. Гродна, 2007.

В. Гарбачовай[1], А. Дашкевічам[2], што дазволіла аўтарам канцэптуальна перагледзець змест моладзевага руху 30-х – пачатку 60-х гг. XIX ст. як асобнай з'явы, характэрнай для грамадскай дзейнасці і працэсаў фарміравання грамадзянскай супольнасці ў дадзены перыяд.

Безумоўна, яшчэ не ўсе праблемы палітычнай гісторыі Беларусі першай паловы XIX ст. узняты беларускімі гісторыкамі. Трэба прызнаць, што вывучэнне гэтай сферы вядзецца вельмі нераўнамерна. Больш увагі надавалася «вяршынным» з'явам, момантам уздыму грамадскіх рухаў, значна менш – параўнальна спакойным, шэраговым. У беларускай гістарыяграфіі ёсць шмат цудоўных даследаванняў рэвалюцыйнага руху першай паловы XIX ст. і яго дзеячаў. Значна менш вывучаны іншыя напрамкі грамадска-палітычнай думкі гэтага часу: лібералізм і кансерватызм (даследаванні, што паклалі пачатак асэнсаванню ліберальнага і кансерватыўнага рухаў Беларусі ў XIX ст., ужо з'явіліся[3]). Між тым навуковая значнасць даследавання гэтых напрамкаў грамадска-палітычнай думкі даволі вялікая, бо дазваляе выявіць агульныя і спецыфічныя асаблівасці палітычнай гісторыі Беларусі ў яе дыялектычным адзінстве і ў супярэчнасцях.

Сапраўдным прарывам у даследаванні гісторыі Беларусі стала распрацоўка праблем вайсковай гісторыі, звязаная з імем А. Лукашэвіча. Дыяпазон прац гэтага навукоўца досыць вялікі: ад гісторыі стварэння на беларускіх землях вайсковай школы да вывучэння стратэгічнага планавання, вайскова-інжынернай і тапаграфічнай падрыхтоўкі беларускіх земляў як верагоднага тэатра вайсковых дзеянняў у 1812 г.[4] Напісаныя

---

[1] *Гарбачова В. В.* Паўстанне 1830–1831 гг. на Беларусі. Мінск, 2001.

[2] *Дашкевіч А. Л.* Маладзёжны рух Беларусі 30-х – пачатку 60-х гг. XIX ст. : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук. Мінск, 2003.

[3] *Сакалова М.* Пачатак ліберальнага руху на Беларусі // Штогоднік Ін-та гісторыі НАН Беларусі. Мінск, 1999. С. 48–56 ; *Яе ж.* Кансерватызм на Беларусі ў XIX ст. // Беларус. гіст. часоп. 1997. № 1. С. 22–34 ; *Соколова М. А.* Общественные движения на территории Беларуси (XIX – начало XX в.). Минск, 2011.

[4] *Бригадин П. И., Лукашевич А. М.* Военная школа в Беларуси, XVIII – первая четверть XIX в. Минск, 2004 ; *Іх жа.* Мятежный корпус: из истории Александровского Брестского кадетского корпуса (1842–1863). Минск, 2007 ; *Лукашевич А. М.* Политическая ситуация в белорусско-польском пограничье и ее оценка российским руководством: по данным разведки и контрразведки (1801–1812 гг.). Минск, 2009 ; *Яго ж.* Белорусские земли как вероятный театр военных действий: изучение, инженерная и топографическая подготовка (70-е гг. XVIII в. – 1812 г.). Минск, 2010 ; *Яго ж.* Западный пограничный регион в военно-стратегических планах Российской империи (конец XVIII в. – 1812 г.) : в 3 кн. Минск, 2012. Кн. 1–2 ; *Яго ж.* Памятники и памятные места 1812 года в Беларуси. Минск, 2012.

на скрыжаванні айчыннай, расійскай і польскай гістарыяграфіі, яны ўносяць шмат новага ў вывучэнне як беларускай, так і расійскай гісторыі. Напрыклад, высновы аўтара пра залежнасць планаў расійскіх кіруючых колаў па вырашэнні «польскай праблемы» ад спроб нейтралізацыі прафранцузскіх настрояў жыхароў літоўска-беларускіх губерняў адкрываюць перспектыву далейшага асэнсавання палітычнай гісторыі Усходняй Еўропы ў цэлым.

Вывучэнне гісторыі Беларусі першай паловы XIX ст. немагчыма без прыцягнення фундаментальных прац, створаных на падмурку апошніх дасягненняў гістарычнай навукі, атрыманых у выніку шматгадовых даследаванняў. Да такіх выданняў варта аднесці чацвёрты том «Гісторыі Беларусі» пад рэдакцыяй М. Касцюка («Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.)»)[1], які можна лічыць выніковым у асэнсаванні гісторыі Беларусі за перыяд 1990-х – пачатак 2000-х гг. І тым не менш у вывучэнні гісторыі Беларусі першай паловы XIX ст. застаецца яшчэ шмат пытанняў, якія чакаюць свайго даследчыка.

Расійская гістарыяграфія гісторыі Беларусі першай паловы XIX ст. з'яўляецца нешматлікай і звязанай у большай ступені з асэнсаваннем «польскага пытання» ў знешняй і ўнутранай палітыцы Расійскай імперыі. Сярод лепшых прац XIX ст. варта назваць даследаванні А. Карнілава[2] і С. Раждзественскага[3], з сучасных цікавасць уяўляюць працы Б. Міронава[4]. Вывучаючы сацыяльную гісторыю Расіі, гэты навуковец закранае і нацыянальнае пытанне. Напрамак урадавай палітыкі на беларускіх землях да паўстання 1830–1831 гг. ён вызначае як прагматычны і талерантны ў адносінах да нацыянальных асаблівасцей ускраін. Паўстанне 1830–1831 гг. змяніла яе характар у бок скасавання адміністрацыйна-палітычнай аўтаноміі Каралеўства Польскага і ўзмацнення жорсткасці нацыянальнай палітыкі.

Вялікі ўклад у вывучэнне паўстання 1830–1831 гг. зрабілі і польскія гісторыкі, якія праяўляюць да вывучэння гісторыі Беларусі не меншую цікавасць.

---

[1] Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал. : М. Касцюк (гал. рэд) [і інш.]. Т. 4 : Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. Мінск, 2005.

[2] *Корнилов А. А.* Курс истории России XIX века. 3-е изд. М., 1993.

[3] *Рождественский С. В.* Исторический обзор деятельности Министерства народного просвещения: 1802–1902. СПб., 1902.

[4] *Миронов Б. М.* Социальная история России периода империи (XVIII – начало XX в.): Генезис личности, демократической семьи, гражданского общества и правового государства : в 2 т. СПб., 1999. Т. 1–2.

## КРЫНІЦЫ

Першая палова XIX ст. характарызуецца вялікімі зменамі ў сацыяльна-эканамічным, палітычным і культурным жыцці Беларусі. Гісторыя Беларусі гэтага перыяду вывучаецца на падставе матэрыялаў з разнастайных гістарычных крыніц, якія падзяляюцца на некалькі груп: заканадаўчыя акты, афіцыйнае справаводства, эканоміка-геаграфічныя і гаспадарчыя апісанні, статыстычныя матэрыялы, мемуары, літаратурныя і публіцыстычныя творы, перыядычны друк.

Асноўную частку гэтых дакументаў складаюць заканадаўчыя акты: законы, маніфесты, указы, пастанаўленні і інш. Апроч іх у гэтую групу гістарычных крыніц уваходзяць разнастайныя праекты, нататкі, інструкцыі, дырэктывы, цыркуляры і да т. п., дакументы, якія раскрываюць гісторыю паходжання таго ці іншага заканадаўчага акта і спецыфіку яго ўжывання. Сюды ж адносяцца пратаколы і іншыя матэрыялы Сената, Камітэта і Рады (Савета) міністраў, розных камісій і іншых устаноў.

У канцы XVIII – першай палове XIX ст. у Расійскай імперыі права выдання новых законаў належала толькі імператару. Сенат, Сінод і іншыя ўрадавыя ўстановы мелі толькі права звяртацца да яго з дакладамі, прапановамі і прадстаўленнямі.

Матэрыялы расійскага заканадаўства дазваляюць прасачыць урадавую палітыку на тэрыторыі Беларусі. Калі па сваім паходжанні і форме законы былі розныя, то па кампазіцыі яны з'яўляліся падобнымі і звычайна падзяляліся на тры часткі: прэамбулу, абгрунтаванне і асноўны тэкст. Трэба таксама адзначыць, што датай выдання заканадаўчага акта з'яўлялася не дата апублікавання, а час зацвярджэння яго імператарам.

У другой чвэрці XIX ст. урад змог прыступіць да працы па кадыфікацыі законаў. З гэтай мэтай у 1826 г. было ўтворана II аддзяленне Уласнай яго імператарскай вялікасці канцылярыі, арганізатарам усёй працы якога па кадыфікацыі з'яўляўся М. Сперанскі.

На працягу 1826–1830 гг. быў падрыхтаваны I Поўны збор законаў Расійскай імперыі (ПЗЗРІ)[1], які ўключаў у сябе заканадаўчыя акты, пачынаючы ад Саборнага ўкладання 1649 г. і заканчваючы законамі, выдадзенымі пры імператары Аляксандры I, г. зн. па 19 лістапада 1825 г. Адначасова з гэтым М. Сперанскі прыступіў да выдання II ПЗЗРІ, які пачынаўся з праўлення Мікалая I (пасля гэты збор быў даведзены да 1 сакавіка 1881 г.).

[1] Полное собрание законов Российской империи (ПСЗРИ) : в 45 т. СПб., 1830–1849. Собр. 1. С 1649 по 12 декабря 1825 г.

I ПЗЗРІ ўключыў у сябе 30 600 заканадаўчых актаў у 41 т., а разам з паказальнікамі (храналагічным і алфавітна-прадметным) і дадатковымі тамамі агульны аб'ём збору склаў 45 т. У 1873 г. быў апублікаваны паказальнік імёнаў і прозвішчаў, якія сустракаюцца ў I ПЗЗРІ (складальнік Р. Рэпінскі).

II ПЗЗРІ ўключыў 61 928 заканадаўчых актаў у 55 т. У канцы кожнага тома змешчаны храналагічны і прадметны паказальнікі. Ёсць таксама паказальнік імёнаў, што сустракаюцца ў II ПЗЗРІ (складальнік П. Майкаў).

Прынцып размеркавання законаў у Поўным зборы храналагічны. Таму ў яго ўключаліся ўсе законы, незалежна ад характару зместу і ад таго, дзейнічалі яны ці былі скасаваны. Але ў Зборы змешчаны далёка не ўсе дакументы. З найвялікшай паўнатой пададзены заканадаўчыя акты за перыяд XIX ст. Аднак законы, якія мелі сакрэтны характар, не друкаваліся. І ўсё ж ПЗЗРІ з'яўляецца найбольш важнай заканадаўчай крыніцай, якая мае ўніверсальны характар. У ім змяшчаюцца заканадаўчыя акты, што адносяцца да арганізацыі дзяржаўнай улады (пра ўтварэнне Камітэта па справах заходніх губерняў), мірныя дагаворы, маніфесты часоў войн 1812, 1813–1814 гг., заканадаўства па сялянскім пытанні, пачынаючы ад закона пра вольных хлебаробаў 20 лютага 1803 г., а таксама ўказы, што тычыліся эканамічнага развіцця Расійскай імперыі, у тым ліку і беларускіх губерняў (мытныя тарыфы, статуты розных банкаў), і г. д.

Іншай крыніцай універсальнага характару з'яўляецца «Збор законаў Расійскай імперыі» (ЗЗРІ), які таксама падрыхтаваў М. Сперанскі. ЗЗРІ быў скончаны і зацверджаны ў 1833 г., яго аб'ём склаў 15 тамоў. У адрозненне ад ПЗЗРІ, ЗЗРІ ўтрымліваў толькі дзейныя законы, якія змешчаны не ў храналагічным, а ў сістэматычным парадку. Збор законаў перыядычна перавыдаваўся. Па ўзоры ЗЗРІ, які насіў агульны характар, ствараліся ведамасныя зборы. Так, у 1838 г. М. Сперанскі падрыхтаваў «Збор вайсковых пастаноў». Ён уключаў усе законы, якія дзейнічалі па вайсковым ведамстве, пачынаючы ад вайсковага статута Пятра I (1716) да тых, што выйшлі да 1 мая 1838 г. Гэты збор атрымаў назву «Збор вайсковых пастаноў 1839 г.».

Пры вывучэнні заканадаўчых актаў неабходна звяртаць увагу на высвятленне існасці палітычнай канцэпцыі, якой прысвечана публікацыя. Што ж датычыцца зместу саміх дакументаў, важна на прыкладзе заканадаўчых актаў і розных надзвычайных законаў умець прасочваць асаблівасці расійскага заканадаўства адносна беларускіх губерняў.

Побач з агульнаімперскімі зводамі на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі і зводы мясцовых узаканенняў: «Статут Вялікага Княства Літоўскага» (1588)[1], розныя палажэнні (аб вайсковай службе дваран заходніх губерняў)[2], правілы (аб складанні люстрацыйных актаў у Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губернях)[3] і інш. Матэрыялы заканадаўства па Беларусі апублікаваны С. Рубінштэйнам у «Хронологическом указателе указов и правительственных распоряжений по губерниям Западной России, Белоруссии и Малороссии за 240 лет с 1652 по 1892 г.»[4].

Зводы законаў дапаўняюцца тэматычнымі зборамі заканадаўчых актаў, што мелі дачыненне да розных галін жыцця насельніцтва беларускіх губерняў: па прававым статусе яўрэйскага насельніцтва[5], прадстаўнікоў розных канфесій[6].

Вялікай і вельмі важнай групай гістарычных крыніц з’яўляюцца афіцыйна-дакументальныя матэрыялы дзяржаўных устаноў, без прыцягнення якіх немагчыма вывучэнне ніводнага пытання гісторыі Беларусі. Гэтыя матэрыялы разнастайныя як па форме, так і па змесце. Сярод крыніц гэтай групы найвялікшае значэнне маюць матэрыялы Камітэта па справах заходніх губерняў, справаздачы грамадзянскіх губернатараў і генерал-

[1] Статут Великого Княжества Литовского. С подведением в надлежащих местах ссылки на конституции, приличные содержанию оного : пер. с пол. : в 2 ч. СПб., 1811. Ч. 1–2.

[2] Положение о дворянах западных губерний, которые по достижении 18 лет поступают в военную службу на основании высочайшего указа 21 апреля 1852 г. СПб., 1852.

[3] Правила для составления, предъявления и утверждения люстрационных актов по казенным селениям и местечкам в губерниях: Виленской, Витебской, Волынской, Гродненской, Киевской, Ковенской, Минской, Могилевской и Подольской. СПб., 1867.

[4] *Рубинштейн С. Ф.* Хронологический указатель указов и правительственных распоряжений по губерниям Западной России, Белоруссии и Малороссии за 240 лет с 1652 по 1892 г. Вильна, 1895.

[5] Полный хронологический сборник законов и положений, касающихся евреев. СПб., 1874 ; *Оршанский И. Г.* Русское законодательство о евреях. СПб., 1887.

[6] *Белоголов И.* Акты и документы, относящиеся к устройству и управлению римско-католической церкви в России. Пг., 1915. Т. 1 ; Алфавитный указатель действующих и руководственных канонических постановлений, указов, определений и распоряжений Св. Прав. Синода (1721–1901 гг. включительно) и гражданских законов, относящихся к духовному ведомству православного исповедания. СПб., 1902.

губернатараў, шматлікая дакументацыя дзяржаўных устаноў, службовая перапіска, дакументы грамадска-палітычных арганізацый (таварыстваў «Філаматаў», «Ваенных сяброў», «Злучаных славян», дзекабрыстаў), следчыя справы[1] і г. д. Некаторыя з відаў крыніц гэтага тыпу апублікаваны ў спецыяльных зборніках дакументаў і матэрыялаў, хрэстаматыях[2] або ў тэматычных зборніках матэрыялаў афіцыйнага справаводства.

Напрыклад, цікавыя дакументальныя матэрыялы, прысвечаныя ўплыву напалеонаўскіх войн 1805–1815 гг. на развіццё гістарычных падзей у Беларусі, змешчаны ў зборніках «Акты, документы и материалы для политической и бытовой истории 1812 года, собранные и изданные по поручению е. и. в. великого князя Михаила Александровича» («Сборник Русского императорского исторического общества», т. 128, 133, 139)[3], «Акты и документы архива Виленского, Ковенского и Гродненского генерал-губернаторского управления, относящиеся к истории 1812–1813 гг.»[4], «Акты, издаваемые Виленской комиссией для разбора древних актов: Т. 37. Документы и материалы, относящиеся к истории Отечественной войны 1812 года»[5], «Беларусь и война 1812 года»[6] і іншых публікацыях.

Аднак большая частка дакументаў першай паловы XIX ст. захоўваецца ў архівах – Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродне, Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы (Вільнюс), Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве (Санкт-Пецярбург), Расійскім дзяржаўным ваенна-гістарычным архіве (Масква), Галоўным архіве старажытных актаў (Варшава) і інш. Пры вывучэнні

[1] Восстание декабристов : док. и материалы. М. ; Л., 1925–1984. Т. 1–18 ; Materialy do historii Towarzystwa Filomatów. Kraków, 1920–1934 ; Archiwum Filomatów. Cz. 1. T. 1–5; Cz. II. T. 1–3. Warszawa, 1913–1934.

[2] Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772–1903 гг.). Мінск, 1940. Т. 2 ; Белоруссия в эпоху феодализма : сб. док. и материалов. Минск, 1979. Т. IV. С. 267–323 ; Хрестоматия по истории Белоруссии: с древнейших времен до 1917 г. Минск, 1977. С. 240–247.

[3] Акты, документы и материалы для политической и бытовой истории 1812 года, собранные и изданные по поручению е. и. в. великого князя Михаила Александровича. СПб., 1909–1912. Т. 1–3.

[4] Виленский временник. Кн. 5: Акты и документы архива Виленского, Ковенского и Гродненского генерал-губернаторского управления, относящиеся к истории 1812–1813 гг. : в 2 ч. Вильна, 1912–1913. Ч. 1–2.

[5] Акты, издаваемые Виленской комиссией для разбора древних актов : в 39 т. Вильно, 1912. Т. 37.

[6] Беларусь и война 1812 года : документы / сост. А. М. Лукашевич, Д. Л. Яцкевич. Минск, 2011 ; 2-е изд. Минск, 2013.

справаводчых крыніц важна ведаць міжархіўныя і ўнутрыархіўныя даведнікі[1], а таксама бібліяграфію да кніг і артыкулаў.

Вялікая колькасць звестак аб Беларусі змяшчаецца ў эканоміка-геаграфічных і статыстычных апісаннях першай паловы XIX ст. Па характары і структуры гэта даволі стракатая група крыніц, аб'яднаная агульнасцю паходжання і тэматыкі. Сярод іх – эканоміка-геаграфічныя і гаспадарчыя апісанні (інвентары памешчыцкіх маёнткаў, ваенна-тапаграфічныя апісанні, памятныя кніжкі), нататкі спадарожнікаў, рэвізскі ўлік насельніцтва, геаграфічныя слоўнікі.

З публікацый такіх крыніц можна назваць, напрыклад, ваенна-геаграфічныя апісанні першай паловы XIX ст. Галоўнае з іх – «Военно-статистическое обозрение Российской империи»[2] (СПб., 1848–1853). Беларускім губерням прысвечаны восьмы (часткі 1, 3)[3] і дзявяты (часткі 2, 3, 4)[4] тамы гэтага выдання.

Нататкі падарожнікаў прадстаўлены публікацыямі «Записки путешествия по западным провинциям Российского государства, или минералогические, хозяйственные и другие примечания, учиненные во время проезда через оные в 1802 году академиком Василием Севергиным»[5], «Дневные записки путешествия А. Бошняка в разные области Западной и Полуденной России в 1815 г.»[6], «Путешествие по Полесью и белорусскому краю» (П. Шпілеўскі)[7] і інш.

---

[1] Центральный государственный исторический архив БССР в г. Минске. Путеводитель. Минск, 1974 ; Фонды Национального исторического архива Беларуси : справочник. Минск, 2006.

[2] Военно-статистическое обозрение Российской империи, издаваемое при 1-м отделении департамента Ген. штаба. СПб., 1848–1853. Т. 1–17.

[3] Военно-статистическое обозрение Российской империи. Витебская губерния [сост. Без-Корнилович]. СПб., 1852. Т. 8. Ч. 1 ; Могилевская губерния [сост. Черницкий]. СПб., 1848. Т. 8. Ч. 3.

[4] Военно-статистическое обозрение Российской империи. Виленская губерния [сост. Норденстренг]. СПб., 1848. Т. 9. Ч. 2 ; Гродненская губерния [сост. Калмберг]. СПб., 1849. Т. 9. Ч. 3 ; Минская губерния [сост. Стренг]. СПб., 1848. Т. 9. Ч. 4.

[5] *Севергин В. М.* Записки путешествия по западным провинциям Российского государства, или минералогические, хозяйственные и другие примечания, учиненные во время проезда через оные в 1802 году академиком Василием Севергиным. СПб., 1803.

[6] Дневные записки путешествия А. Бошняка в разные области Западной и Полуденной России в 1815 г. М., 1820–1821. Ч. 1–2.

[7] *Шпилевский П. М.* Путешествие по Полесью и белорусскому краю. СПб., 1858.

Для вывучэння гісторыі Беларусі немалаважна ведаць знакамітыя слоўнікі. Так, з геаграфічных слоўнікаў найбольшае значэнне мае Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich[1], з энцыклапедычных – «Энциклопедический словарь Ф. А. Брокгауза и И. А. Ефрона»[2].

Асобную групу крыніц – асабістага паходжання – прадстаўляюць мемуары і дзённікі. Мемуарная літаратура XIX ст. адрозніваецца шматаблічнасцю і адлюстроўвае шырокі спектр грамадска-палітычнага, рэлігійнага, культурнага жыцця Беларусі. Часта мемуары з'яўляюцца адзіным сведчаннем, якое дае ўяўленне аб той ці іншай падзеі або факце.

Несумненную цікавасць для вывучэння палітычнай гісторыі Беларусі пачатку XIX ст. маюць мемуары Адама Чартарыйскага, важнага дзяржаўнага дзеяча Расіі, паляка па нацыянальнасці[3]. А. Чартарыйскі прымаў актыўны ўдзел у палітычным жыцці Еўропы і Расіі. Выкарыстоўваючы змаганне Аляксандра I з Напалеонам, ён спадзяваўся на аднаўленне незалежнасці Польшчы. Пасля задушэння паўстання 1830–1831 гг., адным з кіраўнікоў якога з'яўляўся князь, А. Чартарыйскі вымушаны быў парваць з Расіяй, эміграваў у Англію, потым пераехаў у Парыж. Апублікаваныя мемуары ахопліваюць ранні перыяд яго палітычнай дзейнасці да 1805 г. За наступныя гады ёсць толькі асобныя замалёўкі і перапіска з расійскім манархам, якія дазваляюць узнавіць і лёс Беларусі ў дзяржаўных планах А. Чартарыйскага і імператара Аляксандра I. Асабліва важныя тыя сюжэты, якія даюць уяўленне пра дзейнасць А. Чартарыйскага на пасадзе апекуна Віленскай навучальнай акругі, у склад якой уваходзіла ўся тэрыторыя Беларусі.

Звесткі, што змяшчаюцца ў мемуарах князя А. Чартарыйскага, істотна дапаўняюць успаміны такіх палітычных дзеячаў Польшчы, Беларусі і Расіі, як Л. Сапега і М. К. Агінскі[4]. Мемуары не толькі дазваляюць прасачыць палітычныя погляды іх аўтараў і праекты дзяржаўнай перабудовы, што належаць гэтым асобам, але і даюць магчымасць узнавіць менталітэт і псіхалагічнае аблічча цэлай групы магнатаў, злучаных сваім лёсам з Расіяй і Беларуссю канца XVIII – першай паловы XIX ст.

---

[1] Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. Warszawa, 1888–1900. T. 1–15.

[2] *Брокгауз Ф. А., Ефрон И. А.* Энциклопедический словарь : в 86 т. СПб., 1890–1907. Т. 1–86.

[3] *Чарторыйский А.* Мемуары князя Адама Чарторижского и его переписка с императором Александром I : в 2 т. / пер. с фр. А. Дмитриевой ; ред. и вступ. ст. А. Кизеветтера. М., 1912–1913. Т. 1–2.

[4] *Ogiński M.* Pamiętniki Michała Ogińskiego o Polsce i polakach od r. 1788 aż do końca r. 1815 : w 4 t. : przeł. z jęz. fr. Poznań, 1870–1873. T. 1–4.

Змястоўнымі і ёмістымі пры вывучэнні спецыфікі палітыкі расійскага ўрада ў Беларусі з'яўляюцца ўспаміны вышэйшых чыноўнікаў беларускіх губерняў, напрыклад віленскага генерал-губернатара Ф. Міркавіча[1] і віцебскага губернатара І. Жыркевіча[2]. Для разумення ўсяго комплексу палітычных падзей, звязаных з Беларуссю, вялікую цікавасць уяўляюць успаміны М. Чайкоўскага[3], К. Клачкоўскага[4], А. Зеланда[5], Г. Дабрыніна[6], жандарскага афіцэра А. Ламачэўскага[7], селяніна Я. Чабодзькі[8], мітрапаліта літоўскага Іосіфа Сямашкі[9], епіскапаў полацкага Васілія Лужынскага[10] і мінскага Антонія Зубко[11].

Асаблівай увагі пры характарыстыцы грамадскага жыцця Беларусі першай паловы XIX ст. заслугоўваюць два зборнікі ўспамінаў, якія пабачылі свет у канцы XX ст., – «Русское общество 30-х гг. XIX в. Люди и идеи: Мемуары современников»[12] і «Николай I и его времена. Документы, письма, дневники, мемуары, свидетельства современников и труды историков»[13]. Яны ўтрымліваюць важныя звесткі пра ўрадавую палітыку ў Беларусі ў другой чвэрці XIX ст.

---

[1] Федор Яковлевич Миркович. 1789–1866. Его жизнеописание, составленное по собственным его запискам, воспоминаниям близких людей и подлинным документам. СПб., 1889. Т. 1 ; Из записок Ф. Я. Мирковича // Рус. архив. 1890. № 3. С. 395–435.

[2] *Жиркевич И. С.* Записки Ивана Степановича Жиркевича. 1789–1848. М., 2009 ; Из бумаг И.С. Жиркевича // Ист. вестн. 1892. № 4. С. 150–159.

[3] Записки М. С. Чайковского (Садык-паши). СПб., 1895.

[4] Из воспоминаний К. Клочковского // Рус. старина. 1902. № 9.

[5] *Зеланд А. Л.* Воспоминания о польском восстании и войне 1830–1831 гг. // Рус. старина. 1892. Т. 75. № 9. С. 505–531 ; Т. 76. № 10. С. 81–113.

[6] *Добрынин Г.* Истинное повествование, или жизнь Гаврилы Добрынина, им самим писанная в Могилеве и в Витебске. СПб., 1872.

[7] *Ломачевский А. И.* Из воспоминаний жандарма 30-х – 40-х годов : в 2 ч. СПб., 1880. Ч. 1–2.

[8] *Чебодько П. Я.* Из воспоминаний белоруса Я. А. Чебодько. Киев, 1910.

[9] Иосиф, митрополит. Записки Иосифа, митрополита Литовского, изданные императорскою Академиею наук по завещанию автора : в 3 т. СПб., 1883. Т. 1–3.

[10] Записки Василия Лужинского, архиепископа Полоцкого и Витебского о начале и ходе дела воссоединения с православной церковью, написанные в конце 1866 года. Казань, 1885.

[11] Антоний (Зубко), архиеп. О греко-униатской церкви в Западном крае России // Сборник статей, изданных Св. Синодом по поводу 50-летия воссоединения с Православной церковью западно-русских униатов. СПб., 1889. С. 38–76.

[12] Русское общество 30-х гг. XIX в. Люди и идеи: Мемуары современников. М., 1989.

[13] Николай I и его времена. Документы, письма, дневники, мемуары, свидетельства современников и труды историков : в 2 т. М., 2000. Т. 1–2.

Вывучэнню гісторыі грамадска-палітычнага руху разглядаемага перыяду грунтоўна садзейнічаюць нататкі дзекабрыстаў, паўстанцаў 1830–1831 гг., удзельнікаў тайных студэнцкіх арганізацый, якія існавалі пры Віленскім універсітэце. Да гэтай жа групы крыніц далучаюцца эпісталярныя лісты, якія істотна дапаўняюць звесткі па самых разнастайных баках грамадска-палітычнага і культурнага жыцця Беларусі. Вялікую цікавасць сярод іх выклікае карэспандэнцыя філарэтаў і філаматаў, перапіска дзекабрыстаў[1].

Шматлікую групу гістарычных крыніц утвараюць літаратурныя і публіцыстычныя творы. Развіваючыся ў цеснай сувязі з грамадскім жыццём, адчуваючы на сабе ўплыў часу, яны з'яўляюцца спецыфічнай формай выяўлення духоўнага жыцця грамадства. Літаратура XIX ст. прадстаўлена творчасцю А. Міцкевіча, Я. Чачота, А. Вярыгі-Дарэўскага, У. Сыракомлі, В. Дуніна-Марцінкевіча, публіцыстыкай П. Шпілеўскага і інш.

У перыяд новага часу беларускай гісторыі важнае значэнне набывае перыядычны друк, які становіцца моцным сродкам інфармацыі і арганізацыі грамадскай свядомасці. Перыядычны друк першай паловы XIX ст. прадстаўлены «Виленским вестником» і «Губернскими ведомостями», якія насілі афіцыйны характар. Аднак перыядычныя выданні часта выходзілі за рамкі афіцыёзу, калі яны публікавалі матэрыялы па этнаграфіі, краязнаўстве, археалогіі Беларусі.

Своеасаблівай групай крыніц па гісторыі культуры Беларусі з'яўляюцца творы мастацтва першай паловы XIX ст. Створаныя мастакамі, дойлідамі, скульптарамі, яны сведчаць не толькі аб узроўні майстэрства іх аўтараў, але і аб духоўным жыцці беларускага грамадства таго часу. Першыя, найбольш поўныя зборы мастацкіх твораў Беларусі былі зроблены Л. Дробавым[2] і В. Чантурыяй[3]. У цяперашні час гэта праца працягваецца і аўтары публікуюць разнастайныя альбомы – каталогі мастацтва Беларусі[4].

Навуковыя і вучэбныя выданні дакументаў па гісторыі Беларусі першай паловы XIX ст. з'явіліся ў другой палове таго ж стагоддзя. У савецкі час зроблена публікацыя некалькіх цікавых зборнікаў дакументаў. Сярод іх трэба вылучыць «Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772–1903 гг.)»[5], «Матэрыялы па гісторыі мануфактуры Беларусі ў часы распа-

---

[1] Archiwum Filomatów / wydał J. Czubek. Cz. 1. Korespondencja 1815–1823. Kraków, 1913. T. IV–V ; Пачынальнікі. З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. Мінск, 1977.

[2] *Дробов Л. Н.* Живопись Белоруссии XIX – начала XX в. Минск, 1974.

[3] *Чантурия В. А.* История архитектуры Белоруссии. 2-е изд. Минск, 1977.

[4] Іван Хруцкі. 1810–1885: Альбом-каталог. Мінск, 1990.

[5] Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772–1903 гг.). Мінск, 1940. Т. 2.

ду феадалізму»[1], «Беларусь у эпоху феадалізму»[2]. У наш час патрабуецца выданне новых зборнікаў дакументаў па гісторыі Беларусі першай паловы XIX ст., якія б утрымлівалі дакументы, што адлюстроўваюць гісторыю Беларусі ва ўсёй яе паўнаце і разнастайнасці.

## ВЫСНОВЫ

Гістарыяграфія (літаральна – апісанне гісторыі) – дапаможная гістарычная дысцыпліна. Гэта паняцце абазначае:

а) гісторыю гістарычнай навукі;

б) сукупнасць гістарычных даследаванняў, аб'яднаных агульнымі рысамі: нацыянальнымі (беларуская, расійская, польская і інш.), тэарэтычнымі (ліберальна-буржуазная, дэмакратычная, марксісцкая і інш.), тэматычнымі, храналагічнымі (напрыклад, гістарыяграфія гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст.).

Крыніцазнаўства – гістарычная дысцыпліна, якая вывучае формы і змест гістарычных крыніц. Класіфікацыя крыніц распрацоўваецца для выяўлення аб'ектыўных уласцівасцей іх груп паводле паходжання ў рамках гістарычных перыядаў.

## ПЫТАННІ

1. Назавіце гісторыкаў, з імёнамі якіх звязаны пачатак вывучэння гісторыі Беларусі першай паловы XIX ст., і іх працы.

2. Раскрыйце сутнасць нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі.

3. Што аб'ядноўвае пералік:

а) А. М. Люты, Г. М. Туміловіч, С. Л. Лугаўцова, У. А. Сосна, В. С. Макарэвіч?

б) А. М. Філатава, А. А. Гарбацкі, І. Г. Ганчарук, М. А. Папоў, А. Раманчук, П. В. Шаўкун?

4. Ахарактарызуйце класіфікацыю крыніц па гісторыі Беларусі першай паловы XIX ст.

5. Якія публікацыі заканадаўчых крыніц вам вядомы?

---

[1] Матэрыялы па гісторыі мануфактуры Беларусі ў часы распаду феадалізму. Мінск, 1936. Т. 1–2.

[2] Белоруссия в эпоху феодализма : сб. док. и материалов : в 4 т. Минск, 1961–1979. Т. 3–4.

6. Пракаментуйце: «Путевые заметки на поездке из Дерпта в Белоруссию и обратно весной 1835 года»: «В заключение скажу, что я душевно убежден в том, что Белоруссия может быть богатою страною, имея множество больших рек, много лесов и большую часть земли плодородной, требующей только удобрения. Но физические средства ничтожны без нравственной силы. Надобно просвещения, просвещения и просвещения! Просвещение породит фабричную и мануфактурную деятельность, улучшит земледелие, откроет новые пути торговле и, облагородив человека, исторгнет его из постыдного усыпления. Без просвещения все начинания, планы к улучшению, все благодетельные меры не принесут ожидаемой пользы, ибо, *во-первых,* надобно, чтоб человек *понимал* добро, *а во-вторых*, чтоб *умел исполнить* благое предначертание. Молю Господа, да уделит Беларуси десятую долю лифляндского порядка, просвещения, бережливости и хозяйственности, а взаимно Лифляндии ниспошлет хотя сотую долю белорусского радушия и гостеприимства! [1835]»[1].

[1] *Булгарын Ф.* Выбранае. Мінск, 2003. С. 223.

# 2

# ТЭРЫТОРЫЯ І НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ. СІСТЭМА КІРАВАННЯ І СУДАВОДСТВА

## АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫ ПАДЗЕЛ І АРГАНІЗАЦЫЯ КІРАВАННЯ

У апошнія гады праўлення імператара Паўла I (1796–1801) беларускія этнічныя землі ўваходзілі ў асноўным у склад Беларускай, Мінскай і Літоўскай губерняў. У пачатку XIX ст. была праведзена новая адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа, якая амаль на 40 год вызначыла структуру беларускіх зямель. 9 верасня 1801 г. імператар Аляксандр I (1801–1825) падпісаў указ «О восстановлении пяти губерний и о подчинении пограничных губерний военным губернаторам». У выніку ў «Литве» і «Белоруссии» загадвалася аднавіць па адной губерні і іх агульная колькасць павінна была раўняцца пяці. Указам прадугледжваліся асноўныя мерапрыемствы па арганізацыі кіравання ў аднаўляемых губернях (вызначэнне губернскіх гарадоў, размежаванне, прызначэнне службовых асоб, складанне штатаў і г. д.).

Уладкаванне Беларускай і Літоўскай губерняў на новых пачатках заняло некалькі месяцаў. У 1802 г. былі адкрыты «присутственные места» Віленскай (адноўлена 28 жніўня 1802 г., 11 паветаў), Гродзенскай (28 жніўня 1802 г., 8 паветаў), Віцебскай (27 лютага 1802 г., 12 паветаў) і Магілёўскай (27 лютага 1802 г., 12 паветаў) губерняў. Афіцыйна новыя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі атрымалі складаныя назвы: Літоўска-Віленская, Літоўска-Гродзенская, Беларуска-Віцебская і Беларуска-Магілёўская губерні. Мінская губерня афіцыйна не належала ні да «Белоруссии», ні да «Литвы».

Пасля падпісання Тыльзіцкага міру з Францыяй (чэрвень 1807 г.) да Расійскай імперыі адышла пруская частка былых зямель Рэчы Паспалітай, на якіх у 1808 г. была ўтворана Беластоцкая вобласць (чатыры паветы). Для кіравання гэтай вобласцю было створана спецыяльнае палажэнне, якое ўлічвала прававыя нормы Расійскай імперыі, Прусіі, а таксама былых Вялікага Княства Літоўскага і Кароны Польскай.

Пасля задушэння паўстання 1830–1831 гг. імператар Мікалай I (1825–1855) на працягу дзевяці год канчаткова спыніў на тэрыторыі Беларусі дзейнасць Статута ВКЛ. Таму ўказам ад 18 ліпеня 1840 г. былі ліквідаваны і ранейшыя складаныя назвы чатырох губерняў, якія загадвалася называць спрошчана: Віцебская, Магілёўская, Віленская і Гродзенская губерні. Такім чынам расійскі ўрад паступова пачаў замяняць назву «Литва» на «Паўночна-Заходні край» (як і «Украина» замянялася на «Паўднёва-Заходні край»). Назвы «Белоруссия», «белорусский», як і «Малороссия», «малороссийский», афіцыйна не выключаліся з дзяржаўнага ўжытку, паколькі яны мелі агульны з тэрмінам «Великороссия» корань «рос». З пункту гледжання ўрада, гэта нібыта сведчыла аб адзінстве паходжання «трох плямён рускага народа».

Адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэарганізацыя Беларусі і Літвы была скончана ў канцы 1842 г. Указам ад 18 снежня 1842 г. «Аб пераўтварэнні паўночна-заходніх губерняў» прадугледжвалася скасаванне Беластоцкай вобласці і аб'яднанне яе тэрыторыі з Гродзенскай губерняй, а таксама стварэнне Ковенскай губерні з сямі паўночна-заходніх паветаў Віленскай губерні. Пры гэтым Навагрудскі павет Гродзенскай губерні перадаваўся ў склад Мінскай губерні, а Дзісненскі, Вілейскі (з Мінскай) і Лідскі (з Гродзенскай) – у Віленскую. Пераўтвораныя губерні складаліся: Віленская – з сямі паветаў, Гродзенская і Мінская – з дзевяці. (Пры гэтым істотным чынам змяніліся памеры заходніх губерняў, што трэба ўлічваць пры аналізе розных статыстычных паказчыкаў да і пасля рэформы 1842 г.) У Магілёўскай губерні быў скасаваны Бабінавіцкі павет, і толькі межы Віцебскай губерні засталіся нязменнымі. На гэтым адміністрацыйна-тэрытарыяльнае пераўладкаванне Беларусі ў першай палове XIX ст. спынілася.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа пачатку XIX ст. закранула і *сістэму кіравання*. 9 верасня 1801 г. Аляксандр I размежаваў паўнамоцтвы ваенных і грамадзянскіх начальнікаў і падзяліў пагранічныя губерні і губерні на «особенных правах» на 10 частак. Беларускія землі былі падначалены літоўскаму (дзве «литовские» губерні) і беларускаму (дзве «белорусские» губерні) ваенным губернатарам (генералам Л. Л. Бенігсену і А. М. Рымскаму-Корсакаву і іх пераемнікам). Мінская губерня, разам з Кіеўскай, была падпарадкавана кіеўскаму ваеннаму губернатару (гене-

ралу А. С. Феньшу і яго пераемнікам). Фактычна ваенныя губернатары выконвалі функцыі кацярынінскіх генерал-губернатараў.

Адначасова імператар узмацніў патрабаванні да кандыдатаў на пасады грамадзянскіх губернатараў і віцэ-губернатараў: ён загадаў Сенату падабраць чыноўнікаў з ліку «достойнейших и способнейших» асоб, якія выдатна ведалі законы, мелі адміністрацыйны вопыт, розум і сумленнасць. Але знайсці такіх кандыдатаў было амаль немагчыма. Таму ўказам ад 12 жніўня 1802 г. прадпісвалася, каб губернатары не выходзілі за межы сваіх паўнамоцтваў і кіравалі праз губернскае праўленне, а не «своим одним лицом». Але многія з вышэйшых кіраўнікоў аказаліся не зусім здольнымі адміністратарамі, а часам і не зусім добрасумленнымі асобамі, таму жыхары Беларусі часта сутыкаліся з свавольствам расійскіх чыноўнікаў.

Сістэма кіравання на губернскім, павятовым і гарадскім узроўнях у часы Аляксандра I істотна не змянілася ў параўнанні з праўленнем Паўла I. Імператар толькі аднавіў пасады губернскіх і павятовых страпчых і падпарадкаваў у 1802 г. губернскіх пракурораў міністру юстыцыі. Тым не менш уплыў пракуратуры на судовыя рашэнні ў першай палове XIX ст. быў мізэрным. Чыны пракуратуры ажыццяўлялі выключна фармальны нагляд за дзейнасцю мясцовых адміністрацыйных устаноў, які зводзіўся да зачытвання і тлумачэння чыноўнікам тэкстаў атрыманых законаў. Губернскі пракурор толькі на паперы быў незалежны ад мясцовай адміністрацыі, паколькі яго «камера» (памяшканне) і канцылярыя знаходзіліся пры губернскім праўленні. Пасады губернскага пракурора, губернскіх і павятовых страпчых пачалі скасоўвацца пасля судовай рэформы 1864 г.

У гады праўлення Мікалая I адбылася далейшая бюракратызацыя сістэмы губернскага кіравання. «Наказ губернатарам» 1837 г. захаваў дваякае становішча кіраўніка губерні. З аднаго боку, ён абвяшчаўся «гаспадаром» падначаленай тэрыторыі і галоўным наглядчыкам за захаваннем «неприкосновенных верховных прав самодержавия», а з другога — заставаўся толькі выканаўцам («оберегателем») законаў і не мог рабіць «новых постановлений», паколькі знаходзіўся ў падпарадкаванні міністраў. Адначасова змяніліся функцыі губернскага праўлення і яго адказных асоб. З 1845 г. узрасла роля віцэ-губернатара, які стаў членам амаль усіх калегіяльных губернскіх устаноў. Таму гэтая пасада стала свайго роду школай для самастойнай губернатарскай дзейнасці.

З пачаткам правядзення ў 1838 г. рэформы па ўпарадкаванні кіраўніцтва над дзяржаўнымі сялянамі былі ўтвораны Міністэрства дзяржаўных маёмасцей і яго мясцовыя органы: палаты ў губернях і акругі ў паветах.

У першай палове XIX ст. у сістэме расійскага кіравання на Беларусі з'явіўся яшчэ адзін важны інструмент — *ваеннае (надзвычайнае) становішча*. Паняцце «ваеннага становішча» ўпершыню было сфармулявана

ва «Учреждении для управления Большой действующей армией» (зацверджана 27 студзеня 1812 г.) і канкрэтызавана ў сакавіку 1812 г. указамі Сената. Гэтыя акты вызначылі ўзаемаадносіны вышэйшага армейскага кіраўніцтва з губернскай адміністрацыяй.

У выпадку ўвядзення ваеннага становішча ўладныя паўнамоцтвы ў месцах дыслакацыі арміі пераходзілі да галоўнакамандуючага і ён адказваў за забеспячэнне войскаў усім неабходным. З гэтага часу яго загады выконваліся як арміяй, так і ўсімі губернскімі чыноўнікамі «яко высочайшие именные повеления». Асабліва гэта тычылася «вайсковых патрабаванняў» (рэквізіцый): іх кіраўнікі губерняў і паліцыя абавязваліся выконваць «беспрекословно». У адваротным выпадку галоўнакамандуючы атрымліваў права адхіляць чыноўнікаў гарадской і земскай паліцыі, а вінаватых, у т. л. жыхароў, – аддаваць ваеннаму суду (які ствараўся і дзейнічаў паводле «Учреждения»). У той жа час галоўнакамандуючы не павінен быў умешвацца ў кіраванне губернямі па судовай і гаспадарчай частцы.

Упершыню ваеннае становішча на беларускіх землях было ўведзена 16 красавіка 1812 г., напярэдадні вайны з Напалеонам I, і было звязана з неабходнасцю забеспячэння расійскай арміі харчаваннем і фуражом шляхам рэквізіцый. Ваеннае становішча было распаўсюджана на Курляндскую, Віленскую, Мінскую, Гродзенскую, Кіеўскую, Валынскую і Падольскую губерні, а таксама Беластоцкую і Тарнопальскую вобласці. Гэтыя тэрыторыі былі падзелены на дзве ваенныя акругі. Курляндская, Віленская, Мінская, Гродзенская губерні і Беластоцкая вобласць прылічваліся да 1-й ваеннай акругі 1-й Заходняй арміі (галоўнакамандуючы генерал М. Б. Барклай дэ Толі), а ўсе астатнія – да 2-й ваеннай акругі 2-й Заходняй арміі (галоўнакамандуючы генерал П. І. Баграціён). Віцебская і Магілёўская губерні былі абвешчаны на надзвычайным становішчы толькі 12 чэрвеня 1812 г., з пачаткам вайны. З гэтага часу Віцебская губерня прылічвалася да 1-й вайсковай акругі 1-й Заходняй арміі, а Магілёўская – да 2-й акругі 2-й Заходняй арміі.

Адначасова прадугледжвалася ўвядзенне пасад часовых ваенных губернатараў, але летам 1812 г. іх прызначыць не паспелі. І толькі пасля выгнання напалеонаўскіх войскаў, у канцы 1812 г. мінскім часовым ваенным губернатарам быў прызначаны генерал Г. А. Ігнацьеў (з ліпеня 1812 г. выконваў абавязкі бабруйскага ваеннага губернатара). На часовага ваеннага губернатара (падпарадкоўваўся галоўнакамандуючаму Дзеючай арміяй) ускладаўся агульны нагляд за мясцовай адміністрацыяй, ён камандаваў войскамі ў губерні, сачыў за палітычнымі настроямі насельніцтва, прымаў меры па прадухіленні і задушэнні сялянскіх хваляванняў, а таксама зацвярджаў пастановы ваеннага суда. Пасада часовага ваеннага губернатара праіснавала да скасавання надзвычайнага становішча на тэрыторыі Беларусі.

Пасля спынення напалеонаўскіх войн паўнамоцтвы грамадзянскіх губернатараў у Беларусі некалькі пашырыліся. Але такая «свабода» праіснавала нядоўга. З 1822 г. у Расійскай імперыі ў поўным памеры быў адноўлены інстытут генерал-губернатарства. Усходняя частка Беларусі – Віцебская і Магілёўская губерні (разам са Смаленскай і Калужскай) – адышла ў падпарадкаванне генерал-губернатара князя М. М. Хаванскага (і яго пераемнікаў), а Віленская, Гродзенская, Мінская губерні (разам з Валынскай і Падольскай) і Беластоцкая вобласць – у падпарадкаванне цэсарэвіча Канстанціна Паўлавіча. 29 чэрвеня 1822 г. Аляксандр I даў свайму брату, які камандаваў польскай арміяй і Асобным Літоўскім корпусам, вышэйшую ўладу над заходнімі губернямі на правах галоўнакамандуючага Дзеючай арміяй.

1 снежня 1830 г., у час паўстання, Гродзенская, Віленская губерні (разам з Падольскай і Валынскай) і Беластоцкая вобласць былі ў другі раз аб'яўлены на ваенным становішчы і падпарадкаваны галоўнакамандуючаму Дзеючай арміяй генерал-фельдмаршалу І. І. Дзібічу. Мінская губерня ў час паўстання пераходзіла з падпарадкавання віцебскага, магілёўскага і смаленскага генерал-губернатара (8 студзеня – 13 красавіка 1831 г.) да галоўнакамандуючых Рэзервовай (13 красавіка – 31 ліпеня) і Дзеючай (31 ліпеня – 6 кастрычніка 1831 г.) арміямі. У гэтых умовах у Мінскай губерні зноў была ўведзена пасада часовага ваеннага губернатара (31 красавіка 1831 – 22 студзеня 1832 г.). Пасля задушэння паўстання 1830–1831 гг. вышэйшая ўлада ў беларускіх губернях перайшла ў рукі віленскіх і віцебскіх ваенных губернатараў, якія адначасова атрымалі тытул і генерал-губернатараў.

У трэці раз ваеннае становішча на тэрыторыі Беларусі і Літвы было ўведзена з пачаткам Крымскай вайны (1853–1856). Але паколькі ваенных дзеянняў на беларускіх землях не вялося, істотных змен у сістэме кіравання не было: улада па-ранейшаму заставалася ў руках генерал-губернатараў. Між тым у гэты час быў узмоцнены палітычны і жандарскі кантроль. Скасавана ваеннае становішча было толькі ў пачатку 1856 г.

## ЗАКАНАДАЎСТВА І СУДОВАЯ СІСТЭМА

Імператар Аляксандр I пакінуў у сіле дзейнасць на беларускіх землях Статута ВКЛ 1588 г. Першапачаткова ўсе дзяржаўныя ўстановы і службовыя асобы карысталіся Статутам, выдадзеным у 1786 г. у Вільні на польскай мове. У 1811 г. у Санкт-Пецярбургу было падрыхтавана новае выданне Статута – на польскай і рускай мовах. Але паколькі пераклад у рускім выданні быў зроблены не з арыгінала, а з польскага выдання, у ім былі памылкі. Апошні раз Статут на польскай мове выдаваўся ў 1819 г. у Вільні.

У 1826 г. па загадзе Мікалая I пачаліся працы па кадыфікацыі заканадаўства і падрыхтоўцы Зводу законаў Расійскай імперыі. Адначасова пад кіраўніцтвам беларускага вучонага-прававеда Ігната Даніловіча вялася праца па складанні Зводу мясцовых законаў заходніх губерняў (на аснове Статута ВКЛ), які меркавалася ўключыць у агульны ЗЗРІ. Падрыхтоўчая праца практычна была завершана да 1834 г., але Звод мясцовых законаў заходніх губерняў так і не быў уведзены ў дзеянне.

Пасля задушэння паўстання 1830–1831 гг. расійскі ўрад распрацаваў праграму поўнага зліцця далучаных зямель былой Рэчы Паспалітай з астатнімі губернямі імперыі. Гэта праграма цалкам супадала з новым курсам Мікалая I на ўніфікацыю агульнарасійскага заканадаўства. Таму 1 студзеня 1831 г. дзейнасць Статута ВКЛ была спынена ў Магілёўскай і Віцебскай губернях, а 25 чэрвеня 1840 г. – на тэрыторыі Мінскай, Віленскай, Гродзенскай губерняў і Беластоцкай вобласці.

Змены ў заканадаўстве паўплывалі і на рэарганізацыю судовай сістэмы. 30 кастрычніка 1831 г. у заходніх губернях уводзілася расійская сістэма судоў і судаводства. Галоўны суд быў скасаваны, а яго 1-ы і 2-і дэпартаменты пераўтвораны ў агульнасаслоўныя палаты крымінальнага і грамадзянскага суда. *Палата крымінальнага суда* разглядала адпаведныя справы аб злачынствах дваран, чыноўнікаў, падпалах, парубках і г. д. і была апеляцыйнай інстанцыяй для павятовых судоў. *Палата грамадзянскага суда* разглядала справы аб нерухомасці, размешчанай у розных губернях, гарадской уласнасці, афармляла прыгонныя акты на куплю-продаж прыгонных «душ» і ажыццяўляла нагляд за грамадзянскім судаводствам павятовых судоў. У 1867 г. палаты былі аб’яднаны.

Земскія павятовыя суды былі заменены на *павятовыя* («уездные», ажыццяўлялі судовую ўладу для дваран і сялян). Былі скасаваны гродскія (1831 г., Віленская і Гродзенская губерні), падкаморскія (1 мая 1832 г.), межавыя і эксдывізорска-таксатарскія (25 чэрвеня 1840 г., разглядалі справы банкрутаў і падзелу іх маёмасці паміж крэдыторамі) суды. З гэтага часу межавыя спрэчкі вырашаліся ў павятовых судах на аснове правіл, якія былі складзены Межавым дэпартаментам Сената. І толькі магістраты і ратушы (суды для купцоў і мяшчан) засталіся без змяненняў.

У той жа час указам ад 3 снежня 1833 г. у Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губернях (разам з Валынскай, Падольскай і Кіеўскай) і Беластоцкай вобласці былі адноўлены ўсесаслоўныя «*совестные*» суды. Аднак безвыніковасць большасці судовых рашэнняў (у выпадку нязгоды бакоў з рашэннем суда справа перадавалася на разгляд у звычайныя судовыя ўстановы) прывяла да скарачэння колькасці спраў. Таму па прапанове Дзяржрады ад 23 чэрвеня 1852 г. на тэрыторыі Беларусі яны былі скасаваны, што адлюстравана на схеме.




Арганізацыя суда на тэрыторыі Беларусі (1797–1831)

1 мая 1846 г. на ўсёй тэрыторыі Расійскай імперыі было ўведзена «Улажэнне аб пакараннях крымінальных і папраўчых», якім рэгламентавалася прававое становішча прыгонных сялян. Яно захавала за памешчыкамі права караць сялян (біць розгамі, пугамі, палкамі) і высылаць іх у Сібір (на катаржныя працы).

Між тым, нягледзячы на змены ў заканадаўстве і арганізацыі суда, судаводства дарэформеннага часу на тэрыторыі Беларусі захоўвала ўсе феадальныя рысы: саслоўную няроўнасць, адсутнасць галоснасці і «состязательности», закрытасць судовага працэсу, канцыляршчыну. Судовыя ўстановы залежалі ад адміністрацыі і паліцыі на ўсіх этапах судаводства, пачынаючы са следства і заканчваючы «рэвізіяй» справы і выкананнем рашэння.

## КОЛЬКАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА І ЯГО ЭТНАКАНФЕСІЙНЫ СКЛАД

У першай палове XIX ст. на беларускіх землях пражывала featureнае ў этнічным, канфесійным і сацыяльным плане насельніцтва. Уяўленне аб колькасным складзе і вераспавяданні жыхароў Беларусі даюць рэвізіі (перапісы насельніцтва). Асноўным аб’ектам рэвізій было мужчынскае насельніцтва падатковых саслоўяў, ці рэвізскія душы. У першай палове XIX ст. на Беларусі ўлік насельніцтва праводзіўся ў межах VI (1811), VII (1815), VIII (1833), IX (1851) і X (1858) рэвізій.

Збор статыстычных звестак аб прывілеяваных саслоўях і групах (дваранах, духавенстве, дзяржаўных служачых) ажыццяўляўся нерэвізскім шляхам – праз губернскія канцылярыі, духоўныя ўстановы, ваеннае ведамства – і звычайна прымяркоўваўся да тэрміну правядзення рэвізій. У абагульненым выглядзе яны падаваліся ў штогадовых справаздачах грамадзянскіх губернатараў.

Пры вызначэнні колькаснага складу насельніцтва заходніх губерняў і яго этнічнай прыналежнасці неабходна ўлічваць розныя падыходы, якія існуюць у даследчыкаў. Так, вядомы савецкі і расійскі спецыяліст-дэмограф Уладзімір Максімавіч Кабузан вылучае асобны Беларуска-Літоўскі этнічны рэгіён з перавагай у ім беларускага насельніцтва. У склад гэтага рэгіёна ён уключае акрамя пяці заходніх губерняў і Беластоцкай вобласці Смаленскую губерню. Згодна з падлікамі У. Кабузана, за перыяд з 1796 па 1858 г. усё насельніцтва ў гэтым рэгіёне павялічылася з 5159,7 тыс. (без Смаленскай губ. – 4200,2 тыс.) да 6540,2 тыс. (без Смаленскай губ. – 5418,4 тыс.) чалавек.

У той жа час сярод беларускіх даследчыкаў постсавецкага часу ў якасці асноўнага рэгіёна даследавання вылучаецца тэрыторыя ў прыкладных межах сучаснай Беларусі. Гэта значна змяншае агульную колькасць насельніцтва заходніх губерняў і павялічвае ўдзельную вагу беларусаў сярод усіх нацыянальных груп насельніцтва. Згодна з падлікамі Я. Насыткі, за перыяд з 1796 па 1858 г. усё насельніцтва ў сучасных межах Беларусі павялічылася з 2636 тыс. чалавек да 3398 тыс. чалавек (табл. 1).

*Табліца 1*

**Агульная колькасць насельніцтва, тыс. чал.**

| Год рэвізіі | У межах сучаснай Беларусі (паводле Я. Насыткі) | Па Беларуска-Літоўскім рэгіёне без Смаленскай губ. (паводле У. Кабузана) | Усяго па Беларуска-Літоўскім рэгіёне (паводле У. Кабузана) |
|---|---|---|---|
| 1796 | 2636 | 4200,2 | 5159,7 |
| 1811 | 2981 | – | – |
| 1815 | 2909 | 3904,5 | 4816,7 |
| 1833 | 2826 | 5064,2 | 6128,4 |
| 1851 | 3479 | 5236,3 | 6315,5 |
| 1858 | 3398 | 5418,4 | 6540,2 |

Па дадзеных X рэвізіі, у пяці заходніх губернях у сучасных межах Беларусі пражывала 3398 тыс. чалавек. За кошт натуральнага прыросту ў параўнанні з 1796 г. насельніцтва павялічылася на 28,9 %. У той жа час на сітуацыю з насельніцтвам значны ўплыў аказалі дэмаграфічныя крызісы, выкліканыя вайной 1812 г., спусташальнымі эпідэміямі 1813 і 1831 гг., стагнацыяй сельскай гаспадаркі ў 1820-я і 1850-я гг.

У першай палове XIX ст. большасць насельніцтва пяці заходніх губерняў складалі этнічныя *беларусы* (хаця расійскі ўрад амаль увесь час насаджаў іх падзел па веравызнанні на «рускіх» і «палякаў»), якія ў пера-

важнай частцы жылі на вёсцы. У 1858 г., паводле дадзеных Я. Насыткі, у межах сучаснай Беларусі пражывала 2790 тыс. беларусаў (69,7 % усяго насельніцтва). Прычым удзельная вага беларусаў памяншалася з усходу на захад: у Магілёўскай губерні яна складала 81,7 %, у Мінскай – 64,6 %, у Віцебскай – 59,8 %, у Гродзенскай – 57,8 % і Віленскай – 46,9 %. Другой па колькасці этнічнай супольнасцю ў Беларусі ў дарэформенны перыяд, па дадзеных Я. Насыткі, былі *яўрэі*. У канцы 1850-х гг. у пяці заходніх губернях іх пражывала 463,2 тыс. чалавек. У гэты ж час *палякаў* налічвалася 442,3 тыс., *рускіх* – 141,6 тыс., *татар* – 6,2 тыс. чалавек.

Некалькі іншыя лічбы адносна нацыянальнага складу насельніцтва заходніх губерняў называе У. Кабузан. Па яго падліках, у Беларуска-Літоўскім этнічным рэгіёне пражывала 10 асноўных этнічных груп, сярод якіх безумоўную перавагу мелі беларусы (табл. 2).

*Табліца 2*

**Нацыянальны склад насельніцтва Беларуска-Літоўскага рэгіёна (разам са Смаленскай губерняй[1]) па дадзеных У. Кабузана**

| Народы | Год рэвізіі (перапісу) | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 1796 | 1833 | 1851 | 1858 |
| | Колькасць, тыс. чал. | | | |
| Беларусы | 3220 | 3355 | 3456,7 | 3598,9 |
| Рускія | 493 | 606,4 | 639,1 | 644,7 |
| Украінцы | 224,7 | 274,7 | 281,9 | 278,5 |
| Палякі | 280,3 | 330,8 | 351,2 | 338,5 |
| Літоўцы | 624 | 872,2 | 877,2 | 931,7 |
| Латышы | 127,6 | 156,9 | 154,2 | 155,4 |
| Яўрэі | 178,9 | 492,5 | 509,4 | 551,9 |
| Эстонцы | 6,7 | 9,9 | 11,2 | 11,4 |
| Татары | 2,9 | 5,8 | 6,1 | 6,3 |
| Немцы | – | 22,2 | 27,1 | 21,6 |
| Іншыя | 1,6 | 2 | 1,4 | 1,3 |
| Усяго | 5159,7 | 6128,4 | 6315,5 | 6540,2 |
| Усяго беларусаў па імперыі | 3402,5 | 3609,7 | 3719,8 | 4018,4 |

[1]Аддзяліць Смаленскую губерню немагчыма, паколькі У. Кабузан прыводзіць сумарныя лічбы па рэгіёне па ўсіх губернях разам.

Да 1839 г. большасць беларусаў па сваім вераспавяданні былі ўніятамі (80 % ад вясковага насельніцтва), а пасля скасавання ўніяцкай царквы – праваслаўнымі. Паводле даных П. Шафарыка, у 1840 г. на тэрыторыі пяці заходніх губерняў пражывала 2726 тыс. беларусаў, з іх 87,2 % былі праваслаўнымі і 12,8 % – каталікамі. У канцы 1850-х гг. канфесійная прыналежнасць беларусаў істотна не змянілася. Паводле даных Я. Насыткі, з 2790 тыс. чалавек 84,1 % спавядалі праваслаўе і 15,9 % – каталіцтва. Увогуле, па пяці заходніх губернях у 1858 г. праваслаўе спавядала 58,1 % насельніцтва (у т. л. 1,6 % – стараверы), каталіцтва – 29,9 %, пратэстанцтва – 0,4 %, іўдзейства – 9,8 %, іслам – 0,1 %, іншыя – 0,7 %.

У першай палове XIX ст. большая частка насельніцтва Беларусі параненйшаму пражывала на вёсцы, хаця выразна прасочвалася тэндэнцыя да павелічэння колькасці гарадскога насельніцтва. Скарачэнне сельскага насельніцтва было вынікам крызісу прыгонніцкай сістэмы. Значныя рэкруцкія наборы, міжсаслоўныя пераходы, канфіскацыі памешчыцкіх маёнткаў, а таксама нізкі натуральны прырост прывялі да таго, што з 1796 па 1858 г. вясковае насельніцтва павялічылася толькі на 18,2 % (з 2543,5 тыс. да 3113 тыс. чалавек). Пры гэтым удзельная вага панскіх сялян, якія вызначалі дэмаграфічныя працэсы ў грамадстве, за гэты час знізілася з 74 % (1950 тыс.) да 55 % (1869,7 тыс. чалавек) да ўсяго насельніцтва. Падзенне натуральнага прыросту было непасрэдна звязана з панскім усеўладдзем у сваіх маёнтках. Непамерна павышаючы павіннасці, памешчыкі даводзілі сваіх сялян да галечы. У такіх неспрыяльных сацыяльна-эканамічных умовах, калі смяротнасць часта перавышала ўзровень нараджальнасці, узнаўленне насельніцтва прыгоннай беларускай вёскі ішло вельмі марудна.

У адрозненне ад вясковага, гарадское насельніцтва хутка павялічвалася. З 1796 па 1858 г. яно вырасла з 92,5 да 285 тыс. чалавек (у 3,1 раза). За гэты ж час з аднаго да дзевяці павялічылася колькасць буйных гарадоў (звыш 10 тыс. жыхароў), у якіх пражывала 45,3 % гараджан. Вырасла колькасць і сярэдніх гарадоў з насельніцтвам звыш 5 тыс. чалавек (19,5 % гараджан). Такія тэндэнцыі тлумачацца, з аднаго боку, натуральным прыростам, а з іншага – масавай міграцыяй у гарады розных груп вясковага насельніцтва (вольных людзей, панцырных баяр, аднадворцаў, шляхты, дзяржаўных сялян). На рост гарадскога насельніцтва паўплывала таксама значнае павелічэнне колькасці чыноўнікаў (з 1,9 да 13,5 тыс., іх удзельная вага ўзрасла з 1,5 % да 5,2 %) і вайскоўцаў (з 2,8 да 21,8 тыс. чалавек, ці з 2,8 % да 8,4 %). Але галоўнай крыніцай папаўнення гарадскога насельніцтва ў першай палове XIX ст. былі яўрэі.

9 снежня 1804 г. Аляксандр I зацвердзіў «Положение об устройстве евреев», якое было распрацавана «Комитетом по благоустройству евреев»

(1802–1806). Палажэнне прадугледжвала перасяленне да 1 студзеня 1808 г. яўрэяў з сельскай мясцовасці ў гарады і мястэчкі. У час вайны з Францыяй 1806–1807 гг. расійскі ўрад быў вымушаны прыпыніць дзейнасць гэтага палажэння. Але ўжо праз тры месяцы пасля спынення ваенных дзеянняў сенацкім указам ад 19 кастрыніка 1807 г. зноў уводзіўся трохгадовы тэрмін высялення. І толькі напярэдадні вайны 1812 г. урад пайшоў на адмену артыкула аб высяленні яўрэяў з сельскай мясцовасці. Але ў апошняе дзесяцігоддзе праўлення Аляксандра І урад вярнуўся да сваіх рэпрэсіўных рашэнняў. 11 красавіка 1822 г. Сенат забараніў яўрэям пражываць у вёсках пасля 1825 г. Да 1840-х гг. яўрэйскае насельніцтва Беларусі ў асноўным было гвалтоўна перaселена ў гарады і мястэчкі. Менавіта гэтым і тлумачыцца рост колькасці гараджан на 60,6 % у 1833–1851 гг.

## САСЛОЎНАЯ СТРУКТУРА ГРАМАДСТВА

У першай палове XIX ст. саслоўна-групавая структура грамадства Беларусі пaступова мянялася. Афіцыйна грамадства дарэформеннага часу падзялялася на пяць саслоўяў: дваранства, ганаровыя грамадзяне (з 1832 г.), духавенства, гарадскія і сельскія абывацелі. Але яно мела больш складаную структуру, паколькі ўнутры кожнага саслоўя былі асобныя групы ці катэгорыі.

Найбольш прывілеяваным саслоўем заставалася *дваранства*, паколькі яго палітыка-прававое становішча ў першай палове XIX ст. не змянілася (у 1801 г. Аляксандр І пацвердзіў усе ранейшыя прывілеі гэтага саслоўя). Асновай палітычнай і эканамічнай магутнасці дваранства з'яўлялася валоданне не толькі зямлёй, але і прыгоннымі, на што не мелі правоў іншыя саслоўі. Дваранства вызвалялася ад усялякіх падаткаў, цялесных пакаранняў, магло быць асуджана толькі роўнымі сабе.

На беларускіх землях у дваранскім асяроддзі пастаянна адбываліся працэсы дыферэнцыяцыі. Большую частку дваранства складалі прадстаўнікі былога шляхецкага саслоўя, меншую – рускія чыноўнікі і памешчыкі, якія атрымалі маёнткі на беларускіх землях у спадчыну ці арэнду. Сярод першых вылучаліся дзве буйныя групы: землеўласнікі (магнаты, заможная, фальваркавая, далявая, засценкавая шляхта) і беззямельная шляхта (чыншавая, служылая, вулічная, галота). Пераважную большасць прадстаўнікоў гэтых груп складалі этнічныя беларусы, хаця самі яны лічылі сябе палякамі.

Найбольш заможныя і ўплывовыя сем'і (*магнаты*) – Радзівілы, Агінскія, Плятэры, Пшэздзецкія і інш. – валодалі буйнымі латыфундыямі

і па-ранейшаму адыгрывалі значную ролю ў грамадска-палітычным і эканамічным жыцці краю. *Заможная шляхта* валодала зямлёй і сялянамі і была самастойнай у сваёй сацыяльнай і гаспадарчай дзейнасці (sobie pan). *Фальваркавая шляхта* валодала адным ці некалькімі фальваркамі з сялянамі (кіравала імі самастойна ці наймала эканомаў). *«Далявая» шляхта* валодала часткай маёнткаў. Прадстаўнікі гэтай катэгорыі сумесна са сваімі суседзямі выкарыстоўвалі працу сялян і матэрыяльныя рэсурсы маёнтка. *Засценкавая, ці ваколічная, шляхта* належала да мелкапаместнай групы (валодала прысядзібнымі гаспадаркамі, але не мела сялян і таму сама працавала на зямлі). Часам яна стварала шляхецкія паселішчы – т. зв. «засценкі», ці «ваколіцы», якія былі адасоблены ад сялянскага свету.

У пачатку XIX ст. толькі 5–6 % дваран валодалі зямлёй і прыгоннымі. Абсалютную большасць прывілеяванага саслоўя складала дробная беззямельная шляхта. *Чыншавая шляхта* арандавала зямлю ў буйных землеўладальнікаў і апрацоўвала яе сваімі рукамі, *служылая* наймалася ў якасці ўпраўляючых, эканомаў і г. д. Самымі беднымі былі *галота* (выконвала абавязкі прыслугі, працаўнікоў і інш.) і *вулічная шляхта* (пражывала ў гарадах і займалася з 1775 г. «подлымі» заняткамі – гандлем, рамесніцтвам і інш.).

Таму ў першай палове XIX ст. расійскі ўрад праз «разбор шляхты» працягваў сваю палітыку, накіраваную на скарачэнне колькасці дваранскага саслоўя ў заходніх губернях. Найбольш масавы характар яна набыла пасля задушэння паўстання 1830–1831 гг. Тыя шляхцічы, якія не здолелі дакументальна пацвердзіць свайго дваранскага паходжання, згодна з указам ад 19 кастрычніка 1831 г. пераводзіліся ў новыя падатныя саслоўныя групы – *аднадворцаў* (у сельскай мясцовасці) *і грамадзян* (у гарадах) *заходніх губерняў*. Гэтыя катэгорыі плацілі падаткі і пастаўлялі рэкрутаў.

З 1772 да 1816 г. удзельная вага дваранства ў агульнай масе насельніцтва Беларусі знізілася з 8–10 % да 6,7 % (196,7 тыс. чалавек). У выніку «разбора шляхты» 30–40-х гг. XIX ст. удзельная вага дваран Беларусі да 1858 г. знізілася да 5–6 %. Але яна па-ранейшаму заставалася самай высокай у імперыі (у сярэднім па Еўрапейскай Расіі ўдзельная вага дваран складала 1,5 %).

У той жа час урад пакідаў былой шляхце магчымасць вярнуцца ў прывілеяванае саслоўе праз добраахвотную вайсковую ці грамадзянскую службу. Да 1845 г. для атрымання спадчыннага дваранства дастаткова было атрымаць на вайсковай ці горнай службе чын прапаршчыка, а на грамадзянскай – чын 8-га класа (калежскага асэсара). Дваранства надавалася і пры атрыманні любога расійскага ордэна. Хаця ў далейшым гэтыя правілы былі ўскладнены. З 11 чэрвеня 1845 г. спадчыннае дваранства

прыносілі: на вайсковай службе – чыны з 8-га класа (маёр), на грамадзянскай – з 5-га класа (стацкі саветнік), а таксама ордэн Св. Уладзіміра 4-й ступені. Яшчэ большыя абмежаванні былі ўстаноўлены імператарам Аляксандрам II. З 9 снежня 1856 г. права спадчыннага дваранства надавалася на вайсковай службе чынам 6-га класа (палкоўнік), а на грамадзянскай – 4-га класа (сапраўдны стацкі саветнік).

Асобы, якія не здолелі дасягнуць на службе вышэйшых чыноў, атрымлівалі *асабістае (пажыццёвае) дваранства*. Яно давала ўсе правы спадчыннага дваранства, акрамя валодання населенымі маёнткамі, прыналежнасці да дваранскага грамадства і ўдзелу ў саслоўных выбарах. Асабістае дваранства надавалася чыноўнікам, якія атрымалі на грамадзянскай службе чыны з 14-га да 9-га класа – да 1845 г. і з 9-га да 6-га – з 1845 г., а таксама чыны з 14-га да 9-га на ваеннай службе (з 1845 г.). З 1856 г. гэта права надавалася толькі пры дасягненні чыноў 7-га і 8-га класаў на ваеннай службе і з 8-га да 5-га класа – на грамадзянскай.

У 1832 г. з мэтай абмежавання росту дваранства на агульнаімперскім узроўні было ўтворана саслоўе *ганаровых грамадзян*. Яно афармлялася, як і дваранства, праз Герольдыю. Ганаровыя грамадзяне не плацілі падушнага падатку, не неслі рэкруцкай павіннасці і вызваляліся ад цялесных пакаранняў. Устанаўленне новага саслоўя зблізіла прававое становішча вярхоў мяшчанства з дваранствам і фактычна вяло да фарміравання такой групы буржуазнага грамадства, як разначынцы. Ганаровыя грамадзяне падзяляліся на спадчынных і асабістых.

Да *спадчынных* залічваліся па нараджэнні дзеці асабістых дваран і спадчынных ганаровых грамадзян, а таксама дзеці праваслаўных свяшчэннаслужыцеляў (калі яны скончылі духоўную акадэмію ці семінарыю і не былі прылічаны да духавенства), лютэранскіх і рэфарматарскіх прапаведнікаў (пастараў). Гэтыя ж правы атрымлівалі камерц- і мануфактур-саветнікі (а таксама іх удовы і дзеці), артысты і мастакі (са стажам), купцы 1-й гільдыі (са стажам больш за 20 год), а таксама купцы, якія атрымалі па-за межамі службы чыны ці ордэны.

*Асабістае ганаровае грамадзянства* атрымлівалі ўсе афіцэры ад прапаршчыка (з 1884 г. – падпаручніка) да капітана (з 1856 г.) і грамадзянскія чыноўнікі з 14-га па 9-ы клас (да 1856 г. – да 10-га класа), выпускнікі ўніверсітэтаў і іншых вышэйшых навучальных устаноў, дзеці праваслаўных свяшчэннаслужыцеляў (якія не мелі адукацыйнага цэнзу), мусульманскага духавенства і некаторыя інш. На практыцы большасць дзяцей чыноўнікаў, якія не выслужылі спадчыннага дваранства, падпісваліся ў дакументах «из обер-офицерских детей». Іх саслоўныя правы да паўналецця вызначаліся чынам бацькі, а пасля – уласнай адукацыяй і прасоўваннем па службе.

Яшчэ адным прывілеяваным саслоўем, якое вызвалялася ад падушнай подаці, рэкруцкай павіннасці і цялесных пакаранняў, было *духавенства*. На тэрыторыі Беларусі яно было прадстаўлена хрысціянскімі (уніяцкімі, каталіцкімі, праваслаўнымі, пратэстанцкімі) і нехрысціянскімі (іўдзейскімі, мусульманскімі) свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелямі.

З пачатку XIX ст. у агульным складзе насельніцтва ўдзельная вага духавенства знізілася з 1 да 0,6 %. У 1858 г. у пяці заходніх губернях пражывала 27 717 духоўных асоб і членаў іх сем'яў, з іх 21 721 – у сельскай мясцовасці і 5996 – у гарадах. Найбольш шматлікім было праваслаўнае духавенства (83,3 %), за ім ішло каталіцкае (11 %), іўдзейскае (5 %), мусульманскае (0,4 %) і пратэстанцкае (0,3 %).

Да скасавання ў 1839 г. уніяцкай царквы самым шматлікім у Беларусі было *ўніяцкае духавенства*. У 1823 г. у Віленскай епархіі было 350 уніяцкіх святароў, у Брэсцкай – 675, у Полацкай – 550. Уніяцкае духавенства мела даволі высокі ўзровень адукацыі, і з яго асяроддзя выйшлі многія выдатныя дзеячы беларускай і рускай культуры (М. К. Баброўскі, І. А. Гашкевіч, І. Т. Хруцкі і інш.). Пасля скасавання ўніяцкай царквы на яе святароў былі пашыраны ўсе правы праваслаўнага духавенства.

Другое месца па колькасці доўгі час на Беларусі займала *каталіцкае духавенства*. Яно было самым заможным і адукаваным, карысталася вялікім уплывам на вернікаў. Падрыхтоўка каталіцкіх святароў вялася ў духоўных семінарыях і акадэміях. У 1851 г. у чатырох беларускіх губернях былі 852 ксяндзы і манахі.

У першай трэці XIX ст. *праваслаўнае духавенства* на Беларусі яшчэ заставалася нешматлікім. Невялікім быў і яго ўплыў, што тлумачыцца даволі нізкім адукацыйным узроўнем праваслаўных святароў. Але пасля 1839 г. гэтае хрысціянскае духавенства склала большасць свайго саслоўя.

Да праваслаўнага духавенства належалі свяшчэннаслужыцелі (свяшчэннікі, дыяканы) і царкоўнаслужыцелі (дзячкі, панамары і інш.). Саслоўная прыналежнасць перадавалася ў спадчыну, калі дзеці набывалі адукацыю ў духоўных вучылішчах, семінарыях і акадэміях, а затым атрымлівалі духоўны сан ці займалі царкоўную пасаду. У супрацьлеглым выпадку яны выключаліся з саслоўя і вымушаны былі паступаць на дзяржаўную службу, прыпісвацца да мяшчанскай грамады ці да купцоў. Да рэформ 1860-х гг. назіралася пэўная замкнёнасць праваслаўнага духавенства, паколькі кансісторыі клапаціліся, каб святары ўступалі ў шлюб з асобамі свайго саслоўя.

Духавенства іншых хрысціянскіх канфесій было малалікім. Становішча *іўдзейскага духавенства* вызначалася Палажэннем аб яўрэях (1804). За абшчынамі захоўвалася права выбару рабіна (на тры гады), якога

зацвярджаў грамадзянскі губернатар. З 1812 г. рабінам мог стаць толькі той, хто пісьмова валодаў акрамя яўрэйскай рускай, польскай або нямецкай мовамі. У 1840 г. урад увёў пасады яўрэйскіх губернскіх рабінаў, якіх павінны былі рыхтаваць рабінскія вучылішчы.

Да 1848 г. мусульманскае духавенства разглядалася як асобнае саслоўе, прыналежнасць да якога вызначалася паходжаннем. Мулы заходніх губерняў вызваляліся ад падаткаў і павіннасцей, пакуль былі на пасадзе.

У першай палове XIX ст. найбольш шматлікім саслоўем на беларускіх землях па-ранейшаму было *сялянства*. Па юрыдычным стане сярод сялян вылучаліся тры вялікія групы – прыватнаўласніцкія, дзяржаўныя (казённыя) і вольныя. Абсалютную большасць складалі прыватнаўласніцкія (памешчыцкія ці панскія, царкоўныя, якія належалі розным ведамствам, і інш.).

У найбольш цяжкім становішчы знаходзіліся *панскія сяляне*, удзельная вага якіх сярод вясковага насельніцтва няўхільна змяншалася: з 87 % (1950 тыс. чалавек) у 1796 г. да 69,7 % (1869,7 тыс. чалавек) у 1858 г. Паступова памяншалася і частка сялян, што належала царкве. Калі па дадзеных VII рэвізіі колькасць царкоўных сялян склала 112,6 тыс. чалавек (5,4 % сялянскага саслоўя), то ў сярэдзіне XIX ст. яна скарацілася да 10,2 тыс. (0,4 %). Такое памяншэнне было вынікам змен, якія адбыліся ў 30–40-я гг. XIX ст. (перадача ўладанняў ліквідаваных каталіцкіх манастыроў у арэнду памешчыкам; секулярызацыя царкоўных уладанняў; перадача ў дзяржаўную ўласнасць маёнткаў з залежнымі сялянамі парафіяльных цэркваў). З 1842 г. царкоўныя прычты атрымлівалі зямельны надзел у 33 дзесяціны, а манастыры – у 150 дзесяцін. У выніку гэтых актаў царкоўная ўласнасць на сялян на Беларусі была фактычна ліквідавана: к 1858 г. налічвалася толькі 3987 рэвізскіх душ, падуладных цэрквам і манастырам.

У той жа час узрастала ўдзельная вага і роля *дзяржаўных сялян*. Калі ў 1796 г. у Беларусі налічвалася прыкладна 167 тыс. дзяржаўных сялян (7,5 % ад усіх сялян), то ў 1830–40-я гг. адбылося падваенне абодвух паказчыкаў. У пачатку 1850-х гг. дзяржаўных сялян было ўжо 542 тыс. чалавек (20,6 % сялянскага саслоўя).

Такі моцны рост стаў вынікам урадавай палітыкі, якая ажыццяўлялася ў 40–50-х гг. XIX ст. і была накіравана на папаўненне дзяржаўнай вёскі за кошт іншых катэгорый сялян (з канфіскаваных ці выкупленых панскіх маёнткаў, секулярызацыі царкоўных уладанняў, далучэння да дзяржаўных сялян аднадворцаў, якія жылі на казённых землях, а таксама вольных людзей). З 15 мая 1840 г. усе сяляне, якія належалі Міністэрству дзяржаўных маёмасцей (утворана 26 снежня 1837 г.), атрымалі агульную назву – дзяржаўныя сяляне (да гэтага часу існавала шмат розных

груп: старосцінскія, паезуіцкія, паманастырскія, вольныя хлебаробы, канфіскаваныя і інш.).

Дзяржаўныя сяляне плацілі падаткі ў казну, выконвалі розныя земскія павіннасці (зборы на ўтрыманне пошты, на рамонт і будаўніцтва дарог і мастоў і інш.), давалі грошы і прадукты на мірскія мясцовыя патрэбы, а таксама неслі рэкруцкую павіннасць. Але найбольш цяжкімі для сялян былі павіннасці на карысць арандатараў. Дзяржаўныя сяляне былі асабіста вольнымі і мелі права мяняць сваю саслоўную прыналежнасць і месца жыхарства. Атрымаўшы пасведчанне з абшчыны, што за селянінам не лічыцца недаімак і што яго ўчастак не будзе закінуты, а таксама пры гарантыі выплаты падушнай подаці на тры гады наперад дзяржаўны селянін меў права перайсці ў мяшчанства ці купцы.

У другой чвэрці XIX ст. катэгорыя дзяржаўных сялян папоўнілася за кошт *вольных людзей*. Іх колькасць пастаянна вагалася: ад 45,9 тыс. чалавек у 1796 г. (2 % усіх сялян) да 18,7 тыс. (0,9 %) у 1815 г. і 64,3 тыс. (2,5 %) у 1833 г. Па сацыяльным і нацыянальным складзе вольныя людзі былі самай неаднароднай катэгорыяй. Яны маглі запісвацца ў саслоўі купцоў і мяшчан, паступаць на дзяржаўную службу. Але з 14 жніўня 1840 г. вольныя людзі, што жылі ў гарадах, прыпісваліся да гарадской грамады, а паселеныя на казённых землях – да дзяржаўных сялян. 23 мая 1847 г. да дзяржаўных сялян былі аднесены і вольныя, якія мелі ўласныя землі. Для паселеных на панскіх землях уводзіліся абавязковыя дагаворы з уладальнікамі, і без дазволу памешчыка нельга было змяніць месца жыхарства. Але і сама катэгорыя вольных людзей папаўнялася, паколькі ўказам ад 1 жніўня 1857 г. да яе залічваліся былыя шляхцічы – аднадворцы заходніх губерняў.

Саслоўе «*гарадскіх абывацеляў*» па-ранейшаму складалася з шасці разрадаў («настоящие городские обыватели», купцы трох гільдый, цэхавыя рамеснікі, «иногородние и иностранные гости», «именитые граждане» і «посадские»).

Найбольш прывілеяванае становішча сярод гараджан займала *купецтва*. Прыналежнасць да гэтага саслоўя дасягалася ўплатай гільдзейскіх збораў. Да адной з гільдый мог прыпісацца любы чалавек вольнага стану. Першапачаткова існавалі тры гільдыі (з 1863 г. засталіся дзве). З 1807 г. для запісу ў 1-ю гільдыю патрабавалася абвясціць капітал не менш за 50 тыс. р., у 2-ю – 30 тыс. р., у 3-ю – 8 тыс. р. Купцы вызваляліся ад падаткаў, цялесных пакаранняў і рэкруцкай павіннасці (замест выстаўкі рэкрутаў уносілі грашовы эквівалент). Яны маглі свабодна выбіраць месца жыхарства, купляць зямлю, будаваць і ўтрымліваць прамысловыя прадпрыемствы. Да купецкага саслоўя належалі не толькі самі купцы, але і чле-

ны іх сем'яў, запісаныя на адзін капітал. Але купецкія правы маглі быць страчаны ў выніку банкруцтва ці паводле судовага рашэння. Купецкія сем'і, якія знаходзіліся ў 1-й гільдыі на працягу 100 год, маглі хадайнічаць аб спадчынным дваранстве.

Да 1830-х гг. гільдзейскае купецтва на Беларусі ўзрасло да 3,5 тыс. чалавек (1,9 % усіх гараджан), але прадстаўнікоў 1-й гільдыі было крыху больш за 150 чалавек (2,4 % усіх купцоў). У 1851 г. у пяці заходніх губернях налічваліся 6053 гільдзейскія купцы (209 – 1-й гільдыі, 189 – 2-й, 5655 – 3-й). Большасць трымальнікаў купецкага капіталу (66,2 %) складалі яўрэі (у тым ліку 1-й гільдыі – 87,6 %, 2-й – 75,7 %, 3-й – 65,1 %). Пры гэтым колькасць купцоў 1-й гільдыі ў 1850-я гг. паменшылася, што было выклікана павышэннем купецкіх збораў і пераездам буйнейшых купцоў у гарады Цэнтральнай Расіі.

Найбольшую частку сярод гарадскіх груп насельніцтва складалі *мяшчане*. У сувязі з дэмаграфічным ростам, а таксама з перасяленнем у гарады і мястэчкі яўрэяў да пачатку 1830-х гг. колькасць мяшчан амаль падвоілася і склала 154,6 тыс. чалавек (82,2 % усіх гарадскіх абывацеляў). Але ўжо напрыканцы 1850-х гг. з-за павелічэння ўдзельнай вагі іншых груп насельніцтва доля мяшчан знізілася да 75,2 % (пры агульнай колькасці ў 196,8 тыс. чалавек). У шэрагу гарадоў Беларусі мяшчане перавышалі 90 %, у 13 іх удзельная вага складала 80–90 %.

Мяшчане былі абмежаваны ў праве перамяшчэння, плацілі падушныя падаткі, выконвалі рэкруцкую і іншыя павіннасці, а таксама падвяргаліся цялесным пакаранням. Яны мелі права займацца мелкім гандлем і промысламі, працаваць па найме. Састаў мяшчан папаўняўся за кошт іншых катэгорый гарадскога і сельскага насельніцтва. Выхад з мяшчанскага саслоўя быў магчымы праз паступленне на дзяржаўную службу (у выпадку атрымання адукацыі) ці праз запіс у купецкую гільдыю (пры наяўнасці сродкаў).

У першай палове XIX ст. у гарадах захоўвалася і цэхавая арганізацыя (мела свае кіруючыя органы, цэхавыя звычаі, традыцыі і знешнія атрыбуты). Цэхі аб'ядноўвалі майстроў, падмайстроў і іх вучняў. Хаця яшчэ ў канцы XVIII ст. былі зняты абмежаванні ў найме майстрамі вучняў і чэляднікаў і скасаваны абмежаванні ў галіне вытворчасці і збыту вырабаў, у цэхавай арганізацыі назіраўся пэўны крызіс. Члены цэхаў нярэдка ігнаравалі пастановы ўправы, не прымалі ўдзел у пасяджэннях. Новыя рамеснікі з вялікай неахвотай запісваліся ў цэхі, паколькі не жадалі падпарадкоўвацца цэхавым правілам. Пры гэтым сярод *цэхавых і няцэхавых рамеснікаў* вылучаліся розныя групы спецыялістаў. Да першай належалі рамеснікі, якія былі заняты вытворчасцю вопраткі і абутку; да другой – тыя, хто працаваў у хар-

човай вытворчасці; да трэцяй – спецыялісты па вырабе прадметаў хатняга ўжытку. Апошнюю групу складалі майстры менш пашыраных спецыяльнасцей (ювеліры, цырульнікі і інш.).

Іншыя групы гарадскіх абывацеляў («иногородние и иностранные гости», «именитые граждане») былі нешматлікімі.

## ВЫСНОВЫ

Такім чынам, адміністрацыйна-тэрытарыяльныя рэформы, праведзеныя ў першай палове XIX ст., прывялі да пэўнай кансалідацыі беларускіх зямель і канчаткова вызначылі іх склад. Гэтаму спрыяў своеасаблівы погляд Аляксандра I на заходнія губерні як на «польскія», якія мелі адзіную гістарычную традыцыю. У той жа час пры вызначэнні межаў ваенных губернатарстваў урад кіраваўся палітычнай і ваеннай мэтазгоднасцю. Гэта прывяло да таго, што з 1801 г. Беларусь заставалася падзеленай паміж літоўскім, беларускім і кіеўскім ваеннымі губернатарствамі. І толькі пасля задушэння паўстання 1830–1831 гг. большасць губерняў Беларусі была падпарадкавана двум генерал-губернатарскім цэнтрам – у Вільні і Віцебску.

Вышэйшая ўлада на тэрыторыі Беларусі ўвесь час знаходзілася ў руках ваенных губернатараў, а з 1822 г. – генерал-губернатараў. Функцыі грамадзянскіх губернатараў былі абмежаванымі, а губернскія кіраўнікі былі амаль непадкантрольныя з боку пракурорскага нагляду. З 1840 г. на беларускіх землях на ўсіх узроўнях – у губернях, паветах і гарадах – была ўкаранёна цалкам расійская сістэма кіравання.

У першай трэці XIX ст. у якасці асноўнага зводу законаў на тэрыторыі Беларусі дзейнічаў Статут ВКЛ 1588 г. і судовая сістэма беларуска-літоўскіх губерняў захоўвала пэўныя адрозненні ад расійскай. У грамадзянскім судаводстве дзейнічалі нормы Статута ВКЛ, соймавых канстытуцый, а справаводства вялося на польскай мове. Крымінальнае ж судаводства ажыццяўлялася згодна з агульнаімперскімі законамі і на рускай мове. І толькі пасля задушэння паўстання 1830–1831 гг. улады пайшлі на поўную ўніфікацыю беларускай сістэмы заканадаўства і арганізацыі судовых устаноў. На працягу 1831–1840 гг. нормы Статута ВКЛ канчаткова былі скасаваны па ўсёй тэрыторыі Беларусі, што, на думку ўрада, павінна было нівеліраваць асаблівасці беларуска-літоўскага краю і канчаткова надаць яму «рускі» характар.

Для дэмаграфічнай сітуацыі ў Беларусі ў першай палове XIX ст. характэрным было зніжэнне ўдзельнай вагі сельскіх жыхароў (з 96,5 % да 91,6 %) і павелічэнне долі гараджан (з 3,5 % да 8,4 %). Апераджальныя тэмпы росту гарадскога насельніцтва сведчылі аб хуткіх урбанізацыйных пра-

цэсах у Беларусі. У параўнанні з сярэднімі паказчыкамі па Еўрапейскай Расіі, дзе колькасць гарадскога насельніцтва з 1825 па 1858 г. узрасла на 62 %, у беларускіх гарадах рост склаў 90 %. Гэта ў пэўнай ступені было абумоўлена нізкімі зыходнымі данымі колькасці жыхароў беларускіх гарадоў у канцы XVIII ст. і палітыкай расійскіх улад у адносінах да яўрэяў.

У першай палове XIX ст. назіралася паступовая трансфармацыя і саслоўнай структуры грамадства Беларусі. Найбольшыя змены адбываліся ў дваранскім саслоўі, якое ў выніку «разбору шляхты» зменшылася да 6 % у агульнай масе насельніцтва. У той жа час былыя шляхцічы – грамадзяне і аднадворцы заходніх губерняў – папаўнялі катэгорыі сельскіх і гарадскіх абывацеляў. Сярод сялянскага саслоўя яскрава прасочвалася тэндэнцыя да павелічэння ўдзельнай вагі дзяржаўных сялян за кошт скарачэння прыватнаўласніцкіх (панскіх, царкоўных і інш.) і вольных людзей. Рост колькасці розных саслоўных груп гарадскіх абывацеляў адбываўся за кошт павелічэння яўрэйскай часткі мяшчанства, а таксама чыноўніцтва і ваенных. Змены ў саслоўнай структуры грамадства былі заўважаны ўрадам, які пайшоў на стварэнне ў 1832 г. новага саслоўя ганаровых грамадзян, што стала асновай для фарміравання такой групы буржуазнага грамадства, як разначынцы.

## ПЫТАННІ

1. Якія адміністрацыйна-тэрытарыяльныя змены адбыліся ў Беларусі ў першай палове XIX ст.? Чым яны былі абумоўлены?

2. Прааналізуйце змены, якія адбыліся ў сістэме кіравання Беларусі ў першай трэці XIX ст. З чым яны былі звязаны?

3. Якія асаблівасці назіраліся ў сістэме кіравання пасля ўвядзення на тэрыторыі Беларусі ваеннага становішча?

4. У чым заключаліся змены, якія адбыліся ў судовай сістэме Беларусі ў 1830–40-я гг.?

5. Якія тэндэнцыі назіраліся ў дэмаграфічнай сітуацыі на Беларусі ў першай палове XIX ст.?

6. Прааналізуйце змены, якія адбыліся ў саслоўна-групавой структуры грамадства Беларусі. З чым яны былі звязаны?

# 3

# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ НА ЗЫХОДЗЕ ПРЫГОННІЦТВА

## РАЗЛАЖЭННЕ ФЕАДАЛЬНА-ПРЫГОННІЦКАГА ЛАДУ І ФАРМІРАВАННЕ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ АДНОСІН. РАЗВІЦЦЁ ТАВАРНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ Ў СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ

У канцы XVIII ст. і ў першых дзесяцігоддзях XIX ст. у дзяржавах, дзе ўжо адбыліся буржуазныя рэвалюцыі, назіраўся хуткі эканамічны і сацыяльны прагрэс. У Францыі разгарнуўся прамысловы пераварот, а ў Вялікабрытаніі ён ужо завяршыўся. На пачатку другога дзесяцігоддзя XIX ст. каля паловы насельніцтва гэтых краін працавала ў прамысловасці і гандлі. Больш адсталыя еўрапейскія дзяржавы ўсё мацней адчувалі ціск на сваю эканоміку з боку перадавых капіталістычных краін. Расія, нягледзячы на свае гаспадарчыя поспехі ў першай чвэрці XIX ст., значна адставала ад еўрапейскіх дзяржаў, у якіх феадальны парадак быў ужо скасаваны. Новыя капіталістычныя формы эканамічнага жыцця ў прыгонніцкай Расіі праяўляліся ўсё больш яскрава, але працэс разлажэння феадальна-прыгонніцкіх адносін ішоў марудна. У пачатку стагоддзя большасць насельніцтва Расіі існавала за кошт сельскагаспадарчай працы. Сельская гаспадарка па-ранейшаму заставалася вядучай галіной эканомікі.

Беларусь у першай палове XIX ст. з'яўлялася выключна аграрным рэгіёнам Расійскай імперыі. Яе сельская гаспадарка мела ў цэлым экстэнсіўны характар з пераважаннем трохпольнай сістэмы: ярына – азімыя – папар. Дзе-нідзе яшчэ нават захоўвалася аблогавае карыстанне зямлёй.

Нярэдкай з'явай у прыгонніцкай вёсцы былі неўраджаі і голад. Напрыклад, у Віцебскай губерні з 1814 па 1826 г. (на працягу дванаццаці гадоў запар) трымаліся «поўныя неўраджаі», а затым з 1847 г. неўраджайныя гады паўтараліся зноў. «Поўнымі неўраджаямі» ў Гродзенскай губерні характарызуюцца 1845, 1853, 1854 і 1855 гг. Трэба адзначыць, што і ў астатніх губернях Беларусі ўраджайныя гады былі вельмі рэдкай з'явай.

Частыя неўраджаі, характэрныя для беларускіх губерняў, і выкліканы імі рост недаімак у прыгонніцкай вёсцы былі прычынай сур'ёзнай заклапочанасці і трывогі з боку ўрадавага акружэння. Аднак усе прынятыя ўладамі меры былі недастаткова эфектыўнымі.

Нізкая ўраджайнасць была непазбежным спадарожнікам прыгонніцкай сістэмы з яе прымітыўнай тэхнікай земляробства і невысокай прадукцыйнасцю прыгонніцкай працы. Больш за тое, у першай палове XIX ст. яна набыла нават некаторую стабільнасць. Паводле даных губернатарскіх справаздач падлічана, што ў Беларусі з 1801 па 1861 г. ураджайнасць па ярыне і азімых у сярэднім не перавышала: у Магілёўскай губерні – 2,5 чвэрці збору на кожную чвэрць пасеву, у Мінскай – 3, у Гродзенскай – 3,5, у той час як па ўнутраных губернях Расійскай імперыі ўраджайнасць у сярэднім складала не менш за 3,6 чвэрці збору на кожную чвэрць пасеву. Сістэма прыгонніцкіх адносін ператварылася ў моцны тормаз для далейшага развіцця сельскай гаспадаркі. Гэта разумелі і прадстаўнікі ўлады. Магілёўскі губернатар у справаздачы за 1859 г. падкрэсліваў, што галоўная прычына нездавальняючага стану сельскай гаспадаркі заключалася ў існаванні прыгонніцкіх адносін, пры якіх сяляне не мелі магчымасці распараджацца сваёй працай і, не маючы ніякіх праў уласнасці на зямлю, неахвотна выконвалі свае абавязкі па апрацоўцы палёў. Мінскі губернатар у справаздачы за 1859 г. таксама адзначаў, што прыгонніцкая залежнасць земляробства перашкаджае новаму ўдасканаленню.

Адной з прычын нізкай ураджайнасці была прымітыўная тэхніка земляробства. У першай палове XIX ст. асноўнымі сельскагаспадарчымі прыладамі па-ранейшаму заставаліся саха (драўляная бярозавая палка з двума жалезнымі разцамі, якую цягнулі два валы або адзін конь) і драўляная барана, якая складалася з дзвюх дуг, да якіх тонкай лазой прымацоўваліся два дубовыя вострыя зубы. Праўда, часам на цвёрдых глебах выкарыстоўваліся жалезныя бароны. У Віцебскай губерні барану замяняў «смык», які вырабляўся з елкі. Пры ўборцы збожжа па-ранейшаму выкарыстоўваліся сярпы.

З-за недахопу жывёлы палеткі сялян слаба ўгнойваліся, што таксама прыводзіла да нізкай ураджайнасці. Асабліва дрэнна былі забяспеча-

ны жывёлай сяляне Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай губерняў. Так, па колькасці коней Гродзенская губерня была на апошнім месцы – дзевяць коней на 100 жыхароў. Аднак не нашмат лепей былі забяспечаны сяляне іншых беларускіх губерняў. Выключэнне складала Магілёўская губерня, але нават магілёўскі губернатар быў вымушаны прызнаць адчувальны недахоп рагатай скаціны, асабліва ў памешчыцкіх сялян. Па яго меркаванні, гэта пазбаўляла землеўладальнікаў магчымасці ўгнойваць зямлю ў адпаведнасці з патрабаваннямі глебы.

Сярод сельскагаспадарчых культур пераважалі так званыя «шэрыя» хлябы: жыта і ячмень. З 40-х гг. XIX ст. пашыраюцца пасевы бульбы, якая з агароднай культуры становіцца палявой. Хутка бульба стала другім хлебам для сялян і важнай тэхнічнай сыравінай для перапрацоўчай прамысловасці, галоўным чынам для вінакурнай. На поўдні Магілёўскай губерні істотна павялічыліся пасевы цукровых буракоў, якія ішлі на цукровыя заводы і вінакурэнне.

Вайна 1812 г. прывяла народную гаспадарку Беларусі ў стан сур'ёзнага заняпаду. Велізарныя рэквізіцыі і разбурэнні пры адступленні войскаў спустошылі сельскае насельніцтва. Сяляне страцілі амаль усю скаціну і коней. Значна скарацілася плошча пасеваў. Асабліва цяжкімі былі неўраджайныя 1820–1822 гг. Голад прывёў да скарачэння насельніцтва Беларусі. На працягу наступных дзесяцігоддзяў смяротнасць на Беларусі перавышала нараджальнасць. Пры параўнанні даных VIII і X рэвізій выявілася, што з 1833 па 1858 г. у пяці беларускіх губернях прыгоннае насельніцтва скарацілася больш як на 76 тыс. рэвізскіх душ, або на 6,2 % – доўга адбіваліся на Беларусі наступствы мінулай вайны. У справаздачы за 1831 г. віцебскі, магілёўскі і смаленскі генерал-губернатар вымушаны быў прызнаць, што ў выніку падзей 1812 г. Віцебская і Магілёўская губерні працягвалі знаходзіцца ў канчатковым заняпадзе і належаць да самых бедных у дзяржаве.

Аднак прыгонная сельская гаспадарка (як памешчыцкая, так і сялянская) на працягу другой чвэрці XIX ст. пастулова губляла спецыфічныя для яе рысы. Трапляючы ў сферу ўплыву рынку, сельская гаспадарка набывала таварны характар. Адной з прычын росту таварнасці сельскай гаспадаркі з'яўлялася наяўнасць значнай колькасці «спажывецкага» насельніцтва. Так, на Беларусі ў 1835 г. налічвалася больш за 275 тыс. чалавек гарадскога і мястэчковага насельніцтва, якое займалася пераважна рамяством, гандлем, прадпрымальніцтвам і наймалася на розныя працы. Сярод «спажывецкай» часткі насельніцтва неабходна таксама вылучыць значную колькасць адыходнікаў, якія ўлетку працавалі на плытах, рачных суднах і іншых адыходных промыслах. Нарэшце, да ліку «спажывецкай» часткі насельніцтва адносілася значная колькасць войск, якая

ўвесь час знаходзілася ў памежных беларускіх губернях. Неземляробчае насельніцтва праяўляла вялікі попыт на сельскагаспадарчыя тавары, што, безумоўна, станоўча адбівалася на развіцці мясцовых рынкаў.

Росту таварнасці сельскай гаспадаркі садзейнічала павелічэнне вывазу сельскагаспадарчых прадуктаў у прамысловыя губерні Расіі і за мяжу. Развіццю таварна-грашовых адносін спрыялі разгалінаваныя сістэмы рэк, якія звязвалі Беларусь з гарадамі Расіі, Украіны і Польшчы, а праз балтыйскія парты – з краінамі Заходняй Еўропы.

У першай палове XIX ст. пачала акрэслівацца спецыялізацыя асобных рэгіёнаў Беларусі. У прыватнасці, у Віцебскай губерні штогод выраблялася да 500 тыс. пудоў ільновалакна. Лён засяваўся і ў іншых губернях Беларусі, але ў меншых памерах. У Магілёўскай губерні вырошчваліся каноплі. У Мінскай губерні шырокае распаўсюджанне атрымалі пасевы бульбы, якая потым пераганялася ў спірт. Па вытворчасці спірту з бульбы Мінская губерня займала першае месца сярод усіх губерняў Расійскай імперыі. У паўднёвых раёнах Магілёўскай і Мінскай губерняў з канца 1830-х гг. некаторыя памешчыкі сталі істотна пашыраць вытворчасць цукровых буракоў, перапрацоўваючы іх на сваіх заводах. Каб павялічыць аб'ёмы сыравіны, памешчыцкіх сялян нярэдка прымушалі пашыраць пасевы буракоў і здаваць іх на цукровыя заводы.

З другой чвэрці XIX ст. у сельскай гаспадарцы Гродзенскай губерні шырокае развіццё атрымала танкарунная авечкагадоўля. У губернатарскіх справаздачах за 40–50-я гг. XIX ст. падкрэслівалася, што ў губерні воўна складала вельмі значную крыніцу даходу і прадавалася для ўжывання часткова на мясцовыя фабрыкі, а часткова – у Варшаву. У канцы 1830-х – 40-я гг. у Гродзенскай губерні выраблялася штогод да 40–50 тыс. пудоў высакаякаснай танкаруннай воўны.

Жывёлагадоўля ў Беларусі ў першай палове XIX ст. знаходзілася на нізкім узроўні. Так, па афіцыйнай ацэнцы, у памешчыкаў заходніх губерняў яна знаходзілася «ў пасрэдным стане», у сялян жа была «ў абсалютным заняпадзе». За выключэннем танкарунннай авечкагадоўлі, жывёлагадоўля ў гэты час яшчэ не набыла таварнага характару. Буйная рагатая жывёла разводзілася галоўным чынам для атрымання ўгнаенняў. Толькі некаторыя з памешчыкаў спрабавалі прыстасаваць жывёлагадоўлю да патрэб рынку: адкормліваць жывёлу на мяса, выпрабляць на продаж масла і сыр. Удзельная вага прадпрымальніцкага земляробства на працягу першай паловы XIX ст. была нязначнай. Рост прадукцыйнасці сельскагаспадарчай вытворчасці на Беларусі стрымліваўся ў першую чаргу ўплывам прыгоннага права, празмернае ўздзеянне якога прыводзіла да нізкага ўзроўню сельскагаспадарчай вытворчасці.

Асновай *прыгонніцкай гаспадаркі* Беларусі з'яўлялася феадальная ўласнасць на зямлю. Памешчыкі манапольна валодалі амаль усёй ворнай зямельнай плошчай. Напрыклад, у Мінскай губерні, дзе колькасць памешчыкаў складала толькі 0,2 % ад агульнай колькасці жыхароў, ім належала 85 % агульнай прасторы зямлі; у Гродзенскай – 58,5 %, у Віленскай – 69,5 %.

Беларусь была раёнам буйнога памешчыцкага землеўладання. Па даных X рэвізіі, у Беларусі 9404 памешчыкам належала 1 152 411 рэвізскіх душ, гэта значыць сялян мужчынскага полу. Аднак размеркаванне прыгонных паміж памешчыкамі было нераўнамерным. Па колькасці прыгонных сялян усіх памешчыкаў Беларусі можна падзяліць на некалькі груп: безмаёнткавыя – 332 чалавекі, у якіх было 868 рэвізскіх душ; дробнамаёнткавыя (да 100 прыгонных) – 6557, якія мелі 188 921 прыгоннага; сярэднемаёнткавыя (да 500 прыгонных) – 2117, якія валодалі 448 791 рэвізскай душой; буйнамаёнткавыя (больш за 500 прыгонных) – 398 чалавек, мелі 509 000 рэвізскіх душ.

Такім чынам, 398 буйных памешчыкаў (4,2 % ад агульнай колькасці) мелі ва ўласнасці 44,4 % усіх прыгонных. А 149 найбольш буйных памешчыкаў Беларусі (1,5 % ад іх агульнай колькасці), у кожнага з якіх было больш за 1000 рэвізскіх душ, з'яўляліся ўладальнікамі больш як 339,5 тыс. сялян (29,4 % ад колькасці ўсіх прыгонных). Найбольш уплывовымі былі магнаты Вітгенштэйны, Радзівілы, Румянцавы, кожны з якіх валодаў дзясяткамі тысяч прыгонных сялян і сотнямі тысяч дзесяцін зямлі.

Самая вялікая колькасць буйных латыфундый была ў Магілёўскай губерні, а самая малая – у Віленскай. У Магілёўскай губерні знаходзілася і найбольшая колькасць (142) безмаёнткавых памешчыкаў, што складала каля 50 % усіх дваран гэтай катэгорыі.

На працягу першай паловы XIX ст. у памешчыцкай гаспадарцы Беларусі адбываліся змены, якія сведчылі пра разлажэнне феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Памешчыцкая гаспадарка паступова ператваралася ў гаспадарку, якая працавала для рынку. Галоўнымі прадметамі вывазу з Беларусі былі: лён, ільняны алей, пянька, воск, лес, каноплі, скура і інш. З 20-х гг. XIX ст. пашыраецца вываз збожжа. У 1827 г. у параўнанні з 1811 г. вываз хлеба з Беларусі вырас больш чым у дзевяць разоў. Пры гэтым варта мець на ўвазе, што з 1807 да 1812 г. у сувязі з далучэннем Расійскай імперыі пасля Тыльзіцкага міру да кантынентальнай блакады і разрывам гандлёвых зносін з Англіяй вываз сельскагаспадарчых прадуктаў з краіны рэзка скараціўся.

Значнае павелічэнне экспарту беларускага збожжа адзначаецца ў 40-х і асабліва 50-х гг. XIX ст. Так, у Гродзенскай губерні ў гэты час штогод па-

ступала ў продаж у сярэднім да 250 тыс. чвэрцей хлеба на суму каля аднаго мільёна рублёў. Толькі ў Данцынг і Кёнігсберг з губерні вывозілася штогод ад 150 да 175 тыс. чвэрцей жыта, жытняй мукі, проса і іншага зерня. У Віленскай губерні кожны год пастулала ў продаж у сярэднім да 346 тыс. чвэрцей хлеба на суму 1,4 млн р. Трэба адзначыць, што значная частка хлеба, якая прадавалася на ўнутраным рынку, выкарыстоўвалася вінакурэннем.

Галоўным пастаўнікам таварнага збожжа быў памешчык. Але і сяляне, якім былі патрэбны грошы для выплаты дзяржаўных падаткаў і набыцця розных тавараў, рамесных вырабаў, прылад, таксама прадавалі частку свайго хлеба.

Росту таварнай вытворчасці спрыяла выгадная рыначная кан'юнктура – высокія цэны на хлеб у 1840–50-х гг. Цэны на збожжавыя прадукты ў Беларусі і Літве, як правіла, былі больш высокімі, чым у іншых раёнах імперыі, з-за частых неўраджаяў і павышанага попыту на збожжа для памешчыцкага вінакурства. Напрыклад, у Гродзенскай губерні чвэрць жыта ў 1843 г. каштавала 2 р. 8 кап., у 1846 г. – 5 р. 70 кап., а ў 1856 г. – 10 р. Сярэдняя цана чвэрці жыта на рынках Гродзенскай губерні на працягу дзесяці гадоў, з 1848 да 1857 г., трымалася на ўзроўні 5 р. 56 кап. (у 2,5 разы вышэй за аналагічны паказчык у 1843 г.).

Развіццё таварна-грашовых адносін падштурхоўвала памешчыкаў прыстасоўваць сваю гаспадарку да патрэб унутранага і знешняга рынкаў, павышаць даходнасць маёнткаў. Гэта імкненне ажыццяўлялася двума шляхамі: правядзеннем некаторых рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў у сваёй гаспадарцы і ўзмацненнем прыгонніцкай эксплуатацыі сялян.

Для ўдасканалення памешчыцкай гаспадаркі ў 1826 г. было арганізавана Беларускае вольнае эканамічнае таварыства. Таварыства прызначала ўзнагароды за ўвядзенне новай сістэмы гаспадаркі, вынаходніцтва і ўдасканаленне спосабаў, якія вялі б да паляпшэння земляробства, жывёлагадоўлі, рукадзелля і сельскай прамысловасці. Члены таварыства павінны былі ў сваіх гаспадарках выпрабоўваць новыя сельскагаспадарчыя прылады, ствараць узорныя фермы, прымяняць мінеральныя ўгнаенні дзеля павышэння ўрадлівасці глебы. Спачатку гэта рэкамендавалася для Віцебскай і Магілёўскай губерняў. У 1848 г. у маёнтку Горы-Горкі Магілёўскай губерні быў адкрыты (адзін з першых у Еўропе) земляробчы інстытут.

Частка памешчыкаў пачала ўводзіць у сваіх маёнтках лепшае насенне, новыя гатункі збожжавых культур, пашыраць пасевы ільну і бульбы. Гродзенскі губернатар у справаздачы за 1859 г. паведамляў, што ў большай частцы маёнткаў працягвалі весці гаспадарку старымі метадамі, але ў не-

каторых маёнтках ужо прымяняліся новыя падыходы – пачыналі сеяць кармавыя травы і выкарыстоўваць земляробчыя машыны.

У Магілёўскай губерні граф Румянцаў, напрыклад, праводзіў эксперыменты па пасеве розных гатункаў бульбы. У асобных маёнтках пачынаюць ужывацца ўдасканаленыя сельскагаспадарчыя прылады. Так, у Мінскай і Магілёўскай губернях выкарыстоўвалася некалькі малатарняў з арфамі, якія часткова замянялі працоўную сілу. Калі для малацьбы 28 коп жыта пры ручной працы на працягу дня патрабаваліся 24 чалавекі, то пры карыстанні малатарняй з арфай досыць было 9–10 чалавек. У Мінскай губерні ў 50-х гг. XIX ст. памешчыцкая гаспадарка ўжо перабудоўвалася на новы лад: машынай касілі і жалі, малацілі і сеялі, аралі. У Гродзенскай губерні ў 50-х гг. XIX ст. з’явіліся жаткі і адносна шырока ўжываліся ручныя і конныя арфы і сячкарні.

Сельскагаспадарчыя машыны звычайна прывозіліся з-за мяжы (машыны Бутэнопа). Але цікава, што ў Беларусі таксама з’яўляліся вынаходнікі сельскагаспадарчых машын. Так, гаспадар маёнтка Дастоева Пінскага павета Мінскай губерні Якушык зрабіў і пусціў у продаж параконную малатарню, трох- і чатырохконную жнейку (выпрабаваную ў Горы-Горацкім земляробчым вучылішчы), машыну для капання равоў і распілоўкі дошак, а таксама такую саху, якая, па словах вынаходніка, арала за чатыры сахі, нягледзячы на тое, што была запрэжана параю коней або быкоў. Аб’явы пра машыны Якушыка друкаваліся на працягу дзесяці гадоў. Тым не менш ужыванне сельскагаспадарчых машын у Беларусі было адносна рэдкай з’явай. У большасці маёнткаў памешчыцкія палі апрацоўваліся прымітыўным сялянскім інвентаром.

Памешчыцкая гаспадарка была заснавана на выкарыстанні прыгоннай працы. Аднак у першай палове XIX ст. некаторыя памешчыкі ўжо прымянялі і наёмную працу батракоў. Памешчык Магілёўскай губерні Дзярабін расказваў графу Румянцаву, што 10 рабочых замяняюць 30 прыгонных сялян і каштуюць на 88 р. танней, а галоўнае – наёмны працаўнік заўсёды пад рукой, яго можна прывучаць да сваёй справы, якую ён будзе выконваць непараўнальна хутчэй і лепш, чым прыгонны. Памешчык Бабруйскага павета М. Пушчын, карыстаючыся вольнанаёмнай працай на сваёй мануфактуры, прыйшоў да высновы, што яна больш прадуктыўная і выгадная, чым праца прыгонных. Трэба адзначыць, што выгаду вольнанаёмнай працы разумелі многія памешчыкі, але выкарыстоўвалі яе адзінкі. Большасць жа па-ранейшаму аддавала перавагу бясплатнай працы сваіх прыгонных.

У мэтах павышэння прыбыткаў памешчыкі пачынаюць займацца прадпрымальніцтвам. Яны адкрываюць у сваіх маёнтках прыгонніцкія мануфактуры: лесапільныя заводы, вінакурні, заводы па перапрацоўцы

буракоў на цукар. У пачатку XIX ст. у Беларусі налічвалася 5215 вінакурняў, што складала 20 % ад іх агульнай колькасці ў Расіі. Амаль у кожным маёнтку была свая вінакурня. Шырокае распаўсюджанне вінакурэння тлумачылася тым, што Беларусь і Літва карысталіся правам прапінацыі – свабоднай вытворчасці і продажу гарэлкі. Вінакурства давала памешчыкам шэраг выгад. Па-першае, перагонка значнай колькасці збожжа падтрымлівала на высокім узроўні рыначны попыт на збожжа. Па-другое, адходы ад вінакурэння (барда) ішлі на корм жывёле, што пры недахопе сенакосаў палягчала развіццё жывёлагадоўлі. Нарэшце, вінакурэнне прыносіла вялікія грашовыя прыбыткі памешчыкам.

Таварны характар набывала ў Беларусі таксама жывёлагадоўля. Наймацней яна была развіта ў Гродзенскай губерні. Асабліва паскорылася развіццё авечкагадоўлі. Рост суконных мануфактур выклікаў попыт на воўну. Памешчыкі разводзілі спецыяльную пароду авечак-мерыносаў, воўна якіх цалкам прызначалася на продаж. У 1860 г. у Гродзенскай губерні налічвалася 240 тыс. мерыносаў, з якіх здымалі да 68 тыс. пудоў воўны для суконных фабрык.

Адзначаючы тэндэнцыю пераходу памешчыкаў да прадпрымальніцтва, паляпшэння тэхнікі сельскай гаспадаркі і росту прадукцыйнасці працы, пераходу да вольнага найму, варта адзначыць, што гэтыя імкненні былі нядоўгачасовымі і мелі вельмі абмежаванае распаўсюджанне. Ужо ў 1840-х гг. узмацняецца зварот да самых адсталых форм прыгоннай гаспадаркі. Імкненне памешчыкаў да павелічэння прыбытковасці маёнткаў суправаджалася пашырэннем панскіх надзелаў за кошт скарачэння сялянскіх, а таксама істотным павелічэннем сялянскіх павіннасцей.

Памешчыцкая зямля падзялялася на ўласна панскую і сялянскую, якую сяляне атрымлівалі ў карыстанне. Суадносіны часта мяняліся. Паказальны ў гэтых адносінах Гомельскі маёнтак графа І. Ф. Паскевіча-Эрыванскага. За 20 гадоў (з 1814 па 1834 г.) плошча панскай ворнай зямлі павялічылася амаль у два разы, сенажаць памешчыка ўзрасла амаль у тры разы. Калі ўлічыць павелічэнне сялянскага насельніцтва ў маёнтку (у 1814 г. было 13 134 рэвізскія душы, у 1834 – 19 385), то фактычна сялянская зямельная плошча істотна скарацілася. Калі ў 1814 г. на кожную рэвізскую душу даводзілася па 3,76 дзесяціны, то ў 1834 г. – 3 дзесяціны зямлі. Толькі ў 1830 г. І. Ф. Паскевіч адабраў у сялян больш за 38 000 дзесяцін апрацаванай зямлі, і ў маёнтку ўжо налічвалася 700 бабылёў. Пазней, у 1840-х гг., ён пабудаваў завод, адняўшы ў сялян лепшыя землі пад пасеў буракоў, і прадставіў ім наўзамен зямлю дрэннай якасці.

Паміж барскім і сялянскім заворваннем не было дакладна ўстаноўленых меж, зямля была раскідана цераспалосна. Аднак з развіццём

у XIX ст. больш інтэнсіўных форм памешчыцкай гаспадаркі панская зямля ўсё больш адмяжоўвалася ад сялянскай. Тым не менш на працягу доўгага часу захоўвалася сумеснае карыстанне зямельнымі ўгоддзямі, сенажацямі. Шырока было распаўсюджана так званае сервітутнае права – часовае права сялян карыстацца некаторымі ўгоддзямі на панскім засеўку. Найбольш пашыраным быў пашавы сервітут – права сялян пускаць сваю скаціну на памешчыцкія палі пасля збору ўраджаю. Сервітуты папаўнялі недастатковае надзяленне сялян сенажацямі, таму сяляне вялі актыўнае змаганне за сервітутныя ўчасткі.

Памешчыкі імкнуліся да пашырэння свайго заворвання, таму часта пазбаўлялі сялян магчымасці карыстацца зямельнымі надзеламі. Напярэдадні рэформы 1861 г. у Беларусі налічвалася 68 717 беззямельных сялян-агароднікаў, батракоў і бабылёў. У канцы 1850-х гг. у Мінскай губерні мелася 7568 двароў агароднікаў і бабылёў, што складала 8,9 % ад агульнай колькасці памешчыцкіх сялян, у Гродзенскай – 2118 двароў, ці 5,5 %, і 12 753 парабкі, у Віцебскай – толькі ў чатырох паветах (Дынабургскім, Дрысенскім, Люцынскім і Рэжыцкім) – 9757 парабкаў.

Вялікую колькасць беззямельных сялян складалі так званыя «месячнікі» («адзінарнікі»), якія замест зямельнага надзелу атрымлівалі мізэрнае месячнае ўтрыманне за працу на двары памешчыка («месячыну»). Пазбаўленыя сродкаў вытворчасці, месячнікі фактычна былі пастаўлены ў становішча рабоў.

Прыгонныя сяляне Беларусі неслі на карысць памешчыкаў павіннасці ў выглядзе паншчыны або аброку. Пануючай формай павіннасці з'яўлялася паншчына. Паншчынныя сяляне складалі 92,4 % ад агульнай колькасці прыгонных, у той час як аброчныя – 7,6 %.

З развіццём рынкавых сувязей памешчык узмацняў свае патрабаванні да селяніна. Выдадзены Паўлам I у 1797 г. маніфест аб трохдзённай паншчыне на тэрыторыі Беларусі па сутнасці не выконваўся. Памешчыкі даводзілі паншчыну да пяці-шасці дзён на тыдзень. У сялян не заставалася часу для працы ў сваёй гаспадарцы. Дэградацыя сялянскай гаспадаркі адбівалася і на эканамічным стане памешчыкаў. Іх даўгі ўзрасталі і да 1857 г. склалі 39 597 тыс. р., а ў 1858–1859 гг. – звыш 43 165 тыс. р. У прыватнасці, запазычанасць князя Радзівіла ўжо ў 30-х гг. XIX ст. была настолькі значная, што па скаргах крэдытораў была створана адмысловая камісія, якая задаволіла іскі больш чым на 2 млн р. Даўгі графа Агінскага – звыш 4758 тыс. р. – перавышалі кошт усёй яго маёмасці, якая ацэньвалася ў 3432 тыс. р.

Памешчыкі, якія заблытваліся ў даўгах, закладалі свае маёнткі і прыгонных. Амаль ва ўсіх справаздачах начальнікаў беларускіх губерняў за

1850–60-я гг. паведамлялася аб павелічэнні колькасці закладзеных і перазакладзеных маёнткаў. З кожным годам павялічвалася таксама і колькасць закладзеных сялян. Калі ў 1857 г. з 1190 тыс. рэвізскіх душ было закладзена 672 225 (54 %), то ў 1858–1859 гг. – 711 450 (59,8 %).

Запазычанасць памешчыкаў, адсутнасць у іх капіталаў, нізкая вытворчасць працы рабілі марудным пераход гаспадаркі на капіталістычны шлях. Галоўнай перашкодай для эканамічнага развіцця была амаль некантралюемая ўлада памешчыкаў над прыгоннымі сялянамі. Толькі адмена прыгоннага права магла даць прастору для эканамічнага развіцця краіны.

## КРЫЗІС ПРЫГОННІЦКАЙ ГАСПАДАРКІ. САЦЫЯЛЬНЫЯ СУПЯРЭЧНАСЦІ

Сялянская гаспадарка, якая з'яўлялася асноўнай вытворчай базай памешчыцкага маёнтка, рабіла яго ўладальніка зацікаўленым у забеспячэнні гэтай гаспадаркі пэўным мінімумам зямлі.

Зямельныя надзелы сялян у Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губернях адводзіліся ў падворнае карыстанне; у Віцебскай (за выключэннем інфлянцкіх паветаў, дзе таксама было падворнае землекарыстанне) і Магілёўскай губернях пераважала абшчыннае землекарыстанне. Фармальна памеры зямельных надзелаў вызначаліся існаваўшымі інвентарамі, неабавязковымі для памешчыкаў.

Размеркаванне надзелаў паміж сялянамі было нераўнамерным. У канцы 1850-х гг. сярэдні сялянскі надзел у Віцебскай губерні складаў 6,5 дзесяціны, у Магілёўскай – 7,3 дзесяціны, што з цяжкасцю забяспечвала пражыццёвы мінімум.

У Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і часткова Віцебскай губернях асноўнай адзінкай зямельнага забеспячэння лічылася валока (каля 21 га) сенажаці, ворыўнай і прысядзібнай зямлі на двор. Поўныя валочныя гаспадаркі сустракаліся рэдка, у асноўным пераважалі гаспадаркі, якія мелі 3/4 або 1/2 валокі. Пры нізкай ураджайнасці і забалочанасці зямель гэтага надзелу ледзь хапала для забеспячэння пражыццёвага мінімуму сялянскай сям'і.

Дзяржаўныя сяляне таксама пакутавалі ад малазямелля. Сярэднія надзелы на рэвізскую душу складалі ў Гродзенскай губерні ад адной да дзвюх дзесяцін, у Віцебскай і Магілёўскай – ад трох да пяці дзесяцін.

Прыгонныя сяляне знаходзіліся ў поўнай залежнасці ад сваіх уладальнікаў, якія адвольна прызначалі віды і памеры феадальных *павіннасцей*. Памешчык меў права здаваць у рэкруты непажаданага яму селяніна па-за

чаргой, мог адабраць у прыгонных усю іх маёмасць, падвяргаць цялесным пакаранням. Сяляне Беларусі былі абкладзены цяжкімі павіннасцямі, якія ўмоўна можна падзяліць на галоўныя і дадатковыя. Да галоўных адносіліся паншчына, чынш і згоны, дадатковымі з'яўляліся шарваркі (будаўнічыя працы), вартаўніцтва (начная варта) і падводная павіннасць. Сяляне выконвалі дадатковую павіннасць за наданне ім дадатковых прыбыткаў, напрыклад, за права рыбнай лоўлі, лясных промыслаў, здабыванне вапны і да т. п. Па патрабаванні памешчыка сяляне прыносілі ўсялякія «даніны» ягадамі, грыбамі, мёдам, прадзівам, палатном і інш. З развіццём памешчыцкага прадпрымальніцтва эксплуатацыя сялян прыняла яшчэ больш цяжкія формы. Палявыя працы на панскім засеўку суправаджаліся напружанай працай прыгонных на памешчыцкіх мануфактурах. Яе сяляне лічылі сапраўдным бедствам, бо там іх прымушалі працаваць «ад цямна да цямна» круглы год. Як правіла, сяляне не ведалі памеры сваіх заробкаў, бо з імі не разлічваліся.

Становішча дзяржаўных сялян было крыху лепей, чым памешчыцкіх. Яны належалі казне і афіцыйна зваліся «вольнымі сельскімі абывацелямі». У адрозненне ад сялян, якія жылі ва ўнутраных расійскіх губернях і знаходзіліся на «чыншавым становішчы», беларускія дзяржаўныя сяляне заставаліся на «гаспадарчым становішчы». Яно праяўлялася ў тым, што казённыя маёнткі пераважна здаваліся ў арэнду (часта на кароткі тэрмін) памешчыкам з ліку мясцовых землеўладальнікаў ці буйным службоўцам. Як правіла, сяляне адбывалі ў такіх маёнтках паншчыну, часовыя арандатары і ўладальнікі падвяргалі іх эксплуатацыі, больш моцнай, чым памешчыкі. «Уменне прыгнятаць сялян працамі ператварылася ў Беларусі ў найтоншае палохаючае чалавецтва мастацтва», – гаварылася ў ананімнай нататцы, прыкладзенай да матэрыялаў рэвізіі 1836–1840 гг. з нагоды становішча дзяржаўных сялян.

Аднак, нягледзячы на панаванне паншчыннай сістэмы і прыгонную залежнасць, сялянскія гаспадаркі паступова злучаліся з рынкам. Пра гэта сведчыць рост колькасці кірмашоў, у тым ліку аднадзённых, на якіх сяляне прадавалі прадукты сваіх гаспадарак. Галоўным чынам на продаж паступала скаціна-маладняк, сала, аўчыны, палатно, бульба, грыбы, ягады і да т. п., а вось хлеб амаль не прадаваўся.

Гаспадарка сялян была вельмі прымітыўнай. Жывёлы не хапала, глеба ўгнойвалася слаба, ураджаі былі нізкімі. У пошуках выйсця з гэтага становішча частка сялян займалася промысламі, гандлем і іншымі дадатковымі заробкамі.

Дзяржаўныя сяляне Віцебскай губерні займаліся вырабам і продажам ільну, які не толькі выраблялі ў асабістых гаспадарках, але і скуплялі

ў іншых сялян. На мясцовых рынках прадаваліся і вырабы хатніх промыслаў. Гандлёвыя сувязі сялянскай гаспадаркі з рынкам мелі аднабаковы характар: сяляне больш прадавалі, чым куплялі. Амаль усе атрыманыя грошы ішлі на выплату дзяржаўных падаткаў.

У першай палове XIX ст. сярод сялян беларускіх губерняў адбывалася маёмаснае расслаенне. У вёсцы з'яўляліся заможныя сем'і. Па даных П. М. Шпілеўскага, у некаторых сялян Мінскай губерні было па дзесяць і болей коней, кароў, меўся статак авечак і бараноў. Яны выкарыстоўвалі наёмную працу. Нязначная частка заможных сялян займалася гандлем, падрадамі, арандавала млыны, корчмы. У Мінскай губерні ў 1830–40-я гг. зямлю ў асабістай уласнасці мелі не болей за 50 сялян. Адначасова ішло павелічэнне колькасці збяднелых сялян-бабылёў.

Да 1840-х гг. працэс разлажэння феадальнай прыгоннай гаспадаркі паглыбіўся, перарос у агульны крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы. У беларускіх губернях крызіс праявіўся ў паніжэнні ўраджайнасці, памяншэнні пагалоўя жывёлы, зніжэнні прыбытку памешчыцкіх маёнткаў, росце недаімак. Урад быў вымушаны прызнаць факт цяжкага эканамічнага становішча беларускіх губерняў, пра што сведчыць уласнаручная прыпіска імператара Мікалая І. Яна была зроблена ім на дакладзе віцебскага, магілёўскага і смаленскага генерал-губернатара і акцэнтавала ўвагу на жудасным становішчы губерняў, на тым, што аднымі законнымі сродкамі ўзняць край было немагчыма – патрабаваліся экстранныя і крутыя меры.

Адным з паказчыкаў нарастаючага крызісу існуючай сістэмы быў сялянскі рух. У 1800–1839 гг. у Беларусі зафіксавана (акрамя ўцёкаў) 160 сялянскіх хваляванняў, якімі было ахоплена 147 маёнткаў і звыш 200 паселішчаў. 37 выступленняў было задушана ваеннай сілай. У 1840–1860 гг. адбылося (без уцёкаў) 350 хваляванняў: 330 – у маёнтках і 380 – у паселішчах. У 32 выпадках для іх спынення выклікалася войска. Абсалютная большасць хваляванняў (416, або 81,6 %) прыпадала на панскія маёнткі. Паглыбленне антаганізму паміж сялянствам і памешчыкамі было выклікана ўзмацненнем прыгонніцкага ўціску, якое выражалася ў павелічэнні памераў паншчыны і чыншу, захопе сялянскіх надзелаў, гвалтоўным перасяленні сялян на неўрадлівыя землі, пераводзе на вотчынныя фабрыкі, жорсткім абыходжанні прыгоннікаў, аканомаў, арандатараў. Асаблівасцю сацыяльных супярэчнасцей на Беларусі з'яўлялася іх перапляценне з нацыянальна-рэлігійнай варожасцю паміж сялянамі і панамі.

Барацьба сялян супраць прыгнёту вялася ў розных формах (скаргі, «іскі аб вольнасці», адмова ад выканання павіннасцей, уцёкі, супраціўленне вотчыннай паліцыі і войску). Павялічыліся выпадкі забойства прыгоннымі сваіх паноў і аканомаў маёнткаў. У 1840 г. былі забіты па-

мешчыкі Магілёўскай губерні Рымша, Солтан і памешчыкі Віцебскай губерні Радзевіч, Таргонскі і інш. Распаўсюджанай формай пратэсту быў пошук сялянамі «вольных зямель». Яны верылі, што ёсць месцы, дзе людзі жывуць вольна. Таму часта сяляне гуртам накіроўваліся на пошукі лепшай долі. У пачатку 1840-х гг. 1200 прыгонных Беліцкага павета Магілёўскай губерні пакінулі сваё жыллё і накіраваліся на пасяленне ў Херсонскую, Екацярынаслаўскую губерні і Бесарабію. Для вяртання іх на радзіму была паслана ваенная каманда.

У канцы 1840-х гг. сярод сялян Беларусі шырока распаўсюдзіліся чуткі, што рыхтуецца адмена прыгоннага права. У сувязі з гэтым сяляне пачалі часцей уцякаць ад памешчыкаў. У 1847 г. каля 10 000 сялян Віцебскай губерні групамі па 200—300 чалавек накіроўваліся на будаўніцтва Мікалаеўскай чыгункі, спадзеючыся, што, адпрацаваўшы там тры гады, яны будуць вызвалены ад прыгоннай залежнасці.

Большая частка хваляванняў у 1847—1848 гг. была звязана з увядзеннем у беларускіх губернях інвентароў. Абурэнне сялян выклікаў той факт, што замест чакаемай «волі» з'явіліся інвентары, якія пацвярджалі захаванне прыгонніцтва. Мелі месца выпадкі, калі выступленні сялян былі звязаны з прапагандысцкай антыўрадавай дзейнасцю рэвалюцыйна настроенай шляхты. Сялянскія выступленні сталі асаблівай пагрозай у сувязі з актывізацыяй польскага нацыянальнага руху і барацьбой галіцыйскіх сялян за сваю свабоду. Барацьба дзяржаўных і памешчыцкіх сялян за паляпшэнне свайго становішча прымусіла ўрад змяніць сялянскую палітыку ў Беларусі і пайсці на адмену прыгону.

## СТРУКТУРА І ФОРМЫ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАМЫСЛОВАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

Новы, капіталістычны спосаб вытворчасці фарміраваўся перш за ўсё ў прамысловасці. У дарэформеннай Беларусі асноўнымі прадпрыемствамі былі мануфактуры, гаспадары якіх — памешчыкі — прымушалі працаваць на іх прыгонных сялян. Акрамя таго, у гарадах і мястэчках мелася шмат розных дробных прадпрыемстваў і майстэрняў, гаспадарамі якіх былі купцы, мяшчане. Прамысловыя вырабы збываліся ў асноўным на мясцовым рынку.

Дакладных звестак пра колькасць вытворчых прадпрыемстваў Беларусі першай паловы XIX ст. няма, бо яна ўвесь час змянялася. Да таго ж у склад прадпрыемстваў нярэдка пад назвай «фабрык» уключаліся саматужныя майстэрні з двума-трыма рабочымі. Колькасць такіх прадпрыемстваў часта змянялася, яны лёгка ўзнікалі і хутка знікалі, не маючы матэ-

рыяльнай базы. І ўсё ж архіўныя даныя дазваляюць прасачыць не толькі дынаміку колькасці прамысловых прадпрыемстваў у дарэформенны перыяд, але і змены характару вытворчасці ад простага таварнага, заснаванага на феадальных адносінах, да мануфактурнага і фабрычна-заводскага з шырокім ужываннем вольнанаёмнай працы. У перыяд з 1800 па 1829 г. у Беларусі налічвалася 346 прамысловых прадпрыемстваў (264 дробнатаварныя).

Побач з прыгонніцкімі мануфактурамі ў гэты час з’яўляюцца прадпрыемствы, заснаваныя на вольнай працы. На суконнай мануфактуры Любамірскіх у мястэчку Дуброўна Магілёўскай губерні ў 1814 г. быў 261 вольнанаёмны рабочы, на суконнай мануфактуры віцебскага мешчаніна Рубанека – 221. У 50-х гг. XIX ст. значная колькасць вольнанаёмных працавала на цукровых мануфактурах. Так, у 1859 г. на цукровай мануфактуры памешчыка Гомельскага павета Пашкевіча мелася 140 вольнанаёмных, у князя Паскевіча-Эрыванскага – 200, у памешчыцы Чэрыкаўскага павета Комар – 200 і г. д.

Але большасць вольнанаёмных былі прыгоннымі, якіх паны на кароткі тэрмін адпускалі на заробкі. Ва ўмовах пануючай у дарэформеннай Беларусі паншчыннай сістэмы кантынгент такіх вольнанаёмных быў вельмі абмежаваным. Адпушчаныя на кароткі тэрмін прыгонныя не маглі задаволіць патрэбы прамысловасці, якая развівалася і мела попыт на сталых кваліфікаваных майстроў і працоўных. Прыгоннае права, якое перашкаджала ўзнікненню беспрацоўя, стварала сур’ёзныя перашкоды для развіцця капіталістычнай прамысловасці.

Новай з’явай у прамысловым развіцці Беларусі было выкарыстанне на асобных прадпрыемствах машын і паравых рухавікоў. У 1859 г. на цукровым заводзе князя Паскевіча ў Гомелі дзейнічалі дзве паравыя машыны. На цукровым заводзе памешчыцы Комар працавалі тры паравыя катлы магутнасцю ў 60 конскіх сіл, тры гідраўлічныя прэсы для выціскання соку, механічная цёрка. На жалезаапрацоўчым заводзе Бенкендорфа ў сяле Старынцы Чэрыкаўскага павета дзейнічалі: адна доменная печ, тры паліўныя печы, паравы молат, свідравальныя і паравыя машыны.

Крайчанская суконная мануфактура (Вілейскі павет Мінскай губерні) была ўладкавана ва ўсім па прыкладзе замежных і не толькі не саступала, але і была ў вельмі добрым супраць іх выглядзе. Усе машыны, станкі, лясы і г. д. былі выпісаны з-за мяжы, выраб сукон, пачынаючы з валяння, ажыццяўляўся пры вялікай колькасці вады ў рацэ пры дапамозе механізма, якім кіравала кола млына, а пры недастатковасці адной – сілаю пара, які прыводзіў у рух усе машыны. Паказальна, што гэтая мануфактура грунтавалася на прыгоннай працы.

Аднак колькасць прадпрымальнікаў, якія ўкаранялі машынную тэхніку, была нязначнай, бо большасць з іх з'яўляліся памешчыкамі. Тым не менш ужо з 1830-х гг. больш за палову прадпрыемстваў у пяці беларуска-літоўскіх губернях належала купцам і мяшчанам.

Размяшчэнне прамысловых прадпрыемстваў па беларускіх губернях было вельмі нераўнамерным. У канцы 1850-х гг. на прадпрыемствах Гродзенскай губерні працавала больш за палову ад усёй колькасці рабочых Беларуска-Літоўскага краю – 5112 з 9714. У Магілёўскай губерні на прадпрыемствах былі 1882 рабочыя. На апошнім месцы знаходзілася Мінская губерня, на прадпрыемствах якой працавала 815 рабочых.

Найбольшых поспехаў у першай палове XIX ст. дасягнула суконная прамысловасць. Суконныя прадпрыемствы пастаўлялі сваю прадукцыю арміі, таму ўрад быў зацікаўлены ў іх развіцці. У цыркуляры міністра ўнутраных спраў у 1808 г. указвалася на неабходнасць павелічэння колькасці суконных мануфактур у Беларусі. Для заахвочвання прадпрымальнікаў ім даваліся дзяржаўныя пазыкі. Таксама была зроблена спроба дапамагчы ўладальнікам пераадолець цяжкасці ў найме працоўнай сілы. Міністр унутраных спраў А. Б. Куракін рэкамендаваў выкарыстоўваць цяжкае матэрыяльнае становішча яўрэйскай беднаты, спрабаваць стымуляваць рознымі льготамі вольны наём; у выпадку ж няўдачы прымушаць яўрэяў да найму на суконных фабрыках. Адпаведна з указаннем А. Б. Куракіна, віцебскі губернатар прапанаваў кагалам (яўрэйскім абшчынам) тэрмінова прадставіць імянныя спісы беднякоў, каб зрабіць усё магчымае для адпраўлення іх на фабрыкі. Але, нягледзячы на ўсе меры, павялічыць колькасць суконных фабрык да вайны 1812 г. так і не ўдалося.

Найбольш прыкметнымі поспехі суконнай прамысловасці сталі ў сярэдзіне XIX ст. У 1861–1863 гг. у пяці беларуска-літоўскіх губернях налічвалася ўжо 64 суконныя прадпрыемствы, на якіх працавала звыш 51 тыс. рабочых. Разам яны выпускалі прамысловай прадукцыі амаль на 3 млн р. Суконная прамысловасць была ў асноўным сканцэнтравана ў Гродзенскай губерні, дзе ў гэты час знаходзілася 55 прадпрыемстваў, на якіх працавала 85,5 % рабочых з гэтай сферы.

Другое месца ў прамысловасці Беларусі займала вытворчасць вырабаў з воўны. У 1857 г. у пяці беларускіх губернях было сем прадпрыемстваў (усе яны знаходзіліся ў Гродзенскай губерні), на іх працавалі 1444 чалавекі, якія выраблялі штогод 441 630 аршынаў воўны.

Сярод заводаў Беларусі значнае месца займалі папяровыя, шкляныя, чыгунныя, медзеплавільныя, жалезаапрацоўчыя, цагельныя і інш.

Жалезаапрацоўчыя прадпрыемствы працавалі на мясцовай сыравіне. Жалеза здабывалі з балотнай руды. Шкляная прамысловасць была найбольш развіта ў Магілёўскай губерні, дзе знаходзілася 8 з 14 заводаў, якія існавалі ў Беларусі. На іх працавалі 433 рабочыя і выпускалася больш за 90 % усёй прадукцыі шкляной прамысловасці.

З пачатку 30-х гг. XIX ст. прамысловасць Беларусі перажывала крызіс, што было звязана з узмацненнем крызісу ўсёй прыгонніцкай сістэмы. Прамысловасць адчувала востры недахоп у працоўнай сіле і асабліва ў людзях, якія валодалі тэхнічнымі ведамі.

У 1830-я гг. частка прадпрымальнікаў пачала ствараць цукровыя прадпрыемствы. «Цукровая гарачка» на Беларусі назіралася галоўным чынам у Мінскай і Магілёўскай губернях. У 1833 г. у Карэлічах пачаў дзейнічаць цукровы завод, на якім працавалі 150 рабочых. У Бабруйскім павеце ў маёнтку Дабосна на цукровым заводзе памешчыка Булгака ў 1839 г. было арганізавана спецыяльнае таварыства. Статут таварыства, якое павінна было садзейнічаць развіццю мясцовай цукровай прамысловасці, быў зацверджаны Камітэтам міністраў. Гэта таварыства ставіла сваёй мэтай пабудаваць у Бабруйску цукровы завод «вялікіх памераў». На будоўлю завода было выдаткавана 60 тыс. р., але па нейкіх прычынах яна не была завершана.

Цукровыя заводы ў асноўным грунтаваліся на вольнанаёмнай працы. Некаторыя з іх мелі паравыя рухавікі. На цукровым заводзе памешчыка Скірмунта ў Парэччы Пінскага павета быў паравы рухавік, а ўсе рабочыя былі вольнанаёмныя (толькі на палях, дзе вырошчвалі буракі, працавалі прыгонныя). Завод выпрабляў 900 пудоў цукру ў год.

У 1857 г. на Беларусі дзейнічала 13 цукровых заводаў, якія штогод выраблялі 12,5 тыс. пудоў цукру. На іх працавалі 1164 рабочыя. Цукар, які выпрабляўся на беларускіх прадпрыемствах, не толькі прадаваўся на мясцовым рынку, але і вывозіўся ў Маскву.

Аднак «цукровая гарачка» працягвалася нядоўга. Неакрэплыя цукровыя заводы Беларусі не вытрымалі канкурэнтнай барацьбы з больш буйнымі прадпрыемствамі Расіі, Украіны і Польшчы і ў сярэдзіне 60-х гг. XIX ст. спынілі сваё існаванне.

## УЗРАСТАННЕ РОЛІ ГАРАДОЎ І МЯСТЭЧАК. ГАНДАЛЬ. КІРМАШЫ. БУДАЎНІЦТВА ДАРОГ І КАНАЛАЎ

Працэс разлажэння феадальна-прыгонніцкіх адносін знайшоў сваё адлюстраванне ў змяненні складу насельніцтва Беларусі, галоўным чынам у росце долі гарадскіх жыхароў. Назіраўся хуткі рост гарадоў як гандлёва-

прамысловых цэнтраў. У 1825 г. у пяці беларускіх губернях вызначыліся 69 гарадоў. Найбольш буйнымі з іх былі Вільна, Віцебск, Мінск, Магілёў, Гродна. У 59 гарадах колькасць жыхароў была менш за 5 тыс. Па дадзеных Цэнтральнага статыстычнага камітэта гарадское насельніцтва ўзрасло ў 1861 г. да 655,3 тыс. жыхароў супраць 261,4 тыс. у 1825 г. Гарады раслі як за кошт натуральнага прыросту, так і ў выніку прымусовага перасялення яўрэяў з памешчыцкіх маёнткаў. 70–80 % гарадскога насельніцтва складала мяшчанства (рамеснікі, дробныя гандляры), дваранства і духавенства – 6–7 %, купецтва – 2–2,5 %. У першай палове XIX ст. гарады яшчэ не сталі цэнтрамі прамысловасці, у іх працягвалі развівацца гандаль і рамяство.

Развіццё прамысловасці, рост гарадскога насельніцтва стымулявалі пашырэнне ўнутранага рынку. Гандаль на Беларусі развіваўся пераважна ў форме кірмашоў, часта з вялікім абаротам. Так, у Гродзенскай губерні налічвалася 43 кірмашы. На самым буйным з іх – Зэльвенскім – гадавы гандлёвы абарот перавышаў 1 млн р. Сярод буйных кірмашоў Беларусі вылучаліся таксама Любавіцкі ў Магілёўскай губерні, Бешанковіцкі ў Віцебскай губерні і Мінскія кантракты. Усяго на Беларусі праходзіла каля 200 кірмашоў, на якія прывозілі сельскагаспадарчыя і прамысловыя тавары не толькі з мясцовых рэгіёнаў, але і з Маскоўскай, Уладзімірскай, Ніжагародскай губерняў, Украіны, Польшчы, Прусіі і інш. У Беларусь увозілі воўну, металічныя вырабы, галантарэю і г. д. Цікава адзначыць паступовае змяненне асартыменту прывезеных тавараў. Напрыклад, на Стаўпянскую прыстань у 1827 г. прывозілі пераважна прадметы раскошы: парцалянавы і фаянсавы посуд, крышталь, люстэркі, дарагое віно, а ў 1850-х гг. выгружалі пераважна чыгунныя вырабы, свінец, волава, паперу; у 1860 г. было выгружана на прыстань 19,7 тыс. пудоў чыгуну.

У развіцці гандлю важную ролю адыгрывалі суднаходныя рэкі: Бярэзіна, Прыпяць, Дняпро, Сож, Заходняя Дзвіна, Нёман, якія звязвалі Беларусь з балтыйскімі і чарнаморскімі партамі. На іх знаходзілася да 85 прыстаней. У 1804–1805 гг. скончылася будаўніцтва Агінскага і Бярэзінскага каналаў, якія звязалі Дняпро з Заходняй Дзвіной, Нёманам і Віслай. Хоць прапускная магчымасць гэтых каналаў была малой, яны ўсё ж мелі вялікае транспартнае значэнне. Пасля спынення напалеонаўскіх войн з Беларусі за мяжу праз Рыгу, Гданьск, Кёнігсберг адпраўлялі велізарныя баржы з таварамі. Дзякуючы каналам транспартныя перавозкі дасягнулі значных памераў. У 1861 г. у Магілёўскай губерні па Дняпры і Сожы прайшлі 1082 судны, 441 плыт, на якіх было занята 17 тыс. рабочых. У Гродзенскай губерні па суднаходных рэках прайшло 5531 судна і 7584 плыты, 772 суднарабочыя перавезлі тавараў на 8563,5 тыс. р., у Віленскай губерні прайшло 3230 судоў, 2441 плыт; на іх быў заняты 18 991 чалавек і загружалася тавару на 4471 тыс. р. Усё гэта садзейнічала

злучэнню беларускіх губерняў, а таксама забяспечвала гандлёвы абмен з Цэнтральнай Расіяй, Украінай, Прыбалтыкай і Царствам Польскім.

Вывазны гандаль Беларусі асабліва пашыраецца ў 1840–50-я гг., калі павысіліся сусветныя цэны на збожжа. Пра яго ажыўленне сведчыць павелічэнне вывазу збожжавых культур за апошнія пяць год перад рэформай. Так, калі ў 1856 г. з Беларусі вывезена 73 тыс. чвэрцей жыта, 92 тыс. чвэрцей аўса, 39 тыс. чвэрцей ячменю, то ў 1861 г. адпаведна: 318, 447, 154 тыс. чвэрцей. Такім чынам, за пяць год вываз збожжа з Беларусі павялічыўся ў 1,5 разы. Гэтаму спрыяла і паляпшэнне сродкаў сувязі, будаўніцтва дарог. Была пабудавана Маскоўска-Варшаўская шаша, якая прайшла праз тры беларускія губерні: Магілёўскую, Мінскую, Гродзенскую.

## ВЫСНОВЫ

Такім чынам, у Беларусі, як і ва ўсёй Расіі, прыгонніцкая сістэма гаспадаркі, аснову якой складала феадальная ўласнасць на зямлю, да сярэдзіны XIX ст. зжывала сябе. Аднак, нягледзячы на крызіс феадалізму, прыгонніцкія путы былі яшчэ досыць моцныя. Таму запаволеныя тэмпы эканамічнага развіцця Беларусі ў першай палове XIX ст. у значнай ступені былі абумоўлены негатыўным уплывам прыгонніцтва. Чым мацней раскладалася феадальна-прыгонніцкая сістэма, тым больш умоў ствралася для развіцця новых вытворчых адносін.

Узмацненне прыгнёту прывяло да росту сялянскіх выступленняў. Асаблівай пагрозай яны сталі ў сувязі з актывізацыяй польскага нацыянальнага руху і барацьбой галіцыйскіх сялян за сваю свабоду. Барацьба дзяржаўных і памешчыцкіх сялян за паляпшэнне свайго становішча прымусіла ўрад змяніць сялянскую палітыку ў Беларусі і пайсці на адмену прыгону.

Нягледзячы на істотныя зрухі ў прамысловасці Беларусі першай паловы XIX ст., у параўнанні з агульнарасійскай яе памеры былі нязначнымі, а тэмпы развіцця – надзвычай маруднымі. Прыгонніцкія адносіны абцяжарвалі працэс станаўлення рынку працоўнай сілы, запавольвалі назапашванне капіталаў, тэхнічны прагрэс і прамысловае развіццё. Пры гэтым у першай палове XIX ст. гарады Беларусі яшчэ не сталі цэнтрамі прамысловасці, у іх працягвалі развівацца гандаль і рамяство.

Развіццё гандлю было шчыльна звязана са станам прамысловасці, сельскай гаспадаркі, плацёжаздольнасці насельніцтва. Феадальна-прыгонная сістэма скоўвала развіццё ўсіх галін народнай гаспадаркі, абмяжоўвала пашырэнне ўнутранага рынку. Знішчэнне прыгонных адносін з’яўлялася неабходнай перадумовай далейшага эканамічнага развіцця краю.

# ПЫТАННІ

1. У якім стане знаходзілася сельская гаспадарка Беларусі ў першай палове XIX ст.?

2. Прывядзіце прыклады таго, што ў сельскай гаспадарцы Беларусі першай паловы XIX ст. зараджаліся элементы капіталістычнай арганізацыі вытворчасці.

3. Назавіце асаблівасці прамысловага развіцця Беларусі ў першай палове XIX ст.

4. Чаму гарадская прамысловасць Беларусі ў першай палове XIX ст. аказалася няздольнай да канкурэнцыі з вотчыннай?

5. Назавіце буйнейшыя гарады Беларусі сярэдзіны XIX ст.

6. Ахарактарызуйце развіццё гандлю ў беларускіх губернях у першай палове XIX ст.: формы гандлю, шляхі зносін, прадметы экспарту і імпарту.

# 4

# БЕЛАРУСЬ У ЧАС ВАЙНЫ 1812 г.

## РАСІЙСКА-ФРАНЦУЗСКІЯ АДНОСІНЫ І ПАЛІТЫЧНАЯ СІТУАЦЫЯ НА БЕЛАРУСІ НАПЯРЭДАДНІ ВАЙНЫ 1812 г.

На пачатку XIX ст. на Еўрапейскім кантыненце склалася напружанае міжнароднае становішча. Кожная з пяці вялікіх дзяржаў таго часу – Францыя, Вялікабрытанія, Расія, Аўстрыя і Прусія – прэтэндавала на панаванне ў Еўропе. Але ініцыятывай валодала буржуазная Францыя, якая з прыходам да ўлады Напалеона Банапарта (1799 г., з 1804 г. – імператар) усталёўвала кантроль над усё новымі тэрыторыямі. З гэтым не маглі пагадзіцца іншыя краіны, якія з мэтай захавання свайго прыярытэтнага становішча і аднаўлення ў Еўропе феадальных рэжымаў аб'ядноўваліся ў антыфранцузскія кааліцыі. Галоўнай ваеннай сілай гэтых кааліцый была Расія.

У 1806 г. была створана чацвёртая антыфранцузская кааліцыя (тры першыя былі разгромлены Напалеонам у 1797, 1800 і 1805 гг.), у якую ўвайшлі Вялікабрытанія, Прусія, Расія і Швецыя. У кароткі тэрмін Напалеон I здолеў нанесці саюзнікам шэраг параз і ўжо ў канцы 1806 г. вывеў з вайны Прусію. Пасля гэтага асноўны цяжар барацьбы з Францыяй лёг на плечы Расіі. Але 2 (14) чэрвеня 1807 г. пад Фрыдландам (зараз г. Праўдзінск Калінінградскай вобл.) была разбіта і расійская армія. У такіх умовах імператар Аляксандр I быў вымушаны пагадзіцца на перамір'е.

13 (25) чэрвеня 1807 г. каля Тыльзіта (зараз г. Савецк Калінінградскай вобл.) адбылася сустрэча двух імператараў. У выніку перамоў 25 чэрвеня

(7 ліпеня) быў падпісаны мірны дагавор і саюзны трактат. Згодна з дагаворам Расія прызнала ўсе захопы Напалеона ў Еўропе, а яго самога – імператарам і ўступала ў саюз з Францыяй. Акрамя таго, яна абавязвалася спыніць усе стасункі з Вялікабрытаніяй і далучыцца да кантынентальнай блакады. І ўрэшце Аляксандр І быў вымушаны пагадзіцца на стварэнне з прускай часткі былой Рэчы Паспалітай Княства (Герцагства) Варшаўскага.

Тыльзіцкі дагавор супярэчыў інтарэсам Расіі, паколькі падрываў яе эканамічную аснову – гандаль з Вялікабрытаніяй, і прымушаў яе ісці ў фарватары французскай знешняй палітыкі. Праўда, пры пасрэдніцтве Напалеона І дагавор спыняў вайну з Турцыяй (пачалася ў 1806 г.), надаваў Расіі свабоду дзеянняў супраць Швецыі і далучаў да яе Беластоцкую вобласць. Але гэтыя ўмовы значылі не больш чым тры лыжкі мёду ў бочцы дзёгцю. У цэлым Тыльзіцкі дагавор быў цяжкім і зневажальным для Расіі, што вяло да росту незадаволенасці ім у краіне, уключаючы ўрадавыя колы.

На працягу 1808–1810 гг. адносіны паміж Расіяй і Францыяй паступова пагаршаліся, нягледзячы на ўсе спробы Напалеона І захаваць саюз. Кантынентальная блакада Вялікабрытаніі з кожным днём усё больш падрывала эканоміку Расіі, з чым яна не магла мірыцца. Усё часцей Аляксандр І дазваляў сваім гандлярам парушаць тыльзіцкія ўмовы, што выклікала незадавальненне Напалеона І. У выніку канфлікт паміж Расіяй і Францыяй з-за кантынентальнай блакады паступова вёў да вайны. Яе развязванне паскорылі руска-французскія супярэчнасці ў палітычных пытаннях рознага ўзроўню. Самым вострым з іх было пытанне пра гегеманісцкія амбіцыі бакоў.

Напалеон І не хаваў сваіх прэтэнзій на сусветнае панаванне. Да 1812 г. ён паспеў разграміць чарговую, пятую антыфранцузскую кааліцыю (Вялікабрытанія і Аўстрыя, 1809 г.) і знаходзіўся ў зеніце магутнасці і славы. Шлях да панавання над Еўропай перашкаджалі яму толькі Вялікабрытанія і Расія. Галоўным ворагам ён лічыў Вялікабрытанію, якая была адзінай краінай у свеце, больш развітай у эканамічным плане, чым Францыя. Адолець яе Напалеон І мог толькі пасля таго, як паставіў бы ў залежнасць ад сябе Еўрапейскі кантынент. На кантыненце ж адзіным супернікам Францыі заставалася Расія. Усе астатнія дзяржавы былі або павер承жанымі Напалеонам І, або блізкімі да гэтага (як Іспанія). Тэрыторыяй васальнага Княства Варшаўскага Францыя непасрэдна гранічыла з Расіяй.

А што Расія? Ці была яна толькі аб'ектам і ахвярай напалеонаўскай агрэсіі? Здаецца, што не. Расійская імперыя сама імкнулася калі не да сусветнай, дык да еўрапейскай гегемоніі і прыклала для гэтага шмат намаганняў у час кааліцыйных войн 1799–1807 гг. Пасля шэрагу параз

і падпісання Тыльзіцкага міру імператара ніколі не пакідала думка пра рэванш. Ва ўрадзе прыхільнікі саюзу з Францыяй (міністр замежных спраў М. П. Румянцаў, дзяржаўны сакратар М. М. Сперанскі і інш.) пастаянна былі ў меншасці і абапіраліся выключна на асабістую падтрымку Аляксандра І. Расійскі імператар шырока выкарыстоўваў магчымасці саюзу з Францыяй для знешняй экспансіі: на працягу 1808—1812 гг. да Расіі былі далучаны Фінляндыя, Тарнопальская вобласць і Бесарабія.

Стварэнне Княства Варшаўскага вывела на палітычную арэну «польскае пытанне». У пачатку XIX ст. яно фактычна стала адной з галоўных еўрапейскіх праблем. Нават сама пастаноўка пытання аб дзяржаўнасці на землях былой Рэчы Паспалітай закранала інтарэсы многіх краін, і ў першую чаргу Аўстрыі, Прусіі і Расіі.

Упершыню «польскае пытанне» паўстала яшчэ ў канцы XVIII ст., у час рэвалюцыйных войн буржуазнай Францыі з феадальнымі манархіямі Еўропы. Вызваленчыя лозунгі Французскай рэвалюцыі, узброеная барацьба з краінамі, якія падзялілі Рэч Паспалітую, не маглі не прыцягваць да Францыі позіркі палякаў. Гэта не засталося не заўважаным Напалеонам Банапартам. Ён выкарыстаў нацыянальныя настроі часткі польскай эміграцыі ў сваіх інтарэсах, стварыўшы ў 1797 г. у французскай арміі польскія легіёны. Патрыятычныя сілы разглядалі гэтыя вайсковыя адзінкі як сілу, якая ў будучым з дапамогай зброі дазволіць пракласці шлях на радзіму. І хаця ў 1801 г. легіёны былі расфарміраваны, Напалеон многімі ўжо ў той час успрымаўся як сімвал барацьбы за незалежнасць і з ім звязваліся галоўныя надзеі на аднаўленне Рэчы Паспалітай.

Напалеон І актыўна разыгрываў «польскую карту» і па-майстэрску выкарыстоўваў супярэчнасці, якія ўзнікалі паміж еўрапейскімі краінамі. «Польскае пытанне» няўхільна пагаршала расійска-французскія ўзаемаадносіны, паколькі Княства Варшаўскае разглядалася Напалеонам І як магчымы плацдарм супраць Расіі. У мэтах асадзіць Аляксандра І за нявернасць Тыльзіту імператар французаў неаднаразова пагражаў аднавіць Рэч Паспалітую ў межах 1772 г. Гэтыя пагрозы нервавалі расійскі ўрад. Вырашальную ролю ў пагаршэнні расійска-французскіх адносін адыграла адмова Напалеона І ратыфікаваць падпісаную ў Санкт-Пецярбургу 23 снежня 1809 г. (4 студзеня 1810 г.) канвенцыю, якая забараняла б аднаўленне польскай дзяржавы.

Пасля заключэння Тыльзіцкага міру ў заходніх губернях Расіі захоўвалася складанае палітычнае становішча, якое абвастралася неспрыяльнай эканамічнай палітыкай. Неабходнасць выконваць умовы кантынентальнай блакады падрывалі эканамічную аснову насельніцтва Беларусі, якое ў такіх умовах магло спадзявацца толькі на гандаль з Княствам

Варшаўскім і Прусіяй. Але расійскі ўрад штогод уводзіў істотныя абмежаванні ў перамяшчэнні тавараў праз заходнюю мяжу, а таму на Беларусі разгортваўся кантрабандны гандаль. Паколькі мытная варта не спраўлялася з памерамі кантрабанды, у студзені 1811 г. расійскі ўрад стварыў з казакоў другую лінію аховы заходняй мяжы.

Не спрыяла росту папулярнасці расійскага ўрада і яго фінансавая палітыка. На Беларусі амаль да вайны 1812 г. падаткі збіраліся сярэбранай манетай, што істотна павялічвала эканамічны ціск у параўнанні з іншымі губернямі імперыі. Расійскія войскі, размешчаныя ў заходніх губернях, забяспечваліся харчаваннем і фуражом рэквізіцыйным шляхам, збіраючы ўсё неабходнае ў насельніцтва пад распіскі. Таму жыхары Беларусі чакалі вайну і іх сімпатыі, у большасці, знаходзіліся на баку Напалеона I. Прафранцузскія настроі ўзмацніліся пасля вайны 1809 г.

Большая частка шляхты (сярэдняя і дробная) негатыўна адносілася да расійскіх уладаў. Некалі прывілеяваныя колы грамадства ў складзе Расійскай імперыі былі істотна абмежаваны ў палітычных правах і даказвалі сваю дваранскую годнасць. Таму свой матэрыяльны дабрабыт шляхта звязвала з пытаннем адраджэння ўласнай дзяржавы. Сярод гэтай часткі шляхецкага асяродку з сімпатыяй ставіліся да Францыі – традыцыйнага саюзніка былой Рэчы Паспалітай. Францыя дала прытулак многім эмігрантам, частка якіх добраахвотна пайшла ў французскую армію. Значны ўплыў на пазіцыю шляхты аказалі і заявы Напалеона I аб магчымасці ўзнаўлення польскай дзяржавы. Стварэнне ў 1807 г. Княства Варшаўскага і пашырэнне яго тэрыторыі пасля аўстра-французскай вайны 1809 г. успрымаліся грамадствам як сведчанне сур'ёзных намераў імператара.

У час вайны 1809 г. значная колькасць шляхецкай моладзі эмігравала ў Княства Варшаўскае і паступала на службу ў польскае войска. 16 ліпеня 1809 г. стацкі саветнік А. Сталыпін паведамляў князю А. Куракіну, што дваранства, шляхта і ўсе, хто можа насіць зброю, з усіх мясцін беглі ў Княства Варшаўскае. Гэта ўяўляла прыклад беспакаранасці і падбухторвала жыхароў, якія гарэлі жаданнем аднавіць «Польшчу».

Каб спыніць адток насельніцтва і грашовых сродкаў у Княства Варшаўскае, у 1809–1810 гг. была прынята заканадаўчая база і распрацаваны практычны механізм ажыццяўлення секвестра маёнткаў тых шляхцічаў, якія незаконна пакінулі межы Расійскай імперыі. Але, нягледзячы на суровыя прыгаворы, рэпрэсіі толькі на нейкі час спынілі эміграцыю. Выкарыстоўваючы нерашучасць правячых колаў імперыі, многія ўцекачы здолелі выратаваць ад канфіскацыі свае маёнткі, нават тыя, на якія быў накладзены арышт.

Невыпадкова мясцовая шляхта ўсяляк перашкаджала правядзенню падрыхтоўкі да вайны 1812 г. Яна ўхілялася ад таго, каб даваць рабочую сілу, коней, падводы, зрывала пастаўкі харчавання ў ваенныя магазіны (склады). Так, у канцы 1810 г. бабруйскі гараднічы даносіў у Мінскую казённую палату, што сярод бабруйскіх дваран няма нікога, хто б згадзіўся на пастаўку правіянту і фуражу. А сучаснік-вайсковец напярэдадні вайны 1812 г. адзначаў, што ў час нарыхтоўкі фуражу ў Гродзенскай губерні сустракаліся «вялікія цяжкасці». Мясцовыя «паны» добраахвотна нідзе не давалі нават сена, якое даводзілася забіраць у іх «амаль што сілай». Супрацоўнічала шляхта і з польска-французскай разведкай.

У апазіцыі да расійскага ўрада знаходзіліся каталіцкія і ўніяцкія святары. Яны звязвалі з будучай вайной свае спадзяванні на аднаўленне ролі каталіцкай царквы ў грамадскім і палітычным жыцці краю. Таму нярэдка святары распаўсюджвалі антыўрадавыя чуткі і вялі патаемную антырасійскую прапаганду.

Большая частка «сельскіх абывацеляў» таксама была незадаволена сваім становішчам. І хаця сяляне бездакорна выконвалі ўзрастаючыя павіннасці (будаўніцтва ўмацаванняў, перавозка правіянту і г. д.), нават яны чакалі ад будучай вайны перамен. Вяскоўцы звязвалі з Напалеонам І свае спадзяванні на скасаванне прыгону (па прыкладзе Княства Варшаўскага). У той жа час расійскія ўлады не ўлічвалі гэтыя настроі. У селяніне яшчэ не бачылі «палітычнай» сілы, а таму пытанне пра скасаванне прыгонніцтва на Беларусі не знаходзіла падтрымкі ў кіраўніцтва Расіі. Сялянская маса разглядалася царызмам толькі як сродак для папаўнення казны падаткамі і як «гарматнае мяса» для арміі.

На беларускіх землях урад мог разлічваць на падтрымку толькі абмежаваных колаў грамадства. Пэўную лаяльнасць да ўлады праяўляла частка мясцовых буйнейшых памешчыкаў, што тлумачылася бояззю страты свайго багацця. Яны насцярожана адносіліся да буржуазных рэформ у Княстве Варшаўскім. Асаблівую заклапочанасць выклікала адмена прыгоннага права. Для многіх імя Напалеона было непарыўна звязана з французскай рэвалюцыяй, якая знішчыла ўсе феадальныя інстытуты.

На баку ўрада былі сімпатыі праваслаўнага духавенства і чыноўніцтва. Але гэтыя колы не маглі ўплываць на становішча ў Беларусі: з пачаткам вайны 1812 г. большасць рускіх чыноўнікаў і праваслаўных святароў пакінулі «польскія правінцыі».

Заставалася яшчэ насельніцтва беларускіх гарадоў, якое складалася пераважна з яўрэяў. І хаця мяшчане-іўдзеі не выказвалі сімпатый Напалеону І, расійскі ўрад не зрабіў нічога, каб перацягнуць іх на свой бок. Абмежавальныя законы, увядзенне рысы аседласці, перасяленне ў гарады,

падвоеныя падаткі – усё гэта сведчыла пра тое, што ў царызму не было прадуманай праграмы ў дачыненні да яўрэяў. У выніку расійскі ўрад меў абмежаванае кола «саюзнікаў» на беларускіх землях у час будучай вайны.

## ПАДРЫХТОЎКА ДА ВАЙНЫ І ПЛАНЫ АДНАЎЛЕННЯ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

Расія пачала падрыхтоўку да вайны амаль адначасова з Францыяй. У студзені 1810 г. ваенным міністрам замест графа А. А. Аракчэева быў прызначаны генерал М. Б. Барклай дэ Толі. Ён распрацаваў буйнамаштабную праграму павелічэння колькасці войск, удасканалення арганізацыі і павышэння баяздольнасці арміі, ажыццявіў шэраг мер па падрыхтоўцы тэатра ваенных дзеянняў. З сакавіка 1810 г. на тэрыторыі Беларусі разгарнуліся шматлікія рэкагнасцыроўкі і работы па картаграфаванні і ваенна-інжынерным даследаванні мясцовасці. У першую чаргу вывучаліся раёны ўздоўж Заходняй Дзвіны, Дняпра і Бярэзіны, дзе планавалася стварыць асноўную лінію абароны. У гэты ж час пачалося будаўніцтва крэпасцей у Дынабургу (цяпер Даўгаўпілс, Латвія) і Бабруйску, умацаванняў у Барысаве, Рагачове, Себежы і інш. У кастрычніку 1810 г. пачалі фарміравацца новыя для расійскай арміі пастаянныя злучэнні – пяхотныя карпусы і кавалерыйскія дывізіі. На працягу 1810–1812 гг. агульная колькасць узброеных сіл Расіі з улікам ірэгулярных, гарнізонных і вучэбных часцей узрасла з 610 тыс. да 975 тыс. чалавек.

У 1810–1812 гг. Аляксандру І было прадстаўлена некалькі дзясяткаў розных планаў вайны. Большасць з іх мела наступальны характар. Таму, калі інтарэсы саюзнікаў востра сутыкнуліся ў «польскім» і «германскім» пытаннях, Расія не раз рыхтавалася да нанясення першага ўдару.

Абвастрэнне сітуацыі вакол герцагства Альдэнбург і яго захоп Напалеонам І (люты 1811 г.) падштурхнулі Аляксандра І да падрыхтоўкі наступальнай вайны. Расійскі імператар меў намер уключыць у новую кааліцыю Прусію і Данію. Паколькі расійская армія планавала сустрэцца з праціўнікам у Вісла-Одэрскім міжрэччы, узнікла праблема і Княства Варшаўскага. Каб не пакідаць у тыле арміі варожую дзяржаву, Аляксандр І зрабіў пэўныя намаганні, каб перацягнуць княства на свой бок. У лютым 1811 г. ён накіраваў у Варшаву А. Чартарыйскага, які павінен быў высветліць настроі грамадства княства, заручыцца падтрымкай найбольш уплывовых палякаў на выпадак вайны і паспрабаваць перацягнуць на бок Расіі галоўнакамандуючага польскай арміяй князя Ю. Панятоўскага. Узамен на далучэнне да кааліцыі імператар абяцаў адраджэнне Польскага Каралеўства з уключэннем у яго склад заходніх губерняў сваёй імперыі

і ўвядзенне канстытуцыі 3 мая 1791 г. Манархам Польскага Каралеўства павінен быў стаць сам Аляксандр I.

У выпадку згоды на такі план Расія абвяшчала Княству Варшаўскаму фіктыўную вайну, у выніку якой тое павінна было «капітуляваць», а затым выступіць супраць Францыі. Для забеспячэння нейтралітэту Аўстрыі апошняй былі абяцаны Валахія і Малдавія. Але місія А. Чартарыйскага правалілася: большасць насельніцтва Княства Варшаўскага варожа адносілася да Расіі, а Ю. Панятоўскі, калі яму стала вядома пра планы Аляксандра I, неадкладна паведаміў пра іх Напалеону I. Для адбіцця магчымага нападу на Княства Варшаўскае спешна пачаў фарміравацца 1-ы Эльбскі корпус Л. М. Даву. I таму ад ідэі адраджэння Польскага Каралеўства расійскі бок адмовіўся.

Калі стала зразумела, што наступальны план не атрымаецца рэалізаваць, расійскі імператар спыніўся на абарончым варыянце вайны свайго саветніка генерала К. Фуля. Згодна з гэтым варыянтам 1-я Заходняя армія павінна была заняць умацаваны лагер каля г. Дрыса (цяпер — Верхнядзвінск Віцебскай вобл.; будаўніцтва лагера пачалося ў красавіку 1812 г.), прыкрыць напрамкі на Маскву і Санкт-Пецярбург і прыняць на сябе галоўны ўдар французаў. Тым часам 2-я Заходняя армія павінна была дзейнічаць на фланг і ў тыл праціўніка.

Гэты план быў сугучны з прапановамі М. Б. Барклая дэ Толі. Яшчэ ў лютым 1810 г. ён раіў у выпадку абарончай вайны адводзіць арміі ў глыб краіны, зберагаючы сілы. Пры адступленні расійскае войска павінна было пакідаць за сабой вынішчаны край. У запісцы ваеннага міністра гаварылася, што расійская армія павінна была, сустрэўшы ворага на самых межах, супраціўляцца яму ў польскіх правінцыях, пакуль не вычарпаліся б усе спосабы атрымліваць рэсурсы з зямлі. I толькі пасля адступіць на сапраўдную абарончую лінію, пакінуўшы ворагу, які б аддаляўся ад сваіх складоў, усе месцы апустошанымі, без хлеба, скаціны і сродкаў дастаўкі жыццёвых прыпасаў. Гэта было не што іншае, як «тактыка выпаленай зямлі».

Паколькі тэрыторыя Беларусі ператваралася ў ваенны тэатр, расійскі ўрад планаваў максімальна выкарыстаць фінансавыя, людскія (праз рэкруцкія наборы) і матэрыяльныя (праз рэквізіцыю харчавання і фуражу) рэсурсы. З гэтай мэтай Аляксандр I быў вымушаны пайсці на некаторую лібералізацыю палітыкі ў заходніх губернях і ініцыіраваў план стварэння аўтаномнага Вялікага Княства Літоўскага. У гісторыі ён вядомы пад назвай «плана Агінскага».

Міхал Клеафас Агінскі (1765—1833), пяру якога належыць сусветна вядомы паланэз «Развітанне з Радзімай», паходзіў з буйнога магнацка-

га роду Вялікага Княства Літоўскага. За яго плячыма былі і дыпламатычная праца, і змаганне за рэформы ў Рэчы Паспалітай, і ўзброеная барацьба супраць Расіі. У час паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі М. К. Агінскі ўваходзіў у склад Найвышэйшай рады ВКЛ, камандаваў на тэрыторыі Беларусі сфарміраваным на ўласныя сродкі атрадам. Пасля паражэння паўстання жыў у эміграцыі. У 1802 г. з яго маёнткаў быў зняты секвестр і ён вярнуўся на радзіму і пасяліўся ў Залессі каля Смаргоні. Але М. К. Агінскі не застаўся ў баку ад палітычных спраў. Ідэя аднаўлення дзяржавы не пакідала яго. Ён часта вандраваў па краінах Еўропы, сустракаўся з вядомымі палітыкамі і дыпламатамі. У выніку некалькіх гутарак з Напалеонам I М. К. Агінскі прыйшоў да высновы, што імператар французаў не надта зацікаўлены ў аднаўленні Рэчы Паспалітай. Таму свае спадзяванні на вырашэнне гэтага пытання ён звязваў з Аляксандрам I. Апошні таксама меў сімпатыі да М. К. Агінскага. Пасля адыходу ад «польскіх спраў» А. Чартарыйскага Аляксандр I спыніўся на кандыдатуры М. К. Агінскага, які павінен быў выказваць інтарэсы заходніх губерняў. У 1810 г. імператар прызначыў М. К. Агінскага сенатарам, узнагародзіў двума ордэнамі і надаў яму чын тайнага саветніка. З гэтага часу манарх неаднаразова абмяркоўваў з М. К. Агінскім розныя палітычныя пытанні. У красавіку 1811 г. падчас сустрэчы з сенатарам Аляксандр I прапанаваў яму пісьмова выказаць свае меркаванні адносна ідэі ўтварэння з заходніх губерняў асобнай правінцыі.

У маі 1811 г. М. К. Агінскі прадставіў імператару памятную запіску, у якой быў выкладзены асноўны змест плана (у яго распрацоўцы ўдзельнічалі таксама Ф. Любецкі, Л. Плятэр, Т. Ваўжэцкі і інш.). Сенатар прапанаваў утварыць з Гродзенскай, Віленскай, Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, Кіеўскай, Падольскай і Валынскай губерняў, Беластоцкай і Тарнапальскай абласцей асобную правінцыю – Вялікае Княства Літоўскае (ВКЛ) з цэнтрам у Вільні і на чале з намеснікам расійскага імператара. Для кіравання ВКЛ планавалася ўтварыць у Санкт-Пецярбургу пры імператары Літоўскую канцылярыю на чале з міністрам статс-сакратаром, а ў Вільні – Адміністрацыйную раду пад старшынствам намесніка. Асноўным грамадзянскім законам правінцыі абвяшчаўся Статут ВКЛ 1588 г., а мовай справаводства – польская мова. Для вырашэння судовых і крымінальных спраў у Вільні меркавалася стварыць вышэйшую судовую інстанцыю – Вярхоўны трыбунал. Усе дзяржаўныя пасады ў ВКЛ павінны былі займацца толькі яго ўраджэнцамі. Акрамя таго, прапаноўвалася вылучыць асігнаванні на адукацыю ў ВКЛ у спецыяльны рахунак дзяржаўнага бюджэту.

Восенню 1811 г. Аляксандр I даручыў М. К. Агінскаму скласці для ВКЛ канстытуцыю па фінскім узоры. У падрыхтаваным у студзені 1812 г. праекце асобныя палажэнні першапачатковага плана былі распрацаваны больш падрабязна. Згодна з праектам канстытуцыі ў ВКЛ прадугледжвалася стварэнне двухпалатнага сейма і паступовая ліквідацыя прыгоннай залежнасці сялян на працягу 10 гадоў. Адначасова па даручэнні імператара праводзілася работа і над планам арганізацыі асобнага войска ВКЛ у складзе ўзброеных сіл Расіі.

У запісках, накіраваных Аляксандру I у кастрычніку і снежні 1811 г., М. К. Агінскі раіў не абмяжоўвацца стварэннем ВКЛ, а прапанаваў аднавіць Польскае Каралеўства. На яго думку, такі крок выбіў бы ініцыятыву з рук Напалеона I, прымусіў палякаў бачыць у асобе Аляксандра I абаронцу іх радзімы і назаўсёды прывязаў бы іх да расійскага трона. У выпадку вайны з Францыяй імператар павінен быў прыняць польскую карону, і тады «Польшча» выступіла б на баку Расіі. Але Аляксандр I не адобрыў гэту прапанову, якая азначала развязванне вайны з Францыяй і ў той час не адпавядала абарончаму плану вайны.

У пачатку 1812 г. Аляксандр I адмовіўся ад ідэі аднаўлення ВКЛ, паколькі яе абмеркаванне выклікала моцнае незадавальненне ў рускім грамадстве. У «плане Агінскага» была ўбачана спроба расчлянення і пасаблення Расіі перад пагрозай вайны з Францыяй. Значны ўплыў на пазіцыю Аляксандра I аказала «Запіска пра старажытную і новую Расію» М. Карамзіна, у якой падверглася крытыцы знешняя і ўнутраная палітыка імператара. Манарх не мог не лічыцца з нарастаючымі кансерватыўна-нацыяналістычнымі настроямі рускага дваранства, паколькі бачыў у гэтым і асабістую небяспеку (не выключаў магчымасць палацавага перавароту). Таму ў сакавіку 1812 г. ён раптоўна адправіў у адстаўку і ссылку дзяржаўнага сакратара М. Сперанскага і адмовіўся ад афіцыйнага ўхвалення «плана Агінскага».

Нягледзячы на тое што «план Агінскага» застаўся нерэалізаваным, ён адыграў пэўную ролю ў фарміраванні ўрадавай палітыкі ў заходніх губернях. У мэтах прымярэння з мясцовай шляхтай у 1811 г. заходнія губерні былі ўраўнаваны з астатнімі расійскімі губернямі ў адносінах падаткаў. Замест розных збораў серабром на Беларусі быў уведзены агульнадзяржаўны падушны падатак асігнацыямі. Жыхары таксама атрымалі права выплачваць падаткі не грашыма, а збожжам. У маі – чэрвені 1812 г. памешчыкі Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў і Беластоцкай вобласці далі згоду на стварэнне Галоўнага камітэта вайсковых павіннасцей у Вільні, яго губернскіх і павятовых устаноў (займаліся раскладкай і пастаўкай харчавання для расійскага войска). Гэта дазволіла сканцэнтраваць у ваенных

магазінах вялізную масу збожжа (на шэсць месяцаў), якое з пачаткам вайны было наўмысна знішчана.

Але сімпатыі большасці шляхты, каталіцкага і ўніяцкага духавенства, а таксама часткі сялянства па-ранейшаму былі на баку Напалеона. Таму расійскія ўлады вясной 1812 г. звярнуліся да высылкі ў глыб імперыі «нядобранадзейных» асоб, а ў чэрвені – соцень службовых асоб мясцовага паходжання, якія валодалі інфармацыяй аб эканамічных і фінансавых магчымасцях краю. Фактычна гэтыя аперацыі ператвараліся ў схаваную дэпартацыю насельніцтва. Таму невыпадкова, што Напалеон I знайшоў на Беларусі ў час вайны 1812 г. значную палітыка-эканамічную падтрымку.

Вясной 1812 г. Расія ў чарговы раз рыхтавалася да наступальнай вайны (Аляксандр I прыбыў у Вільню ў красавіку і ўзначаліў арміі), але адсутнасць саюзнікаў стрымлівала імператара ад нанясення першага ўдару. Фактычна Напалеону I удалося палітычна ізаляваць Расію. Францыя здолела ануляваць расійска-прускі саюз (быў афармлены 5 (17) кастрычніка 1811 г. у выніку заключэння ваеннай канвенцыі) і падпісала 12 (24) лютага 1812 г. з Прусіяй і 2 (14) сакавіка з Аўстрыяй саюзныя дагаворы. Супраць Расіі была ўтворана кааліцыя еўрапейскіх краін. Але поўнай ізаляцыі Расіі Напалеон дабіцца не здолеў. 24 сакавіка (5 красавіка) Расія заключыла саюз са Швецыяй, а 16 (28) мая падпісала Бухарэсцкі мірны дагавор, якім скончылася цяжкая вайна з Турцыяй (1806–1812). Падпісанне гэтых пагадненняў дазволіла ў далейшым вызваліць і накіраваць супраць напалеонаўскай арміі корпус Ф. Ф. Штэйнгейля з Фінляндыі і Дунайскую армію.

Для нашэсця на Расію Напалеон I падрыхтаваў 647-тысячную армію. Да сярэдзіны мая Вялікая армія (La Grande Armee) была разгорнута на рубяжы Віслы. Яна складалася з трох груп карпусоў. Адну з іх узначальваў (з сярэдзіны чэрвеня) сам Напалеон I, а дзве іншыя – Эжэн Багарнэ і Жэром Банапарт. У пачатку чэрвеня 1812 г. галоўныя сілы Вялікай арміі (групы Напалеона і Э. Багарнэ, каля 300 тыс. чалавек, 735 гармат) былі сканцэнтраваны ва Усходняй Прусіі, супраць цэнтра 1-й Заходняй арміі, а група карпусоў Жэрома Банапарта (каля 70 тыс. чалавек, 159 гармат) – у раёне Варшавы і Астраленкі. На флангах размяшчаліся карпусы Ж. Э. Макдональда (каля Тыльзіта) і К. Ф. Шварцэнберга (каля Любліна).

Французская армія ўяўляла сабой вялікую моц. Яна захоўвала ўсе тыя перавагі перад феадальнымі арміямі Еўропы ў камплектаванні, навучанні і кіраванні, якія бліскуча прадэманстравала пад Аўстэрліцам (1805) і Фрыдландам (1807). Яшчэ больш грознымі сілы Вялікай арміі выглядалі ад таго, што ўзначальваў іх сам Напалеон I. Амаль усе сучаснікі (у т. л. Аляксандр I) лічылі яго самым геніяльным палкаводцам усіх часоў і народаў. Праўда, у 1812 г. Вялікая армія ўжо мела і сур’ёзныя недахопы

(шматнацыянальны склад, падзенне былога рэвалюцыйнага духу, адсутнасць многіх выдатных палкаводцаў), але гэта не рабіла яе менш магутнай.

Расія ў пачатку вайны 1812 г. здолела супрацьпаставіць Вялікай арміі толькі 317 тыс. чалавек, якія былі падзелены на тры арміі і тры асобныя корпусы. 1-я Заходняя армія (каля 120 тыс. чалавек, 580 гармат, галоўнакамандуючы генерал М. Б. Барклай дэ Толі) дыслацыравалася ў раёне Вільна і прыкрывала пецярбургскі напрамак. 2-я Заходняя армія (каля 49,5 тыс. чалавек, 180 гармат, галоўнакамандуючы генерал князь П. І. Баграціён) першапачаткова размяшчалася ў ваколіцах Луцка, а потым была значна набліжана да 1-й арміі – у раён Ваўкавыска. 3-я Абсервацыйная (рэзервовая) армія (каля 44 тыс. чалавек, 168 гармат, галоўнакамандуючы генерал А. П. Тармасаў) займала месца ў раёне Жытоміра, а ў маі была пераведзена да Луцка. Яна прыкрывала кіеўскі напрамак. Акрамя таго, у першай лініі абароны пад Рыгай знаходзіўся корпус генерала І. М. Эсена (каля 38 тыс. чалавек), а ў другой – два рэзервовыя корпусы: 1-ы – генерала Я. І. Мелер-Закамельскага (каля 27,5 тыс.) каля Тарапца і 2-і – генерала Ф. Ф. Эртэля (каля 37,5 тыс.) каля Мазыра. Флангі першых ліній прыкрывалі 19-тысячны корпус генерала Ф. Ф. Штэйнгейля ў Фінляндыі і Дунайская армія (каля 57,5 тыс., галоўнакамандуючы адмірал П. В. Чычагоў) у Валахіі. Але войскі на флангах у пачатку вайны бяздзейнічалі, таму расіяне колькасна ўступалі французам у зоне наступлення амаль у паўтары разы.

Між тым галоўная бяда расійскай арміі была не ў малалікасці, а ў феадальнай сістэме камплектавання, утрымання, навучання і кіравання. Саступала яна Вялікай арміі і па сваім вышэйшым камандным саставе, хаця сярод расійскіх генералаў былі такія, што маглі паспрачацца з напалеонаўскімі маршаламі.

## ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў 1812 г.

10 (22) чэрвеня 1812 г. Францыя аб’явіла Расіі вайну, і 12 (24) чэрвеня галоўныя сілы Вялікай арміі пачалі пераправу цераз Нёман у раёне Коўна. На працягу тыдня ў межы Расійскай імперыі ўступіла 448-тысячнае войска (з 647 тыс.) пры 1372 арматах. Астатнія войскі падыходзілі на Беларусь летам і восенню 1812 г. у якасці падмацаванняў.

Стратэгічны разлік Напалеона І у пачатку вайны заключаўся ў тым, каб разбіць паасобку расійскія арміі ў прыгранічных бітвах, выйсці на рубеж Заходняя Дзвіна – Днепр і там чакаць міру. Згодна з планам, якім дзяліўся імператар французаў з аўстрыйскім канцлерам К. Метэрніхам у маі 1812 г., ён хацеў пачаць кампанію пераходам цераз Нёман і скончыць

яе ў Мінску і Смаленску. Напалеон планаваў умацавацца ў гэтых гарадах, а ў Вільні, дзе павінна была знаходзіцца яго галоўная кватэра, заняцца арганізацыяй «Літвы», якая прагла скінуць з сябе «расійскае ярмо». Пераходзіць Заходнюю Дзвіну імператар не планаваў, бо разумеў, што рухацца ў той час далей азначала ісці насустрач пагібелі. Ні аб якіх паходах на Маскву тады не было і размовы.

Каб разграміць расійскія арміі, Напалеон I ажыццявіў клінападобнае высоўванне ад Нёмана на ўсход трыма групамі Вялікай арміі. Але па меры таго, як стала зразумела, што расіяне ўхіляюцца ад генеральнай бітвы і што разбіць іх арміі паасобку не ўдаецца, ён быў вымушаны мяняць першапачатковы план. Ужо ў Вільні Напалеон I распрацаваў новую стратэгію, якая прадугледжвала няспыннае праследаванне 1-й Заходняй арміі, навязванне ёй генеральнай бітвы і, адначасова, акружэнне і знішчэнне 2-й Заходняй арміі. Рашэнне ісці на Маскву Напалеон I прыняў толькі ў Смаленску, пасля бітвы за горад, калі аб'яднаная расійская армія пачала адыход да старажытнай сталіцы.

У сваю чаргу расійскія арміі першапачаткова дзейнічалі па плане К. Фуля. 1-я Заходняя армія адступала ў Дрысенскі ўмацаваны лагер, а 2-я праз Слонім, Навагрудак і Мінск спяшалася ёй на дапамогу. 29 чэрвеня (11 ліпеня) армія М. Б. Барклая дэ Толі была ўжо сканцэнтравана ў Дрысенскім лагеры, але яна там не засталася. Праведзены ваеннымі спецыялістамі агляд лагера паказаў поўную непрыдатнасць яго да абароны. Лагер не прыкрываў шляхоў ні на Санкт-Пецярбург, ні на Маскву. Праціўнік мог лёгка абысці яго, а войскі, якія знаходзіліся ў лагеры, не маючы падтрымкі звонку, павінны былі капітуляваць. Таму расійскае камандаванне вырашыла для прыкрыцця шляхоў на Санкт-Пецярбург пакінуць у Віцебскай губерні асобны корпус генерала графа П. Х. Вітгенштэйна, а асноўныя сілы 1-й Заходняй арміі адвесці да Віцебска. Там М. Б. Барклай дэ Толі спадзяваўся дачакацца П. І. Баграціёна. Такім чынам, і расійскі бок ужо ў самым пачатку вайны адмовіўся ад свайго галоўнага аперацыйнага плана.

Адыход расійскіх армій ажыццяўляўся ў складаных умовах. Напалеон I рабіў усё магчымае, каб М. Б. Барклай дэ Толі і П. І. Баграціён ніколі ўжо не ўбачыліся. Чакаючы падыходу войска П. І. Баграціёна, 1-я Заходняя армія ўступіла ў баі з французамі пад Астроўна – Віцебскам, пасля чаго 16 (28) ліпеня пачала адыход да Смаленска. Тым часам П. І. Баграціён спрабаваў вырвацца з пасткі, якую паставіў яму Напалеон. Ён адыходзіў у пастаянных ар'ергардных баях (пад Мірам і Раманавам). Але ў выніку прамаруджвання Жэрома Банапарта і памылак Л. М. Даву (пасля бою пад Салтанаўкай не праследваў П. І. Баграціёна) 2-я Заходняя армія адарвалася ад французаў. Каля Смаленска расійскія арміі аб'ядналіся і пасля

бітвы за горад 4–5 (16–17) жніўня працягвалі адступленне, зберагаючы сілы. І толькі пад Барадзіном адбылася генеральная бітва.

У ліпені – жніўні 1812 г. на тэрыторыі Беларусі адбыліся ўпартыя баі і на іншых напрамках. Але ваенныя дзеянні на паўночным і паўднёвым флангах мелі самастойнае значэнне і да завяршальнага этапу вайны не былі непасрэдна звязаны са становішчам на цэнтральным напрамку. У прыватнасці, корпус П. Х. Вітгенштэйна пад Клясціцамі і Полацкам з пераменным поспехам змагаўся з карпусамі маршалаў Н. Ш. Удзіно і Л. Г. Сен-Сіра, а армія А. П. Тармасава – пад Кобрынам і Гарадзечнай з карпусамі генералаў Ж. Л. Э. Рэйнье і К. Ф. Шварцэнберга. На працягу некалькіх месяцаў, пры падтрымцы 2-га рэзервовага корпуса генерала Ф. Ф. Эртэля, трымалася Бабруйская цытадэль.

Да пачатку жніўня 1812 г. большая частка Беларусі, акрамя паўднёвых паветаў Мінскай і Магілёўскай губерняў і поўначы Віцебшчыны, была занята напалеонаўскімі войскамі.

Новыя ахвяры і разбурэнні прынеслі Беларусі адступленне Вялікай арміі і рух расійскіх войскаў на Захад. У кастрычніку 1812 г. Галоўная армія фельдмаршала М. І. Кутузава вымусіла Напалеона І пакінуць Маскву і адступаць па старой Смаленскай дарозе. Адначасова змяніліся абставіны і на стратэгічных флангах. У наступленне перайшлі расійскія войскі на поўначы і поўдні Беларусі. Разам з Галоўнай арміяй яны павінны былі акружыць французскія войскі на Бярэзіне і захапіць Напалеона І у палон. У выніку паспяховых баёў пад Полацкам і Чашнікамі войскі корпуса П. Х. Вітгенштэйна значна наблізіліся да 3-й Заходняй арміі (7 (19) верасня армія А. П. Тармасава аб'ядналася з Дунайскай арміяй і атрымала назву 3-й Заходняй). Тым часам адмірал П. В. Чычагоў, паставіўшы заслон ад войскаў К. Ф. Шварцэнберга і Ж. Л. Э. Рэйнье ў выглядзе групы генерала Ф. В. Остэн-Сакена, з баямі (пад Новасвержанем, Койданавам і Барысавам) крочыў да Бярэзіны.

У лістападзе 1812 г. рэшткі Вялікай арміі апынуліся на Беларусі. Калі Напалеон І падышоў да Бярэзіны, ён меў толькі 30–40 тыс. баяздольных войск (і столькі ж бяззбройных і хворых). Становішча было амаль крытычнае. З трох бакоў расійскія войскі ўсё мацней сціскалі кальцо акружэння, а нечаканая адліга ўскрыла раку (гэта не дазваляла будаваць масты). Але і ў гэтай бязвыхаднасці Напалеон І знайшоў адзіны шанс для ратавання. Выкарыстаўшы маруднасць фельдмаршала М. І. Кутузава (адстаў на тры пераходы) і стрымліваючы націск войск П. Х. Вітгенштэйна, імператар французаў выбіў П. В. Чычагова з Барысава. Затым ён стварыў бачнасць пераправы цераз Бярэзіну каля с. Ухалоды (тым заблытаў адмірала), а сам навёў масты каля Студзёнкі. З цяжкімі баямі 14–16 (26–28) лістапада На-

палеон I пераправіў баяздольныя часці (былі захаваны гвардыя, усе маршалы, значная частка генералітэту і афіцэрскага корпуса) на правы бераг і крочыў ад Бярэзіны да Смаргоні і Вільні.

Вырвацца з акружэння рэшткам Вялікай арміі дазволілі памылкі і пралікі расійскага камандавання. Але Бярэзінская аперацыя, нават не зусім удалая для рускіх, паставіла Напалеона I на край пагібелі. Вялікая армія фактычна перастала існаваць: пасля пераправы засталося 9 тыс. баяздольных і каля 10–15 тыс. небаяздольных чалавек, якіх няспынна праследавалі расійскія войскі. Спыніцца, перадахнуць, падмацаваць свае сілы ў такой сітуацыі не было магчымасці.

Сам Напалеон бачыў, што кампанія безнадзейна прайграна. Таму ён вырашыў падрыхтаваць грамадскую думку Францыі і Еўропы да ўспрыняцця катастрофы, якая яго напаткала. 21 лістапада (3 снежня) у Маладзечне імператар склаў «пахавальны» 29-ы бюлетэнь, у якім прызнаў сваё паражэнне. Але тлумачыў яго Напалеон I зменлівасцю рускай зімы. 23 лістапада (5 снежня) у Смаргоні імператар перадаў камандаванне І. Мюрату і пакінуў рэшткі сваёй арміі. Ён спяшаўся ў Парыж, каб сабраць новую армію.

Апошнія баі 1812 г. адбыліся пад Вільняй і Коўнам. 29 лістапада (11 снежня) расійскія войскі ўступілі ў былую сталіцу ВКЛ, а праз 12 дзён сюды прыехаў і Аляксандр I. Вайна 1812 г. была скончана. Са складу Вялікай арміі праз мяжу Расійскай імперыі ў снежні назад выйшла не больш за 30 тыс. чалавек. Тым не менш барацьба з Напалеонам I працягвалася яшчэ два доўгія гады.

## ПАЛІТЫКА ФРАНЦУЗСКІХ УЛАД

Праз два дні пасля пачатку вайны з Расіяй, 14 (26) чэрвеня, у Варшаве сабраўся сейм Княства Варшаўскага. 16 (28) чэрвеня ён аб'явіў сябе «Генеральнай канфедэрацыяй Каралеўства Польскага» і прыняў «Акт аднаўлення і незалежнасці старажытнага Каралеўства Польскага». Саксонскі кароль і вялікі князь варшаўскі Фрыдрых Аўгуст I перадаў уладу Савету міністраў княства. Да імператара Напалеона I была накіравана дэпутацыя.

19 чэрвеня (1 ліпеня) 1812 г. незалежна ад варшаўскіх улад Напалеон I стварыў Камісію часовага кіравання (урад; КЧК) ВКЛ. Гэты крок выклікаў разачараванне сярод варшаўскіх палякаў. Тым не менш Генеральная канфедэрацыя звярнулася да КЧК ВКЛ з заклікам далучыцца да яе. 25 чэрвеня (7 ліпеня) была выдадзена «Адозва Генеральнай канфедэрацыі Каралеўства Польскага да палякаў, якія знаходзяцца ў рус-

кай службе». У ёй жыхароў заходніх губерняў заклікалі пакінуць службу і выступіць са зброяй у руках супраць Расійскай імперыі. Большая частка шляхты Беларусі і Літвы падтрымала гэты заклік. Паслухаўся яго нават А. Е. Чартарыйскі, які ў лісце да Аляксандра І прасіў аб адстаўцы з усіх пасад (зварот застаўся без адказу).

29 чэрвеня (11 ліпеня) 1812 г. Напалеон І у Вільні прыняў дэлегацыю ад Генеральнай канфедэрацыі. Галава дэпутацыі Ю. Выбіцкі звярнуўся да імператара з просьбай абвясціць Польскае Каралеўства і прыняць яго пад сваю апеку. Але Напалеон, хаця і падкрэсліў у сваёй прамове сімпатыі да палякаў, ухіліўся пацвердзіць рашэнні Варшаўскага сейма. Ён зазначыў, што аднаўленне каралеўства можа быць вынікам толькі шырокага нацыянальнага руху. Напалеон казаў, што, калі Літва, Жамойція, Віцебск, Полацк, Магілёў, Валынь, Падолія і Украіна натхняцца тым духам, які ён пабачыў у Польшчы, іх «святой справе» дапаможа сама Правідэнцыя.

І тут узнікае пытанне: чаму Напалеон І, які абвясціў вайну з Расіяй «Другой польскай вайной», адмовіўся ад аднаўлення Польскага Каралеўства? Справа ў тым, што імператар французаў у той момант не меў да канца вызначаных планаў. Як і раней, ён не жадаў у час вайны звязваць сабе рукі ў «польскім пытанні», якое магло б сур'ёзна ўскладніць яго адносіны з Прусіяй і Аўстрыяй і перашкодзіць у будучым заключэнню міру з Расіяй. Таму Напалеон І не толькі не абвясціў утварэнне Польскага Каралеўства, але і не падпарадкаваў КЧК ВКЛ Віцебскую і Магілёўскую губерні. Апошнія маглі быць разменнай картай пры перамовах аб міры.

Нягледзячы на такую пазіцыю Напалеона І, Вільня падтрымала заклік Варшавы. 2 (14) ліпеня 1812 г. КЧК ВКЛ далучылася да Генеральнай канфедэрацыі. Ад імя ўрада і жыхароў ВКЛ акт далучэння быў урачыста абвешчаны ў Віленскім кафедральным саборы. Падобныя акты прымаліся таксама ў гарадах і паветах ВКЛ. У канцы ліпеня 1812 г. да Генеральнай канфедэрацыі далучыўся нават Магілёўскі дэпартамент.

Пасля заняцця тэрыторыі Беларусі перад Напалеонам І паўстала задача арганізацыі новай сістэмы кіравання. Неадкладнасць вырашэння гэтага пытання вызначалася неабходнасцю хутчэйшай мабілізацыі, а затым планамернага і эфектыўнага выкарыстання людскіх і матэрыяльных рэсурсаў краю для патрэб Вялікай арміі. Але Напалеон І пазбягаў карэннай ломкі і перамен традыцыйных інстытутаў і парадкаў на тэрыторыі Беларусі. Таму ён арганізаваў сістэму грамадзянскай адміністрацыі пад выглядам дзяржаўна-палітычных структур ВКЛ, у якой мясцовыя прадстаўнікі павінны былі дзейнічаць пад старшынствам і наглядам французскіх чыноўнікаў і ваенных.

Паўнамоцтвы КЧК ВКЛ, утворанай для кіравання беларуска-літоўскімі губернямі, распаўсюджваліся на Віленскую, Гродзенскую, Мінскую

губерні і Беластоцкую вобласць, якія былі перайменаваны ў дэпартаменты. Віцебскі і Магілёўскі дэпартаменты не падпарадкоўваліся КЧК ВКЛ. Пытанне аб аб'яднанні гэтых тэрыторый з ВКЛ заставалася адкрытым, паколькі яны маглі стаць прадметам палітычнага гандлю ў час верагодных мірных перамоў з Аляксандрам І.

Часовы ўрад ВКЛ складаўся з сямі камітэтаў. Старшынёй камісіі Напалеон І прызначыў былога надворнага маршалка ВКЛ С. Солтана, які адначасова ўзначаліў камітэт харчавання і магазінаў. Акрамя яго ў склад урада ўвайшлі старшыні іншых камітэтаў: паліцыі – К. Прозар, фінансаў – граф Ю. Серакоўскі (выконваў абавязкі старшыні камісіі да прыбыцця С. Солтана), ваеннага – князь А. Сапега, судовага – граф Ф. Ельскі, унутраных спраў – граф А. Патоцкі, народнай асветы і рэлігіі – рэктар Віленскага ўніверсітэта Я. Снядэцкі. Генеральным сакратаром (з правам дарадчага голасу) быў прызначаны Ю. Касакоўскі.

Сваю дзейнасць КЧК ВКЛ ажыццяўляла пад наглядам імператарскага камісара барона Л. П. Э. Біньёна, на якога ўскладаліся кантрольныя функцыі і палітычнае кіраўніцтва, а таксама міністра замежных спраў Францыі Г. Б. Марэ герцага дэ Басана. Апошні акрамя выканання сваіх прамых дыпламатычных абавязкаў узгадняў і рэгуляваў узаемаадносіны паміж грамадзянскай і вайсковай адміністрацыямі ВКЛ.

Камісіі часовага кіравання ВКЛ падпарадкоўваліся цэнтральныя і мясцовыя органы грамадзянскага кіравання. У кожным дэпартаменце ВКЛ, як і ў Магілёўскім і Віцебскім, ствараліся адміністрацыйныя камісіі. Яны складаліся з трох аддзелаў: унутраных спраў, паліцыі і судаводства; вайсковага і харчавання; фінансаў, асветы і рэлігіі. У склад адміністрацыйнай камісіі ўваходзілі старшыні аддзелаў (іх прызначаў ці зацвярджаў Напалеон І), а на яе чале стаяў французскі чыноўнік – інтэндант (выбіраўся з ліку аўдытараў Дзяржаўнага савета Францыі). У сваёй дзейнасці інтэнданты падпарадкоўваліся Л. П. Э. Біньёну.

У адміністрацыйных адносінах дэпартаменты падзяляліся на дыстрыкты на чале з падпрэфектамі. Падпрэфектуры складаліся з трох аддзелаў: юстыцыі; забеспячэння; фінансаў, адукацыі і рэлігіі. На пасады падпрэфектаў прызначаліся ранейшыя прадстаўнікі органаў дваранскага самакіравання – павятовыя маршалкі, падкаморыя ці харунжыя. Грамадзянскую адміністрацыю кантонаў, на якія падзяляўся дыстрыкт, узначальваў інспектар.

Для самакіравання гарадоў, якія раней мелі магдэбургскае права, ствараліся муніцыпалітэты. Выканаўчая ўлада ў горадзе была сканцэнтравана ў руках мэра (прэзідэнта), якому дапамагалі чатыры саветнікі.

Акрамя таго, існавала муніцыпальная рада, якая складалася з 12 чалавек. Члены рады мелі толькі дарадчы голас. У дэпартаменцкіх гарадах рада падпарадкоўвалася адміністрацыйнай камісіі, а ў галоўных гарадах дыстрыктаў – падпрэфектуры.

Адначасова з грамадзянскай уладай на тэрыторыі Беларусі ўводзілася і французская ваенная адміністрацыя. На чале яе стаялі генерал-губернатары Літвы (генерал Ц. ван Гагендорп, ён жа з 12 (24) жніўня адначасова і прэзідэнт КЧК ВКЛ), Віцебскага (генералы А. Ф. М. Шарпанцье, Ф. Р. Пужэ) і Магілёўскага (генерал П. А. П. Алорна) дэпартаментаў. Генерал-губернатару падпарадкоўваліся ваенныя губернатары, якія дзейнічалі ў кожным дэпартаменце. Яны прызначаліся з ліку вышэйшых камандных чыноў французскай арміі. У дыстрыктах ваенная ўлада належала плацкамендантам. Яны ўзначальвалі мясцовыя гарнізоны, падтрымлівалі парадак і забяспечвалі бяспеку жыхароў.

У функцыі КЧК ВКЛ уваходзілі: збор падаткаў і размеркаванне бюджэтных сум, арганізацыя ўзброеных сіл, фарміраванне жандармерыі і суда. Галоўнай задачай ваенных і грамадзянскіх улад была арганізацыя харчовага і фуражнага забеспячэння французскага войска. Але патрэбы Вялікай арміі былі невымяральнымі з магчымасцямі краю. Сітуацыя абцяжарвалася і тым, што Напалеон I не разлічваў на доўгатэрміновыя ваенныя дзеянні, таму не рабіў спецыяльных запасаў. Усё забеспячэнне арміі ён перакладаў на плечы занятых тэрыторый. У выніку месцамі нарыхтоўкі ператвараліся ў звычайнае рабаванне. КЧК ВКЛ з вялікай цяжкасцю спраўлялася з выкананнем абавязкаў па матэрыяльным забеспячэнні французскай арміі. Таму ў канцы жніўня 1812 г. генерал-губернатару Літвы Ц. Гагендорпу было перададзена кіраўніцтва КЧК ВКЛ. На гэты конт Напалеон пісаў, што ваенная і грамадзянская ўлады павінны быць аб'яднаны. Агульнымі намаганнямі ваеннай і грамадзянскай адміністрацыі да лістапада 1812 г. у Вільні і Мінску былі ўтвораны вялікія правіянцкія магазіны. Але запасы французаў дасталіся наступаючым расійскім войскам.

Вельмі важнай праблемай для КЧК ВКЛ было фарміраванне ўзброеных сіл. Для абароны краю і папаўнення напалеонаўскай арміі ствараліся нацыянальная (народная) гвардыя, пяхотныя і кавалерыйскія палкі, жандармерыя, егерскія батальёны і інш.

Нацыянальная гвардыя (апалчэнне) пачала фарміравацца ў Вільні ў адпаведнасці з загадам Напалеона I ад 19 чэрвеня (1 ліпеня). Яна налічвала 1450 чалавек і складалася з двух батальёнаў (камандзір – адстаўны палкоўнік Ю. Казельскі). Служба ў апалчэнні была абавязковай для

ўсіх гараджан мужчынскага полу ад 18 да 50 гадоў, якія валодалі маёмасцю. Яны жылі дома, а па нядзелях збіраліся на вучэнні, якія праводзілі польскія афіцэры. У іншых гарадах Беларусі нацыянальная гвардыя пачала фарміравацца толькі восенню 1812 г.

Адначасова для забеспячэння і падтрымання парадку ў краі імператар французаў загадаў заснаваць мясцовую жандармерыю. У кожным павеце стваралася па адной роце (107 чалавек), агульная колькасць дасягала 3540 чалавек. Разам з нацыянальнай гвардыяй жандармерыя выконвала паліцэйскія функцыі.

Пытаннямі арганізацыі вайсковых часцей для арміі займаўся ваенны камітэт КЧК ВКЛ на чале з князем А. Сапегам (пасля яго смерці – з генералам С. Грабоўскім). Па загадзе Напалеона I планавалася сфарміраваць пяць пяхотных (нумары з 18-га па 22-і) і чатыры кавалерыйскія (нумары з 17-га па 20-ы) палкі. 23 чэрвеня (5 ліпеня) была прынята пастанова аб наборы на шасцігадовую службу ў пяхоту 10 тыс. мужчын ва ўзросце ад 17 да 34 гадоў, а 20 ліпеня (1 жніўня) – аб наборы 4 тыс. чалавек у кавалерыю. Усе палкі атрымалі польскую форму і арганізацыю. Акрамя таго, 23 ліпеня (4 жніўня) быў аб'яўлены набор добраахвотнікаў шляхецкага паходжання для службы ў палку імператарскай гвардыі. Камандзірам гэтага палка быў прызначаны генерал Я. Канопка. У якасці разведчыкаў гвардзейцам пазней былі прыданы эскадрон падпалкоўніка М. Ахматовіча, сфарміраваны з літоўскіх татар.

31 ліпеня (12 жніўня) КЧК ВКЛ вырашыла мабілізаваць большую частку паляўнічых і палясоўшчыкаў і стварыць з іх шэсць батальёнаў егераў (былі створаны толькі тры). Акрамя таго, узброеныя сілы ВКЛ папоўнілі часці, сфарміраваныя магнатамі за іх уласны кошт (коннаегерскі полк І. Манюшкі, уланскія палкі Л. Паца і Д. Радзівіла, коннаартылерыйская рота Р. Тызенгаўза і інш.).

Фарміраванне ўзброеных сіл ВКЛ ішло даволі марудна. Адмоўна сказвалася расійская сістэма камплектавання войска (шляхам рэкруцкіх набораў) і няўдалы падбор афіцэрскіх кадраў (выбіраліся з заможных шляхцічаў, якія часам не мелі ваеннай падрыхтоўкі і здольнасцей). Пры стварэнні вайсковых адзінак ураду прыйшлося сутыкнуцца і з іншымі цяжкасцямі: слабай падкантрольнасцю тэрыторыі, на якой праводзіліся наборы; недахопам сродкаў, коней, абмундзіравання і амуніцыі, узбраення (на тэрыторыі Беларусі не было ні заводаў, ні аружэйных майстэрняў); адсутнасцю жадаючых служыць у новым войску.

Найбольшую актыўнасць пры фарміраванні арміі праяўляла шляхта. Аднак і сярод яе аказалася значна менш добраахвотнікаў, чым мож-

на было чакаць. Адна частка шляхты прытрымлівалася пазіцыі чакання і не жадала ісці ў ствараемае войска, другая лічыла, што дастаткова будзе матэрыяльных ахвяраванняў. І ўсё ж да зімы 1812 г. войска ВКЛ, разам з жандармерыяй, налічвала каля 20 тыс. чалавек.

У канцы вайны 1812 г. часці беларуска-літоўскага войска прынялі ўдзел у баях з расійскай арміяй. Але не цалкам укамплектаваныя, слаба арганізаваныя і ўзброеныя, малаабучаныя, яны адразу пацярпелі паражэнне. Першым загінуў гвардзейскі полк Я. Канопкі, разбіты 8 (20) кастрычніка генералам Я. Чапліцам пад Слонімам. 22-гі пяхотны полк і частка 18-га ўланскага палка былі знішчаны 1 (13) лістапада пад Навасвержанем. На Бярэзіне засталіся 23-ці пяхотны і другая частка 18-га ўланскага палка. Астатнія часткі войска ВКЛ (жандармерыя, нацыянальная гвардыя, егеры і інш.) пасля абароны Вільні 28 лістапада (10 снежня) з вялікімі стратамі адышлі на Захад. У час фарміравання новай французскай арміі яны былі раскіданы па іншых вайсковых часцях. Пасля спынення ваенных дзеянняў у 1815 г. рэшткі войска ВКЛ былі ўключаны ў армію Каралеўства Польскага, а ў 1818 г. дэмабілізаваны.

З набліжэннем расійскай арміі французская і мясцовая адміністрацыі пакінулі Вільню. 27 лістапада (9 снежня) члены КЧК ВКЛ разам з архівамі і дзяржаўным скарбам накіраваліся праз Коўна ў Варшаву. Іх суправаджаў імператарскі камісар Л. П. Э. Біньён. Генерал-губернатар Ц. Гагендорп на наступны дзень выехаў у Кёнігсберг. Пасля непрацяглай працы ў Варшаве ў лютым 1813 г. члены КЧК ВКЛ разам з членамі ўрада Княства Варшаўскага пераехалі ў Кракаў, дзе заставаліся да красавіка. У ліпені 1813 г. Камісія спыніла сваё існаванне ў Дрэздэне.

## УЗАЕМААДНОСІНЫ НАСЕЛЬНІЦТВА З ВЯЛІКАЙ АРМІЯЙ

Насельніцтва Беларусі аднеслася да Вялікай арміі неадназначна. Гараджане з надзвычайнай помпай наладжвалі ўрачыстыя сустрэчы. Дэлегацыі віталі войскі яшчэ за гарадской заставай, падносілі хлеб-соль, а вуліцы гарадоў усцілалі перад французамі кветкамі. У Вялікай арміі бачылі вызваліцеляў. Наладжванню такіх сустрэч у многім спрыяў Напалеон І, які дазволіў 16 (28) чэрвеня першым увайсці ў Вільню 8-му польскаму ўланскаму палку на чале з Дамінікам Радзівілам.

У той самы час у мясцовасцях, дзе адбываліся непасрэдна баявыя дзеянні, насельніцтва імкнулася схавацца, пакідала свае дамы, уцякала ў лес. Рускія чыноўнікі і памешчыкі адыходзілі на ўсход услед за вой-

скам. У поглядах духавенства не было адзінства. Калі каталіцкія і ўніяцкія святары падтрымлівалі Напалеона I, то праваслаўны клір, які пераважаў у Віцебскай і Магілёўскай губернях, заставаўся, у большасці, на баку расійскага імператара. Выключэннем была толькі здрада віцебскага і магілёўскага архіепіскапа Варлаама (т. зв. «Магілёўская царкоўная смута»).

З вонкавага боку адносіны паміж напалеонаўскімі ўладамі і мясцовым насельніцтвам былі даволі лагоднымі, але ў сапраўднасці адбывалася паступовае ахалоджванне. У шэрагах Вялікай арміі хутка пагаршалася дысцыпліна, вынікам чаго стала эпідэмія марадзёрства. Напалеон і яго адміністрацыя разумелі небяспечнасць гэтай з’явы, спрабавалі спыніць ці абмежаваць яе маштабы. Імператар не стамляўся паўтараць сваім маршалам і генералам, што тэрыторыя Літвы і Беларусі – гэта яшчэ не варожая тэрыторыя. Таму і армія тут павінна ўстрымлівацца ад рабавання мясцовага насельніцтва. Асаблівай жорсткасцю ў падтрыманні дысцыпліны вызначаўся маршал Л. М. Даву. Па яго загадах у ліпені былі расстраляны 13 кірасіраў у Мінску (за рабаванне яўрэйскай лаўкі) і двое салдат у Магілёве (за пабоі жыхароў). Для барацьбы з марадзёрамі і дэзерцірамі былі створаны спецыяльныя руховыя вайсковыя каманды. Аднак кардынальнага паляпшэння дысцыпліны ў арміі не назіралася: самавольныя рабункі і несанкцыянаваныя рэквізіцыі працягваліся.

Не скаліся ў французскіх уладаў адносіны і з яўрэйскай часткай беларускіх гарадоў. У час вайны яўрэі заставаліся на месцы, бо існавала мяжа аседласці. Таму на іх, як і на сялян, выпаў асноўны цяжар забеспячэння запасамі напалеонаўскага войска. Зразумела, што яўрэі ўсяляк імкнуліся ўхіляцца ад цяжкіх павіннасцей. Увогуле, урад ВКЛ і французскія ваенныя ўлады даволі падазрона ставіліся да яўрэяў, паколькі ў кожным іўдзеі, і небеспадстаўна, бачылі шпіёна.

Вайна 1812 г. абвастрыла і сацыяльныя супярэчнасці на беларускай вёсцы. У тых раёнах, дзе расійская адміністрацыя эвакуіравалася, сяляне выходзілі з падпарадкавання памешчыкаў. Яны адмаўляліся выконваць феадальныя павіннасці, уцякалі ў лес і нават аказвалі ўзброены супраціў сваім гаспадарам. Так, ужо ў ліпені 1812 г. прыгонныя пана Ф. Янкоўскага з в. Кузявічы Барысаўскага дыстрыкта паднялі бунт, не з’явіліся на звычайную павіннасць у маёнтак і не хацелі нават слухаць пра гэта. Каб прымусіць сялян выконваць свае абавязкі, мясцовыя памешчыкі звярталіся за дапамогай да новай улады. Але і гэта не заўжды прыносіла поспех.

У зоне непасрэдных баявых дзеянняў вяскоўцы шукалі паратунку ў лесе, і пасля заканчэння баёў многія з іх не спяшаліся вяртацца дамоў.

Так, сяляне вёсак Стараселле, Мажаны, Клеўка і Ясьмоны Бярэзінскага кантона Барысаўскага дыстрыкта хаваліся па лясах, стварылі некалькі атрадаў і здзяйснялі напады на хлебныя лаўкі, свірны і каморы навакольных памешчыкаў, а потым сталі рабаваць і спальваць навакольныя двары і фальваркі. Узброеныя нападзенні вяскоўцаў адбываліся амаль паўсюдна. Найбольш моцныя хваляванні назіраліся ў Віцебскім дэпартаменце. Для навядзення парадку французскія ўлады былі вымушаны пасылаць супраць сялян вайсковыя атрады.

У адносінах да Вялікай арміі сяляне пэўны час займалі палітыку чакання, паколькі сярод іх распаўсюдзіліся чуткі аб намеры Напалеона I скасаваць прыгоннае права. Нягледзячы на неаднаразовыя падобныя выказванні імператара французаў, ён гэтага не зрабіў. На нашу думку, Напалеон I не пайшоў на скасаванне прыгонніцтва на Беларусі таму, што галоўную апору ў ваенны час ён бачыў у шляхце і памешчыках. Між тым скасаванне прыгонніцтва ў Беларусі пасля падпісання міру было непазбежным, аб чым сведчыў вопыт Княства Варшаўскага.

Што тычыцца «карэннай» Расіі, то, нягледзячы на ўсе прапагандысцкія крокі, Напалеон I не адважыўся на скасаванне прыгону, нават у крытычны момант. У снежні 1812 г. імператар тлумачыў Сенату сваё рашэнне тым, што пасля таго, як ён пабачыў грубасць нораваў прыгонных сялян, адмовіўся ад гэтай меры, каб абараніць сем'і памешчыкаў ад смерці, гвалту, крадзяжоў і ўсялякіх пакут. Але больш верагодна, што Напалеон I не столькі клапаціўся аб рускім дваранстве, колькі баяўся згубіць вынікі ваеннай кампаніі ў час народнага сацыяльнага выбуху.

Такім чынам, новая ўлада не толькі не адмяніла на Беларусі прыгон, але і павялічыла паборы з сялян на сваю карысць. Гэта, безумоўна, выклікала незадавальненне, варожасць і супраціў з боку апошніх. Сяляне пачалі нападаць на марадзёраў, розныя каманды фуражыраў і г. д. Але паказваць гэты рух як «партызанскі» – памылкова.

У сучаснай літаратуры даволі распаўсюджана думка пра існаванне на тэрыторыі Беларусі моцнага антыфранцузскага «партызанскага руху». Нават існуе такое вызначэнне: «партызанскі рух – узброеная барацьба народных мас на акупіраванай тэрыторыі супраць напалеонаўскіх войск» (Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Мінск, 1999. Т. 5. С. 49). Але з гэтым цяжка пагадзіцца.

Па-першае, у пачатку XIX ст. у тэрміны «партызан», «партызанскі рух» укладвалі зусім іншы сэнс. У 1812 г. «партызанскі атрад» – гэта вайсковая адзінка рэгулярнай арміі, якая дзейнічала ў тыле праціўніка. Адпаведна, «партызан» – вайсковец, які служыў у такім атрадзе. Па-другое, у 1812 г. на Беларусі не існавала «партызанскага руху» як формы барацьб-

бы шырокіх колаў мірнага насельніцтва супраць «акупантаў». Найбольш слушным сёння выглядае меркаванне тых гісторыкаў, якія лічаць, што на ўсёй тэрыторыі Літвы і Беларусі антыфранцузскія выступленні колькасна саступалі антыпрыгонніцкім акцыям. Гэтую думку падмацоўваюць і тыя факты, што пасля выгнання французаў хваляванні народных мас працягваліся. І душылі іх ужо расійскія войскі. Так, па загадах генерала П. Х. Вітгенштэйна карнікі расстрэльвалі і вешалі «зачинщиков» сялянскіх хваляванняў у Пскоўскай, Віцебскай і Ліфляндскай губернях. А генерал М. Б. Барклай дэ Толі і фельдмаршал М. І. Кутузаў неаднаразова накіроўвалі атрады на задушэнне хваляванняў у Смаленскай губерні і сумежных з ёй паветах Беларусі.

## ВЫНІКІ І НАСТУПСТВЫ ВАЙНЫ 1812 г. ДЛЯ БЕЛАРУСІ

Саюз паміж Расіяй, Швецыяй і Вялікабрытаніяй, які ўтварыўся яшчэ летам 1812 г., склаў аснову шостай антыфранцузскай кааліцыі. На працягу 1813 г. да кааліцыі далучыліся Прусія і Аўстрыя, што канчаткова вызначыла расклад сіл у Еўропе. У 1814 г. вайна скончылася поўным паражэннем напалеонаўскай Францыі, падзеннем імперыі і рэстаўрацыяй каралеўскай улады і дынастыі Бурбонаў. Парыжскі мірны дагавор 18 (30) мая 1814 г. і пастановы Венскага кангрэса 1814—1815 гг. вызначылі новую палітычную сістэму ў Еўропе.

Ваенныя падзеі 1812—1814 гг. прынеслі Беларусі вялікія спусташэнні: загінула шмат людзей, былі разбураны многія гарады і вёскі, амаль напалову скарацілася колькасць жывёлы і зменшыліся пасяўныя плошчы. Былі страчаны многія культурныя каштоўнасці Беларусі: у вогнішчы вайны загінулі архівы і кнігасховішчы Беластока, Віцебска (часткова), Шклова (бібліятэка і архіў былога Шклоўскага шляхетнага вучылішча) і інш. У лістападзе 1812 г. расійскія войскі генерала С. А. Тучкова і адмірала П. В. Чычагова разрабавалі Нясвіжскі замак, і яго багацці апынуліся за межамі Беларусі. Агульныя страты пяці беларуска-літоўскіх губерняў і Беластоцкай вобласці за 1812—1814 гг. склалі больш 160 млн р.

У канцы 1812 г. у заходніх губернях было адноўлена расійскае ваеннае кіраванне. Паколькі рускіх чыноўнікаў з губернскіх устаноў не было на месцы, па ініцыятыве літоўскага ваеннага губернатара А. М. Рымскага-Корсакава былі сфарміраваны часовыя выканаўчыя камісіі Віленскай і Гродзенскай губерняў. У іх склад увайшлі былыя члены розных камісій і камітэтаў з напалеонаўскай адміністрацыі Вялікага Княства Літоўскага.

У студзені 1813 г. улады стварылі люстрацыйныя камісіі. Яны займаліся забеспячэннем расійскай арміі харчаваннем і вызначэннем страт насельніцтва ў час вайны. У сакавіку 1813 г. паўсюдна была адноўлена губернская адміністрацыя і зноў пачаў працу Галоўны камітэт вайсковых павіннасцей.

Расійскія ўлады імкнуліся ў хуткі час ачысціць край ад трупаў людзей і жывёлы. Але вайна прывяла да такіх спусташэнняў, што не было каму хаваць нябожчыкаў, не хапала працоўных рук і падводаў. Становішча ўскладнялася і тым, што зімой 1812–1813 г. зямля глыбока прамерзла. Таму трупы проста спальвалі, спускалі пад лёд ці закопвалі на малую глыбіню. У выніку вясной 1813 г. на Беларусі выбухнула эпідэмія, якая забрала больш чалавечых жыццяў, чым сама вайна 1812 г.

Пасля пераносу ваенных дзеянняў у Еўропу беларускія землі ператварыліся ў бліжэйшы тыл расійскіх войск. Таму ўсе беларуска-літоўскія губерні былі пакінуты на ваенным становішчы, якое працягвала дзейнічаць да лістапада 1813 г. На Беларусі фарміраваліся ці кватэравалі рэзервовыя часці расійскай арміі, знаходзіліся шматлікія шпіталі і лазарэты. Праз беларускія губерні на захад крочылі дзясяткі тысяч салдат, а ў адваротным напрамку – тысячы палонных. Вельмі цяжкай павіннасцю для насельніцтва было выкананне рэквізіцый – паставак харчавання і фуражу, коней і жывёлы, выкананне падводнай павіннасці, абслугоўванне шпіталяў і кватэруючых войск. У дадатак да ўсяго праводзіліся ўзмоцненыя рэкруцкія наборы. Таму становішча ў 1813–1814 гг. у беларускіх губернях было не лепш, чым летам – восенню 1812 г. Толькі добрыя ўраджаі 1813 і 1814 гг. дазволілі пазбегнуць на Беларусі масавага голаду.

Кіруючыся ваенна-стратэгічнымі і палітычнымі меркаваннямі, Аляксандр I дараваў шляхце Літвы і Беларусі яе здраду ў час вайны. Больш за тое, імператар адхіліў прапанову фельдмаршала М. І. Кутузава аб канфіскацыі на карысць рускіх генералаў і афіцэраў маёнткаў беларуска-літоўскай шляхты, якая выступіла на баку Напалеона І. Маніфестам 12 (24) снежня 1812 г. аб'яўлялася амністыя жыхарам заходніх губерняў – удзельнікам вайны супраць Расіі і членам французскай адміністрацыі пры ўмове іх вяртання на радзіму на працягу двух месяцаў. Толькі пасля гэтага тэрміну маёнткі шляхты і магнатаў падлягалі канфіскацыі.

Але абвешчанай Аляксандрам I амністыяй скарысталіся не ўсе. Тады яшчэ Напалеон I не быў канчаткова пераможаны і многія буйныя і дробныя землеўладальнікі па-ранейшаму звязвалі свае надзеі з яго спробамі павярнуць назад ход ваенных дзеянняў. Таму ў заходніх губернях, стомленых вайной, захоўвалася напружанае палітычнае становішча.

Насельніцтва не спяшалася здаваць зброю, якая засталася пасля вайны. Чуткі аб тайных сховішчах зброі і боепрыпасаў выклікалі ў расійскіх улад падазронасць у падрыхтоўцы да мяцяжу. Таму за насельніцтвам Беларусі быў яшчэ больш узмоцнены паліцэйскі нагляд, а асобы, якія распаўсюджвалі небяспечныя чуткі, былі пакараны. Поўнай ці частковай канфіскацыі ў Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай губернях падлягалі маёнткі з 153 тыс. сялян мужчынскага полу. І толькі ў выніку ўсеагульнай і безумоўнай амністыі, якая была абвешчана маніфестам ад 30 жніўня (11 верасня) 1814 г., усе канфіскаваныя або секвестраваныя маёнткі былі вернуты іх уладальнікам.

Аднак пасля заканчэння напалеонаўскіх войн царскі ўрад не спяшаўся прымаць кардынальных мер па стабілізацыі становішча ў Беларусі. Прыгоннае права было захавана, працягваліся рэкруцкія наборы, падатковы ціск амаль не змяншаўся. Негатыўныя наступствы падзей 1812 г. адчуваліся на Беларусі на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў.

## ВЫСНОВЫ

Адной з галоўных еўрапейскіх праблем XIX ст., вакол якой разгараліся палітычныя і ўзброеныя канфлікты, стала «польскае пытанне». Праблема аднаўлення дзяржаўнасці на землях былой Рэчы Паспалітай разам з вострым расійска-французскім эканамічным супрацьстаяннем стала галоўнай прычынай, якая прывяла да вайны 1812 г. Падрыхтоўка Францыі і Расіі да вайны парадзіла на свет розныя праекты аднаўлення польска-ліцвінскай дзяржаўнасці.

У 1807 г. Напалеон I стварыў васальнае Княства Варшаўскае на чале з саксонскім каралём і пашырыў яго тэрыторыю ў 1809 г. У сваю чаргу Аляксандр I неаднаразова ініцыіраваў праекты аднаўлення Польскага Каралеўства і ВКЛ. Але расійскі ўрад заўжды разглядаў іх толькі як палітычную частку ваенна-стратэгічных планаў, у якіх вырашэнню «польскага пытання» надавалася хаця і важная, але не выключная роля. Аднаўленне Польскага Каралеўства разглядалася Аляксандрам I у мэтах толькі наступальнай вайны, а ВКЛ – вайны абарончай.

Насельніцтва беларускіх губерняў, якое, нягледзячы на сацыяльныя разыходжанні, аб’ядноўвала «жаданне быць народам», у першае дзесяцігоддзе XIX ст. было апазіцыйна настроена да расійскай улады і чакала моманту, каб толькі выйсці з падпарадкавання. Таму яно імкнулася аказваць супраціў падрыхтоўчым мерапрыемствам урада і ўсяляк супрацоўнічала з польска-французскай разведкай. У мэтах нейтралізацыі прафранцуз-

скага ўплыву напярэдадні вайны 1812 г. у заходніх губернях расійскі ўрад зрабіў стаўку на рэпрэсіўныя, хаця і малаэфектыўныя меры. Улады не здолелі распрацаваць прывабную сацыяльна-эканамічную і палітычную праграму для насельніцтва Беларусі. Прынятыя ў 1811—1812 гг. урадам крокі ў напрамку лібералізацыі палітыкі («план Агінскага», ураўнаванне падаткаў і інш.) былі непаслядоўнымі і запозненымі. Усё гэта прывяло да таго, што ў час вайны 1812 г. на Беларусі Напалеон I сустрэў істотную падтрымку з боку мясцовага насельніцтва.

Надзеі жыхароў Літвы, Беларусі і Польшчы на аднаўленне незалежнай дзяржавы ў час кампаніі 1812 г. таксама выявіліся марнымі. Напалеон I праявіў у «польскім пытанні» вялікую асцярожнасць, што тлумачылася бояззю імператара пазбавіцца саюзнікаў (Прусіі і Аўстрыі) па антырасійскай кааліцыі. Нерашучасць у сацыяльнай палітыцы і адкладванне вырашэння пытання аб прыгонніцтве адштурхнулі ад Напалеона I большую частку беларускага сялянства. Стаўка ў гэтых умовах на шляхту і магнатаў Беларусі і Літвы, якім за незлічоныя ахвяраванні былі даравались толькі дзяржаўна-адміністрацыйныя структуры ў выглядзе КЧК ВКЛ, таксама не прынеслі чакаемых вынікаў. Многія з памешчыкаў аказаліся не гатовымі ахвяраваць сваім жыццём і маёмасцю на карысць справы адраджэння Айчыны.

Паражэнне Напалеона I прымусіла шляхту заходніх губерняў прынесці пакаянне і публічна дэманстраваць лаяльнасць да Расійскай імперыі. Нягледзячы на супрацоўніцтва ў 1812 г. з напалеонаўскай адміністрацыяй, шляхта, каталіцкае і ўніяцкае духавенства атрымалі амністыю і захавалі свае правы і прывілеі. Здрада гэтых груп насельніцтва для Аляксандра I была прадказальнай. У той жа час праваслаўнае духавенства і рускія чыноўнікі, якія ў прыватных выпадках здрадзілі ў 1812 г. прысязе свайму імператару, панеслі суровае пакаранне.

Нягледзячы на вялікія матэрыяльныя і людскія ахвяры, галоўная страта для Беларусі ў час вайны 1812 г. была палітычная. Хаця пасля вайны характэрная для Аляксандра I дэмагагічная палітыка заляцанняў да шляхты працягвалася, ідэя вяртання ранейшай дзяржаўнасці на беларускія землі была практычна пахавана, што прывяло да кансервацыі нізкага ўзроўню нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, да складвання на тэрыторыі Літвы і Беларусі спецыфічнага, польскага па змесце і формах нацыянальна-вызваленчага руху. У той жа час шырокія колы грамадства зразумелі неабходнасць глыбокіх перамен у палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сістэме Расійскай імперыі, што няўхільна вяло ў будучым да ўзрастання напружанасці ў Беларусі.

# ПЫТАННІ

1. Ахарактарызуйце расійска-французскія ўзаемаадносіны пачатку XIX ст. Чым яны вызначаліся?

2. Якія палітычныя настроі панавалі ў розных колах грамадства Беларусі напярэдадні вайны 1812 г.?

3. Якое месца адводзілася «польскім праектам» у ваенна-стратэгічных планах Расійскай імперыі?

4. Ахарактарызуйце французскую сістэму кіравання на беларускіх землях у час вайны 1812 г. Якія асаблівасці ў ёй можна вызначыць?

5. Як складваліся ў 1812 г. адносіны насельніцтва Беларусі з Вялікай арміяй? З чым гэта было звязана?

6. Якія наступствы мелі падзеі вайны 1812 г. і замежных паходаў 1813–1814 гг. для Беларусі?

# 5

# УРАДАВАЯ ПАЛІТЫКА

## «ПОЛЬСКАЕ ПЫТАННЕ» І ЎРАДАВАЯ ПАЛІТЫКА

Урадавая палітыка ў першай палове XIX ст. звязана з імёнамі расійскіх імператараў Аляксандра І і Мікалая І. Для эпохі Аляксандра І (1801–1825) была характэрна палітыка «заходніцтва». Расчараванне вынікамі французскай рэвалюцыі, якая не стварыла «царства розуму на зямлі», прывяло самыя шырокія колы еўрапейскай грамадскасці да паўсюднага ўмацавання веры ў эвалюцыйны, рэфармісцкі шлях дзяржаўнага развіцця. Адсюль паходзіць спроба правядзення ў Расіі шырокіх дзяржаўных пераўтварэнняў – «дней Александровых прекрасное начало». Намер Аляксандра І павярнуць краіну на шлях канстытуцыйнай манархіі і вырашыць сялянскае пытанне сустрэў ва ўрадавых колах Расіі моцную апазіцыю з боку кансерватараў, праціўнікаў лібералізацыі дзяржаўнага жыцця, асабліва перад пагрозай напалеонаўскага нашэсця. Заходніцкі курс паступова згубіў сваю дынаміку, а ў 1820-х гг. ён змяніўся ўзмацненнем самадзяржаўных тэндэнцый і расчараваннем імператара, які ўсвядоміў правал сваёй палітыкі.

Час праўлення Мікалая І (1825–1855) – гэта вяртанне да традыцыяналісцкага шляху развіцця Расіі. Ідэалагічным абгрунтаваннем гэтага шляху стала так званая «тэорыя афіцыйнай народнасці», адной з праяў якой з'явілася ўмацаванне асноў манархічнага праўлення і новая спроба вырашэння сялянскага пытання, для чаго было створана некалькі сакрэтных камітэтаў. Нягледзячы на розныя падыходы ў здзяйсненні ўнутранай

палітыкі, абодвух імператараў аб'ядноўвала адно – тэрміновае вырашэнне «польскага пытання».

Падзелы Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795) паклалі канец існаванню адной з буйных дзяржаў Еўропы і абумовілі ўзнікненне «польскага пытання». Адной з яго асаблівасцей было пастаяннае імкненне пераважнай большасці польскага грамадства да аднаўлення страчанай дзяржаўнасці і былой велічы. Гэта рабіла «польскае пытанне» ўвесь час вострым і злабадзённым.

«Польскае пытанне» аказвала ўплыў на ўсе сферы ўрадавай палітыкі, якая праводзілася на тэрыторыі Беларусі. Аднак найбольш яно праявілася ў заканадаўчай, саслоўнай, нацыянальна-рэлігійнай палітыцы і ў галіне асветы.

Без змены сваёй сутнасці формы і метады гэтай палітыкі мяняліся ў залежнасці ад палітычнай сітуацыі ў заходнім рэгіёне. Пры Аляксандры I землі Вялікага Княства Літоўскага разглядаліся як «польскія», а пры Мікалаі I – як «спрадвечна рускія». Таму адной з галоўных задач урад лічыў вяртанне страчаных на працягу XVII–XVIII стст. пазіцый праваслаўя, ліквідацыю ўплыву Рыма на ўнутраныя справы Расіі, асабліва ў галіне царкоўнага жыцця і асветы.

Характар урадавай палітыкі на тэрыторыі Беларусі шмат у чым вызначаўся канстытуцыянальнымі імкненнямі Аляксандра I, які паставіў пытанне аб магчымым аднаўленні польскай дзяржаўнасці. Гэта дапамагло прыцягнуць да агульнаімперскай дзяржаўнай дзейнасці дзеячаў былой Рэчы Паспалітай, у тым ліку А. Е. Чартарыйскага і М. К. Агінскага, садзейнічала стварэнню Каралеўства (Царства) Польскага (1815) са сваёй канстытуцыяй і мясцовай адміністрацыяй.

Няўпэўненасць, якая існавала ў Аляксандра I адносна межаў будучай «Польшчы», а магчыма, і дыпламатычныя меркаванні прывялі да таго, што ўся тэрыторыя Беларусі была ўключана ў склад Віленскай навучальнай акругі, польскай па характары сваёй дзейнасці. Вынікам такой палітыкі з'явілася ажыўленне польскага ўплыву ў галіне культуры і мовы, умацаванне пазіцый каталіцызму. Выкрыццё на пачатку 1820-х гг. у Віленскім універсітэце тайных студэнцкіх гурткоў, у якіх прымала ўдзел беларуская моладзь, спрыяла змяненню ўрадавай палітыкі на Беларусі. З гэтага часу асноўным яе напрамкам становіцца ўсямернае паслабленне польскага палітычнага і культурнага ўплыву. Невыпадкова з Віленскай вучэбнай акругі ў 1824 г. былі выключаны і перададзены ў Пецярбургскую вучэбную акругу дзве беларускія губерні – Віцебская і Магілёўская, а А. Е. Чартарыйскага на пасадзе папячыцеля акругі змяніў М. М. Навасільцаў.

Гэты курс яшчэ больш узмацніўся ў канцы 1820-х гг. і асабліва ў сувязі з паўстаннем 1830—1831 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі. Менавіта гэтым тлумачыцца стварэнне Беларускай навучальнай акругі з дакладна акрэсленымі адміністрацыйна-этнічнымі межамі беларускай тэрыторыі. У імкненні даказаць, што гэта тэрыторыя была здаўна «рускай», урад разгарнуў адносна шырокую выдавецкую дзейнасць па гісторыі, этнаграфіі і культуры Беларусі.

## ЭВАЛЮЦЫЯ САСЛОЎНАЙ ПАЛІТЫКІ

Саслоўная палітыка, якая праводзілася на тэрыторыі Беларусі, была накіравана на ўмацаванне пазіцый Расіі. У адносінах да дваранства Беларусі яна ўлічвала гістарычныя асаблівасці, якія складваліся ў ВКЛ на працягу стагоддзяў. Расія не ведала такой сацыяльнай групы, як дробная шляхта, якая часам набліжалася да становішча селяніна-аднадворца. Працэнт дваранскага саслоўя ў Расіі быў значна ніжэйшы, чым у Беларусі. Збяднелыя дваране ў Расіі гублялі свае прывілеі, пераходзілі на дзяржаўную ваенную або грамадзянскую службу. На Беларусі збяднелая шляхта фармальна не адрознівалася ад магнатаў і юрыдычна мела з імі аднолькавыя правы. Розніца ў прававым статусе дваранства ў Расіі і Беларусі была даволі значнай. У былой Рэчы Паспалітай шляхта не прывыкла да бясспрэчнага паслухмянства дзяржаўнай уладзе. Традыцыя гэта ўзыходзіла яшчэ да эпохі «залатых вольнасцей шляхецтва». У Расіі, дзе існавала неабмежаваная манархія, традыцыі палітычнага жыцця былі зусім іншыя. Таму палітыка расійскага ўрада ў адносінах да дваранства Беларусі яшчэ з канца XVIII ст. вызначалася надзвычайнай асцярожнасцю.

Мясцовай шляхце надаваліся ўсе правы і прывілеі, якімі валодала расійскае дваранства, дазвалялася права карыстання «мясцовымі законамі», калі яны не супярэчылі «расійскім». На тэрыторыі Беларусі да 1840 г. дзейнічаў Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. Невыпадкова ва ўсіх указах, якія выходзілі ў першай чвэрці XIX ст., падкрэслівалася, што «суд і расправа» з'яўляюцца асаблівымі ўнутранымі справамі тэрыторый, якія былі далучаны да Расіі. Яны павінны весціся на мясцовым праве і пераважна на мясцовай (польскай) мове. Аднак мясцовая губернская і павятовая адміністрацыя стваралася паводле расійскіх норм і была строга падпарадкавана цэнтральнай уладзе. Асцярожнасць у адносінах да дваранства Беларусі дыктавалася тактычнымі меркаваннямі.

Новым ва ўрадавай палітыцы быў дыферэнцыраваны падыход да розных груп дваранства беларускіх губерняў. На першы план вылучаецца палітыка ў адносінах да дробнай шляхты, якая складала абсалютную боль-

шасць мясцовага прывілеяванага саслоўя. Яна праявілася ў так званым «разборы» шляхты, у прыпісцы былых шляхцічаў да розных груп падатковага саслоўя.

І хоць «разбор» шляхты быў дэклараваны яшчэ ў 1772 г., яго рэалізацыя праводзілася марудна, непаслядоўна, асабліва з прычыны ўскладненай юрыдычнай сістэмы доказаў дваранскага паходжання. З пачатку XIX ст. адным са шляхоў паслаблення пазіцый дробнага дваранства было змяненне заканадаўства ў сістэме выбарных судовых органаў. Штуршком для змянення становішча па «разборы» шляхты з'явілася паўстанне 1830–1831 гг. «Разбор» праводзіўся з пункту гледжання не толькі стварэння адзінай эканамічнай і палітычнай прасторы, але і пашырэння фіскальнай практыкі ўрада, павелічэння колькасці плацельшчыкаў падаткаў і пастаўшчыкоў рэкрутаў.

З канца XVIII ст. дваранства Беларусі з'яўлялася актыўным удзельнікам выступленняў за аднаўленне Рэчы Паспалітай. Палітыка ўрада ў адносінах да паўстанцаў, а таксама да членаў тайных гурткоў да 1830-х гг. была дваістай. Удзельнікі найбольш масавых з іх (паўстанне Т. Касцюшкі, паход Напалеона 1812 г.) практычна засталіся без пакарання. Гэтым урад спрабаваў прыцягнуць на свой бок вышэйшае саслоўе беларускіх губерняў. Адначасова адбываўся працэс абмежавання праў і прывілеяў мясцовай шляхты. У выніку яе становішча пагоршылася, а імкненне шляцічаў да аднаўлення Рэчы Паспалітай узмацнілася.

Значнай падзеяй было паўстанне 1830–1831 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі. Невыпадкова рэпрэсіі абрынуліся ў першую чаргу на прадстаўнікоў дробнай шляхты. Арышты, высылка ва ўнутраныя губерні імперыі, сакрэтны нагляд паліцыі, цэнзура асабістай перапіскі сталі традыцыйнымі мерамі «супакойвання» шляхты. Пазіцыя беларускага дваранства ў ходзе падзей 1830–1831 гг. прымусіла ўрад Мікалая І перагледзець адносіны да сялянства і пачаць палітыку русіфікацыі Беларусі.

Урадавыя мерапрыемствы ў *сялянскім пытанні* на працягу першай паловы XIX ст. зведалі значную эвалюцыю. Гэта пытанне не магло не зацікавіць мясцовых памешчыкаў. «Вызваленне сялян» у «Остзейскім краі» (Прыбалтыцы) у 1816–1819 гг., паводле якога сяляне атрымлівалі асабістую свабоду, а памешчык заставаўся ўласнікам усіх зямельных угоддзяў, умацавала ў землеўладальніках памежных раёнаў жаданне беззямельнага вызвалення сялян. Дынабургскае дваранства Віцебскай губерні стварыла камітэт для выпрацоўкі адпаведнага палажэння. Аднак работа над ім зацягнулася надоўга і не была рэалізавана.

Пасля паўстання 1830–1831 гг. урад пачаў глядзець на сялян як на сваіх саюзнікаў, імкнуўся схіліць іх на свой бок, пра што сведчыць, напрыклад,

рэформа кіравання казённымі маёнткамі і дзяржаўнымі сялянамі. Яна праводзілася па праекце створанага ў 1837 г. Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. Рэформа П. Д. Кісялёва на Беларусі складалася з трох частак: рэформы сістэмы кіравання; палітыкі «апякунства» ў адносінах да сялян; шэрагу аграрных мерапрыемстваў, вядомых пад назвай «люстрацыі дзяржаўных маёмасцей». Рэформа пачалася з перабудовы апарату кіравання дзяржаўнай вёскай. У аснову заснавання ніжэйшых ступеняў кіравання было пакладзена «Устанаўленне аб кіраванні дзяржаўнымі маёмасцямі ў губернях» (1838).

28 снежня 1839 г. было выдадзена спецыяльнае «Палажэнне аб люстрацыі дзяржаўных маёмасцей заходніх губерняў і Беластоцкай вобласці». Замест чатырохступеннай сістэмы мясцовага кіравання, якая была ўведзена ў расійскіх губернях, на Беларусі ўстанаўлівалі тры адміністрацыйныя ступені: губерня – акруга – сельская ўправа. Функцыі валаснойадміністрацыі былі размеркаваны паміж часовымі ўладальнікамі і сялянскімі выбарнымі. Новая адміністрацыя ўвяла жорсткі кантроль за часовымі ўладальнікамі, узняла статус сельскіх абшчын.

Другой часткай рэформы стала палітыка «апякунства» над дзяржаўнымі сялянамі. Яна прадугледжвала арганізацыю харчовай дапамогі сялянам праз спецыяльна перабудаваныя запасныя хлебныя магазіны, распрацоўку мер на выпадак неўраджаяў і масавых эпідэмій. Ставілася пытанне аб арганізацыі розных агранамічных мерапрыемстваў, пачатковага навучання дзяржаўных сялян, першай медыцынскай дапамогі, развіцця сістэмы страхавання, барацьбы з п’янствам, актывізацыі гандлю. Аднак недахоп сродкаў, жаданне палепшыць сялянскі быт цалкам за кошт сялян звузілі рамкі рэформ, перашкаджалі здзяйсненню планаў рэфарматараў.

Галоўнай часткай рэформы П. Д. Кісялёва з’явілася люстрацыя дзяржаўнай маёмасці. Яна ставіла тры мэты: больш дакладны ўлік дзяржаўнай маёмасці, выраўноўванне гаспадарчага ўзроўню сялян шляхам скасавання малазямелля і рэгламентацыі павіннасцей сялян, павышэнне плацёжаздольнасці дзяржаўнай вёскі.

На першым этапе правядзення рэформы (да 1844 г.) урад спрабаваў вырашыць праблему шляхам пераразмеркавання зямельнага фонду паміж дзяржаўнымі маёнткамі і перасялення часткі сялян у больш забяспечаныя зямлёй губерні Расіі.

Люстрацыйныя камісіі павінны былі скласці інвентарныя вопісы казённых маёнткаў, вызначыць гаспадарчае становішча сялян, памеры сялянскіх надзелаў і павіннасцей. Зыходзячы з факту маёмаснай няроўнасці, што склалася ў дзяржаўнай вёсцы, сяляне дзяліліся на чатыры разрады: цяглых, якія мелі не менш дзвюх галоў буйной рагатай жывё-

лы; паўцяглых, якія мелі адну галаву працоўнай жывёлы; агароднікаў (халупнікаў), якія мелі хату з агародам, але былі пазбаўлены надзелу на полі; бабылёў (кутнікаў) – беззямельных і бяздомных сялян. Закон прадугледжваў, каб усе сяляне перайшлі ў разрад цяглых або, на крайні выпадак, паўцяглых гаспадароў, змяншаючы па магчымасці колькасць такіх, якія не маюць вясковай гаспадаркі і належаць да класа бабылёў. Рэалізацыя гэтага палажэння патрабавала наяўнасці запаснога зямельнага фонду, а таксама правядзення ўсеагульнага перадзелу зямлі ў казённых маёнтках. Абмежаванасць зямельнага фонду прымусіла ўсталяваць невысокі зямельны надзел на рэвізскую душу ў памеры трох дзесяцін пашы і адной дзесяціны сенакосу. Відавочна, што такі надзел быў недастатковым для забяспечвання пражытковага мінімуму сялян, але быў большым за дарэформенны. Тым не менш у выніку перадзелу колькасць бабылёў і агароднікаў у казённай вёсцы скарацілася.

Люстрацыя дакладна рэгламентавала павіннасці дзяржаўных сялян Беларусі. За выключэннем даніны, захоўваліся ўсе формы раней існаваўшых павіннасцей, але былі дакладна акрэслены іх памеры і нават усталяваны памеры штодзённых урокаў. Рэформа не адмяніла асноўную паншчынную павіннасць, але ў далейшым прадугледжвалася перавесці дзяржаўных сялян на аброк, што і пачало ажыццяўляцца ў 1844 г. Шматлікія павіннасці адымалі ў сялян амаль палову іх працоўнага часу (замест 1/3 паводле закону), аднак люстрацыя ўсё ж істотна абмежавала самавольства часовых гаспадароў і арандатараў, паставіла іх пад больш кантроль дзяржаўных чыноўнікаў.

З 1844 г. урад мяняе напрамак рэформы: фальваркова-прыгонная сістэма ва ўсіх дзяржаўных маёнтках знішчаецца. Дзяржаўныя сяляне паскоранымі тэмпамі пераводзяцца на пазямельны аброк. З фальварковых зямель ім былі зроблены прырэзкі да надзелаў. Да канца 1857 г. на аброк былі пераведзены ўсе маёнткі Мінскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў. Была ліквідавана і сістэма часовага ўладання.

Рэформа кіравання дзяржаўнымі сялянамі, якая суправаджалася важнымі гаспадарчымі і адміністрацыйнымі пераўтварэннямі, садзейнічала істотнаму паляпшэнню становішча дзяржаўных сялян. У выніку рэформы агульная плошча надзельнага фонду павялічылася на 10,73 %. Але гэта мала што змяніла ў забеспячэнні сялян зямлёй, бо за гады рэформы колькасць рэвізскіх душ павялічылася на 38,5 %. Тым не менш рэформа дазволіла некалькі выраўняць становішча сялян, у асноўным за кошт зніжэння паншчыны на 20 % і колькасці павіннасцей.

Асабліва заўважныя змены адбыліся ў прававым становішчы дзяржаўных сялян Беларусі. За імі прызнавалася права атрымання ўласнасці

ў спадчыну, права занятку гандлем і промысламі. На Беларусі мелі месца выпадкі змагання сялян за права лічыцца казённымі.

Рэформа П. Д. Кісялёва насіла буржуазны характар. Перавод на аброк спрыяў паскарэнню маёмаснай дыферэнцыяцыі, працэсу першапачатковага накаплення капіталу, вызваліў працоўныя рукі для капіталістычнай вытворчасці, стымуляваў рост гарадоў, з'явіўся адным з падрыхтоўчых мерапрыемстваў урада па вырашэнні аграрнага пытання ў Расіі ў цэлым.

У 40-х гг. XIX ст. урадам Расіі было пастаўлена пытанне пра ўвядзенне абавязковых інвентароў у памешчыцкіх маёнтках. З сакавіка 1840 г. П. Д. Кісялёў пачаў падрыхтоўку інвентарнай рэформы з мэтай падцягнуць узровень памешчыцкай вёскі да дзяржаўнай. У 1844 г. быў створаны Камітэт заходніх губерняў для выпрацоўкі «Правілаў для кіравання маёнткамі па зацверджаных для гэтага інвентарах». Былі складзены інвентары-апісанні памешчыцкіх маёнткаў з дакладнай фіксацыяй сялянскіх надзелаў і агульнай для ўсіх маёнткаў колькасці паншчынных дзён.

Увядзенне ў дзеянне перагледжаных і зноў складзеных інвентароў пачалося ў Беларусі з 1845 г. Для цяглавай сялянскай гаспадаркі, у залежнасці ад колькасці і якасці зямлі, у маёнтках устанаўліваліся надзелы памерам ад чатырох да дзевяці дзесяцін. Такая гаспадарка павінна была адпрацаваць на паншчыне тры дні з канём (мужчынская паншчына) і адзін дзень без каня (жаночая паншчына). Падводная павіннасць заставалася, але павінна была выконвацца не звыш паншчыны, а за кошт паншчынных дзён. Памешчыкам забаранялася самавольна ўсталёўваць згонныя дні, а таксама абкладаць сялян «данінай» – натуральнымі паборамі. Аднак памешчыкі рашуча сталі на абарону сваёй уласнасці, усяляк перашкаджалі перагляду старых і складанню новых інвентароў. Уваходзячы ў склад інвентарных камітэтаў, яны дамагаліся для многіх маёнткаў не толькі захавання былых прыгонніцкіх павіннасцей, але і, у шэрагу выпадкаў, іх павелічэння. Асцерагаючыся абвастрэння адносін з мясцовымі памешчыкамі, урад асабліва не падганяў іх. Да 1857 г. перагледжаныя і зноў складзеныя інвентары былі ўведзены ў дзеянне толькі ў дзясятай частцы памешчыцкіх маёнткаў Беларусі. А ў сувязі з падрыхтоўкай сялянскіх рэформ 1860-х гг. неабходнасць ва ўвядзенні інвентароў зусім адпала.

## УРАДАВАЯ ПАЛІТЫКА Ў ГАЛІНЕ АСВЕТЫ

Зыходзячы з уяўлення пра далучаныя беларускія тэрыторыі як «спрадвечна рускія», з канца 1820-х гг. расійскі ўрад пачаў рэарганізацыю адукацыі на новых пачатках. Найбольш яскрава гэтыя мэты былі сфармуляваны ў нататцы віцебскага, магілёўскага і смаленскага генерал-губернатара князя

М. М. Хаванскага імператару Аляксандру I у 1824 г. Ён пісаў, што з часоў далучэння Беларусі да Расійскай імперыі адукацыя юнацтва знаходзілася ў руках каталіцкага і ўніяцкага духавенства, а ў школах манаскіх ордэнаў навучанне вялося па метадах старажытных аўтараў. Навукі пры гэтым выкладаліся на польскай і лацінскай мовах, славеснасць абмяжоўвалася вывучэннем польскай мовы, лацінскай і некаторых замежных, а расійская заставалася ў поўнай знявазе. Маладыя людзі, якія скончылі гімназіі, былі нявдольнымі да грамадзянскай службы, бо не ўмелі правільна перапісваць паперы на дзяржаўнай (рускай) мове.

Аднак зрабіць замах на пануючую ў Беларусі традыцыйную школу ўрад адразу не адважваўся, бо не жадаў абвастрэння адносін з мясцовым дваранствам. Таму сістэма адукацыі Беларусі ў першай чвэрці XIX ст. была пабудавана на прынцыпах, закладзеных яшчэ Адукацыйнай камісіяй. Згодна з рэформай адукацыі 1802 г. уся тэрыторыя Беларусі ўвайшла ў склад Віленскай навучальнай акругі (1803–1824), якую ўзначальваў князь А. Чартарыйскі. Навучальная акруга мела поўную самастойнасць і кіравалася «Статутам, ці Агульнымі пастановамі Віленскага ўніверсітэта і вучылішчаў яго акругі» (1803) і «Прадпісаннем арганізацыі вучылішчаў у акрузе імп. Віленскага ўніверсітэта» (1804). Карыстаючыся неабмежаваным даверам Аляксандра I і міністраў народнай адукацыі П. Завадоўскага і А. Разумоўскага, апякун акругі мог смела праводзіць ідэі аднаўлення самастойнасці Польшчы, якія, па прызнанні А. Чартарыйскага, былі альфай і амегай усяго яго існавання.

У аснову сістэмы адукацыі Беларусі, як і Расіі, былі пакладзены прынцыпы бессаслоўнасці, бясплатнасці навучання на ніжэйшых яго ступенях, пераемнасці навучальных праграм.

Згодна з рэформай ствауралася некалькі тыпаў навучальных устаноў. Пачатковая школа была прадстаўлена аднакласнымі прыходскімі вучылішчамі для ніжэйшых саслоўяў. Сярэднюю адукацыю давалі павятовыя вучылішчы (3 класы) і гімназіі (6 класаў). Адначасова са свецкімі ўстановамі ў Беларусі меліся шасцікласныя манастырскія павятовыя вучылішчы. Яны давалі сярэднюю адукацыю і адпавядалі павятовым вучылішчам і гімназіям, а іх выпускнікі мелі права паступаць ва ўніверсітэт. У першыя дзесяцігоддзі XIX ст. у Беларусі дзейнічала сетка вучылішчаў пры каталіцкіх і базыльянскіх манастырах. Аднак іх колькасць на працягу першай трэці XIX ст. паступова скарачалася, а ў 1832 г. у сувязі з закрыццём каталіцкіх манастыроў яны былі пераўтвораны ў свецкія. У 1824 г. у Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай і беларускіх паветах Віленскай губерні налічваліся 32 сярэднія школы і каля 130 пачатковых школ. Выкладанне ў навучальных установах вялося на польскай мове, руская мова выкладалася як адна з вучэбных дысцыплін.

Установай, якая забяспечвала вышэйшую ступень адукацыі, быў Віленскі ўніверсітэт з чатырма факультэтамі: маральных і палітычных навук, фізіка-матэматычным, медыцынскім, літаратурным і вольных мастацтваў, а таксама настаўніцкай і духоўнай семінарыямі. Меліся бібліятэка, батанічны сад, астранамічная абсерваторыя, анатамічны музей, лабараторыі. Першымі рэктарамі ўніверсітэта былі браты І. і Я. Снядэцкія. У функцыі ўніверсітэта ўваходзіла таксама арганізацыя навучальнага працэсу ў навучальнай акрузе наогул. Універсітэт павінен быў распрацоўваць навучальныя праграмы, выпускаць падручнікі, прызначаць настаўнікаў у гімназіі і вучылішчы. З 1805 г. універсітэт выдаваў штомесячны навукова-літаратурны часопіс Dziennik Wileński, а з 1812 г. – газету Kurjer Litewski і быў своеасаблівым цэнтрам культурнага жыцця краю, вакол якога згуртоўвалася мясцовая інтэлігенцыя.

Раскрыццё ў 1823 г. тайных таварыстваў у навучальных установах Віленскай акругі дазволіла расійскім уладам распачаць працэс дэпаланізацыі сістэмы асветы Беларусі. Дзеля гэтага праводзіўся перагляд праграм і падручнікаў, забаранялася заснаванне любых таварыстваў. Згодна з планам новага папячыцеля акругі М. М. Навасільцава пачалася ліквідацыя павятовых вучылішчаў з гімназічным курсам навук. Толькі два з іх – у Гродне і Жыровічах – атрымалі статус гімназій. А восем астатніх былі пераўтвораны ў звычайныя павятовыя вучылішчы, выпускнікі якіх не мелі права вучыцца ва ўніверсітэце.

Па-іншаму разгортваліся падзеі ў Віцебскай і Магілёўскай губернях, навучальныя ўстановы якіх з 1824 г. былі перададзены ў падпарадкаванне Пецярбургскай навучальнай акрузе. Але поўнага аб’яднання мясцовай сістэмы асветы з расійскай не адбылося.

Новым у беларускіх губернях стала стварэнне сістэмы духоўнай адукацыі. Вышэйшая каталіцкая адукацыя ў Беларусі была прадстаўлена Галоўнай духоўнай семінарыяй пры Віленскім універсітэце (1808–1831) з чатырохгадовым курсам навучання. Яна рыхтавала будучых членаў духоўных кансісторый і выкладчыкаў для епархіяльных семінарый (рымакаталікоў і грэка-каталікоў). У статуце семінарыі сцвярджалася, што ніхто з клірыкаў, прынятых у Галоўную семінарыю, не мог пакінуць духоўнага стану, нават па вельмі важных і справядлівых прычынах. Навучальны план семінарыі складаўся з вывучэння як багаслоўскіх, так і свецкіх дысцыплін, што дазваляла атрымаць будучым святарам самую шырокую адукацыю. Пасля заканчэння вучобы яны маглі выконваць функцыі не толькі святароў, але і семінарскіх выкладчыкаў і царкоўных кіраўнікоў. Пасля паўстання 1830–1831 гг. Галоўная семінарыя была пераўтворана ў каталіцкую акадэмію і ў 1845 г. пераведзена ў Санкт-Пецярбург.

Сярэднюю духоўную адукацыю рыма-каталікі маглі атрымаць у Магілёўскай духоўнай семінарыі (1783), размешчанай пры кафедральным саборы Св. Станіслава. Акрамя Магілёўскай семінарыі ў перыяд кіравання Рымска-каталіцкай царквой мітрапаліта Станіслава Богуша-Сестранцэвіча была ўтворана таксама Беластоцкая семінарыя.

Уніяцкія духоўныя ўстановы былі прадстаўлены Новасвержаньскай (1743–1828) і Лаўрышаўскай (1799–1828) семінарыямі, якія кіраваліся базыльянскім ордэнам, і Полацкай семінарыяй (1806–1828), створанай мітрапалітам Іраклііем Лісоўскім.

Прадметы ў гэтых навучальных установах выкладаліся пераважна на польскай і лацінскай мовах. Але з навучальнага раскладу не зніклі царкоўнаславянская мова і ўніяцкая (усходняя) царкоўная абраднасць. Тым не менш невысокі ўзровень выкладання царкоўнаславянскай мовы і ўсходняй абраднасці адбіўся на стане ўніяцкага набажэнства. Протаіерэй Міхаіл Бабpоўскі адзначаў, што непавага да грэцкага абраду спарадзіла грэбаванне царкоўнаславянскай мовай. Яна ледзь знайшла сабе прытулак і сховішча ў хоры манастыроў і ў кліры цэркваў.

Полацкая семінарыя за кароткі тэрмін стала ключавой навучальнай установай для грэка-каталікоў. Яе выпускнікі вылучаліся сярод іншых уніяцкіх святароў дэталёвымі ведамі «грэка-хрысціянскай абраднасці» і добрым валоданнем царкоўнаславянскай мовай. Невыпадкова менавіта на базе Полацкай епархіяльнай семінарыі ў 20-я гг. XIX ст. планавалася адкрыць уніяцкую духоўную акадэмію. У 1828 г. адкрылася семінарыя ў Жыровічах, дзе важнае месца занялі выпускнікі Галоўнай духоўнай семінарыі: протаіерэй Антоній Зубко (рэктар), святары Плакід Янкоўскі, Антоній Сасноўскі і інш.

Такім чынам, неаднаразовыя спробы ўніяцкіх іерархаў стварыць уласную навучальную ўстанову, прызначаную для навучання пастыраў уніяцкіх прыходаў, былі, у канчатковым выніку, рэалізаваны.

Праваслаўная духоўная адукацыя Беларусі знаходзілася ў стадыі фарміравання. Яе духоўным цэнтрам па-ранейшаму заставалася Магілёўская семінарыя, якая шмат зрабіла для стварэння пачатковых духоўных школ (Гомель, Невель). У 1785 г. архіепіскапам Віктарам Садкоўскім у Слуцку была адкрыта семінарыя, у 1840 г. яна была пераведзена ў Мінск. У 1833 г. у сувязі з аднаўленнем праваслаўнай Полацкай епархіі была адкрыта Віцебская семінарыя, у 1845 г. – Літоўская ў Вільні. Згодна з статутам 1808 г. пачалася арганізацыя павятовых вучылішчаў, якія былі павінны распачаць падрыхтоўку будучых выхаванцаў мясцовых семінарый.

Змены ў сістэме асветы Беларусі пачаліся пасля выкрыцця ў навучальных установах Віленскай навучальнай акругі тайных гурткоў. Узыхо-

джанне на трон імператара Мікалая I, вядомага сваімі антыпольскімі настроямі, зрабіла гэты працэс незваротным. У аснову народнай асветы пры новым імператары быў пакладзены прынцып строгай саслоўнасці. Каб ажыццявіць гэты прынцып, у 1828 г. быў выдадзены «Статут навучальных устаноў».

Згодна з ім пачатковая і сярэдняя адукацыя падзялялася на тры катэгорыі: для дзяцей ніжэйшага саслоўя (сялян) прызначаліся аднакласныя прыходскія вучылішчы з элементарнай праграмай навучання; для «сярэдніх» саслоўяў – трохкласныя вучылішчы з больш шырокай праграмай пачатковага навучання; для дзяцей дваран і чыноўнікаў уводзіліся сямікласныя гімназіі, заканчэнне якіх давала права для паступлення ва ўніверсітэты. Статут ліквідаваў пераемную сувязь паміж ступенямі. Узровень адукацыі павінен быў адпавядаць сацыяльнаму класу вучня, каб ніхто не намагаўся ўзвысіцца над становішчам, у якім яму «наканавана» застацца. Паводле новага Палажэння аб навучальных акругах (1835) апошнія выключаліся з-пад улады ўніверсітэтаў, істотна пашыраліся правы папячыцеляў навучальных акруг.

У поўнай адпаведнасці з палажэннем Статута 1828 г. была створана Беларуская навучальная акруга (1829). Дадатковыя палажэнні Статута тлумачылі мэту стварэння акругі – неабходнасць навучання юнакоў згодна з асаблівасцямі Беларусі – і прадпісвалі навучаць «роднай» (рускай) мове. У новую вучэбную акругу ўвайшлі Віцебская, Магілёўская, а ў 1831 г. – і Мінская губерня.

Падзеі 1830–1831 гг. прымусілі ўрад актывізаваць сваю палітыку на Беларусі. У студзені 1830 г. магілёўскі губернатар М. М. Мураўёў звярнуўся да Мікалая I з нататкай аб неадкладнай і поўнай ліквідацыі польскага і каталіцкага ўплыву на працу школ на Беларусі. У красавіку 1831 г. з'явіўся «найвышэйшы загад», у якім адзначалася, што спосаб тагачаснага выхавання юнацтва на Беларусі і іншых губернях, «вернутых ад Польшчы», патрабуе неадкладнага пераўтварэння і ўдасканалення. У сувязі з гэтым Міністэрству народнай асветы і папячыцелю акругі рэкамендавалася прыкласці ўсе магчымыя намаганні да хутчэйшага выпраўлення вучылішчаў пры рымска-каталіцкіх манастырах і да пераводу на рускую мову свецкіх вучылішчаў. У мэтах збліжэння мясцовых жыхароў з «прыроднымі рускімі» ў маі 1832 г. у сувязі з закрыццём Віленскага ўніверсітэта была ліквідавана Віленская навучальная акруга. Навучальныя ўстановы Віленскай, Гродзенскай губерняў і Беластоцкай вобласці ўвайшлі ў склад Беларускай навучальнай акругі. Цэнтр навучальнай акругі знаходзіўся ў Віцебску, яе папячыцелямі былі вядомы матэматык Р. І. Карташэўскі

(1829–1835) і былы дырэктар вучылішчаў Закаўказскай вобласці і Тыфліскага дваранскага пансіёна Е. А. Грубер (1836–1850).

Замест закрытага Віленскага ўніверсітэта меркавалася адкрыць у Оршы вышэйшае вучылішча для дзяцей дваран з далейшым яго пераўтварэннем у вышэйшую навучальную ўстанову. Аднак падчас паўстання 1830–1831 гг. пачатая справа была спынена. Асігнаваныя для гэтага грошы былі пераведзены ў Кіеў на будаўніцтва ўніверсітэта Св. Уладзіміра.

Сістэма асветы ў першай палове XIX ст. не абмяжоўвалася толькі мужчынскай і духоўнай адукацыяй. Разам з ёй у краі дзейнічалі жаночыя манаскія і прыватныя пансіёны.

Выкладанне ва ўсіх тыпах навучальных устаноў Беларускай навучальнай акругі было пераведзена на рускую мову. Польская мова была выключана з праграм адукацыі. Толькі ў заходніх губернях акругі яна вывучалася як асобны прадмет па скарочанай праграме. Выпускнікам Віленскага ўніверсітэта забаранялася выкладаць у мясцовых школах. Падрыхтоўку выкладчыкаў для Беларусі пачынае весці настаўніцкая семінарыя, створаная ў 1834 г. у Віцебску.

Важнай падзеяй у галіне асветы было адкрыццё ў 1840 г. у Горы-Горках земляробчай школы, якая ў 1848 г. была пераўтворана ў земляробчы інстытут.

Адметнай рысай мясцовай сістэмы асветы стала пашырэнне ваенна-вучэбных устаноў. Калі ў эпоху Аляксандра I яны былі прадстаўлены юнкерскімі вучылішчамі ў Бабруйску, Дынабургу і Магілёве, то пры Мікалаі I былі адкрыты кадэцкія карпусы ў Полацку (1835) і Брэсце (1842). Створаныя ў сувязі з умацаваннем агульнарасійскай ваеннай школы ў цэлым, кадэцкія карпусы Беларусі разглядаліся ўрадам як сродкі выхавання апазіцыйна настроенага дваранства ў духу адданасці самадзяржаўю і таму камплектаваліся напалову за кошт дваранства беларускіх губерняў. Усяго на пачатку 1860-х гг. у Беларусі налічвалася 567 навучальных устаноў усіх тыпаў, у тым ліку адна вышэйшая, 12 сярэдніх, 21 духоўнае вучылішча, звыш 400 пачатковых школ.

## ЗАКАНАДАЎСТВА

Палітыка ў галіне заканадаўства была непарыўна звязана з агульнай мэтай палітычнага курсу расійскага ўрада на беларуска-літоўскіх землях – прывязаць тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага да Расійскай імперыі.

Адносіны самадзяржаўя да пануючага саслоўя былі лаяльнымі, але ў шляхецкай свядомасці жыла ідэя былой незалежнасці Вялікага Княства

Літоўскага, якая яскрава адлюстроўвалася ў так званым ліцвінскім патрыятызме. Расійскі ўрад дакладна рэагаваў на гэту асаблівасць менталітэту мясцовага дваранства і па-рознаму падыходзіў да вырашэння амаль усіх найбольш істотных праблем былога Вялікага Княства Літоўскага і асабліва Польшчы.

Напярэдадні вайны 1812 г. з Францыяй імператару Аляксандру I неабходна было забяспечыць падтрымку з боку дваранства Літвы і Беларусі. Таму імператар істотна знізіў падаткі, якія паступалі ў казну з зямель былога Вялікага Княства Літоўскага, і выказаў жаданне аднавіць яго цэласнасць пад эгідай Расіі. Па даручэнні імператара ў 1811 г. магнаты М. К. Агінскі, Ф. Любецкі, Л. Плятэр, К. Любамірскі, Т. Ваўжэцкі склалі праект «Палажэння аб кіраванні аўтаномным Вялікім Княствам Літоўскім», у склад якога павінны былі ўвайсці ўсе тэрыторыі, што адышлі да Расіі ад былой Рэчы Паспалітай. Першым крокам на шляху да аўтаноміі павінна было стаць абвяшчэнне маніфеста Вялікага Княства Літоўскага. Прадугледжвалася таксама паступовае на працягу 10 год асабістае вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці. Здаецца, менавіта ў гэтай сувязі трэба разглядаць публікацыі на польскай і рускай мовах у 1811 г. Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г.

Аднак акрамя ідэі аўтаноміі Вялікага Княства Літоўскага Аляксандр I меў і іншы план, прапанаваны князем А. Чартарыйскім. Мелася на ўвазе аднавіць Каралеўства Польскае ў межах 1793 г., не звяртаючы ўвагі на княства. Гэты план падтрымліваўся большасцю польскай і апалячанай шляхты Літвы і Беларусі. Аднак дыялог з дваранствам не атрымаўся. Ажыццяўленне праектаў зацягвалася, а вайна з Напалеонам карэнным чынам змяніла становішча Беларусі.

Тым не менш праца над новым выданнем Статута працягвалася. Паколькі ў выданні 1811 г. былі зроблены памылкі (пераклад быў выкананы з польскага тэксту, а не з арыгінала), 17 лістапада 1828 г. Камітэт міністраў прыняў рашэнне стварыць камісію па перакладзе і выданні Статута ВКЛ 1588 г. на рускай і старажытнабеларускай мовах, а таксама яго польскім перакладзе 1614 г. Праца камісіі была скончана ў 1834 г. Аднак паўстанне 1830–1831 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі цалкам пахавала ідэю аўтаноміі. Урадам імператара Мікалая I была распрацавана праграма зліцця далучаных зямель з імперыяй. Яна поўнасцю супадала з новым курсам самадзяржаўя на ўніфікацыю агульнарасійскага заканадаўства, якое знайшло адлюстраванне ў кадыфікацыі законаў Расійскай імперыі.

Важным мерапрыемствам у гэтым напрамку было ўвядзенне ўказам ад 1 студзеня 1831 г. расійскага заканадаўства ў Магілёўскай і Віцебскай гу-

бернях, а таксама адмена 25 чэрвеня 1840 г. дзеяння Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. на тэрыторыях Мінскай, Віленскай, Гродзенскай губерняў і Беластоцкай вобласці. У 1840–1842 гг. урадам быў праведзены шэраг мерапрыемстваў па ўпарадкаванні мясцовага справаводства. Яго вынікам стаў загад 18 ліпеня 1840 г., які прадпісваў замест агульнага найменавання «белорусских» і «литовских» губерняў выкарыстоўваць іх асобныя назвы: Віцебская, Магілёўская, Віленская і Гродзенская. Мінская губерня афіцыйна не адносілася ні да «белорусских», ні да «литовских». Урад Мікалая І паступова замяняў назвы «Украіна» і «Літва» на «Паўднёва-Заходні» і «Паўночна-Заходні край».

## КАНФЕСІЙНАЯ ПАЛІТЫКА

Асноўным зместам канфесійнай палітыкі на тэрыторыі Беларусі было аднаўленне страчаных пазіцый праваслаўя. Аднак формы і метады дасягнення галоўнай мэты пры Аляксандры І і Мікалаі І былі рознымі. Яшчэ «Духовный регламент» Пятра І абвяшчаў імператара «верховным защитником и хранителем догматов господствующей церкви», а саму праваслаўную царкву – «першынствуючай і пануючай». Аднак, нягледзячы на сваё пануючае становішча ў эпоху імператара Аляксандра І, праваслаўная царква ў Беларусі знаходзілася ў цяжкім матэрыяльным і маральным стане. Веруючымі ў асноўным былі прыгонныя сяляне, бедная шляхта і мяшчане. Дваранства, пераважна каталіцкае, мала клапацілася пра ўладкаванне праваслаўных прыходаў. Больш за тое, сталі частымі выпадкі пераводу праваслаўных у каталіцызм, а далучэнне ўніятаў да праваслаўнай царквы з 1797 г. спынілася.

Для кіравання недзяржаўнымі веравызнаннямі ў Расійскай імперыі, згодна з маніфестам 25 ліпеня 1810 г., было створана Галоўнае ўпраўленне духоўных спраў замежных веравызнанняў (1810–1817, 1824–1832) на правах адмысловага міністэрства. Пад яго кантроль былі пастаўлены ўсе прадметы, якія адносіліся да духавенства розных замежных рэлігій і вызнанняў, выключаючы іх судовыя справы. Да гэтага ведамства на тэрыторыі Беларусі адносілася каталіцтва, іўдаізм і іслам.

Узначаліла новую ўстанову адна з найбольш давераных і набліжаных да цара асоб – князь А. М. Галіцын. У 1817 г. пад кіраўніцтвам А. М. Галіцына было ўтворана аб'яднанае Міністэрства духоўных спраў і народнай асветы (1817–1824), дзе ў рамках аднаго ведамства апынуліся кантроль над усімі рэлігіямі і сістэмай навучальных устаноў імперыі. Новая ўстанова павінна была спрыяць узмацненню барацьбы з ідэалагічным

вальнадумствам, прапагандзе рэлігійных, галоўным чынам «хрысціянскіх каштоўнасцей». Упадаючы ва ўсё мацнейшы містыцызм, Аляксандр I і А. М. Галіцын марылі пра пабудову «евангельскай дзяржавы». Адмысловае значэнне імі надавалася дзейнасці «Біблейскага таварыства». Таму ў Беларусі шырокай свабодай карысталіся каталіцтва і пратэстантызм. З дазволу імператара па ўсёй Беларусі зацвярджаліся езуіцкія місіі. Полацкая езуіцкая калегія загадам ад 12 студзеня 1812 г. была пераведзена ў ранг акадэміі з правамі ўніверсітэта. Толькі пасля вайны1812 г., падчас якой выявілася супрацоўніцтва каталіцкага духавенства з напалеонаўскай адміністрацыяй, езуіты былі выдвараны з Расіі, а іх маёмасць канфіскавана. Тады ж была скасавана і Полацкая акадэмія (1820).

Актывізацыя каталіцызму адбілася на становішчы ўніяцкай царквы Беларусі. Раз’язджаючы па ўніяцкіх прыходах, каталіцкія ксяндзы абвяшчалі, што быццам ёсць прадпісанне расійскага ўрада неадкладна далучыць уніятаў да каталікоў. Былі выпадкі гвалтоўнага захопу каталікамі ўніяцкіх храмаў. Значную шкоду аўтарытэту ўніяцкай царквы нанеслі базыльяне, прыхільнікі далейшай лацінізацыі царкоўнай уніі. Польская гісторыя, мова і літаратура былі асноўнымі прадметамі базыльянскіх школ.

У выніку пастаянных скаргаў іерархаў уніяцкай царквы ў Санкт-Пецярбург у 1805 г. каталіцкая калегія была падзелена на два дэпартаменты, каталіцкі і ўніяцкі, а ў 1830 г. было забаронена схіляць уніятаў да каталіцтва. Аднак барацьба ўнутры самой уніяцкай царквы паміж базыльянамі і белым духавенствам, прыхільнікамі яе «чысціні», не спынялася. У 1822 г. міністр духоўных спраў і народнай асветы князь А. М. Галіцын прапанаваў уніяцкаму дэпартаменту закрыць базыльянскія манастыры, якія знаходзіліся ў населеных пунктах з праваслаўным насельніцтвам. У выніку ў Беларускай базыльянскай правінцыі засталося 18 манастыроў, у Літоўскай – 12. Уніяцкаму духавенству было перададзена каля 600 душ сялян і больш за 14 тыс. дзесяцін зямлі.

У адрозненне ад свайго старэйшага брата, Мікалай I шукаў у праваслаўнай царкве апору для сваёй палітыкі. У 1832 г. Галоўнае ўпраўленне духоўнымі справамі замежных веравызнанняў было пераўтворана ў Дэпартамент духоўных спраў замежных веравызнанняў і ўключана ў структуру Міністэрства ўнутраных спраў, у складзе якога яно знаходзілася (за выключэннем 1880–1881 гг.) аж да 1917 г. З мэтай павышэння прэстыжу праваслаўнай царквы, адукацыйнага ўзроўню духавенства ў канцы 1820-х – пачатку 1830-х гг. была праведзена царкоўная рэформа. Яна грунтоўным чынам змяніла становішча праваслаўнай царквы ў Расійскай імперыі.

Мянялася становішча праваслаўнай царквы і ў Беларусі. Яшчэ ў 1826 г. распараджэннем імператара каталікам забаранялася будаваць капліцы ў мясцовасцях з праваслаўным насельніцтвам. У 1827—1830 гг. былі праведзены мерапрыемствы, скіраваныя на рэфармаванне ўніяцкай царквы і зближэнне яе з праваслаўем. Была створана асобная грэка-ўніяцкая калегія, а чатыры ўніяцкія епархіі рэарганізаваны ў дзве — Беларускую і Літоўскую. У базыльянскія манастыры дазвалялася прымаць толькі ўніятаў, якія добра ведалі «славянскую мову», прытрымліваліся грэка-ўсходняга богаслужэння, а прамаўляючы казанні, выкарыстоўвалі «мясцовы дыялект». Прадугледжвалася таксама ліквідацыя залежнасці ўніяцкага духавенства ад памешчыкаў-каталікоў. У аснову ўніяцкага навучання была пакладзена праваслаўная адукацыйная сістэма. У Віленскую каталіцкую семінарыю забаранялася прымаць уніятаў. Для іх была створана асобная семінарыя ў Жыровічах (1828). Адначасова адбывалася ачышчэнне ўніяцкай царквы ад лацінскіх абрадаў.

Паўстанне 1830—1831 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі і ўдзел у ім часткі ўніяцкага духавенства прадвызначылі лёс уніяцкай царквы. Для ўзмацнення пазіцый праваслаўя на Беларусі ў 1833 г. была створана Полацкая епархія. Дзейнасць іерархаў уніяцкай царквы, прыхільнікаў уз'яднання з праваслаўем, прымала больш мэтанакіраваны і актыўны характар. Аднак паспешлівасць у працэсе аб'яднання цэркваў, якая часта суправаджалася няўмелымі ўчынкамі мясцовай адміністрацыі, выклікала не толькі абурэнне ўніяцкіх святароў, але і сялянскія хваляванні. Рост незадаволенасці сярод сялянства прывёў да змянення тактыкі ў справе аб'яднання цэркваў.

«Найвышэйшы наказ» ад 13 студзеня 1834 г. прадпісваў праваслаўным епіскапам дзейнічаць «асцярожна і няспешна», а ўніяцкім — «асцярожна і паступова» ачышчаць уніяцкую царкву ад лацінства. У маі 1835 г. быў заснаваны Сакрэтны камітэт па справах уніяцкай царквы, у распараджэнні якога была сканцэнтравана ўся дзейнасць па аб'яднанні дзвюх цэркваў. У студзені 1837 г. кіраванне ўніяцкай царквой перайшло да Св. Сінода.

Пасля смерці ўніяцкага мітрапаліта Іасафата Булгака (1838) — праціўніка аб'яднання — старшынёй грэка-ўніяцкай калегіі быў прызначаны епіскап літоўскі Іосіф Сямашка, а Беларускую епархію ўзначаліў епіскап Васілій Лужынскі. Найбольш спакойна справа царкоўнага ўз'яднання ішла ў Літоўскай епархіі. З 1057 служыцеляў уніяцкай царквы за аб'яднанне выказаліся 760. У Полацкай епархіі з 680 царкоўных дзеячаў згоду далі толькі 186.

Для паскарэння аб'яднання ў канцы 1838 г. у Беларусь прыбыў прадстаўнік обер-пракурора Св. Сінода надворны саветнік В. Скрыпіцын.

Разам з Іосіфам Сямашкам яны дабіліся згоды большасці ўніяцкага духавенства на аб'яднанне. 12 лютага ў Полацку епіскапамі і вышэйшым духавенствам быў падпісаны «Саборны акт» аб уз'яднанні цэркваў і напісана прашэнне на вышэйшае імя. 26 лютага І. Сямашка перадаў прашэнне і «Саборны акт» обер-пракурору Св. Сінода графу М. Пратасаву, які 1 сакавіка прадставіў іх на вырашэнне імператару. Да прашэння быў дададзены спіс 1305 свяшчэннікаў, якія падтрымалі аб'яднанне. 25 сакавіка «сінадальны ўчынак» зацвердзіў Мікалай І. Уніятам былі пакінуты тыя абрады і звычаі, якія не супярэчылі сутнасці праваслаўя. Усяго ў 1839 г. да праваслаўнай царквы далучылася каля 1607 прыходаў і больш 1 млн 600 тыс. чалавек. Аднак у 1839 г. унія была ліквідавана не паўсюль. Уніяты засталіся ў Холмскай епархіі. Уз'яднанне на гэтай тэрыторыі адбылося ў 1875 г.

Духоўнае жыццё **мусульман** заходніх губерняў Расійскай імперыі да 1810 г. было засяроджана ў адной з экспедыцый МУС. Пасля стварэння Галоўнага ўпраўлення духоўных спраў замежных веравызнанняў «мусульманскія справы» былі перададзены ў новы орган. «Неспрыяльныя» для ўлады «настроі» адсочвала ІІІ аддзяленне Уласнай яго імператарскай вялікасці канцылярыі.

Пры Мікалаі І быў распрацаваны і прыняты шэраг важных заканадаўчых актаў, рэгулюючых жыццё і побыт мусульман Расійскай імперыі. Так, указ 27 сакавіка 1840 г. замацаваў дваранскі статут мусульманскага дваранства «заходніх» губерняў. Паводле ўказа 8 сакавіка 1842 г. мусульмане — дваране і нашчадкавыя ганаровыя грамадзяне мелі права распаўсюджваць і перадаваць у спадчыну правы і прывілеі ўсім сваім законным жонкам і дзецям. Удовы мусульман захоўвалі набыты ў шлюбе саслоўны статус.

Такім чынам, становішча мусульман у Расійскай імперыі было гарантавана дзяржаўным заканадаўствам, якое выконвалася бясспрэчна.

Становішча **яўрэяў** у эпоху Аляксандра І не змянілася ў параўнанні з папярэдняй эпохай. На яўрэйскае насельніцтва распаўсюджвалася мяжа аседласці, якая не дапускала яўрэяў ва ўнутраныя губерні Расійскай імперыі. У 1802 г. быў заснаваны першы яўрэйскі камітэт — вышэйшы заканадаўчы орган, які займаўся становішчам яўрэяў у Расіі, у тым ліку і Беларусі. У 1817—1856 гг. праводзіліся рэкруцкія наборы малалетніх яўрэйскіх дзяцей у так званыя яўрэйскія школы кантаністаў з наступным 25-гадовым тэрмінам вайсковай павіннасці. Кантаністам і іх нашчадкам дазвалялася пражыванне па-за межамі аседласці. Шматлікія кантаністы перайшлі ў праваслаўе. Пры Мікалаі І яўрэйскае пытанне набыло новы напрамак у параўнанні з папярэдняй эпохай. Яно было сфармулявана

міністрам народнай асветы графам С. С. Уваравым, які лічыў найбольш важнай задачай у адносінах да яўрэяў знішчэнне іх адасобленасці, «фанатызму раз'яднання». У 1844 г. купцам-яўрэям 1-й гільдыі дазвалялася сяліцца па-за межамі аседласці.

## ВЫСНОВЫ

Такім чынам, унутраная палітыка расійскага ўрада на беларускіх землях была абумоўлена неабходнасцю вырашэння «польскага пытання». Наяўнасць Каралеўства Польскага, створанага па рашэннях Венскага кангрэсу, аказвала вялікі ўплыў на грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя працэсы ў беларускіх губернях. І калі да 1830 г. урадавая палітыка характарызавалася адносным лібералізмам, то пасля паўстання 1830–1831 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі яна карэнным чынам змянілася. Імператар Мікалай І узяў курс на гвалтоўную ўніфікацыю ўсіх асаблівасцей беларускага краю на расійскі ўзор. Каардынуючую функцыю ў гэтай справе павінен быў выконваць Камітэт па справах заходніх губерняў.

Уніфікацыя закранула ўсе сферы жыцця грамадства. Каралеўства Польскае пазбавілася канстытуцыі і аўтаноміі, а на беларускіх землях быў скасаваны Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. Адбылося ўмацаванне расійскіх інстытутаў кіравання. Пэўны час у беларускіх губернях захоўвалася ваеннае становішча, а ўлада была цалкам сканцэнтравана ў руках генерал-губернатараў. Правы мясцовага дваранства былі часткова абмежаваны, удзельнікі паўстання і асобы, якія мелі да яго дачыненне, панеслі пакаранне. Яны былі сасланы ў Сібір ці вымушана падаліся ў эміграцыю, пазбавіліся маёмасці.

Сістэма адукацыі на беларускіх землях спачатку паступова (1823–1829), а пасля паўстання 1830–1831 гг. – хуткімі тэмпамі – стала пераводзіцца на рускую мову навучання. Яна пазбавілася бессаслоўнасці. Былі зачынены вышэйшыя і многія сярэднія навучальныя ўстановы, якія існавалі з часоў Рэчы Паспалітай. Яны замяняліся разгалінаванай сеткай духоўных і вайсковых вучылішчаў, семінарый і карпусоў, у якіх вучэбны і выхаваўчы працэс быў накіраваны на падрыхтоўку адданых расійскаму ўраду асоб.

Пасля задушэння паўстання 1830–1831 гг. расійскі ўрад паспрабаваў знайсці апору на беларускіх землях у сялянстве, пераважна праваслаўным. Таму быў узяты курс на паступовую ліквідацыю ўніяцкай царквы, які прывёў да Полацкага сабору 1839 г. і абвяшчэння ўз'яднання ўніятаў з праваслаўнымі. Гэтым жа тлумачыліся і рэформы, якія праводзіліся

на вёсцы. Між тым рэформы ў дзяржаўнай і памешчыцкай гаспадарцы ў 1830–50-х гг. захавалі дваранскую накіраванасць. Прынцыпы рэфармавання дзяржаўнай вёскі былі прызнаны памешчыкамі празмерна радыкальнымі. Сацыяльна-прававое становішча памешчыцкіх сялян змянілася мала. І пасля правядзення рэформ феадальная ўласнасць заставалася амаль некранутай. Тым не менш феадалізм нястомна рухаўся насустрач сваёй згубе.

## ПЫТАННІ

1. Узгадайце, якая частка польскіх зямель была перададзена Расіі па рашэннях Венскага кангрэса? Як тая частка стала называцца і якія правы атрымала?
2. Чым можна растлумачыць змены ва ўрадавай палітыцы на Беларусі ў 1830-я гг.?
3. З якіх мерапрыемстваў складалася рэформа П. Д. Кісялёва на Беларусі і чым яна адрознівалася ад гэтай жа рэформы ў расійскіх губернях?
4. Якія мерапрыемствы ўрада 30–40-х гг. XIX ст. сталі сведчаннем яго курсу на пашырэнне рускага ўплыву на беларускіх землях?

# 6

# ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ РУХ. ПАЎСТАННЕ 1830—1831 гг. У ПОЛЬШЧЫ, ЛІТВЕ І БЕЛАРУСІ

## «ВЕНСКІЯ СПАДЗЯВАННІ» 1815—1830 гг.

На развіццё грамадска-палітычнага руху ў Беларусі ў першай трэці XIX ст. моцны ўплыў аказалі рашэнні Венскага кангрэса (1814—1815) адносна «польскага пытання». Удзельнікі кангрэса пагадзіліся на далучэнне да Расійскай імперыі большай часткі былога Княства Варшаўскага, але дабіліся ад яе абавязку ўвесці на тэрыторыі новастворанага Каралеўства (Царства) Польскага ліберальную канстытуцыю. У далейшым расійскі ўрад павінен быў распаўсюдзіць «свабоду» (канстытуцыю. – *Аўт.*), права бяспошліннага гандлю і свабоды плавання па суднаходных рэках на ўсёй тэрыторыі «Польшчы ў межах 1772 г.».

15 (27) лістапада 1815 г. імператар Аляксандр I зацвердзіў Канстытуцыйную хартыю (канстытуцыю) Каралеўства Польскага (складалася з сямі раздзелаў і 165 артыкулаў). Яна вызначыла статус новадалучанай часткі польскіх зямель у складзе Расіі і іх дзяржаўнае ўладкаванне. Канстытуцыя абвяшчала, што каралеўства назаўсёды далучаецца да імперыі, а расійскі імператар становіцца спадчынным польскім каралём. Пры гэтым кожны новы манарх павінен быў асобна каранавацца, а яго ўлада на тэрыторыі каралеўства абмяжоўвалася палажэннямі канстытуцыі.

Па канстытуцыі інтарэсы расійскага імператара прадстаўляў намеснік (віцэ-кароль), які прызначаўся з ліку вялікіх князёў, а пры іх адсутнасці – з мясцовых ураджэнцаў. Канстытуцыя гарантавала насельніцтву значныя

правы (палітычныя, асабістыя, маёмасныя, роўнасць усіх перад законам, права адбыцця пакарання на радзіме) і пэўныя свабоды (друку, перамяшчэння; недатыкальнасць маёмасці, прэзумпцыя невінаватасці і інш.). Пануючай рэлігіяй у каралеўстве абвяшчалася каталіцтва, пры захаванні свабоды вераспавядання. Канстытуцыя таксама пацвярджала адмену прыгонніцтва. Усе пасады на дзяржаўнай службе і ў войску каралеўства (у мірны час складалася з трох пяхотных, дзвюх кавалерыйскіх дывізій і трох артылерыйскіх брыгад агульнай колькасцю 35 тыс. чалавек) павінны былі займацца мясцовымі ўраджэнцамі. Набыць грамадзянства можна было пры наяўнасці ўласнасці ці праз службу (на яе залічвалі праз пяць год пражывання ў каралеўстве).

Такім чынам, канстытуцыя істотна абмяжоўвала на тэрыторыі Каралеўства Польскага ўладу расійскага імператара. У выніку неабмежаваны самадзержац усерасійскі на невялічкай частцы сваёй імперыі станавіўся канстытуцыйным, ці абмежаваным, манархам. Невыпадкова звесткі аб канстытуцыі выклікалі ўзмоцнены інтарэс адукаванага грамадства Беларусі. Паколькі гэты акт уяўляў пэўную небяспеку для шматнацыянальнай імперыі, расійскія ўлады забаранілі друкаваць аб ім усялякія паведамленні. Тэкст канстытуцыі ніколі не змяшчаўся і ў расійскіх афіцыйных выданнях: ён быў выдадзены толькі на польскай і французскай мовах у першым нумары «Дзённіка законаў Каралеўства Польскага» за 1815 г.

Пэўнае расчараванне ў грамадстве выклікалі і ўрадавыя прызначэнні. Хоць міністэрскія пасады ў Каралеўстве Польскім занялі добра вядомыя палітычныя дзеячы мінулых часоў (Ст. Костка Патоцкі, Т. Мастоўскі, Т. Матушэвіч, Ю. Вельгорскі, Т. Ваўжэцкі, І. Сабалеўскі), фактычна ўлада апынулася ў руках трох набліжаных да расійскага імператара асоб – генерала Ю. Заёнчыка, сенатара М. Навасільцава і цэсарэвіча Канстанціна Паўлавіча.

Прызначэнне на вышэйшую адміністрацыйную пасаду 62-гадовага Юзафа Заёнчыка (1752–1826) было сустрэта польскім грамадствам як праява непавагі. Былы напалеонаўскі генерал не толькі з'яўляўся далёкім ад палітыкі чалавекам, але і быў інвалідам: у лістападзе 1812 г. у час абарончых баёў на Бярэзіне ён згубіў нагу. Польская грамадскасць вылучала на пасаду намесніка князя А. Чартарыйскага – шчырага патрыёта, высокаадукаванага, сумленнага і адданага польскай справе чалавека, выдатнага дыпламата. Але расійскі імператар адмовіўся ад ухвалення яго кандыдатуры. Аляксандр I бачыў у А. Чартарыйскім занадта самастойнага і незалежнага палітыка, а таксама ненадзейнага сябра, які здрадзіў у 1812 г.

Генерал Ю. Заёнчык станавіўся паслухмяным выканаўцам імператарскай волі, паколькі грамадзянская ўлада ў Каралеўстве Польскім фактыч-

на была сканцэнтравана ў руках Мікалая Навасільцава. Адзін з бліжэйшых сябраў Аляксандра I, вядомы ў расійскім грамадстве як праціўнік польскай аўтаноміі, М. М. Навасільцаў заняў неканстытуцыйную пасаду імператарскага камісара пры ўрадзе (Дзяржаўным савеце).

Урэшце, ваенная ўлада ў каралеўстве апынулася ў руках цэсарэвіча Канстанціна Паўлавіча, які стаў галоўнакамандуючым польскай арміяй. Гэта быў грубы і наравісты чалавек, які шырока практыкаваў цялесныя пакаранні, бязлітасна здзекаваўся не толькі з салдат, але нават і з афіцэраў. Такімі сваімі паводзінамі і імпульсіўнасцю ён рабіў на палякаў адмоўнае ўражанне і нават выклікаў усеагульную нянавісць. Пасля смерці Ю. Заёнчыка (1826) цэсарэвіч фактычна стаў намеснікам імператара.

Такім чынам, нягледзячы на знешнюю прывабную афарбоўку, Каралеўства Польскае знаходзілася ў поўнай залежнасці ад волі Аляксандра I. Невыпадкова мясцовая моладзь, не задаволеная абмежаванай аўтаноміяй і расійскім панаваннем у каралеўстве, пачала аб'ядноўвацца ў тайныя таварыствы.

Падобная палітычная сітуацыя назіралася і на беларускіх землях. Пасля Венскага кангрэса ў адукаванай часткі грамадства некалькі год захоўваліся спадзяванні на хуткае далучэнне беларуска-літоўскіх губерняў да Каралеўства Польскага. З мэтай умацавання пазіцый Расіі на еўрапейскай арэне гэтыя спадзяванні «падаграваў» і расійскі імператар. Аляксандр I неаднаразова публічна (на сеймах у Варшаве) і ў прыватных размовах выказваў жаданне аб'яднаць заходнія губерні імперыі з Каралеўствам Польскім.

Пэўныя меры, якія здзейсніў імператар, быццам пацвярджалі такі намер. У 1816 г. адбылася лібералізацыя мытнага тарыфа, а ў 1819 г. была заключана мытная унія паміж Расіяй і Каралеўствам Польскім. У 1816–1819 гг. на кіруючыя пасады ў беларускіх губернях былі прызначаны мясцовыя ўраджэнцы (К. Сулістроўскі, В. Гечан-Гечэвіч і інш.), а ў 1817 г. створаны Асобны Літоўскі корпус (яго ўзначаліў цэсарэвіч Канстанцін Паўлавіч). Радавы састаў гэтага корпуса фарміраваўся за кошт рэкрутаў з беларуска-літоўскіх і заходніх украінскіх губерняў, а на ківерах яго вайсковых частак выкарыстоўвалася «Пагоня» – сімвал Вялікага Княства Літоўскага, – змешчаная на двухгаловым расійскім арле.

Але далей гэтых касметычных крокаў расійскі імператар не пайшоў. Аляксандр I яшчэ пасля разгрому напалеонаўскіх войскаў у снежні 1812 г. канчаткова для сябе вырашыў, што землі, далучаныя да імперыі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай, раз і назаўсёды замацаваны за Расіяй. Для яго было зразумела, што аб'яднанне гэтых тэрыторый з астатняй часткай Польшчы немэтазгодна. Новаўтворанае аб'яднанне будзе прэтэндаваць на аўтаномію, ці поўную незалежнасць, і гэта можа пагражаць стратай не толькі заваёў імператрыцы Кацярыны II, але і стабільнасці ў імперыі.

Канчаткова ілюзіі ў грамадстве Беларусі растаялі ў 1822 г., калі Расія фактычна адмовілася ад выканання ўзятых на сябе ў Вене абавязкаў адносна «свабоды ў межах Польшчы 1772 г.». Менавіта ў 1822 г. расійскі ўрад скасаваў мытную унію з Каралеўствам Польскім, увёў новы мытны тарыф, які меў пратэкцыяніcцкі характар, і аднавіў інстытут генерал-губернатарства ў заходніх губернях. Таксама ўзмацнілася барацьба з антыўрадавымі і тайнымі таварыствамі (у 1817—1823 гг. у асяроддзі студэнцкай і вучнёўскай моладзі існавала каля 50 тайных згуртаванняў).

У першую чаргу ў жніўні 1822 г. былі забаронены *масонскія ложы* (масонства – рэлігійна-маральны рух, які ўзнік у пачатку XVIII ст. у Вялікабрытаніі. – *Аўт.*). Іх распаўсюджанне на тэрыторыі Беларусі было звязана з легальнай дзейнасцю масонства ў Каралеўстве Польскім. У гэты час масонскія арганізацыі існавалі ў большасці еўрапейскіх краін і не выклікалі актыўнага процідзеяння з боку ўлад. Больш за тое, даволі часта ў склад масонскіх ложаў уваходзілі ўплывовыя асобы. Але пасля рэвалюцыйных падзей пачатку 1820-х гг. у Еўропе (Грэцыя, Іспанія, Пьемонт, Неапаль, Сіцылія) расійскія ўлады ўбачылі ў масонстве пагрозу, паколькі яно выкарыстоўвалася для прыкрыцця антыўрадавай дзейнасці.

Масонскія ложы на тэрыторыі Літвы і Беларусі былі звязаны з адпаведнымі польскімі арганізацыямі. У 1819 г. у Вільні было створана адгалінаванне польскага таварыства «Нацыянальнае масонства», якое выступала за аднаўленне незалежнай «Польшчы ў магчыма больш шырокіх межах». У 1820 г. «Нацыянальнае масонства» фармальна спыніла сваё існаванне, а яго актыўныя ўдзельнікі ўвайшлі ў склад створанага ў маі 1821 г. «Патрыятычнага таварыства». Услед за гэтым рэгіянальнае аддзяленне «Нацыянальнага масонства» ў Вільні было рэарганізавана ў правінцыяльны савет новага таварыства (старшыня – М. Ромер, удзельнікі К. Радзівіл, Я. Вайніловіч, К. Навамейскі, А. Солтан). Асноўнай яго мэтай з’яўлялася барацьба любымі сродкамі, у тым ліку рэвалюцыйнымі, за свабоду і незалежнасць польскай дзяржавы ў межах 1772 г. Праз Т. Зана масоны ўстанавілі сувязі з тайнымі арганізацыямі студэнцкай і вучнёўскай моладзі, а таксама звярталі ўвагу на служачых Асобнага Літоўскага корпуса. Але выступленне не ўдалося, паколькі ў 1826 г. «Патрыятычнае таварыства» было выкрыта па справе дзекабрыстаў. Дзейнасць іншых масонскіх ложаў на Беларусі («Саюз тампліераў» і інш.) была менш прыкметнай.

Паралельна з масонскімі арганізацыямі і ў пэўнай сувязі з імі існавалі розныя легальныя і паўлегальныя студэнцкія і вучнёўскія таварыствы. 1 кастрычніка 1817 г. студэнтамі Віленскага ўніверсітэта (Т. Занам, А. Міцкевічам, А. Петрашкевічам, Э. Палюшынскім, Б. Сухецкім і Ю. Яжоўскім) было створана Таварыства філаматаў (сяброў навук).

Яно мела намер пры дапамозе культурна-асветніцкай дзейнасці «падняць дабрабыт айчыны». «Айчына» для філаматаў уключала землі былога ВКЛ, якія на той час уваходзілі ў склад Віленскай навучальнай акругі. Паступова ад ідэі ўнутранага ўдасканалення філаматы перайшлі да ідэі ўдасканалення грамадства шляхам карэнных сацыяльна-эканамічных рэформ: ліквідацыі прыгоннага права, увядзення канстытуцыйнага кіравання. І хоць практычная дзейнасць у гэтым напрамку была нязначнай, іх заслуга ў тым, што філаматы ўздымалі такія праблемы і спрабавалі звярнуць на іх увагу грамадства. У праграме таварыства вылучалася таксама ідэя аб праве народаў на незалежнае існаванне.

Некаторы час філаматы заставаліся нешматлікай групоўкай (у склад таварыства ўваходзілі ўсяго 19 чалавек). Для павелічэння колькасці прыхільнікаў нацыянальна-асветніцкіх ідэй вясной 1820 г. Т. Зан заснаваў новую студэнцкую арганізацыю – Таварыства прамяністых, – якая дзейнічала пад легальнай назвай «Таварыства сяброў карыснай забавы». «Прамяністыя» шчыра верылі ва ўзаемны добратворны ўплыў і прапагандавалі высокамаральныя ідэі. Асноўныя задачы таварыства вызначаліся ў статуце: «...жадаць дабра сваім землякам, кожнаму стану і цэламу народу наогул, захоўваць бацькоў сваіх карысныя звычаі, любіць прыродную мову і ёй вучыцца, маючы ў памяці адвагу і подзвігі продкаў, браць прыклад з іх па меры сіл сваіх і стану». Але дзейнасць «прамяністых» выклікала незадаволенасць універсітэцкага кіраўніцтва.

Замест распушчаных паводле загаду рэктара Віленскага ўніверсітэта «прамяністых» у канцы 1820 г. была ўтворана новая арганізацыя – Таварыства філарэтаў (прыхільнікаў маральнай чысціні). Адным з асноўных напрамкаў дзейнасці філарэтаў па-ранейшаму з'яўлялася пашырэнне асветы, але галоўная мэта – аднаўленне Рэчы Паспалітай – насіла палітычны характар. Новая арганізацыя стала больш масавай, паколькі ахоплівала шырокія колы моладзі: пад уплыў філарэтаў трапілі навучэнцы Мінскай, Свіслацкай і іншых гімназій.

Пасля забароны дзейнасці нелегальных таварыстваў на тэрыторыі Каралеўства Польскага і Віленскай навучальнай акругі (снежань 1821 г.) за моладдзю быў узмоцнены паліцэйскі нагляд. Вясной 1823 г. уладам стала вядома пра існаванне студэнцкіх і вучнёўскіх арганізацый у Віленскай навучальнай акрузе. У выніку следства, якое вялося пад кіраўніцтвам М. Навасільцава, было арыштавана каля 100 чалавек. У верасні 1824 г. спецыяльны камітэт (А. Аракчэеў, М. Навасільцаў, А. Шышкоў) вынес прысуд. Найбольш цяжкія пакаранні панеслі 11 філаматаў і 9 філарэтаў. «За распаўсюджванне безразважнага польскага нацыяналізму сродкамі навукі» яны былі высланы ў аддаленыя губерні Расіі, у тым ліку на Урал (Т. Зан,

А. Сузін і Я. Чачот). Некаторых асуджаных пакінулі ў Санкт-Пецярбургу і Маскве (А. Міцкевіча, Я. Сабалеўскага, Ю. Яжоўскага, Ф. Малеўскага). За выпушчанымі на волю нагляд вёўся да 1830 г. Была праведзена «чыстка» прафесуры Віленскага ўніверсітэта. Ад працы былі адхілены І. Лялевель, Ю. Галухоўскі, І. Даніловіч, М. Бабroom. Сваіх пасад пазбавіліся рэктар універсітэта Ю. Твардоўскі і папячыцель Віленскай навучальнай акругі А. Чартарыйскі (яго змяніў М. Навасільцаў).

Следства закранула і Свіслацкую гімназію, дзе ў 1819—1820 гг. існавалі тайныя суполкі (Вучэбнае і Маральнае таварыствы). Пасля арыштаў у Віленскім універсітэце гімназісты спрабавалі выступіць з акцыяй пратэсту. У выніку зачыншчыкі антыўрадавых дзеянняў былі арыштаваны і аддадзены ў салдаты.

Важным момантам у дзейнасці тайных таварыстваў Каралеўства Польскага, Літвы і Беларусі было наладжванне кантактаў з рускімі дзекабрысцкімі арганізацыямі. Пасля паўстання Сямёнаўскага палка ў Санкт-Пецярбургу (1820) на заходнюю ўскраіну імперыі былі перадыслацыраваны гвардзейскія часці, у якіх служылі будучыя дзекабрысты А. Бястужаў-Марлінскі, М. Лунін, А. Адоеўскі, К. Рылееў і інш. У 1821 г. кіраўнік Паўночнага таварыства М. Мураўёў напісаў «мінскі варыянт» Канстытуцыі. У 1823 г. С. Мураўёў-Апостал і М. Бястужаў-Румін выношвалі ідэю «бабруйскай змовы». Яны планавалі паўстанне войскаў у Бабруйскай крэпасці і арышт імператара ў час агляду цытадэлі. І хоць выступлення не адбылося, стала відавочнай неабходнасць сувязі правінцыі з цэнтрам і аб’яднання Паўночнага і Паўднёвага таварыстваў.

Дзекабрысты спрабавалі наладзіць супрацоўніцтва і з членамі «Патрыятычнага таварыства». Аднак у іх было рознае разуменне асноўных мэтаў: патрыёты Каралеўства Польскага і беларуска-літоўскіх зямель на першы план ставілі нацыянальнае вызваленне, а дзекабрысты галоўную задачу бачылі ў змене дзяржаўнага ладу і вырашэнні сялянскага пытання. Рознагалоссі прывялі да таго, што паўстанне на Сенацкай плошчы (снежань 1825 г.) было падтрымана толькі афіцэрамі Асобнага Літоўскага корпуса – членамі таварыства «Ваенныя сябры» (1825—1826 гг., Бранск Беластоцкага павета). Адным з яго заснавальнікаў быў адпушчаны на волю за недахопам улік філамат М. Рукевіч. Гэта таварыства мела свае філіялы «Згода» (уваходзілі грамадзянскія асобы) і «Заране» (вучні Свіслацкай і Беластоцкай гімназій). Выступленне Літоўскага піянернага батальёна (24 снежня 1825 г.), як і спроба ўзняць паўстанне ў Палтаўскім палку ў Бабруйскай крэпасці (студзень 1826 г., падпаручнік С. Трусаў, член таварыства «Злучаныя славяне»), скончылася няўдачай. У выніку да следства былі прыцягнуты 144 чалавекі. Капітан К. Ігельстром, паручнік А. Вягелін і іншыя зазналі долю ссыльных дзекабрыстаў.

Пасля разгрому студэнцкіх і вучнёўскіх груповак, а таксама выступлення дзекабрыстаў на Сенацкай плошчы яшчэ больш узмацніўся кантроль за дзейнасцю моладзі з боку афіцыйных улад. Нягледзячы на гэта, вызваленчы рух на былых землях ВКЛ не спыніўся, але ў ім адбыліся сур'ёзныя ідэалагічныя змены.

У 1826—1830 гг. тайныя таварыствы («Чорныя браты», «Браты пільныя», «Сармацкае племя», «Мнезеры») змяняюць напрамак сваёй дзейнасці. Калі раней асвета служыла асновай для выпрацоўкі вызваленчай ідэі, то з гэтага часу вызваленчая ідэалогія падпадае пад уплыў элементаў рэвалюцыйнага дэмакратызму. У праграмных патрабаваннях з'явіліся палажэнні, звязаныя з абавязковым набыццём і захаваннем зброі з мэтай барацьбы за аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Сацыяльна-культурныя пытанні, у якіх раней былі сканцэнтраваны амаль усе памкненні і надзеі членаў патрыятычнай моладзі, адыходзілі на другі план. Больш асцярожнай стала і дзейнасць саміх таварыстваў, хоць гэта не выратавала іх ад выкрыцця ўладамі.

## ПАЎСТАННЕ 1830—1831 гг.

У канцы 20-х гг. XIX ст. нацыянальна-вызваленчы рух, узброены ідэяй незалежнасці Рэчы Паспалітай, уступіў у новую фазу свайго развіцця. Нетрываласць у самой аснове саюза паміж самадзяржаўнай Расіяй і канстытуцыйнай Польшчай, невыкананне палажэнняў, зафіксаваных Венскім кангрэсам, сістэматычнае парушэнне правоў і свабод, гарантаваных канстытуцыяй, вялі да рэзкага абвастрэння супярэчнасцей паміж Расіяй і Каралеўствам Польскім.

У снежні 1828 г. у Варшаве па ініцыятыве П. Высоцкага ўзнікла тайнае Таварыства падхарунжых. Таварыства планавала забойства імператара Мікалая І падчас яго каранацыі ў Варшаве (май 1829 г.) і захоп улады. Змоўшчыкі вагаліся, тэрмін выступлення некалькі разоў пераносіўся. Непасрэдна падштурхнулі да паўстання рэвалюцыйныя падзеі 1830 г. у Францыі (ліпень) і Бельгіі (верасень).

Мікалай І планаваў кінуць на разгром рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Еўропе польскую армію і Асобны Літоўскі корпус. Аб гэтых планах стала вядома ў Варшаве, і кіраўнікі апазіцыі адчулі, што далей адцягваць паўстанне нельга. У ноч на 29 лістапада 1830 г. курсанты школы падхарунжых захапілі варшаўскі арсенал. Іх падтрымала большасць насельніцтва. Цэсарэвіч Канстанцін Паўлавіч дзейнічаў нерашуча, а потым увогуле прыняў рашэнне аб адводзе расійскіх войскаў з польскай тэрыторыі.

З першых дзён у паўстанцкім руху вылучыліся дзве плыні: кансерватыўна-арыстакратычная (на чале з А. Чартарыйскім) і радыкальна-дэмакратычная, так званая «левіца» (сярод яе кіраўнікоў найбольш актыўную ролю адыгрываў І. Лялевель). Арыстакраты прапаноўвалі вырашыць канфлікт дыпламатычным шляхам, а таму ўсяляк стрымлівалі патрыятычныя сілы і падрыхтоўку польскай арміі да вядзення ваенных дзеянняў. Кансерватары баяліся ўзмацнення народнага руху ў ходзе паўстання, а таму і не лічылі патрэбным здзяйсненне грунтоўных сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў. Яны імкнуліся паказаць паўстанне як канфлікт Каралеўства Польскага з Расіяй, а не як нацыянальна-вызваленчы рух польскага народа. Кансерватары займалі ўплывовыя пасады ў арміі (дыктатар Ю. Хлапіцкі і інш.), урадзе і ўтваралі большасць у сейме.

«Левіца», ці шляхецкія рэвалюцыянеры, якія ўваходзілі ў склад «Патрыятычнага таварыства», пераважна адлюстроўвала інтарэсы прагрэсіўнай часткі сярэдняй і дробнай шляхты, буржуазіі і студэнцка-вучнёўскай моладзі. Яна выступала за аднаўленне і незалежнасць Рэчы Паспалітай як цэнтралізаванай дзяржавы ў межах 1772 г. У барацьбе з расійскім самадзяржаўем галоўнай сілай шляхецкія рэвалюцыянеры лічылі польскі народ. «Левіца» падкрэслівала, што змаганне ідзе не супраць рускага народа, а супраць расійскага абсалютызму. Толькі «Патрыятычнае таварыства» адзначала, што паўстанне можа мець поспех, калі ахопіць усе землі былой Рэчы Паспалітай, а таму быў вылучаны лозунг «За нашу і вашу свабоду». «Патрыятычнае таварыства» было і адзінай палітычнай сілай, сацыяльная праграма якой улічвала інтарэсы падатковых саслоўяў. Але дэмакратычная плынь не была кансалідаванай, яе ўплыў у сейме і арміі быў нязначным.

Паколькі кіраўніцтва паўстаннем канцэнтравалася ў руках кансерватараў (Ю. Хлапіцкі, М. Радзівіл), яны спачатку спрабавалі наладзіць перамовы з Канстанцінам Паўлавічам і Мікалаем І (праз Ф. Друцкага-Любецкага і Ю. Язерскага), але безвынікова. 18 снежня 1830 г. пачаў працу польскі сейм. Пад націскам патрыятычных сіл 20 снежня ён выдаў маніфест, які абвяшчаў нацыянальны характар паўстання, а яго галоўнай мэтай – змаганне за «незалежнасць і свабоду». У студзені 1831 г. сейм дэтранізаваў Мікалая І з польскага прастола.

Некаторыя рэвалюцыйныя дзеячы разумелі неабходнасць пашырэння паўстання на тэрыторыю Літвы і Беларусі. 22 студзеня 1831 г. беларуска-літоўская шляхта, аб'яднаная ў Варшаве І. Лялевелем у клуб «Згуртаванне братоў», звярнулася да сейма з пасланнем (яго падпісала каля 200 чалавек). У «Адрасе Ліцвінаў» падкрэслівалася, што Літва, Валынь, Падолія і Украіна заўсёды былі з палякамі адзіным народам, адзінай Польшчай. З таго часу, як рэвалюцыя набыла нацыянальны характар, неабходным

лічылася вяртанне «адабраных» зямель, бо толькі так, паводле «Адраса...», паўстанне адпавядала б свайму высокаму прызначэнню.

Нацыянальны ўрад, у сваю чаргу, звярнуўся з заклікам да насельніцтва Беларусі, Літвы і Украіны. У ім адзначалася, што паколькі сейм і ўрад абвясцілі цэласнасць і незалежнасць Польшчы, таму і насельніцтва ўсходніх тэрыторый былой Рэчы Паспалітай павінна прымаць актыўны ўдзел у барацьбе. Але заклікі І. Лялевеля, Д. Хлапоўскага і М. Махнацкага накіраваць польскую армію на ўсход, каб дапамагчы сваім братам скінуць расійскі прыгнёт, не былі пачуты. З пачаткам паўстання на землях былога ВКЛ на разгляд сейма былі вынесены пытанні аб палітычных адносінах народаў у будучай адроджанай дзяржаве. Аднак толькі 1 мая 1831 г. Нацыянальны ўрад прыняў рашэнне аб арганізацыі дапамогі жыхарам беларуска-літоўскіх зямель, а 2 мая – аб прадстаўніцтве шляхты гэтых тэрыторый у сейме (адзін дэпутат ад павета).

На Беларусі і Літве вусная агітацыя і распаўсюджанне пісьмовых адозваў з заклікам да паўстання пачаліся ў студзені 1831 г. Акцэнт пры гэтым рабіўся на цяжкае становішча краю, прыгнечанага «маскалямі». Насельніцтва заклікалі ўзяць у рукі зброю і ўсёй грамадой ісці вызваляць краіну ад рускай улады. Але ніякіх канкрэтных абяцанняў аблягчэння становішча найбольш прыгнечанай часткі насельніцтва не гучала.

Для падрыхтоўкі і кіраўніцтва паўстаннем у студзені 1831 г. быў створаны Віленскі цэнтральны камітэт (С. Шумскі, М. Балінскі, А. Гарэцкі і інш.), большасць членаў якога прытрымлівалася памяркоўна-кансерватыўных поглядаў. Камітэт прызнаваў вяршэнства Нацыянальнага ўрада ў Варшаве і не праяўляў асаблівай ініцыятывы. Магчыма, гэта тлумачыцца згасаннем самой ідэі ВКЛ. Аднаўленне княства ў той момант ужо адыходзіла на другі план, і больш важным станавілася дасягненне незалежнасці, што атаясамлівалася з польскай дзяржаўнасцю ў межах 1772 г.

Камітэт займаўся зборам грашовых сродкаў на мэты паўстання, арганізацыяй майстэрні па вырабе зброі, спрабаваў каардынаваць дзейнасць павятовых камітэтаў. Але ў яго не было выразнай лініі паводзін і праграмы дзеянняў. Па сутнасці, камітэт не стаў кіруючым органам паўстання ў Літве і Беларусі, хоць яго дзейнасць спрыяла падрыхтоўцы выступлення.

За развіццём падзей на Беларусі ўважліва сачылі ў Санкт-Пецярбургу і прымалі экстранныя меры па прадухіленні паўстання. 1 снежня 1830 г. Віленская, Гродзенская, Мінская губерні і Беластоцкая вобласць былі пераведзены на ваеннае становішча. Паміж Каралеўствам Польскім і беларуска-літоўскімі губернямі была абмежавана сувязь. Адначасова ўмацоўваліся расійскія гарнізоны, татальным і больш пільным стаў нагляд за насельніцтвам. Найбольш падазроныя асобы былі этапіраваны

ў глыб Расіі, адбывалася чыстка мясцовай адміністрацыі (чыноўнікі-католікі замяняліся праваслаўнымі), уводзілася цэнзура перапіскі. Секвестру падвяргаліся маёнткі памешчыкаў, якія з пачаткам паўстання выехалі ў Каралеўства Польскае. Але прынятых мер было недастаткова.

Вясной 1831 г. у Беларусі і Літве склалася вельмі напружаная палітычная сітуацыя. Перадыслакацыі расійскіх вайсковых кантынгентаў і рэквізіцыі на патрэбы вайны вялі да пагаршэння і так дрэннага становішча большай часткі насельніцтва. Узбуджальна на грамадства дзейнічалі і чуткі аб поспехах польскай арміі (пад Варшавай і Грохавам). Да таго ж у многіх рэгіёнах Беларусі і Літвы не было значных расійскіх вайсковых сіл, якія рушылі далей на захад. У такіх умовах шляхта Віленшчыны і Міншчыны палічыла, што настаў зручны момант для паўстання.

Узброенае выступленне ў Беларусі ў красавіку 1831 г. у першую чаргу ахапіла Ашмянскі і Свянцянскі паветы Віленскай губерні, Вілейскі і Дзісненскі паветы Мінскай губерні. Але гэтыя дзеянні не былі скаардынаваны, паколькі агульнага кіраўніцтва не існавала.

У выпадку перамогі і авалодання цэнтрам павета шляхта выбірала паўстанцкі ўрад, кіраўніка ўзброеных сіл і фарміравала апалчэнне. Кіруючыя пасады ў большасці займалі прадстаўнікі буйной і сярэдняй шляхты, якія пры расійскім рэжыме служылі па выбарах дваранства. Павятовыя ўрады неадкладна абвяшчалі акты паўстання, у якіх прапагандавалі «вольнасць і роўнасць па праве». Паняцце «вольнасці» разглядалася як выгнанне з тэрыторыі ВКЛ расійскіх войск, аб'яднанне тэрыторый, страчаных у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай, і адначасова як рэалізацыя спрадвечнага імкнення ліцвінаў да захавання самастойнасці ў складзе федэратыўнай дзяржавы. Паўстанцкія ўлады прыводзілі насельніцтва да прысягі, абвяшчалі набор рэкрутаў; шляхце, якая далучалася да паўстання, гарантавалася захаванне ўсіх саслоўных і маёмасных правоў. Сялян і мяшчан яны заклікалі рашуча ўзяцца за зброю і адстойваць «сваю» новую ўладу і ў той жа час падпарадкоўвацца памешчыкам і выконваць звычайныя павіннасці.

На працягу красавіка – мая 1831 г. дзісненскія, свянцянскія, ашмянскія і вілейскія паўстанцы (да 10 тыс. чалавек) захапілі шэраг населеных пунктаў. Сярод кіраўнікоў партызанскіх атрадаў легендарную знакамітасць набыла беларуская паэтэса і фальклярыстка Эмілія Плятэр (1806–1831). Веданне народа, павага з боку простага селяніна-беларуса дапамаглі ёй хутка сабраць значны паўстанцкі атрад. Пераапранутая юнаком Э. Плятэр на чале свайго атрада прымала ўдзел у шматлікіх баях (нават спрабавала захапіць Дынабург), паказаўшы сапраўдную мужнасць і гераізм. Але 23 снежня 1831 г. смерць напаткала адважную беларускую дзяўчыну.

Для падаўлення паўстання ў Віленскай і Мінскай губернях і прадухілення яго на астатняй тэрыторыі ВКЛ у пачатку красавіка 1831 г. была сфарміравана спецыяльная Рэзервовая армія пад кіраўніцтвам генерала П. А. Талстога. У яе склад увайшлі войскі, размешчаныя каля Брэста і Гродна, і рэзервовыя часткі. Паколькі паўстанцы не маглі супрацьстаяць рэгулярнай арміі, яны пазбягалі адкрытых баёў. Пры набліжэнні расійскіх войскаў паўстанцы разбіваліся на малыя групы і адыходзілі ў бяспечныя месцы. Тым не менш да канца мая 1831 г. урадавым войскам удалося ліквідаваць ачагі супраціву на Віленшчыне і Міншчыне.

Рэальная пагроза паўстання існавала і ў іншых беларускіх губернях, але шмат дзе шляхта адмовілася ад выступлення з-за боязі выклікаць стыхійны сялянскі рух. На прадухіленне паўстання пэўны ўплыў аказалі эпідэмія халеры (ад яе памерлі нават цэсарэвіч Канстанцін Паўлавіч і фельдмаршал І. І. Дзібіч) і рашучыя захады расійскіх уладаў. З мэтай не дапусціць аб’яднання шляхецкага руху з сялянскім 3 красавіка 1831 г. быў выдадзены ўказ, які прадугледжваў ваенную падсуднасць шляхцічаў-паўстанцаў (з канфіскацыяй іх маёмасці), у той час як сялянам абяцалася прабачэнне, калі яны добраахвотна складуць зброю і вернуцца дамоў.

У канцы мая 1831 г. на Беларусі пачаўся новы этап паўстання, які быў звязаны з падыходам польскай арміі. Першым на беларускія землі ўступіў атрад генерала Д. Хлапоўскага (820 чалавек, крочыў праз Беластоцкую вобласць). Атрымаўшы шэраг перамог у невялікіх баях (пад Гайнаўкай, Лідай, Аранамі), гэты атрад папоўніўся зброяй і людзьмі, у тым ліку былымі салдатамі расійскай арміі. У хуткім часе пад кіраўніцтвам Д. Хлапоўскага было ўжо каля 5 тыс. чалавек.

Набліжэнне польскіх войскаў выклікала хваляванні ў Лідскім, Навагрудскім, Пружанскім, Кобрынскім і Слонімскім паветах Гродзенскай губерні. Найбольшую актыўнасць праявілі паўстанцы, якія дзейнічалі ў Белавежскай пушчы (да 800—1000 чалавек). Яны сур’ёзна пагражалі камунікацыям расійскай арміі, якая ваявала ў Каралеўстве Польскім. Таму на задушэнне паўстання ў Белавежскай пушчы ўлады кінулі значныя вайсковыя сілы і ў хуткім часе знішчылі ачагі супраціву.

У пачатку чэрвеня 1831 г. на тэрыторыю Віленскай губерні ўступіў 12-тысячны корпус генералаў А. Гелгуда, Г. Дэмбінскага і Ф. Роланда. 10 чэрвеня ў раёне Кейданаў адбылося яго аб’яднанне з атрадам Д. Хлапоўскага. Адзінае камандаванне польскімі рэгулярнымі сіламі на беларуска-літоўскіх землях прыняў на сябе А. Гелгуд. Пры штабе камандуючага быў створаны Часовы паўстанцкі ўрад (на чале з графам Т. Тышкевічам), які распаўсюджваў сваю ўладу на тэрыторыю Віленскай губерні. Урад неадкладна прыняў захады для папаўнення войска сялянамі і шляхцічамі,

што дазволіла сканцэнтраваць пад Вільняй каля 24 тыс. чалавек. Паўстанцы ставілі сваёй мэтай захоп горада.

Штурм Вільні пачаўся 19 чэрвеня 1831 г. Сілы былі няроўныя: расійскія войскі (каля 40 тыс. чалавек) мелі шмат артылерыі і лёгка адбівалі атакі. Поспех 1794 г. пад Вільняй паўтарыць не ўдалося. Страціўшы ў бітве каля 2 тыс. чалавек, паўстанцы вымушаны былі адступіць. Сярод іх пачалася дэмаралізацыя і дэзерцірства. Рэшткі экспедыцыйных і мясцовых атрадаў пакінулі Беларусь, частка з іх перайшла ў Прусію і склала зброю. Толькі атрад генерала Г. Дэмбінскага (каля 4 тыс. чалавек) здолеў адысці ў Гродзенскую губерню. У Навагрудку да атрада Г. Дэмбінскага далучыліся паўстанцы Навагрудскага і Слонімскага паветаў (400 чалавек на чале з Ю. Кашыцам) і разам з ім пакінулі горад.

У чэрвені – ліпені 1831 г. паўстанцкі рух разгарнуўся ў Мазырскім, Рэчыцкім і Пінскім паветах Мінскай губерні. Арганізатарамі і кіраўнікамі яго былі мясцовыя памешчыкі Ф. Кеневіч і Т. Пуслоўскі. Колькасць паўстанцаў склала каля 1300 чалавек, але дасягнуць нейкіх рэальных поспехаў яны не здолелі.

Пасля адыходу польскай арміі паўстанне на тэрыторыі Беларусі пайшло на спад. Амаль да восені 1831 г. працягвалася партызанская вайна асобных атрадаў. І толькі звесткі пра падзенне Варшавы (8 верасня), а затым Модліна і Замосця (адпаведна 9 і 21 кастрычніка) – апошніх паўстанцкіх бастыёнаў у Каралеўстве Польскім – прымусілі разысціся тыя атрады, якія яшчэ знаходзіліся ў лясах. Усяго за перыяд з красавіка па лістапад 1831 г. колькасць удзельнікаў паўстання на Беларусі склала каля 15 тыс. чалавек.

У тым, што паўстанне 1830–1831 гг. на Беларусі пацярпела паражэнне, былі свае прычыны. Неразуменне глыбіні сялянскага пытання і недастатковы ўлік этнарэлігійных асаблівасцей прывялі да таго, што надзеі на шырокі ўдзел у паўстанні падатковых саслоўяў не спраўдзіліся. Не адчуўшы рэальнага паляпшэння свайго становішча, сялянства ў асноўным засталося абыякавым да палітычнай праграмы паўстанцаў. Сітуацыя ўскладнялася і тым, што не было належнага ўзаемапаразумення паміж Нацыянальным урадам і Віленскім цэнтральным камітэтам, адзінства і ўзгодненасці ў паўстанцкім кіраўніцтве. Не было і адзінага ўрада Літвы і Беларусі, якому б падпарадкоўваліся ўсе павятовыя паўстанцкія структуры. Не спраўдзіліся надзеі беларускіх паўстанцаў і на падтрымку польскай рэгулярнай арміі. Дапамога, патрэбная ў сакавіку – красавіку 1831 г., якая магла б забяспечыць перавагу сіл на землях ВКЛ на карысць змагароў за незалежнасць, прыбыла са спазненнем на цэлыя два месяцы і ўжо не змяніла агульны ход гістарычных падзей.

Паўстанне 1830—1831 гг. на беларускіх землях насіла пераважна шляхецкі характар: у яго падрыхтоўцы і правядзенні асноўная роля належала сярэдняй шляхце, памешчыкам, чыноўніцтву і студэнцкай моладзі. Усё гэта прадвызначыла адвачны кансерватызм паўстання. У той жа час яно мела больш шырокі народны характар: у распаўсюджанні паўстання ўдзельнічалі каталіцкія і ўніяцкія святары, а каля 30 % паўстанцаў з'яўляліся прадстаўнікамі падатковых саслоўяў. Тым не менш выступленне нанесла моцны ўдар па самаўладстве, паспрыяла замацаванню рэвалюцыйных змен у Еўропе, разгортванню нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў іншых краінах.

Пасля задушэння паўстання на Беларусі пачаліся масавыя рэпрэсіі. Спецыяльныя следчыя губернскія камісіі пакаралі актыўных удзельнікаў выступлення і большасць з іх саслалі ў Сібір. Сваіх маёнткаў пазбавіліся не толькі сотні шляхцічаў, але і прадстаўнікі магнацкіх родаў, якія валодалі тысячамі прыгонных: Агінскія, Плятэры, Пшаздзецкія, Радзівілы, Сапегі, Чартарыйскія і інш. Многія паўстанцы знайшлі выратаванне ў эміграцыі. Пасля паўстання быў паскораны «разбор шляхты». Але ўрад не абмяжоўваўся рэпрэсіямі: пасля 1831 г. быў распрацаваны канкрэтны план поўнага зліцця заходніх губерняў з тэрыторыяй Расіі пад сцягам праваслаўя і адзінай рускай народнасці. Яго рэалізацыі паспрыяў спецыяльна створаны пры імператары Камітэт па справах заходніх губерняў (1831—1848).

Нягледзячы на рэпрэсіі, якія істотна абмяжоўвалі магчымасці нацыянальна-вызваленчага руху, цалкам пагасіць імкненне да волі, нацыянальнай і сацыяльнай свабоды царскія ўлады не змаглі.

## ГРАМАДСКІ РУХ У 30—50-х гг. XIX ст.

Пасля рэвалюцыйных падзей 1830 г. у Еўропе і паўстання 1830—1831 гг. у грамадска-палітычным жыцці Літвы і Беларусі назіраліся істотныя змены. Яны былі звязаны з паступовым афармленнем у грамадскай думцы трох асноўных плыняў: кансерватыўнай, ліберальнай і рэвалюцыйна-дэмакратычнай.

Доўгі час у грамадстве Беларусі панавалі **кансерватыўныя погляды**. Ідэалогія кансерватызму аформілася ў Еўропе яшчэ ў канцы XVIII ст. як рэакцыя на рацыяналізм і падзеі Вялікай Французскай рэвалюцыі. Кансерватары крытыкавалі змест ліберальных канцэпцый, заснаваных на дактрыне натуральнага права, ставілі пад сумненне пытанне ідэі натуральнага стану, грамадскага дагавору, прынцыпы суверэннасці народаў і праў чалавека.

З пункту гледжання кансерватараў, гістарычнае развіццё кіравалася Божай воляй, а таму чалавек павінен падпарадкоўвацца ягоным законам

маралі. Разам з рэлігіяй – найважнейшай асновай грамадства, – вялікую ролю ў падтрыманні балансу і парадку ў грамадстве кансерватызм адводзіў саслоўна-карпаратыўным формам грамадскага жыцця. Гарадскія і сялянскія абшчыны, цэх, саслоўная іерархія ў цэлым выконвалі, па меркаванні кансерватараў, сувязную ролю паміж індывідам і дзяржавай, прадухілялі іх узаемную адчужанасць. Роўнасць жа быццам разбурала гэту іерархію, рабіла індывіда бездапаможным перад тварам цэнтральнай улады і прыводзіла да дэзарганізацыі жыцця грамадства і дзяржавы, да хаосу. Таму парадак і стабільнасць былі асноўнымі каштоўнасцямі для кансерватараў.

У грамадскім жыцці кансерватызм праяўляўся перш за ўсё ў адносінах да рэлігіі, нацыянальных ідэй, а таксама ў крытыцы лібералізму. Надзвычай папулярнымі на Беларусі былі ідэі французскага палітычнага дзеяча і філосафа, аднаго з заснавальнікаў кансерватыўнай дактрыны Ж. дэ Местра (1753–1821). Ён з’яўляўся прыхільнікам аўтакратыі і рэлігійнага правідэнцыялізму, лічыў, што дзеянні людзей вызначаны «Божай рукой». Пэўны час ідэі Ж. дэ Местра праз часопіс Miesięcznik Połocki (1818–1820) распаўсюджвалі прафесары Полацкай езуіцкай акадэміі.

Сярод адукаваных пластоў Беларусі шырокае распаўсюджанне атрымала ідэя рамантычнага правідэнцыяльнага нацыяналізму (*польскага месіянізму*), якая спалучала Божы промысел з ідэалізацыяй даўніны, традыцый і бытавых асаблівасцей народнасці. Галоўным ідэолагам польскага месіянізму з’яўляўся філосаф-містык А. Тавяньскі, які распачаў сваю дзейнасць у 1820 г. у Вільні. Пад уплывам А. Тавяньскага знаходзіўся мастак В. Ванькові і такія радыкальна настроеныя дзеячы, як Ф. Савіч, А. Рэніер і інш. Ідэі польскай нацыянальнай выключнасці распаўсюджвалі А. Міцкевіч («Кніга народа польскага і польскага пілігрыма») і яго сябры па Віленскім універсітэце.

Феадальны рамантызм, пропаведзь каталіцкай рэлігійнасці і крытыка рацыяналізму запаўнялі старонкі мастацка-публіцыстычных выданняў, якія ў 30–50-х гг. XIX ст. выходзілі ў Вільні (Niezabudka, Znicz, Atheneum), Гродне (Ondyna) і Віцебску (Rubon). Усе яны знаходзіліся пад уплывам кансерватыўных літаратараў і грамадскіх дзеячаў (Г. Ржавускага, М. Грабоўскага, І. Галавінскага, Л. Штырмера, К. Буйніцкага).

Ідэі *рускага кансерватызму* распаўсюджваліся на Беларусь праз працы гісторыкаў М. Карамзіна, М. Пагодзіна, філолага С. Шэвырова, журналістаў М. Грэча, Ф. Булгарына і афіцыйную ідэалогію. У 1832 г. з мэтай выхавання моладзі ў рускім нацыянальным духу міністр народнай асветы С. Увараў сфармуляваў «тэорыю афіцыйнай народнасці». Яе сутнасць заключалася ў тым, што рускае самадзяржаўе, праваслаўе і народнасць, як

асновы рускай гісторыі, забяспечваюць дабрабыт і магутнасць Расіі, мір паміж саслоўямі і абарону ад «тлетворных» рэвалюцыйных ідэй Захаду. Дзякуючы намаганням урада ўплыў гэтай ідэалогіі на Беларусі быў вельмі моцны, асабліва сярод праваслаўных сялян і духавенства.

У другой чвэрці XIX ст. у асяроддзі ўніяцкага (затым — праваслаўнага) духавенства пачала фарміравацца ідэалогія «*заходнерусізму*». Глебу для яе распаўсюджання стваралі жорсткі ўрадавы курс на русіфікацыю краю і ліквідацыю яго асаблівасцей. Хоць гэта ідэалогія адмаўляла гістарычнасць беларусаў і атаясамлівала іх з велікарускім этнасам, яна садзейнічала вывучэнню беларускай мовы, гісторыі і культуры. Найбольшы ўплыў на фарміраванне новага напрамку кансерватызму ў Беларусі аказалі епіскап Іосіф (Сямашка, 1798—1868) і навукоўца І. Грыгаровіч (1790/1792—1862). Але канчаткова як ідэалогія «заходнерусізм» аформіўся толькі пасля паўстання 1863—1864 гг.

У 30—50-я гг. XIX ст. у беларускім грамадстве пэўнае распаўсюджанне набылі **ліберальныя ідэі**. Яны вызначаліся ў імкненні да вызвалення асобы ад абмежаванняў, што накладваліся традыцыяй, грамадскай структурай ці законам, а таксама ў веры ў паступовасць прагрэсу і паслядоўнасць усіх яго стадый. У галіне дзяржаўнага ўладкавання ліберала́м былі ўласцівы: канстытуцыйны прадстаўнічы парадак, пашырэнне мясцовага самакіравання, свабода асобы ад дзяржаўнай апекі, адмена саслоўных прывілегій, удзел народа ў правасуддзі, палітычныя свабоды (слова, сходаў і саюзаў). У эканамічнай вобласці прынцып свабоды лібералы разумелі як свабоду гандлю і працы, неўмяшанне дзяржавы ў эканамічную дзейнасць уласнікаў.

На Беларусі ліберальныя ідэі знайшлі найбольшае распаўсюджанне якраз у эканамічнай сферы. Адным з ідэолагаў лібералізму быў віленскі юрыст Ф. Бохвіц (1799—1856). У сваіх выданнях (Obraz mysli, 1838, і інш.) ён прапагандаваў веру ў прагрэс, звязаны з развіццём прыродазнаўчых навук і прамысловасці. Ф. Бохвіц выказваў надзею, што пазбавіцца беднасці і голаду можна шляхам пашырэння кола ўласнікаў і надзялення ўсіх роўнымі правамі. Таму ён выступаў за вызваленне сялян ад прыгону, забеспячэнне недатыкальнасці асобы і ўласнасці. Фактычна гэтыя прынцыпы фарміравалі т. зв. праграму «арганічнай працы». Апошняя разумелася як паступовая і легальная дзейнасць і супрацьпастаўлялася планам рэвалюцыйнай узброенай барацьбы і нелегальнай актыўнасці.

Менавіта гэтыя прынцыпы ляжалі ў аснове дзейнасці мясцовых памешчыкаў, якія імкнуліся перабудаваць сваю гаспадарку на капіталістычны лад. Яны прапагандавалі прагрэсіўныя метады апрацоўкі зямлі, развіцця прамысловасці і гандлю. Дваране-лібералы патрабавалі часовага

вызвалення ад падаткаў памешчыкаў-фабрыкантаў, субсідзіравання нова-га будаўніцтва і стварэння ўмоў для развіцця прамысловасці ў гарадах, заснавання ў Вільні агранамічнага інстытута. Гэту легальную апазіцыю так званых «арганічнікаў» узначальвалі віленскі і віцебскі губернскія прадвадзіцелі дваранства Э. Мастоўскі і Л. Шадурскі.

Ліберальныя ідэі таксама абмяркоўваліся ў дваранскіх салонах і гуртках, якія існавалі ў Вільні (графа Р. Тышкевіча, С. Казакевіча, Э. Ромера, А. Балінскага), у Мазырскім (Я. і Н. Еланскіх), Кобрынскім (Л. Орды) і Пінскім (Ажэшкі) паветах. Ідэолагам памяркоўна-ліберальных колаў тагачаснай Беларусі быў ксёндз Л. Трынкоўскі, які выступаў у абарону сялян, крытыкаваў саслоўны эгаізм шляхты і заклікаў кіравацца ў адносінах да сялян «законамі розуму», лічыць іх братамі, роўнымі сабе людзьмі.

Радыкальны напрамак у грамадска-палітычным руху быў неаднародным. Пасля задушэння паўстання 1830—1831 гг. сур'ёзную небяспеку для царызму ўяўляла шляхецкая эміграцыя. З першых дзён свайго існавання яна разгарнула шырокую дзейнасць. Патрыёты не толькі не адмовіліся ад намеру ўзнавіць паўстанне, але вылучылі ідэю еўрапейскай рэвалюцыі. Яе пачаткам павінна было стаць паўстанне на землях былой Рэчы Паспалітай, а рухаючай сілай — народныя масы. Выкананне праекта было ўскладзена на палкоўніка Ю. Заліўскага (1797—1855), які павінен быў разгарнуць шырокі сялянскі рух.

У сакавіку 1833 г. частка эмісараў экспедыцыі Ю. Заліўскага тайна перайшла мяжу Расійскай імперыі. Тэрыторыя былога ВКЛ была падзелена на асобныя акругі. Сам Ю. Заліўскі павінен быў знаходзіцца на Магілёўшчыне. Акругу ў складзе Гродзенскага і Лідскага паветаў узначаліў М. Шыманскі, акругу са Слонімскага і Навагрудскага паветаў — М. Валовіч (1806—1833), які праявіў найбольшую актыўнасць. З сялян уласнай вёскі эмісар сфарміраваў невялікі атрад і пачаў партызанскія дзеянні. Мэтай сваёй барацьбы ён лічыў скасаванне памешчыцкага землеўладання, вызваленне сялян ад прыгону і абвяшчэнне тэрыторыі Беларусі і Літвы дэмакратычнай рэспублікай. Аднак мясцовыя памешчыкі мабілізавалі свае намаганні супраць эмісара. Сяляне таксама не падтрымалі заклікаў М. Валовіча і 15 мая 1833 г. выдалі патрыёта царскім уладам. Эмісара схапілі і пакаралі смерцю праз павешанне. У хуткім часе была ліквідавана дзейнасць і іншых партызанскіх атрадаў на тэрыторыі Віленскай і Гродзенскай губерняў.

Сацыяльны неспакой разам з актывізацыяй польскай эміграцыі спрыяў ажыўленню дзейнасці нелегальнай апазіцыі. У 30—40-я гг. XIX ст. праграмы нелегальных гурткоў вызначаліся спалучэннем нацыянальнага рамантызму і лібералізму. У той жа час вастрыня і нявырашанасць са-

цыяльных пытанняў прывялі да стварэння і першых рэвалюцыйна-дэмакратычных арганізацый. Патрыёты выношвалі планы вызвалення народа з-пад прыгнёту царызму і аднаўлення польскай дзяржавы ў межах 1772 г. шляхам узброенага паўстання.

У 30-х гг. XIX ст. эпіцэнтрам апазіцыі па-ранейшаму заставалася Вільня. Пасля закрыцця Віленскага ўніверсітэта там дзейнічалі створаныя на яго базе Медыка-хірургічная і Духоўная (каталіцкая) акадэміі. Першапачаткова ў асяроддзі студэнцкай моладзі пераважалі ліберальныя погляды. Найбольшым аўтарытэтам карыстаўся М. Лавіцкі, які лічыў неабходным знішчэнне саслоўнай няроўнасці, распаўсюджанне асветы сярод шырокіх народных мас, усталяванне народнага кіравання і г. д.

Паступова сярод студэнтаў вылучылася больш радыкальна настроеная групоўка. Ад сваіх ліберальных таварышаў яны адрозніваліся не столькі ўяўленнямі аб прынцыпах пабудовы справядлівага грамадства, колькі антыпамешчыцкай накіраванасцю і спробамі знайсці падтрымку ў сялян і рамеснікаў. Да ліку радыкальна настроеных студэнтаў Медыка-хірургічнай акадэміі належаў Ф. Савіч (каля 1815 – каля 1845), які ў 1836 г. стварыў «Дэмакратычнае таварыства». Акрамя студэнтаў у склад суполкі ўваходзілі прадстаўнікі разначыннай інтэлігенцыі, выхадцы са шляхецкага асяроддзя. Іх ідэалам было грамадства роўных магчымасцей. Удзельнікі гуртка даволі крытычна ацэньвалі дзейнасць сваіх папярэднікаў за тое, што яны ў 1830–1831 гг. не здолелі ўзняцца да прызнання роўнасці ўсіх людзей, не пазналі ў селяніне брата. Ф. Савіч і яго аднадумцы выступалі за права кожнага народа на самастойнасць, прапагандавалі рэспубліканскі лад.

Такіх жа поглядаў прытрымліваліся члены гуртка Р. Брынка і З. Навіцкага ў Слуцкім павеце. Былы філамат Зыгмунт Навіцкі стаў адным з найбліжэйшых памочнікаў эмісара ад дэмакратычнага крыла эміграцыі Шымана Канарскага (1808–1839). У 1835–1838 гг. яны паспрабавалі аб'яднаць апазіцыйныя колы Беларусі, Літвы і Украіны ў адну арганізацыю «Садружнасць польскага народа». Паводле меркавання Ш. Канарскага, «нельга розніцца і парушаць еднасць... У Польшчы адзіны павінен быць дух і адзінае цела, каб увесь народ... злучыць адным таварыствам... дабівацца ўсеагульнай свабоды». Такая агульная фармулёўка зрабіла магчымым далучэнне да «Садружнасці» як студэнтаў-радыкалаў, якія групаваліся вакол Ф. Савіча (1837), так і памяркоўных лібералаў (Л. Трынкоўскага, С. Казакевіча і інш.). Асноўнай мэтай дзейнасці Ш. Канарскага была падрыхтоўка новага паўстання, але ў маі 1838 г. эмісар трапіў у рукі ўладаў і быў пакараны смерцю. У чэрвені 1838 г. улады выкрылі і арганізацыю Ф. Савіча, а яе кіраўніка і актыўных членаў саслалі салдатамі на Каўказ.

У канцы 1830-х гг. палітычнае становішча на Беларусі заставалася даволі складаным. Афіцыйныя ўлады ўвесь час вялі пошукі палітычных змоўшчыкаў. У гэтай атмасферы нервовасці ў 1840—1841 гг. была сфабрыкавана так званая «справа паслядоўнікаў» Ш. Канарскага. Яе пачатак быў пакладзены ў красавіку 1840 г. арыштам на граніцы з Прусіяй двух студэнтаў Медыка-хірургічнай акадэміі і вучня Мінскай гімназіі, у якіх знайшлі забароненыя вершы. Студэнты былі абвінавачаны ў падрыхтоўцы замаху на жыццё Мікалая I. На Медыка-хірургічную акадэмію абрынулася хваля арыштаў. У выніку следства, якое вялося забароненымі метадамі (катаванні, пагрозы), жандары атрымалі прызнанні аб існаванні ў Вільні тайнага таварыства «Чалавечнасць», галоўнай мэтай якога была прапаганда ідэй адраджэння Рэчы Паспалітай. Адбыліся новыя арышты, у тым ліку С. Залівакі, які даў паказанні аб падрыхтоўцы паўстання на тэрыторыі Літвы, Беларусі і Украіны.

Для расследавання справы ў Вільню быў камандзіраваны палкоўнік У. І. Назімаў, які прыйшоў да высновы, што ніякай змовы не існуе. Але віленскі генерал-губернатар Ф. Я. Міркавіч настойваў на абвінавачваннях. І толькі пасля паўторнага следства, якое правёў генерал-ад'ютант А. А. Кавелін, Ф. Я. Міркавіч прызнаў сваю памылку. Генерал-губернатар падаў у адстаўку, але яна не была прынята: Мікалай I падзяляў погляды Ф. Я. Міркавіча на неабходнасць пільнага кантролю за заходнім краем. Арыштаваныя па справе былі ў большасці вызвалены, а палкоўнік У. І. Назімаў заслужыў гонар справядлівага следчага. У 1855 г., калі ён прыехаў у Вільню ў якасці генерал-губернатара, мясцовая шляхта сустракала яго з вялікай радасцю.

У 1846—1848 гг. новы рэвалюцыйны ўздым ахапіў амаль усю Еўропу. Выступленні дэмакратычнага і нацыянальна-вызваленчага характару назіраліся ў Францыі, Італіі, Германіі, Аўстрыі, Венгрыі, Грэцыі, Галіцыі, Букавіне, Малдове, Валахіі і інш. Гэтыя падзеі, якія ўвайшлі ў гісторыю пад назвай «вясна народаў», аказалі значны ўплыў і на грамадскі рух у Беларусі. Пад уздзеяннем сялянскіх выступленняў у Галіцыі (1846) сярод апазіцыйна настроеных прадстаўнікоў «адукаванага класа» станавілася папулярнай ідэя народнага паўстання, ці дэмакратычнай рэвалюцыі.

Прагрэсіўная інтэлігенцыя ў гэты час групавалася вакол грамадска-літаратурных часопісаў Gwiazda (1846—1849, Кіеў) і Pamiętnik Naukowo-Literacki (1849—1851, Вільня). Тут былі выхадцы са збяднелай шляхты, былыя «палітычныя злачынцы» (сасланыя раней на Каўказ), а таксама служачыя, урачы і настаўнікі. Актыўная грамадская пазіцыя выдаўцоў, абмеркаванне на старонках часопісаў розных сацыяльных пытанняў прымусілі ўлады зачыніць гэтыя выданні.

Былі праявы і больш радыкальнай дзейнасці. Так, у 1847 г. шляхціч Ю. Бакшанскі (1824—1863) звярнууся да смаргонскіх сялян з заклікам выступіць разам з мяшчанамі і салдатамі супраць сваіх паноў.

Мэту сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення народаў Польшчы і Расіі ў 1846—1849 гг. ставіў «Саюз свабодных братоў» («Братні саюз літоўскай моладзі»). Гэта была тайная арганізацыя, створаная ўраджэнцамі Лідскага павета Францішкам (1825—1904) і Аляксандрам (1827—1862) Далеўскімі. Колькасць удзельнікаў «Саюза» дасягала 200 чалавек, яго суполкі існавалі ў Ашмянах, Вільні, Гродне, Лідзе і Мінску. Мінскае аддзяленне вяло работу сярод вучнёўскай моладзі і вайскоўцаў гарнізона. У Бараўлянах была наладжана вытворчасць зброі і патронаў. Уплыў арганізацыі распаўсюджваўся нават на выхаванцаў Брэсцкага кадэцкага корпуса (адчынены ў 1842 г.), дзе ў гэты час узнік палітычны гурток. Пад уплывам рэвалюцыйных падзей у Еўропе «Саюз» падышоў да практычнай падрыхтоўкі ўзброенага паўстання, але здзейсніць яго не здолеў.

Звесткі аб рэвалюцыйных падзеях у еўрапейскіх краінах і скасаванні там прыгону параджалі сярод насельніцтва Беларусі антырасійскія, антыўрадавыя і антыпрыгонніцкія чуткі. У адказ расійскія ўлады прынялі надзвычайныя меры для «навядзення парадку». Часопісы ліберальнага напрамку трапілі пад забарону, быў выкрыты шэраг тайных гурткоў. За насельніцтвам беларуска-літоўскіх губерняў узмоцнілі адміністрацыйна-паліцэйскі нагляд. Але нават гэтыя меры пецярбургскія ўлады лічылі недастатковымі. Таму на віленскага генерал-губернатара Ф. Я. Міркавіча ў III Аддзяленні сфабрыкавалі справу, і ён быў адхілены ад пасады. Яго пераемнікам у 1850 г. стаў генерал І. Г. Бібікаў, малодшы брат міністра ўнутраных спраў Расіі Д. Г. Бібікава.

Мэтанакіраваная рэпрэсіўная палітыка царскіх улад на Беларусі, а затым увядзенне ваеннага становішча ў час Крымскай вайны (1853—1856) паралізавалі антыўрадавую дзейнасць. У пачатку 50-х гг. XIX ст. апазіцыя амаль страціла надзеі на завяванне для беларускага краю незалежнасці, і таму грамадства апынулася ў стане апатыі і пэўнага ідэалагічнага крызісу.

## ВЫСНОВЫ

Грамадска-палітычны рух у Беларусі ў першай палове XIX ст. сведчыў аб комплексным крызісе грамадства. Рашэнні Венскага кангрэса адрадзілі спадзяванні на хуткае далучэнне Беларуска-Літоўскага краю да Каралеўства Польскага і распаўсюджанне на яго канстытуцыі. Але яны выявіліся марнымі: рэвалюцыйныя ўзрушэнні пачатку 1820-х гг. у Еўропе

пахавалі надзеі на аўтаномію краю. У расійскіх урадавых колах сталі пераважаць кансерватыўныя настроі. Таму любыя нацыянальныя праявы ў заходніх губернях разглядаліся як палітычны сепаратызм. У гэтых умовах моладзь беларуска-літоўскіх і польскіх зямель пачала аб'ядноўвацца ў тайныя таварыствы. У пераважнай ступені яны прайшлі шлях ад навукова-асветніцкай і маральна-этычнай дзейнасці да рэвалюцыйнай. Канчатковай іх мэтай было аднаўленне суверэннай польскай дзяржавы ў межах 1772 г.

Паўстанне 1830—1831 гг. яшчэ больш выкрыла сацыяльныя і нацыянальныя праблемы грамадства Беларусі. У той жа час выступленне не прывяло да выпрацоўкі самастойнай праграмы па гэтых пытаннях. Знішчэнне Вялікага Княства Літоўскага падчас падзелаў Рэчы Паспалітай, няўдалая спроба яго аднаўлення ў 1812 г. і мэтанакіраваная палітыка расійскіх улад прывялі да сгасання самой ідэі ліцвінскай дзяржаўнасці. Таму ў час паўстання 1830—1831 гг. на першае месца выйшла не ідэя аднаўлення Вялікага Княства Літоўскага, а імкненне да поўнай незалежнасці Каралеўства Польскага з далучанымі да яго беларуска-літоўскімі губернямі. Не пераадолелі паўстанцы і сацыяльнага кансерватызму: праблема вызвалення сялянства ад прыгону імі амаль не ўздымалася. Таму паўстанне не было падтрымана шырокімі народнымі масамі (асабліва праваслаўнымі).

У 30—50-я гг. XIX ст. пануючыя пазіцыі на беларускіх землях займала кансерватыўная ідэалогія, якая была прадстаўлена польскай і рускай плынямі. Распаўсюджанне ідэй правідэнцыялізму і польскага месіянізму адбывалася пераважна ў асяроддзі добраадукаванага грамадства. У той жа час «тэорыю афіцыйнай народнасці» ўрад шырока выкарыстоўваў для ўзмацнення свайго ўплыву на малаадукаваныя колы беларускага грамадства – уніяцкае і праваслаўнае сялянства. У такіх умовах на хвалі польска-рускага ідэалагічнага супрацьстаяння пачаў фарміравацца «заходнерусізм», ідэолагам якога выступаў уніяцкі, а затым і праваслаўны епіскап і мітрапаліт Іосіф (Сямашка).

Распаўсюджанне ліберальных ідэй на беларуска-літоўскіх землях абмяжоўвалася эканамічнай сферай. Для развіцця легальнага палітычнага лібералізму ў Беларусі не было спрыяльных умоў. Дзейнасць радыкальных гурткоў і польскай эміграцыі ў 1830-я гг. знаходзілася пад пільным наглядам расійскіх улад, якія імкнуліся адразу спыняць малейшыя праявы палітычнага сепаратызму. Светапоглядная аснова нешматлікіх тайных студэнцкіх і вучнёўскіх арганізацый у 1830-я гг. спалучала ідэі нацыянальнага рамантызму і лібералізму. Але пад уплывам рэвалюцыйных падзей 1846—1848 гг. у Еўропе ў грамадска-палітычным руху Беларусі пачала фарміравацца і рэвалюцыйна-дэмакратычная плынь.

У той жа час у першай палове XIX ст. грамадская думка яшчэ не здолела сфарміраваць новую — уласна беларускую — нацыянальна-дзяржаўную ідэю. Між тым удзельнікі гурткоў і арганізацый, створаных на мясцовай, хоць і моцна спаланізаванай глебе, праяўлялі так званы «ліцвінскі сепаратызм»: яны любілі і вывучалі родны край, што пры збліжэнні іх з беларускай сялянскай масай стварала неабходныя перадумовы для фарміравання такой ідэі ў недалёкай будучыні.

## ПЫТАННІ

1. Якім чынам рашэнні Венскага кангрэса паўплывалі на грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі?
2. Патлумачце, чаму ліберальныя спадзяванні беларуска-літоўскага грамадства ў першай трэці XIX ст. выявіліся марнымі.
3. Якую ідэалагічную скіраванасць мелі студэнцкія і вучнёўскія таварыствы першай трэці XIX ст.?
4. Вызначце асаблівасці, якія праявіліся ў час паўстання 1830—1831 гг. на Беларусі. Чым іх можна патлумачыць?
5. Ахарактарызуйце асноўныя плыні, якія вылучаліся ў грамадска-палітычнай думцы Беларусі ў 30—50-я гг. XIX ст.
6. Якія новыя тэндэнцыі з’явіліся ў грамадска-палітычным руху Беларусі пад уздзеяннем рэвалюцыйных падзей 1840-х гг. у Еўропе?

# 7

# КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ. АД АСВЕТНІЦТВА ДА РАМАНТЫЗМУ

## НОВАЕ Ў КУЛЬТУРЫ: РАЦЫЯНАЛІЗМ, ДЭМАКРАТЫЗАЦЫЯ І ДЫФЕРЭНЦЫЯЦЫЯ

Культура Беларусі ў дарэформенны перыяд генетычна звязана з папярэдняй эпохай. Але Новы час характарызаваўся своеасаблівымі рысамі. Галоўныя з іх – рацыяналізм і свецкасць культуры, у якой, як і ў асвеце, Царква згубіла самастойную ролю. Манаполія рэлігійнага светапогляду была парушана. Аднак рацыяналізм XVIII ст., звязаны з распаўсюджаннем ідэалогіі і этыкі эпохі Асветніцтва, не азначаў поўнага знішчэння рэлігійнага светапогляду.

Характэрнай рысай гісторыка-культурнага працэсу Беларусі становіцца яго паскарэнне і ўскладненне, што было звязана з больш хуткім развіццём грамадства ў цэлым. Пачыналася дыферэнцыяцыя культуры, з’явіліся яе новыя напрамкі (мастацкая літаратура, свецкі жывапіс, тэатр і інш.). Адначасова адбываліся значна большыя, чым было да гэтага часу, сутыкненне і ўзаемаўплыў розных сфер культуры. У параўнанні з папярэднім перыядам у грамадстве істотна пашыралася сістэма перадачы культурных каштоўнасцей, фарміраваўся новы механізм іх распаўсюджання (свецкая школа, выданне кніг, газет, часопісаў, развіццё тэатра і інш.). Духоўнае жыццё беларускага грамадства станавілася больш разнастайным.

У дарэформенны перыяд адбывалася дэмакратызацыя агульнакультурнага працэсу: пашыралася кола вытворцаў і спажыўцоў культурных

каштоўнасцей, з'яўлялася магчымасць далучэння да культуры розных сацыяльных груп. Аднак амаль да канца феадальнай эпохі дэмакратызацыя культуры адлюстроўвалася больш у тэндэнцыі яе развіцця, чым у рэальных выніках. Саслоўныя абмежаванні стрымлівалі гэты працэс. Тым не менш сацыяльныя супярэчнасці, якія прыкметна абвастрыліся ў першай палове XIX ст., унеслі новыя напрамкі ў развіццё культуры і былі звязаны з ідэйна-маральнымі праблемамі і пошукамі.

Духоўнае жыццё беларускага грамадства рабілася больш складаным. Адной з праяў гэтага стала развіццё сістэмы адукацыі, якое разумелася ўжо як сродак паляпшэння становішча народа. Безумоўна, падобныя настроі, думкі і погляды адлюстроўвалі ўплыў ідэалогіі заходнееўрапейскага Асветніцтва. Аднак сувязь з грамадскімі ідэаламі эпохі спрыяла ўзросту сацыяльнай скіраванасці культуры Беларусі.

Адметнай асаблівасцю яе развіцця ў першай трэці XIX ст. быў працэс паланізацыі. У многім гэта абумоўлівалася палітыкай імператара Аляксандра I, якая была накіравана на аднаўленне польскай дзяржаўнасці і знайшла падтрымку ў асяроддзі магнатэрыі і паланізаванага беларускага шляхецтва. Цэнтрам польскага ўплыву з'яўлялася Вільня з яе ўніверсітэтам. Працэс паланізацыі крыху зменшыўся, але не спыніўся пры Мікалаі I, які праводзіў палітыку паслядоўнай русіфікацыі Беларусі.

Уплывовым фактарам грамадскага развіцця Беларусі таго часу стала супрацьстаянне дзвюх канфесій: праваслаўнай і каталіцкай, носьбітаў розных культурных і духоўных традыцый. Каталіцызм у асноўным з'яўляўся верай прывілеяванага, дваранскага саслоўя. Праваслаўе было звязана пераважна з сялянствам, збяднелым дваранствам і мяшчанствам Беларусі. Цэнтрам праваслаўнай культуры Беларусі быў старажытны Магілёў, дзе знаходзілася духоўная семінарыя, якую заснаваў яшчэ архіепіскап Георгій Каніскі. Трэба адзначыць, што выхаванцы гэтай установы шмат чаго зрабілі для адраджэння сваёй канфесіі. Сярод іх, напрыклад, быў буйнейшы лінгвіст, фалькларыст і этнограф І. Насовіч (1788—1877), аўтар «Слоўніка беларускай мовы».

Падзел беларускага грамадства па саслоўнай і канфесійнай прыкмеце паспрыяў стварэнню на Беларусі двух культурных напрамкаў: польскага, носьбітам якога ў асноўным было беларускае дваранства, і «заходнерускага», прадстаўнікамі якога з'яўляліся праваслаўнае і часткова ўніяцкае духавенства, купецтва, мяшчанства. Абапіраючыся на праваслаўе, прыхільнікі «заходнерускага» напрамку аднаўлялі, як ім здавалася, асновы традыцыйнай, народнай культуры. Наяўнасць гэтых дзвюх плыняў стрымлівала працэс стварэння адзінай беларускай нацыі.

Безумоўна, культура Беларусі адлюстроўвала сацыяльную структуру тагачаснага грамадства і яго асобных слаёў: магнатаў, сярэдняй і дробнай шляхты, мяшчан і насельніцтва гарадоў і мястэчак, сялян. І хоць розніца паміж імі на працягу XIX ст. пад уплывам сацыяльна-эканамічных фактараў паступова згладжвалася, тым не менш канфесійная неаднастайнасць прыводзіла і да культурнай дыферэнцыяцыі, насіла падчас характар вострага супрацьстаяння.

Па ўзроўні развіцця культуры як у цэлым, так і па асобных яе сферах розныя рэгіёны Беларусі істотна адрозніваліся паміж сабою. Ролю галоўных культурных цэнтраў адыгрывалі беларускія гарады. На працягу ўсёй першай паловы XIX ст. прызнаным навуковым і літаратурным асяродкам усёй Беларусі была Вільня, дзе знаходзіўся ўніверсітэт, у сценах якога атрымлівала адукацыю беларуская моладзь.

Іншымі важнымі культурнымі цэнтрамі Беларусі былі Магілёў, Віцебск, Слонім. Значны ўклад у развіццё культуры Беларусі ўносілі магнацкія цэнтры: рэзідэнцыя Храптовічаў у Шчорсах, маёнтак М. Агінскага ў Залессі, маёнтак Ваньковічаў у Мінску і інш.

## АСВЕТА. НАВУКА

Якасна новым момантам у развіцці асветы на Беларусі было фарміраванне сістэмы вышэйшай, сярэдняй і пачатковай адукацыі. Стварэнне Міністэрства народнай асветы (1802) цэнтралізавала дзяржаўнае кіраўніцтва школай. У кожным губернскім горадзе стваралася гімназія, у павятовым горадзе – павятовае вучылішча, пры кожным царкоўным прыходзе – царкоўнапрыходскае вучылішча, куды прымаліся дзеці «ўсялякага стану». Прадугледжвалася сувязь паміж школамі розных ступеней. Аднак фактычна для распаўсюджання адукацыі сярод народа было зроблена мала. Казна не брала на сябе выдаткаў на ўтрыманне школ, перакладала гэта або на органы мясцовага кіравання, або на памешчыкаў. Статут 1804 г. адзначаў, што дзяцей прыгонных сялян нельга прымаць у гімназіі. Несумяшчальнасць прыгоннага права з распаўсюджаннем адукацыі сярод шырокіх слаёў сялянства станавілася больш відавочнай.

Значнымі былі поспехі ў сферы вышэйшай адукацыі. Асноўным асяродкам навукі і адукацыі Беларусі ў першай трэці XIX ст. быў Віленскі ўніверсітэт, які ў 1803 г. атрымаў назву імператарскага. Адначасова ён з’яўляўся вучэбным і адміністрацыйным цэнтрам навучальнай акругі, ажыццяўляў кантроль над работай школ, а яго выкладчыкі прымалі ўдзел у складанні праграм навучання, напісанні падручнікаў.

Палітычныя падзеі 1820–30-х гг. прывялі да ліквідацыі Віленскай навучальнай акругі, закрыцця ўніверсітэта і стварэння Беларускай навучальнай акругі, унеслі істотныя змены ў сістэму асветы Беларусі. Пераемнасць навучання была парушана. Выпускнікам Віленскага ўніверсітэта як удзельнікам рэвалюцыйных падзей забаранялася выкладаць у мясцовых школах. Настаўніцкія кадры для Беларусі рыхтаваліся Пецярбургскім педагагічным інстытутам і створанай у 1834 г. Віцебскай настаўніцкай семінарыяй.

Развіццё асветы Беларусі першай паловы XIX ст. характарызавалася наяўнасцю каталіцкай манастырскай адукацыі, нягледзячы на паступовае яе скарачэнне. Новай з'явай стала стварэнне сістэмы духоўнага, а таксама зараджэнне ваеннага і прафесійнага навучання.

Важным паказчыкам распаўсюджання адукацыі было павелічэнне цікавасці да кнігі і актывізацыя выдавецкай справы. На Беларусі існавалі казённыя, прыватныя і царкоўныя друкарні.

Разам са значным павелічэннем колькасці друкарняў і агульнага аб'ёму выдавецкай прадукцыі павялічвалася ўдзельная вага свецкай кнігі, пашыралася яе тэматыка. На Беларусі выдавалася вучэбная і мастацкая літаратура, назіраліся тэндэнцыі да фарміравання навуковай і навукова-папулярнай літаратуры. З'явіліся першыя краязнаўчыя публікацыі і першыя часопісы. Узнікненне перыядычнага друку сведчыла пра сталасць грамадскага жыцця беларускага грамадства. Найбольш уплывовымі выданнямі былі «Месячнік Полацкі», друкаваны орган Полацкай езуіцкай акадэміі, і «Літоўскі кур'ер», які з 1840 г. выходзіў пад назвай «Віленскі веснік». З 1838 г. выдаюцца «Губернскія ведамасці».

Вялікая роля ў духоўным жыцці грамадства належала інтэлігенцыі. Па сваім сацыяльным складзе інтэлігенцыя Беларусі была ў асноўным дваранскай. Аднак у яе асяроддзі з'явіліся разначынцы. Беларуская інтэлігенцыя спрабавала аб'яднаць народную і прафесійную традыцыю. Адукаванага выхадца з беларускай шляхты, разначынца ўжо не зусім задавальняла польска-лацінская культура, у яго з'явілася цікавасць да мясцовай гісторыі, этнаграфіі, археалогіі, фальклору, мовы. Гэтыя галіны навуковых ведаў звязаны з імёнамі І. Грыгаровіча, М. Баброўскага, З. Даленгі-Хадакоўскага, Т. Нарбута, А. Кіркора, І. Даніловіча, братоў Я. і К. Тышкевічаў і інш. Гэта былі людзі розных палітычных поглядаў і культурных плыней.

Так, з імем протаіерэя І. Грыгаровіча (1792–1852) звязана дзейнасць гісторыка-асветніцкага гуртка ў Магілёве, удзельнікаў якога аб'ядноўвалі пошукі, збор і апрацоўка гістарычных матэрыялаў, шляхі аднаўлення мінулага роднага краю. Дзейнасць яго вылілася ў выданне першага зборніка

дакументаў па гісторыі Беларусі пад назвай «Беларускі архіў старажытных актаў» (1824), выхадам у свет «Актаў археаграфічнай экспедыцыі» (т. 1–4, 1834–1838) і «Актаў гістарычных». Вялікі ўклад у працу гэтага гуртка ўнёс граф М. П. Румянцаў, пад кіраўніцтвам і на сродкі якога былі сабраны рукапісныя, этнаграфічныя, нумізматычныя калекцыі, створана бібліятэка, якая паклала пачатак вядомаму ў Маскве Румянцаўскаму музею.

На той час прыпадае навуковая дзейнасць гісторыка, прафесара Віленскага ўніверсітэта М. К. Баброўскага (1784–1848), заснавальніка беларусазнаўства і славяназнаўства. Менавіта яго заслуга ў тым, што былі адкрыты Супрасльскі летапіс, працы Ф. Скарыны. Прадстаўніком гістарычнай навукі быў таксама прафесар Віленскага ўніверсітэта І. Даніловіч (1788–1843). Прыхільнік аднаўлення суверэнітэту Вялікага Княства Літоўскага, ён выдаў Статут ВКЛ 1529 г., Судзебнік Казіміра IV 1468 г., Супрасльскі летапіс і іншыя крыніцы.

З дзейнасцю гэтых навукоўцаў звязана зараджэнне на Беларусі археаграфіі, крыніцазнаўства, славяназнаўства, а таксама беларусазнаўства.

Вялікую вядомасць у дарэформенны перыяд атрымалі працы З. Даленгі-Хадакоўскага (1784–1825), братоў Канстанціна (1806–1868) і Яўстафія (1814–1873) Тышкевічаў, стваральнікаў беларускай археалогіі і музеязнаўства. Па ініцыятыве братоў Тышкевічаў у 1842 г. быў створаны першы на Беларусі музей старажытнасцей, экспанаты якога склалі аснову музея ў Вільні. У 1855 г. Я. Тышкевіч арганізаваў і ўзначаліў Віленскую археалагічную камісію, якая займалася зборам, вывучэннем і публікацыяй дакументаў, звязаных з гісторыяй Беларусі, Украіны і Літвы. Значны ўклад у развіццё беларусазнаўства ўнеслі П. Шпілеўскі (1823–1861), аўтар «Падарожжа па Палессі і беларускім краі», «Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках», і М. В. Без-Карніловіч, які выдаў у Санкт-Пецярбургу «Гістарычныя звесткі».

У 1840-я гг. пачынаецца творчая, культурна-асветніцкая і выдавецкая дзейнасць А. Кіркора (1818–1886). Выдатны знаўца гісторыі і этнаграфіі Беларусі і Літвы, ён надрукаваў шматлікія навуковыя матэрыялы ў польскай і рускай перыёдыцы. Асабліва каштоўнай для станаўлення беларускай этнаграфіі была яго праца «Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню» (1857–1859), напісаная ў адпаведнасці з праграмай Рускага геаграфічнага таварыства. У ёй было надрукавана больш за сотню беларускіх песень і прыказак, слоўнік беларускай мовы.

Вялікая цікавасць да гісторыі, этнаграфіі, археалогіі Беларусі, якая выразна праявілася ў дарэформенны перыяд, – сведчанне паскарэння працэсу духоўнага адраджэння Беларусі. Аднак першая палова стагоддзя была звязана з развіццём не толькі гуманітарных, але і прыродазнаўчых

навук. У Віленскім універсітэце працавалі ўраджэнцы Беларусі: батанік і біёлаг С. Юндвіл, фізіёлаг М. Гамаліцкі. З Горы-Горацкім земляробчым інстытутам была звязана дзейнасць заснавальніка хімічнай навукі Беларусі К. Шміта і І. Цютчава.

## ЛІТАРАТУРА. ТЭАТР. МУЗЫКА

Для мастацтва Беларусі дарэформеннага перыяду была характэрна змена ідэйных напрамкаў, суіснаванне розных стыляў. Ва ўсведамленні дзеячаў культуры адбываўся паступовы адыход ад эстэтыкі класіцызму, які ляжаў у аснове асветніцкай ідэалогіі, калі матывамі дзеянняў героя былі перш за ўсё грамадзянскі абавязак і служэнне грамадству. З цягам часу ўзрастае ўвага да чалавека, яго ўнутранага свету. Пачуццё, а не абавязак выступае пабуджальнай крыніцай яго ўчынкаў. На змену класіцызму прыходзіць рамантызм.

На Беларусі рамантызм зарадзіўся ў пачатку XIX ст. Яго сутнасцю было імкненне супрацьпаставіць рэльнасці абагульнены ідэальны вобраз. Асаблівасцю рамантызму мастакоў Беларусі была цікавасць да мясцовай гісторыі, шмат у чым звязанай з Вялікім Княствам Літоўскім. Да гэтай тэматыкі звярталіся многія пісьменнікі і паэты. Гісторыя была прадметам роздуму А. Міцкевіча. Яго творы, напісаныя на польскай мове, лічацца культурным скарбам Беларусі. У сваіх ранніх творах «Мешка, князь Навагрудка», «Бульба», а таксама ў паэмах «Дзяды», «Пан Тадэвуш», «Гражына» А. Міцкевіч выкарыстоўваў тэмы і вобразы беларускага фальклору, сюжэты беларускай гісторыі. Блізкімі па настроі, думках да А. Міцкевіча былі У. Сыракомля, Я. Чачот. Асаблівае месца ў плеядзе рамантыкаў Беларусі належыць Я. Баршчэўскаму. Яго празаічны зборнік «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» уяўляе сабой, па водгуках сучаснікаў, беларускі цыкл «1000 і адной ночы».

У 1840-я гг. у культуры Беларусі ярка праявіўся пераход ад рамантызму да рэалізму. Важнай вехай на гэтым шляху была творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча. Першымі творамі пісьменніка сталі лібрэта аперэт «Рэкруцкі яўрэйскі набор», «Спаборніцтва музыкаў», «Чароўная вада», напісаныя на польскай мове і пастаўленыя на мінскай сцэне. У 1852 г. убачыла свет музычная п’еса В. Дуніна-Марцінкевіча «Сялянка» («Ідылія»), у якой упершыню загучала жывая беларуская мова. У 1850-я гг. пісьменнік стварае вершаваныя апавяданні «Вечарніцы» і «Гапон», «Халімон на каранацыі», займаецца перакладамі. На пачатку 1860-х гг. ён стварае свой лепшы твор – фарс-вадэвіль «Пінская шляхта».

У дарэформенны перыяд усё большую ролю ў грамадска-культурным жыцці Беларусі адыгрывае тэатральная дзейнасць, асноўнай формай якой у гэты час з'яўляецца прыватная антрэпрыза. Як правіла, тэатр меў базу ў губернскім або буйным павятовым горадзе і перыядычна вандраваў па навакольных гарадах, мястэчках, маёнтках і кірмашах. Пастаянныя тэатральныя калектывы выступалі ў Вільні (трупа Д. Мараўскага), Гродне (тэатр Саламеі Дзешнер), Мінску (трупа М. Кажынскага). У выніку рэфармавання 1845—1847 гг. у губернскіх гарадах ствараліся пастаянныя тэатры, вызначаўся тэатральны сезон, але дзейнасць «аб'язных» труп пасля гэтага не спынілася. Існавалі яны і ў больш позні час. Адлюстроўвае моўную сітуацыю ў краі рэпертуар тэатра: ён быў двухмоўным — польскім і рускім. На сцэне ставіліся п'есы польскіх, рускіх і заходнееўрапейскіх аўтараў.

Разам з прафесійным тэатрам развіваўся аматарскі, які быў вельмі папулярны сярод шляхецтва, чыноўнікаў і афіцэраў. Падзеяй у культурным жыцці Беларусі стала ўзнікненне першай трупы беларускага нацыянальнага тэатра В. Дуніна-Марцінкевіча. 23 верасня 1841 г. адбылася прэм'ера спектакля — камічнай оперы «Рэкруцкі яўрэйскі набор», лібрэта да якога напісаў сам В. Дунін-Марцінкевіч, музыку — С. Манюшка і К. Кжыжаноўскі. 9 лютага 1852 г. была пастаўлена п'еса «Ідылія» на музыку тых самых кампазітараў. П'есы таленавітага драматурга, рэжысёра і акцёра неаднаразова ставіліся на прыватных кватэрах не толькі Мінска, але і іншых гарадоў Беларусі.

У грамадстве ўзмацнялася цікавасць да камерных і публічных канцэртаў. Музыка гучала ў салонах мясцовай магнатэрыі, яе выкладалі ў навучальных установах, адбываліся сольныя выступленні, аркестровыя канцэрты, праходзілі музычныя спектаклі. На Беларусі была добра вядома музыка заходнееўрапейскіх і рускіх кампазітараў. Папулярнасцю карысталіся таксама творы мясцовых музыкантаў. Першая палова XIX ст. — час пачатку збору і публікацыі беларускай народнай песні, спробы яе кампазітарскай і канцэртнай апрацоўкі. Вялікую цікавасць уяўляюць апрацоўкі народных песень і заснаваныя на іх фартэпіянныя п'есы ўраджэнца Віцебшчыны А. Абрамовіча, асабліва «Беларускае вяселле». Шырокую вядомасць атрымалі і творы М. Агінскага, Д. Стэфановіча, Ф. Міладоўскага і іншых таленавітых музыкантаў і выканаўцаў.

Глыбокі след у беларускай музычнай культуры пакінуў ураджэнец Ігуменскага павета Мінскай губерні С. Манюшка, у творы якога арганічна ўвайшлі беларускія народныя песні. Музычную адукацыю С. Манюшка атрымаў у Мінску ў таленавітага музыканта і настаўніка Д. Стэфановіча. З Мінскам звязана таксама стварэнне і пастаноўка першых вадэвіляў,

музычных камедый і опер С. Манюшкі. Асабліва плённым было творчае ўзаемадзеянне кампазітара з В. Дуніным-Марцінкевічам. На лібрэта апошняга былі напісаны оперы «Спаборніцтва музыкаў», «Чарадзейная вада», «Сялянка» («Ідылія»).

## АРХІТЭКТУРА

У канцы XVIII ст. стыль барока змяніўся класіцызмам. Для яго развіцця на Беларусі характэрна аб'яднанне заходнееўрапейскага і рускага напрамкаў з мясцовымі мастацкімі традыцыямі. Важную ролю ў фарміраванні агульнага выгляду беларускіх гарадоў адыграла Віленская архітэктурная школа (М. Шульц, К. Падчашынскі, Л. Стуока-Гуцявічус), творчасць вядомых рускіх архітэктараў М. Львова, В. Стасава, А. Мельнікава, а таксама англічаніна Д. Кларка. Гэта быў час рэгулярнай тыпавой забудовы, горад разглядаўся як цэласная, строга спланаваная сістэма, заснаваная на прынцыпах рацыяналізму і класічных ідэалаў. Як правіла, гарадам надавалася форма прамавугольнікаў або шматвугольнікаў. У старых гарадах Беларусі (Мінску, Віцебску, Полацку і інш.) вялося ўпарадкаванне вулічнай сеткі, узбуйняліся кварталы, ствараліся новыя плошчы. Праектны цэнтр там звычайна сумяшчаўся з гістарычна ўсталяваным ансамблем, які вызначаўся як новай забудовай, так і манументальнымі будынкамі XVII–XVIII стст., галоўным чынам манастырамі, касцёламі, калегіумамі. Гэта надавала цэнтрам беларускіх гарадоў пэўную адметнасць.

Асаблівасцю будаўніцтва гэтага часу было развіццё ансамблевай забудовы, узвядзенне будынкаў спецыяльнага дзяржаўнага і грамадскага прызначэння (адміністрацыйныя, навучальныя, медыцынскія). У кожным губернскім горадзе на цэнтральнай плошчы акрамя сабораў узводзіліся дзяржаўныя ўстановы і гандлёвыя рады, якія сталі прадметам новага грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця. Тут узнікалі школы, музеі, бібліятэкі. Прынцыпы прамавугольнай планіроўкі найбольш паслядоўна здзейснены ў Клімавічах, Суражы, Мсціслаўі, Чавусах.

У палацава-сядзібным будаўніцтве Беларусі класіцызм абумовіў геаметрычнасць планіроўкі тэрыторыі. З'явіўся новы тып палаца – цэнтрычная кампактная забудова з купалам (Грудзінская сядзіба ў Быхаўскім раёне), для якой характэрны галерэі-каланады, размешчаныя паўкругам або франтальна. Галоўным кампазіцыйным акцэнтам прысядзібнага дома з'яўляўся манументальны порцік. Сярод выдатных помнікаў гэтага тыпу трэба назваць палац графа М. П. Румянцава ў Гомелі (з 1830-х гг.

ён перайшоў да фельдмаршала І. Ф. Паскевіча), Крычаўскі і Жыліцкі (Кіраўскі раён) палацы, комплекс у Снове (Нясвіжскі раён), палацы генерал-губернатара ў Віцебску і віцэ-губернатара ў Гродне. Да ўзораў дадзенага архітэктурнага напрамку адносяцца і культавыя забудовы: Петрапаўлаўскі сабор у Гомелі, Праабражэнская царква ў Чачэрску, Пакроўская царква ў Стрэшыне, касцёлы ў Лідзе і Шчучыне.

Аднак класіцызм быў не адзіным архітэктурным стылем дарэформеннага перыяду. Побач з ім развівалася неаготыка – архітэктурны аналаг эпохі сентыменталізму і рамантызму, які ахапіў усе сферы культуры Заходняй Еўропы і Расіі яшчэ ў канцы XVIII ст.

Захапленне сярэдневяковым гатычным стылем на Беларусі пачынаецца на рубяжы стагоддзяў. Неаготыка да 1830–40-х гг. суіснавала побач з класіцызмам. Яе элементы часцей за ўсё выкарыстоўваліся ў дэкаратыўных рашэннях пабудоў і фасадаў гарадскога будаўніцтва. Больш шырокае прымяненне неаготыка знайшла ў культавых збудаваннях і «англійскім» пейзажна-паркавым мастацтве, загарадных прысядзібных комплексах. Да сярэдзіны XIX ст. у Беларусі амаль не было садова-паркавай рэзідэнцыі, якая не мела б экзатычнай пабудовы – імітацыі перыяду сярэднявечнага рыцарства: грота, казачных масткоў, малых замкаў, брам. Яркімі прыкладамі могуць служыць сядзібныя капліцы ў вёсках Заказель, Ражанка, Панямонь (Гродзенскай вобл.), касцёл на Кальварыйскіх могілках і Пішчалаўскі замак (Мінск), палац у Косаве (Брэсцкая вобл.).

Сярод стылёвай разнастайнасці помнікаў архітэктуры вылучаецца шматлікая група збудаванняў, у мастацка-вобразнай трактоўцы якіх назіраецца ўплыў старажытнарускай архітэктурнай культуры. Пачаткам развіцця «руска-візантыйскага стылю» з'яўляюцца 1830-я гг. На Беларусі асноўнай сферай яго прымянення было царкоўнае будаўніцтва. Развіццё гэтага стылю адбывалася ў двух напрамках: перабудове існуючых каталіцкіх і ўніяцкіх храмаў (Заслаўскі фарны касцёл, Ізабэлінская Міхайлаўская царква) і ўзвядзенні цэркваў па санкцыянаваных Сінодам, а таксама прыватных праектах. Найбольшага росквіту стыль дасягнуў у другой палове XIX – пачатку XX ст.

## ЖЫВАПІС

Развіццё класіцызму і рэалізму ў выяўленчым мастацтве першай паловы XIX ст. азначала сур'ёзныя змены ў жывапісе Беларусі. У 1830–40-я гг. ідэйныя каноны акадэмізму, заснаваныя на іерархічных каштоўнасцях жанраў, усё больш старэлі. Захоўваўся прыярытэт гістарычнага жывапісу; быта-

вы жанр як паўнапраўны яшчэ не прызнаваўся. Ідэйна-мастацкія ўстаноўкі акадэмізму ўступалі ў супярэчнасць з патрабаваннямі жыцця і грамадскімі задачамі мастацтва.

Важную ролю ў гэты перыяд адыграла Віленская школа жывапісу – аддзяленне выяўленчага мастацтва факультэта літаратуры і мастацтва Віленскага ўніверсітэта. Заснавальнікам школы быў прафесар Ф. Смуглевіч, які ўвайшоў у гісторыю жывапісу як майстар вялікіх шматфігурных кампазіцый на гістарычныя і рэлігійныя тэмы, пейзажыст і бытапісец. Яго вучні – таленавіты майстар жанравага партрэта Я. Рустэм і скульптар К. Ельскі. За чвэрць стагоддзя свайго існавання школа падрыхтавала больш за 250 мастакоў, гравёраў, скульптараў і выкладчыкаў малявання для навучальных устаноў Беларусі. Аднак яна не магла поўнасцю вырашыць праблему прафесійнага навучання, бо давала толькі сярэднюю адукацыю. Для ўдасканалення ведаў і атрымання вышэйшай адукацыі найбольш таленавітыя студэнты накіроўваліся ў Пецярбургскую акадэмію мастацтваў або ў Маскоўскае вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства (Строганаўскае вучылішча). Значнае месца ў падрыхтоўцы прафесійных мастакоў Беларусі належала Полацкай езуіцкай акадэміі.

Найбольш папулярнымі былі гістарычны жанр і партрэт. У 1830–40-я гг. распаўсюджанне атрымлівае пейзаж і бытавы жывапіс. Асаблівае месца ў гэты час належала нацюрморту.

У беларускім жывапісе першай паловы XIX ст. можна адзначыць два напрамкі развіцця. Першы звязаны з Віленскай (Ф. Смуглевіч) і Пецярбургскай школамі жывапісу, якім былі ўласцівы традыцыі класіцызму. Другая лінія была звязана з імёнамі В. Баравікоўскага і А. Кіпрэнскага, якія былі схільны да рамантызму і сентыменталізму. Большасць мастакоў Беларусі першапачатковую адукацыю атрымалі ў Вільні і Санкт-Пецярбургу. Да іх адносяцца І. Аляшкевіч, Ю. Пешка, В. Ваньковіч, І. Хруцкі і многія іншыя.

Буйным майстрам партрэтнага жанру на Беларусі быў член Імператарскай акадэміі мастацтваў І. Аляшкевіч (1777–1830). Пэндзлю мастака належаць партрэты вядомых палітыкаў і дзеячаў Беларусі: А. Чартарыйскага, Л. Сапегі, М. Радзівіла, А. Міцкевіча і інш. У апошнія гады жыцця І. Аляшкевіч пісаў шмат рэлігійных кампазіцый, якія адрозніваліся добрымі каларыстычнымі спалучэннямі (напрыклад, «Мадонна з дзіцем»). Не менш цікавым партрэтыстам быў Ю. Пешка (1767–1831). Ён пісаў выявы прадстаўнікоў віленскай шляхты і духавенства. Найбольш вядомымі з'яўляюцца партрэты віленскага саветніка Вейса, партрэт С. Солтана (узначальваў урад Вялікага Княства Літоўскага ў перыяд

напалеонаўскага нашэсця ў 1812 г.) і партрэт вядомай апякункі мастацтваў Тэафілы Радзівіл.

Яркім прадстаўніком азначанай плеяды быў В. Ваньковіч (1799—1842). Сярод вялікай і разнастайнай спадчыны мастака ёсць шмат партрэтаў дзеячаў літаратуры і мастацтва, навукі. Лепшымі з твораў В. Ваньковіча з'яўляюцца кампазіцыйны партрэт «Міцкевіч на скале Аю-Даг», партрэты А. Тавяньскага і яго жонкі Караліны, піяністкі М. Шыманоўскай, скрыпача К. Ліпіньскага, паэта А. Гарэцкага. Радавы маёнтак В. Ваньковіча ў Сляпянцы пад Мінскам быў цэнтрам, які аб'ядноўваў вакол сябе лепшыя мастацкія сілы Беларусі першай паловы XIX ст. Тут бывалі Я. Дамель, М. Кулеша і іншыя мастакі, скульптары, кампазітары.

Развіццё гістарычнага жанру ў жывапісе Беларусі шмат у чым вызначалася захаваннем сярод мастакоў палітычных поглядаў, якія былі звязаны з аднаўленнем Рэчы Паспалітай. Невыпадкова многія бралі для сваіх кампазіцый сюжэты з мясцовай гісторыі. Аднак мясцовыя творцы намагаліся адлюстроўваць тыя моманты, якія былі непасрэдна звязаны з мінуўшчынай роднага краю. Адным з такіх жывапісцаў гэтага часу быў Я. Дамель (1789—1840). На сваіх палотнах ён адлюстроўваў найбольш драматычныя моманты гістарычнага развіцця. Гэта карціны «Смерць князя Панятоўскага», «Гібель магістра крыжаносцаў Ульрыха ў Грунвальдскай бітве», «Павел I вызваляе Касцюшку з няволі» і інш. Вядомасць атрымала карціна «Пераход Напалеона праз Бярэзіну». Акрамя гістарычных палотнаў для творчасці Я. Дамеля характэрны шматлікія рэлігійныя кампазіцыі, а таксама партрэты, якія адрозніваюцца глыбокім псіхалагізмам.

Якасці гістарычнага жывапісца і мастака-этнографа ўдала спалучаліся ў творчасці М. Кулешы (1800—1863). Пра яго майстэрства можна меркаваць па такіх кампазіцыях, як «Гусары», «Гетман». Прыхільнікам гістарычнай тэматыкі М. Кулеша заставаўся і ў сваіх эпічных пейзажах і шматлікіх літаграфіях. Значнае месца гістарычны жанр займаў у работах Я. Траяноўскага і Я. Сухадольскага (таксама вядомы як баталіст).

Важная роля ў выяўленчым мастацтве Беларусі належыць пейзажу. Вялікі ўклад у беларускі пейзажны жывапіс унеслі мастакі В. Садоўнікаў, І. Герасімовіч, В. Дмахоўскі. Крыху ўбаку ад агульнага развіцця гэтага жанру стаіць творчасць мастака-этнографа і гісторыка Напалеона Орды (1807—1883). Усё сваё жыццё ён прысвяціў адлюстраванню цікавых мясцін Беларусі, Літвы і Украіны, звязаных з вялікімі гістарычнымі падзеямі, а таксама з выдатнымі асобамі, якія тут нарадзіліся. Н. Орда ў асноўным працаваў як акварэліст. Яго эмацыянальна насычаныя і паэтычныя

акварэлі («Разваліны замка ў Лідзе», «Крэва», «Мір», «Нясвіж», «Белая вежа» і інш.) надзвычайна дакладна перадаюць прыгажосць пейзажу і гістарычных помнікаў Беларусі.

Яркім прадстаўніком беларускага жывапісу быў І. Т. Хруцкі (1810–1885), які ўвайшоў у гісторыю сусветнага мастацтва як заснавальнік класічнага нацюрморта. У 1839 г. за карціну «Кветкі і плады» ён атрымаў званне акадэміка. Аднак не менш яскрава мастак праявіў сябе ў жанры партрэта і пейзажа.

У творчасці жывапісцаў Беларусі першай паловы XIX ст. даволі інтэнсіўна развіваўся бытавы жанр. Мастакі стварылі шмат яркіх жывапісных палотнаў, дзе паказалі багацце матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа. Першымі ў гэтым мастацкім напрамку на Беларусі былі выхаванцы Віленскай школы жывапісу К. Кукевіч, Ю. Карчэўскі, К. Русецкі і інш. Нягледзячы на ўплыў класіцызму, у творчасці прадстаўнікоў бытавога жанру ўсё больш зацвярджаецца рэалістычны элемент.

Некаторыя мастакі, што нарадзіліся ў Беларусі, увайшлі ў гісторыю рускага рэалістычнага жывапісу. Сярод іх – вядомыя партрэтысты XIX ст. С. Заранка (1818–1871) і К. Карсалін (1809–1871). Яны амаль усё сваё свядомае жыццё правялі за межамі Беларусі, але ніколі не парывалі сувязі з радзімай.

Развіццё паліграфіі, масавыя тыражы друкаваных выданняў прадвызначылі эвалюцыю беларускай графікі. Сярод майстроў гэтага віда мастацтва найбольш вядомымі з'яўляюцца М. Падалінскі, Ю. Главацкі, Ю. Азямблоўскі, Б. Клямбоўскі. Творчасці беларускіх графікаў уласціва ярка выражаная сацыяльная накіраванасць. Так, літаграфія ўраджэнца Мінска Ю. Азямблоўскага «Славянскі нявольнік» («Беларускі раб») сваім сюжэтам прыцягнула ўвагу А. Міцкевіча і дэманстравалася ім падчас чытанняў лекцый па славянскіх літаратурах у Парыжы. Публіцыстычнасць сюжэта гэтай літаграфіі зацікавіла А. Герцэна, які высока ацаніў работу беларускага графіка.

Жывапіс Беларусі першай паловы XIX ст. багаты і разнастайны. Яго станаўленне і развіццё адбывалася ў агульным рэчышчы рускага, польскага, літоўскага і ўкраінскага жывапісу, а эвалюцыя ад класіцызму да рэалізму складала не толькі сутнасць развіцця, але і шляхі яго далейшага ўдасканалення.

Адной з форм выяўленчага мастацтва Беларусі першай паловы XIX ст. была скульптура. Сярод скульптараў таго часу найбольшую вядомасць набылі Ельскія (бацька – Караль і два яго сыны – Ян і Казімір), Я. Астароўскі, Р. Слізень і інш. Іх творчасць была разнастайная па жанры: пар-

трэты-бюсты, медальёны і барэльефы гістарычных дзеячаў, родных, знаёмых. Асаблівае месца ў іх творчасці займала скульптурнае ўпрыгожванне каталіцкіх храмаў.

## ВЫСНОВЫ

Да сярэдзіны XIX ст. завяршыўся адзін з самых значных этапаў у гісторыі беларускай культуры. Пад уплывам польскай і рускай культуры ішоў працэс фарміравання і развіцця нацыянальнай культуры. Перш за ўсё ён вызначыўся ў станаўленні сучаснай беларускай мовы, новай беларускай літаратуры, асэнсаванні гістарычнага шляху.

Разам з тым у грамадскім жыцці народа Беларусі выразна праявілася неадпаведнасць паміж дасягнутым узроўнем духоўнага развіцця і авалоданнем культурнымі грамадскімі каштоўнасцямі. Магчымасці распаўсюджання асветы, народнай адукацыі былі абмежаваны. Феадальны строй уступаў у супярэчнасць не толькі з сацыяльна-эканамічным, але і з грамадска-культурным прагрэсам.

## ПЫТАННІ

1. Ахарактарызуйце асноўныя напрамкі развіцця культуры Беларусі ў першай палове XIX ст. У чым заключаецца прынцыповая розніца паміж імі?
2. Якія змены адбыліся ў галіне адукацыі на беларускіх землях у першай палове XIX ст.?
3. Назавіце беларускіх пісьменнікаў першай паловы XIX ст. і асноўныя тэмы іх творчасці.
4. Якія жанры развіваліся ў мастацтве Беларусі ў першай палове XIX ст.? Назавіце вядомых беларускіх мастакоў гэтага перыяду і іх творы.
5. Назавіце найбольш вядомыя архітэктурныя пабудовы ў стылі класіцызму на тэрыторыі Беларусі.

# ЗМЕСТ

УСТУП ........ 3

1. АЙЧЫННАЯ І ЗАМЕЖНАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ. КРЫНІЦЫ. ІХ КЛАСІФІКАЦЫЯ

Гістарыяграфія ........ 4
Крыніцы ........ 14
Высновы ........ 22
Пытанні ........ 22

2. ТЭРЫТОРЫЯ І НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ. СІСТЭМА КІРАВАННЯ І СУДАВОДСТВА

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел і арганізацыя кіравання ........ 24
Заканадаўства і судовая сістэма ........ 28
Колькасць насельніцтва і яго этнаканфесійны склад ........ 30
Саслоўная структура грамадства ........ 34
Высновы ........ 41
Пытанні ........ 42

3. САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ НА ЗЫХОДЗЕ ПРЫГОННІЦТВА

Разлажэнне феадальна-прыгонніцкага ладу і фарміраванне капіталістычных адносін. Развіццё таварнай вытворчасці ў сельскай гаспадарцы ........ 43
Крызіс прыгонніцкай гаспадаркі.Сацыяльныя супярэчнасці ........ 52
Структура і формы арганізацыі прамысловай вытворчасці ........ 55
Узрастанне ролі гарадоў і мястэчак. Гандаль. Кірмашы. Будаўніцтва дарог і каналаў ........ 58
Высновы ........ 60
Пытанні ........ 61

## 4. БЕЛАРУСЬ У ЧАС ВАЙНЫ 1812 г.

Расійска-французскія адносіны і Палітычная сітуацыя на Беларусі напярэдадні вайны 1812 г. .......... 62
Падрыхтоўка да вайны і планы аднаўлення дзяржаўнасці .......... 67
Ваенныя дзеянні ў 1812 г. .......... 72
Палітыка французскіх улад .......... 75
Узаемаадносіны насельніцтва з Вялікай арміяй .......... 80
Вынікі і наступствы вайны 1812 г. для Беларусі .......... 83
Высновы .......... 85
Пытанні .......... 87

## 5. УРАДАВАЯ ПАЛІТЫКА

«Польскае пытанне» і ўрадавая палітыка .......... 88
Эвалюцыя саслоўнай палітыкі .......... 90
Урадавая палітыка ў галіне асветы .......... 94
Заканадаўства .......... 99
Канфесійная палітыка .......... 101
Высновы .......... 105
Пытанні .......... 106

## 6. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ РУХ. ПАЎСТАННЕ 1830–1831 гг. У ПОЛЬШЧЫ, ЛІТВЕ І БЕЛАРУСІ

«Венскія спадзяванні» 1815–1830 гг. .......... 107
Паўстанне 1830–1831 гг. .......... 113
Грамадскі рух у 30–50-х гг. XIX ст. .......... 119
Высновы .......... 125
Пытанні .......... 127

## 7. КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ. АД АСВЕТНІЦТВА ДА РАМАНТЫЗМУ

Новае ў культуры: рацыяналізм, дэмакратызацыя і дыферэнцыяцыя .......... 128
Асвета. Навука .......... 130
Літаратура. Тэатр. Музыка .......... 133
Архітэктура .......... 135
Жывапіс .......... 136
Высновы .......... 140
Пытанні .......... 140

Вучэбнае выданне

**Лукашэвіч** Андрэй Міхайлавіч
**Цяплова** Валянціна Анатольеўна

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ (першая палова XIX ст.)

**Дапаможнік**

Рэдактар *А. В. Яфімаў*
Мастак вокладкі *Т. Ю. Таран*
Тэхнічны рэдактар *Т. К. Рамановіч*
Камп’ютарная вёрстка *С. М. Ягоравай*
Карэктар *Н. В. Яненка*

Падпісана да друку 30.11.2015. Фармат 60×84/16. Папера афсетная.
Рызаграфія. Ум. друк. арк. 8,37. Ул.-выд. арк. 9,75. Тыраж 120 экз. Заказ 814.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/270 ад 03.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 4, 220030, Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

**Лукашэвіч, А. М.**

Л84 Гісторыя Беларусі (першая палова XIX ст.) : дапаможнік / А. М. Лукашэвіч, В. А. Цяплова. – Мінск : БДУ, 2015. – 142 с.
ISBN 978-985-566-236-6.

У дапаможніку прадстаўлены гістарыяграфічны і крыніцазнаўчы агляд першай паловы XIX ст., паслядоўна асвятляюцца факты і падзеі беларускай гісторыі гэтага перыяду. Аналізуецца ваенна-палітычнае, сацыяльна-эканамічнае, этна-культурнае становішча Беларусі ў складзе Расійскай імперыі ў 1801–1855 гг. Разглядаюцца важнейшыя пытанні ўнутранай і знешняй палітыкі, сацыяльнай барацьбы і грамадскага руху.

Для студэнтаў, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-21 03 01 «Гісторыя (па напрамках)».

**УДК 94(476)"18"(075.8)**
**ББК 63.3(4Беи)я73-1**